Belorussian Review * Weißruthenische Rundschau * Revue Biélorussienne

БЕЛАРУСКІ ЗБОРНІК

U. of ILL. LIBRARY
SEP 3 1976
CHICAGO CIRCLE

КНІГА 6

Institute for the Study of the USSR

Institut zur Erforschung der UdSSR

Institut d'études sur l'URSS

МЮНХЭН
1956

ІНСТЫТУТ ДЛЯ ВЫВУЧЭНЬНЯ СССР
Institute for the Study of the USSR * Institut zur Erforschung der UdSSR
Institut d'études sur l'URSS

БЕЛАРУСКІ ЗБОРНІК

КНІГА

6

МЮНХЭН

1956

Перадрук артыкулаў і матарыялаў із Зборніка дазваляецца з умовай паданьня крыніцы.

Працы, што выдае Інстытут, зьяўляюцца вольным выражэньнем аўтарскіх паглядаў і вывадаў, якія не абавязкава маюць супадаць з паглядамі й вывадамі Выдавецкай Калегіі.

Рэдагуе Выдавецкая Калегія Навуковай Рады Інстытуту

Herausgeber: Institut zur Erforschung der UdSSR, e.V. München 37, Schliessfach 5, Germany. Verantwortlicher Redakteur: Dr. Stanisłaŭ Stankievič, München 2, Augustenstrasse 46/III.

B E L O R U S S I A N R E V I E W

of the

Institute for the Study of the USSR

W E I S S R U T H E N I S C H E R U N D S C H A U

des

Instituts zur Erforschung der UdSSR

R E V U E B I E L O R U S S I E N N E

de

l'Institut d'études sur l'URSS

6

M Ü N C H E N

1956

С т. С т а н к е в і ч

Я К У Б К О Л А С

/3.II.1882 - 13.8.1956/

Дня 13 жніўня сёлета раптоўна памёр у Менску на 74-ым годзе жыцьця найвялікшы, побач Янкі Купалы, беларускі паэта й пісьменьнік Якуб Колас. Гэткім чынам, пасьля сьмерці ў 1942 г. Янкі Купалы і ў 1941 годзе Зьмітрака Бядулі, а так-жа зьліквідаваных у 30-ых гадох раду старэйшых пісьменьнікаў на чале з Властам і Максімам Гарэцкім, у васобе Коласа зыйшоў зь літаратурнае сцэны апошні буйны прадстаўнік беларускае літаратуры нашаніўскага пэрыяду.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі Беларусі і Савет Міністраў Беларускай ССР, выдаючы афіцыйнае паведамленьне аб сьмерці пісьменьніка[1], пералічылі наступныя ягоныя становішчы і тытулы: "сябра ЦК КПБ, дэпутат Вярхоўнага Савету СССР і Вярхоўнага Савету БССР, віцэ-прэзыдэнт Акадэміі Навук БССР, народны паэта Беларускай ССР". У паведамленьнях аб сьмерці іншых арганізацыяў былі паказаныя яшчэ становішчы й заслугі Коласа, як старшыні Беларускага Камітэту абароны міру і сябры прэзыдыюму праўленьня Саюзу Савецкіх пісьменьнікаў СССР і БССР, як узнагароджанага пяцьцю ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сьцягу, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу і некалькімі мэдалямі ды як двойчы ляўрэата Сталінскай прэміі[2]. Некалькі дзён пазьней ЦК Камуністычнай партыі Беларусі і Савет Міністраў БССР выдалі пастанову аб названьні імем Коласа адной вуліцы й пляцу ў Менску, прысваеньні ягонага імені некалькім аддзелам Акадэміі Навук БССР, пачаткавым і сярэднім школам Беларусі, а ў Беларускім

Дзяржаўным Унівэрсытэце і Пэдагагічным Інстытуце ў Менску ўстаноўлены стыпэндыі імя Якуба Коласа[3].

З гэтага пералічэньня высокіх становішчаў паэты, займаных ім у вапошнім часе, ды прызнаньнем яму партыяй і ўрадам высокіх узнагародаў і пасьмертных адзначэньняў на першы пагляд выглядала-б, што Якуб Колас быў беззаганным бальшавіком, бязьмежна адданым справе камунізму і савецкай сыстэме ды палажыў для іх несьмяротныя заслугі. Падобна і савецкая літаратурная крытыка, асабліва пэрыяду пасьля апошняе сьветавае вайны, адназгодна адзначае, што Якуб Колас быў палымяным савецкім патрыётам і натхнёным песьняром савецкае эпохі. Затое запраўднае ідэйнае аблічча паэты й пісьменьніка, шырака і глыбака ім выяўленае нятолькі ў дарэвалюцыйнай ягонай творчасьці, але і ў творах першага пэрыяду савецкай улады на Беларусі ў дваццатых гадох, сяньня старанна замоўчваецца, а вялікая колькасьць ягоных твораў, напісаных у гэтым часе, выкінута зь літаратурнай спадчыны паэты. Таму галоўнай мэтай гэтага артыкулу ёсьць паказаць, кім узапраўды быў Якуб Колас і якая ягоная роля ў беларускай літаратуры.

x

Беларускае адраджэнства пэрыяду "Нашае Нівы", як і ўсіх папярэдніх пэрыядаў гэтага адраджэнства ад часу ягонага ўзьнікненьня ў пачатку XIX стагодзьдзя, разьвівалася галоўным чынам у галіне літаратурнай. Гэтая літаратура ня была толькі мастацтвам для самаго мастацтва ані ў разуменьні стваральнікаў ейных, ані ў успрыйманьні яе чытачамі, але й выконвала нацыянальныя ды грамадзкія функцыі ў найшырэйшым і найглыбейшым значаньні гэтага слова. Нацыянальныя й сацыяльныя лёзунгі, заклікі й ідэі гэтага адраджэнства канкрэтызаваліся галоўным чынам у мастацкай літаратуры і ў такой форме даходзілі да народных масаў. Такім чынам беларуская літаратура нашаніўскага пэрыяду была ня толькі вызначальнікам культурнага адраджэньня, разьвіцьця й прагрэсаваньня беларускага народу, але ў роўнай, а мо нат і большай, меры ягонага адраджэньня нацыянальнага, сацыяльнага ды навет і палітычнага.

Гэтая ўнівэрсальная роля беларускае літаратуры часоў "Нашае

Нівы" найбольш шырака і ўсебакова праявілася ў творчасьці двух найбуйнейшых яе прадстаўнікоў і заснавальнікаў - Янкі Купалы і Якуба Коласа. Нельга гаварыць аб ролі ў беларускай літаратуры Коласа зусім незалежна ад Купалы, як і аб ролі Купалы ў вадарванасьці ад Коласа. Абодвы яны равесьнікі /радзіліся ў 1882 годзе/, абодвы амаль раўначасна пачалі пісаць і друкавацца /Купала ў 1905, а Колас у 1906 годзе/, абодвы былі цесна зьвязаныя з "Нашай Нівай" і ейным ідэйным кірункам ды абодвы амаль аднолькава рэагавалі праз даўжэйшы час на вонкавыя палітычныя абставіны, у якіх ім было суджана жыць і тварыць.

Ня гледзячы на гэтыя падабенствы й супольнасьці абодвых паэтаў, яны значна між сабою розьніліся паводля літаратурнага характару сваёй творчасьці. Перш за ўсё яны былі ў вялікай меры прадстаўнікамі адменных літаратурных жанраў і адменна рэагавалі на зьявы жыцьця. Купала, хаця і пакінуў у сваей літаратурнай спадчыне рад невялікіх эпічных паэмаў, большых і меншых паэмаў драматургічнае формы ды некалькі большых выдатных напісаных прозаю драмаў, у васноўным быў паэтам лірычным. Ягоная лірыка вызначалася ідэйнай глыбінёй, эмацыянальнай магутнасьцяй і вялізарнай сілай узьдзейваньня. Канкрэтызуючы і фармулюючы пры помачы гэтых спэцыфічных для паэты мастацкіх прыёмаў ідэі беларускага нацыянальнага адраджэньня, Купала стаўся агульнанародным трыбунам, агульна вызнаным прарокам гэтага адраджэньня і духовым правадыром беларускага народу.

Колас таксама распачаў сваю творчасьць ад лірычных вершаў і спачатку стаўся ведамым галоўна як лірык. Лірычныя вершы былі бесьперапынным літаратурным жанрам і выходзілі з пад ягонага пяра на працягу ўсяе літаратурнае дзейнасьці паэты. Аднак не яны, але буйныя эпічныя, хоць і густа насычаныя лірычным элемэнтам, творы - вялікія вершаваныя паэмы, празаічныя апавяданьні і повесьці вызначылі месца ў беларускай літаратуры й здабылі яму заслужаную славу.

Колас, падобна як і Купала і галоўна ў сваіх лірычных вершах, таксама чула адклікаўся на нацыянальныя й сацыяльныя зьявы беларускага народу і заклікаў яго да змаганьня за сваю будучыню, у васноўным аднак праявіў свой літаратурны талент, як незраўнаны мастак беларускага краю і абразоў ягонае прыроду, як рэаліс-

тычны адтваральнік быту беларускае вёскі і псыхалёгіі беларускіх сялянскіх тыпаў. Адлюстроўваючы ў эпічных формах зьявы прыроды й жыцьця, Колас звычайна захварбоўваў іх глыбокім і шчырым лірызмам, які, у вадрозьненьне ад магутнай сілы і ўрачыстага тону лірызму Купалы, вызначаўся асаблівай пяшчотнасьцю, мяккасьцю і духовай цяплынёй.

Падабенстваў і розьніцаў між абодвымі паэтамі можна знайсьці шмат. Але й прыведзеныя намі дастэткова паказваюць, што Колас у ніякім выпадку ня быў паўтарэньнем Купалы ці наадварот, але адзін другога дапаўнялі. Гэта былі дзьве магутныя творчыя індывідуальнасьці, у многім розныя й адменныя, якія сваёй багатай творчасьцю выпаўнілі асноўны зьмест беларускае літаратуры пэрыяду "Нашае Нівы" й пазьнейшых гадоў аж да мамэнту, калі на зьмену нашаніўства прыйшла новая выдатная пара беларускае літаратуры, пара "ўзвышэнства" /ад літаратурнага згуртаваньня і часапісу "Узвышша", што існавалі ад 1926 да 1931 году/, бязьлітасна спыненага, падобна як і свабодная творчасьць Коласа і Купалы, бальшавіцкім тэрорам у самым пачатку жахлівых трыццатых гадоў.

Якуб Колас пачаў пісаць вершы, маючы ўсяго 12 гадоў жыцьця[4], але пачаткам ягонае літаратурнае творчасьці трэба лічыць 1906 год, калі ў першым нумары за 14 верасьня першай легальнай беларускай газэты "Наша Доля" паявіўся першы друкаваны ягоны верш "Наш родны край". Пасьля гэтага вершы Якуба Коласа часта паяўляюцца на бачынах "Нашае Долі", пазьней "Нашае Нівы", якая замяніла закрытую царскім урадам "Нашу Долю", а ў 1910 годзе выйшаў першы зборнік ягоных вершаў "Песьні жальбы".

Лірычныя вершы Коласа гэтага першага пэрыяду, што хранаалягічна супадае з паяўленьнем часапісу "Наша Ніва", з тэматычнага гледзішча можна агульна падзяліць на дзьве розныя групы. У вадной групе, якая пераважае спачатку і ў ладнай меры ёсьць зьвязаная з падзеямі рэвалюцыі 1905 году, паэта ў словах войстрага абурэньня пратэстуе супраць сацыяльнай несправядлівасьці над беларускім народам і заклікае яго да змаганьня за свае правы. Апрача гэтага, паэта ня менш войстра і часта ў сатырычнай форме выступае супраць царскага самаўладзтва, раскрываючы яго антынародны сэнс. Вершы другой групы галоўна прысьвячае паэта абразом беларускае прыроды, жыцьцю і працы беларускага селяніна. Гэтыя абра-

зы прасякнутыя глыбокім патрыятызмам, бязьмежнаю любоўю роднага краю й народу, нявымоўным болем з прычыны яго цяжкага лёсу. Паколькі першая група вершаў гучыць рэвалюцыйнай бунтарнасьцю, дык другая вызначаецца характэрнай Коласу мяккай пачуцьцёвасьцю і глыбокім ціхім сумам, што знайшло адбітак навет у назове ўспомненага зборніка ягоных вершаў. Ужо гэтыя раньнія вершы Коласа паказалі ягоны няштодзённы талент, як глыбокага й чульлівага лірыка.

У 1911 годзе Колас, адбываючы трохгадовую кару ў Менскім астрозе за ўдзел у нелегальным зьезьдзе настаўнікаў, пачынае свой манумэнтальны твор - паэму "Новая Зямля", і ў тым-жа 1911 годзе, выйшаўшы з вастрогу, прыступае да другой вялікай паэмы - "Сымон Музыка". Але ня гэтыя творы, што былі толькі распачатыя і праца над якімі на доўгі час была перарваная, вызначылі літаратурнае аблічча Коласа ў часе перад першай сьветавай вайной. Гэтую найбольш вызначальную ролю, апрача лірычных вершаў, згуляла мастацкая проза Коласа.

Выдадзеныя ў Вільні ў 1912 годзе яго "Апавяданьні" і ў 1914 годзе вялікі зборнік апавяданьняў "Родныя зьявы", а так-жа ў 1913 годзе надрукаваныя ў Пецярбургу дзьве даўжэйшыя навэлі "Тоўстае палена" і "Нёманаў дар" сталіся бадай што найважнейшай пазыцыяй у творчасьці Коласа нашаніўскага пэрыяду, як і занялі асабліва важнае месца ў беларускай літаратуры.

Пачынальнікамі мастацкай прозы ў новачаснай беларускай літаратуры звычайна ўважалі К.Каганца, Алёйзу Пашкевіч - Цётку, а перадусім Ядвігіна Ш., якія некаторымі сваімі празаічнымі творамі апярэдзілі Коласа, а некаторымі былі ягонымі сучасьнікамі. Якубу Коласу або Тарасу Гушчы, як ён падпісваў тады ды нейкі час пазьней свае празаічныя творы, выпала на долю быць стваральнікам беларускай мастацкай прозы, у гэтым часе навэлі, а пасьлей - повесьці. Ужо раньнія апавяданьні Коласа вызначаліся цікавасьцю сюжэту, жывым разьвіцьцём акцыі, удалай яе матывацыяй, умеласьцю кампазыцыі, плястычнасьцю й сакавітасьцю апісаньняў ды індывідуалізацыяй і ўскрыцьцём глыбокіх псыхічных перажываньняў пэрсанажаў. Звычайныя выпадкі вясковага жыцьця або духовыя перажываньні людзей, што служылі звычайна тэмамі Коласавых апавяданьняў, былі паказаны ў праўдзівым і рэалістычным

асьвятленьні, а ня рэдка былі захварбаваныя шчырым сялянскім гумарам. У некаторых апавяданьнях, як "У старых дубох", "Дзеравеншчына" або "Злучыліся" Колас паказаў сябе здольным майстрам адтвараньня глыбокіх і складаных духовых перажываньняў сялянскіх дзяцей. Гэтая здольнасьць пазнаваць сьвет дзяцінага духовага жыцьця, набытая даўгалетняй практыкай народнага вучыцеля, пазьней выявіцца ўва ўсёй шырыні ў паэме Коласа "Новая Зямля". Першыя Коласавы апавяданьні паказалі, што ў маладой беларускай літаратуры паявіўся празаік выдатных мастацкіх здольнасьцяў.

Глыбокі нацыянальны характар ранѣняй творчасьці Коласа праявіўся галоўным чынам у ягонай бязьмежнай любові роднага краю й народу, зь якімі зьвязвалі паэту ніці арганічнай пачуцьцёвай сувязі. Часта парушаныя ў творах Коласа сацыяльныя праблемы адбівалі запраўдны стан тагачасных сацыяльных узаемадачыненьняў у Беларусі і былі асьвятляныя паэтам таксама ў нацыянальным беларускім аспэкце, а не паводля дактрынаў тагачаснага бальшавізму, якія прыгатаўлялі грунт для кастрычніцкай рэвалюцыі. У лірычных вершах і таксама апавяданьнях Колас асабліва часта паказваў сацыяльныя супярэчнасьці не ў самым беларускім сялянскім народзе, у якім, падобна як і іншыя паэты нашаніўцы ды й сама "Наша Ніва", не знаходзіў ані клясавага падзелу, ані клясавага змаганьня, але выключна між селянінам Беларусам з аднаго боку, а польскім панам і расейскім памешчыкам або чыноўнікам - з другога. Найвышэйшай і канчальнай мэтай гэрояў Коласавых твораў - малазямельнага й безьзямельнага беларускага селяніна ёсьць прыдбаць собскую зямлю, як адзіны варштат працы й апору існаваньня, а ўжо прыдбаную - абараніць перад пасяганьнямі на яе й у цэласьці перадаць патомкам. Гэтай "нацыянальнай абмежаванасьці" і неразуменьня "сацыялістычнага характару" рэвалюцыі не магла дараваць Коласу савецкая літаратурная крытыка, навет апошніх гадоў, калі паэта, ужо ўзьведзены да ролі "натхнёнага песьняра савецкае эпохі", дачакаўся поўнае рэгабілітацыі ад ранейшых грахоў. Гэтак Л. Фіглоўская, аўтарка разьдзелу аб Коласе ў калектыўным "Очерке Истории Белорусской Советской Литературы", між іншага, піша:[5]

> "... дарэвалюцыйная творчасьць беларускага пісьменьніка выявіла і абмежаванасьць ягонага сьветапагляду. Ён не падняўся ў тыя гады да разуменьня гістарычнай ролі пралетарыяту ў рэвалюцыйным змаганьні, да асэн-

саваньня буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, як неабходнага этапу да пераходу да рэвалюцыі сацыялістычнай".

x

Пасьля некалькігадовага перапынку, выкліканага падзеямі першае сьветавае вайны, толькі ў бурлівым і багатым выпадкамі 1917 годзе ўзнаўляе Колас сваю літаратурную дзейнасьць.

У мамэнт Кастрычніцкай рэвалюцыі й некалькі гадоў пасьля яе ў Беларусі разгортваецца змаганьне дзьвюх узаемнаварожых палітычных сілаў: беларускае нацыянальнае рэвалюцыі, што мела за мэту стварэньне незалежнай беларускай дзяржавы - Беларускай Народнай Рэспублікі, і чужога наноснага бальшавізму, ня маючага ў беларускім народзе масавага падтрыманьня, а замацоўванага тут нацыянальна чужымі небеларускімі армейскімі элемэнтамі Заходняга фронту[6]. Якуб Колас, як і наагул беларускія нацыянальныя элемэнты, прыстаў да першага кірунку, поўнасьцяй уключыўшыся ў беларускі нацыянальны рух ды астаючыся ў ягоных радох і пасьля ўстанаўленьня савецкае улады ў Беларусі аж да ліквідацыі бальшавікамі гэтага руху.

Калі ў травені 1917 году пачаў у Менску выходзіць беларускі тыднёвы часапіс "Вольная Беларусь", які стаўся ворганам беларускае нацыянальнае рэвалюцыі й быў рэдагаваны Коласавым дзядзькам Язэпам Лёсікам, паэта зараз-жа навязаў з гэтым часапісам цесную лучнасьць і друкаваў у ім свае творы. Ужо цяпер, а яшчэ больш пасьля павароту паэты вясной 1921 году на бацькаўшчыну, у Менск, пачынаецца найбольш плодны пэрыяд у творчасьці Коласа.

З пад ягонага пяра выходзіць цяпер рад лірычных вершаў, якія ўвайшлі ў выдадзены ў 1922 годзе ў Менску вялікі зборнік "Водгульле". У напісаных цяпер лірычных вершах якраз найшырэй і храналягічна найраней выступілі нацыянальныя ідэі Коласа ў іхнай войстрай супярэчнасьці з бальшавіцкай рэчаіснасьцю. Пытаньню Коласавага антыбальшавізму ў гэтым часе і доўгага ды ўпорыстага супраціву паэты саветызацыі ягонай творчасьці прысьвяціў асобную працу ведамы беларускі літаратуравед на эміграцыі Антон Адамовіч[7]. Таму ў гэтым артыкуле антыбальшавізм Коласа паказаны для паўніні абраза толькі на прыкладзе некалькіх ягоных, найбольш характэрных у гэтым сэньсе, вершаў.

У самы разгар Кастрычніцкай рэвалюцыі, у канцы I9I7 году, Колас піша й друкуе верш "Да працы", у заключнай зваротцы якога чытаем:

Дапомаж Бог нам у прыгодзе!
Ні царскі біч, ні прышлы хам, -
Хай будзе лад у сваёй гасподзе
Стварацъ народ-ўладарац сам.

"Прышлы хам" тут выразна абазначае бальшавікоў, што прэтэндавалі тады на "ўладарца" Беларусі й замянялі сабой ужо здадзены ў архіў гісторыі "царскі біч". Пазьней і бальшавікі заўважылі гэтую да іх алюзію, бо ў пазьнейшых савецкіх выданьнях твораў Коласа "прышлы хам" не ў папад ужо быў заменены "панскім хамам". Такое абазначэньне "прыйшоўшых" на Беларусь бальшавікоў, не сваіх, а наносных чужых людзей, як "прышлага хама", згуквае-цца з Купалавым іх абазначэньнем, як "раскаваных рабоў" /у вершах I9I8 г. "На сход" і "Крыўда"/, якія "крывавяць" беларускі народ і ягоную "Бацькаўшчыну рэжуць на кускі".

Калі ў I92I годзе пасьля доўгае разлукі вярнуўся на бацькаўшчыну, спатканую ў ёй бальшавіцкую запраўднасьць схарактарызаваў у напісаным у тым-жа I92I г. вершы "Родныя малюнкі" гэткімі словамі:

Кавалі другія,
А ланцуг той самы -
Песьні ўсё старыя
Неаджытай гамы.

З нагоды гэтага верша казённы бальшавіцкі крытык Л.Бэндэ ў I93I годзе пісаў:[8]

"Апяваючы "Родныя малюнкі", Якуб Колас перамогу рабочае клясы і ўстанаўленьне пралетарскай дыктатуры на Беларусі ўспрыймае як зьмену аднаго прыгнятацеля другім, як працягваньне старой песьні".

Але найвайстрэй праявіўся антыбальшавізм Коласа ў ведамым ягоным вершы "Беларускаму люду", напісаным у тым-жа I92I годзе. На гвалт падзелу Беларусі між бальшавікамі й Палякамі Рыскім трактатам I8 сакавіка I92I году паэта адказаў такімі войстрымі словамі пратэсту:

Хіба забудзем мы тыя межы,
Што правадзілі бяз нас?
Раны глыбокі; ох, яшчэ сьвежы!
Помсты агонь не пагас.

Нас падзялілі - хто? Чужаніцы,
  Цёмных дарог махляры,
К чорту іх межы! К д'яблу граніцы!
  Нашы тут гоні, бары!

Будзем мы самі гаспадарамі,
  Будзем свой скарб ратаваць.
Годзе тэй крыўды! У ногу з братамі
  Пойдзем свой край вызваляць.

Як бачым, у гэтым вершы паэта ня робіць ужо ніякай розьніцы між Палякамі й бальшавікамі ў спрычыненым імі беларускаму народу гвалце. І адныя і другія тыя-ж самыя "чужаніцы" і такія-ж "цёмных дарог махляры". Пры гэтым, Колас тут не абмяжоўваецца адно толькі выказваньнем пратэсту, але й заклікае народ "свой край вызваляць", заклікае нядьузначна ў далейшых радкох верша беларускі народ да збройнага паўстаньня супраць абодвых акупантаў у вабодвых частках імі падзеленага краю: "Люд вызваляйся, рві свае путы, новую песьню сьпявай!"

Апрача гэтых трох скамэнтаваных намі вершаў Коласа, нэгатыўныя, а то й варожыя дачыненьні да бальшавізму, уцёкі ў сьвет гэтак званай тады "нутранай эміграцыі"[9] ад савецкай запраўднасьці й няпрызнаваньне яе, у большай або меншай меры, знаходзім яшчэ ў такіх вершах паэты, як "Люд стогне", "Не прасі", "Дай зірну", "Дубы", "Покліч", "Цені-страхі", "Звон шыбаў" і інш. Бальшыня гэтых вершаў у пазьнейшых савецкіх выданьнях твораў Коласа не пабачыла болей сьвету, а тыя, што былі дапушчаныя да перавыданьня, былі тэндэнцыйна зьінтэрпрэтаваныя ў выгадным бальшавізму сьвятле. Савецкая літаратурная крытыка асабліва трыццатых гадоў не абмінала ніводнай нагоды, каб на падставе пералічаных вершаў не абвінаваціць іх аўтара ў "буржуазным нацыяналізьме". Вось адна з тыповых для гэнага часу ацэнаў Коласавых вершаў із зборніка "Водгульле"[10]:

> "Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі Міцкевіч /Канстанцін Міцкевіч - запраўднае прозьвішча Коласа - С.С./ піша рад нацыяналістычных вершаў. У зборніку вершаў "Водгульле", выйшаўшым у 1922 г., пасьля прыезду Міцкевіча ў БССР, ёсьць цэлы рад варожых выпадаў супраць савецкае ўлады".

У 1921 годзе выходзіць у Коўне зборнік кароткіх алегарычных апавяданьняў Коласа "Казкі жыцьця", у якім былі зьмешчаныя творы гэтага жанру, напісаныя ім раней, пачынаючы ад 1906 году, і

багата папоўненыя напісанымі ў пэрыяд I9I7-I92I гадоў. У творах гэтага, асабліва ўлюбленага Коласам, жанру, у форме зьяваў жывое й мёртвае прыроды, пісьменьнік насьвятляў і разьвязваў важныя праблемы з жыцьця грамадзтва й паасобных людзей, закранаючы й актуальныя праблемы нацыянальныя, сацыяльныя, выпадкі першае сьветавае вайны й самой рэвалюцыі ды ў тым-жа нязгодным з бальшавіцкай дактрынай сэньсе, што і ў лірычных вершах. Відаць, гэта й паслужыла прычынай, што "Казкі жыцьця" ніразу ня былі перавыдадзеныя ў Савецкім Саюзе й былі старанна замоўчваныя савецкай крытыкай, а факт іхнага першага выданьня вонках БССР, пэўнаж, таксама ня быў чыстым прыпадкам. І толькі пасьля сьмерці пісьменьніка паявіўся ў БССР артыкул, прысьвечаны спэцыяльна "Казкам жыцьця"[II]. Аўтар артыкулу А.Семяновіч, адзначаючы нацыянальны характар напісанай ў I906 годзе казкі "Дудар" і вульгарна стараючыся папасьці ў тон сяньняшнім вымаганьням нацыянальнае палітыкі, без найменшага абаснаваньня ў тэксьце самога твору робіць проста ткі рэвэляцыйны вывад:[I2]

> "У працівагу нацыяналістым розных колераў, якія стараліся пасеяць варожасьць і недавер'е паміж народамі, Якуб Колас стаяў на пазыцыі еднасьці народаў у іх барацьбе за лепшую будучыню, адлюстроўваючы тым самым гістарычную тэндэнцыю і імкненьне беларускага народу да свайго старэйшага брата - рускага народу".

На колькі Колас высака ставіў у сваей творчасьці гэты літаратурны жанр, сьветчыць добра факт, што ён вярнуўся да яго хутка перад сваей сьмерцю, напісаўшы й надрукаваўшы ў гэтым годзе тры новыя "казкі жыцьця": "Як птушкі дуб ратавалі"[I3], "Цьвіркун"[I4] і "Адзінокі курган"[I5].

Алегарычнымі "казкамі жыцьця" і навэлямі, якія пішa на працягу ўсяе свае літаратурнае дзейнасьці, ня вычэрпваецца празаічная творчасьць Коласа. У гэтым часе пісьменьнік пераходзіць і да буйных празаічных жанраў, ствараючы на працягу I92I-I922 году першую сваю повесьць "У Палескай глушы", якая сталася першай часткай задуманай ім "палескай" трылёгіі разам з выдадзенай у I927 годзе другой яе часткай "У глыбі Палесься" і напісанай на працягу I948-54 гадоў яе часткай апошняй "На ростанях", ад якой атрымала назоў і цэлая трылёгія. Характэрна ды, хіба-ж, таксама ня прыпадкова і повесьць "У Палескай глушы" першы раз была надрука-

ваная ў I923 годзе так-жа за межамі БССР, у Вільні.

"На ростанях" - гэта трылёгія аўтабіяграфічнага характару. Сваім дзеяньнем яна ахоплівае час ад I902 г., калі Колас пачаў сваю працу ў якасьці народнага вучыцеля, да I9II году, калі ён выйшаў зь менскага астрогу, дзе, як успаміналася, адбываў трохгадовае судовае пакараньне за ўдзел у рэвалюцыйнай дзейнасьці. Галоўнай тэмай твору ёсьць праблема беларускае інтэлігенцыі, адна часьць якой, будучы ўзгадаванай у казённым духу "веры, царя и отечества", сталася падпорай антынароднага рэжыму царскага самадзяржаўя, другая, - як адцеміў сам аўтар у прадмове да повесьці, "апускалася на дно і зацягвалася балотам", а трэйцяя часьць, здаровая маральна й моцная ідэйна, зблізілася зь сялянскімі масамі і павяла сярод іх рэвалюцыйную й грамадзкую дзейнасьць. Дзеяньне повесьці разьвіваецца вельмі павольна і частагуста пераплятаецца элемэнтамі апісальнага й рэфлексыйнага характару, як вынік яе аўтабіяграфізму. З гледзішча мастацкага з усіх трох частак асабліва дадатна выдзяляецца частка першая - "У палескай глушы" і зьяўляецца паважным дасягненьнем у літаратурным працэсе Коласа. Ня гледзячы на рэвалюцыйныя тэндэнцыі повесьці, афіцыяльная савецкая крытыка прыняла яе няпрыхільна, а савецкая энцыкляпэдыя яшчэ ў I934 годзе адзначала:[I6]

> "рад вялікіх повесьцяў /"У палескай глушы", "У глыбі Палесься" і інш./ тэматычна і ідэялягічна зьвернуты ў мінулае, якое ім /Коласам - С.С./ ідэялізуецца і процістаўляецца сучаснасьці. У менаваных повесьцях Міцкевіч рэтраспэктыўна адтварае абраз ідэяльнага нашаніўца Лабановіча - змагара за "адраджэньне Беларусі".

З мамэнтам заканчэньня й выхадам у сьвет дзьвюх вялікіх манумэнтальных паэмаў - "Новай Зямлі" ў I923 годзе і "Сымона Музыкі" ў I925 годзе, распачатых, як успаміналася, яшчэ ў I9II годзе і потым прадаўжаных некалькімі наваротамі з большымі і меншымі перарывамі між імі, паэтычны талент Коласа дасягае свайго зэніту.

"Новая Зямля" раскрывае на фоне багатай і вобразна адмаляванай наднёманскай прыроды ўва ўсіх яе порах году штодзённае жыцьцё беларускай сям'і канца XIX стагодзьдзя і дае багатыя зарысоўкі беларускага сялянскага быту. Просты сюжэт паэмы і таксама павольнае яе дзеяньне расплываюцца ў статычных элемэнтах

твору - у вапісаньнях сялянскіх тыпаў, быту, звычаяў, земляробскай працы і асабліва абразоў і зьяваў прыроды, якія самі ў сабе вызначаюцца высокімі мастацкімі якасьцямі і маюць дакумэнтальнае значаньне, як рэалістычны й тыповы паказ жыцьця беларускае вёскі дадзенае пары.

У паэме ярка паказаная сацыяльная несправядлівасьць безьзямельнага беларускага сялянства, крыўджанага й эксплятаванага буйнымі земляўласьнікамі. Адзіны выхад з сацыяльнай залежнасьці селяніна Колас бачыць у набыцьці ім собскае зямлі, да чаго й імкнецца на працягу ўсяго дзеяньня паэмы галоўны ейны гэрой Міхал. Імкненьне Міхала "купіць зямлю, прыдбаць свой кут, каб з панскіх выпутацца пут", абаснаванае ў паэме ягоным, разам з тым і паэтавым, наступным разважаньнем:

А дзе-ж той выхад? дзе збавеньне
Зь няволі цяжкай, з паланеньня?
Адзін ён ёсьць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ральля:
То - наймацнейшая аснова
І жыцьця першая умова.
Зямля ня зьменіць і ня зрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасьць волі, дасьць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх ня кіне,
Зямля - аснова ўсёй айчыне.

У гэтым запаветным імкненьні Міхала, якое выражае і галоўную ідэю твору, савецкая крытыка трыццатых гадоў бачыла супярэчную бальшавіцкай дактрыне апотэозу прыватнага собсьніцтва, як адзіны шлях разьвязаньня сацыяльнай праблемы сялянства. Але ў вапошнія гады, калі наступіла поўная рэгабілітацыя Коласа, гэтая-ж крытыка ўжо яго апраўдвала тым, што ў умовах часу, у якім разыгрываецца акцыя паэмы, імкненьне сялянства да "зямлі і волі", згодна вучэньню Леніна, было прагрэсыўным. Гэта тым больш, што быццам Колас паказвае гэтае імкненьне да прыватнага собсьніцтва не як самамэту, а як сяродак, "каб з панскіх выпутацца пут"[I7].

Аднак ня толькі ў галоўнай ідэі твору мы знаходзім супярэчныя з камуністычнай дактрынай устаноўкі. Ня гледзячы на тое, што акцыя паэмы разыгрываецца ў часы дарэвалюцыйныя, у ейных разьдзелах, напісаных ужо пры савецкай уладзе, ёсьць шмат лірычных дыгрэсіяў, заадрысаваных да сучаснасьці. У гэтых лірычных устаўках, уплеценых у паэму, паэта не хавае сваіх нэгатыўных і варо-

жых дачыненьняў да сучаснай яму бальшавіцкай рэчаіснасьці, як зусім яму чужой і сілком накінутай беларускаму народу. Гэтак, прыкладам, у напісаным у I922-23 гг. апошнім XXX разьдзеле паэмы Колас дае характарыстыку этапаў часу, на працягу якіх пісалася "Новая Зямля". Тут характарыстыка савецкай запраўднасьці ў часе перабываньня Коласа ў савецкай Расеі да траўня I92I году адмаляваная паэтам у далёка не пазытыўным сьвятле, але як

Разлука з краем і трывога
І паднявольнае блуканьне,
І гэта нуднае змаганьне
За інтарэсы жывата,
Ды зноў варожая пята...

І сваей спэцыфічна беларускай праблематыкай і дакумэнтальным адлюстраваньнем беларускіх сялянскіх тыпаў і жыцьця, і, галоўнае, глыбокім патрыятычным элемэнтам, выражаным у шчырай любові паэты роднага краю й народу, зьяўляецца "Новая Зямля" адным з найбольш нацыянальных твораў усяе беларускае літаратуры. Ейнае вялікае значэньне й асаблівую ролю ў гэтай літаратуры зусім трапна вызначыў Р. Склют у наступных словах[I8]:

"Новая Зямля" найпаўней і найхарактэрней рэпрэзэнтуе нашую літаратуру часоў нашаніўскага адраджэнцтва /інат ягонага беспасярэдняга падрыхтаваньня/ ды творчасьць Коласа тых-жа часоў. Дзеля таго-ж, што заканчэньне й зьяўленьне ў сьвет цэласьці твору прыпала на самы канец гэных часоў, тая ягоная рэпрэзэнтацыйнасьць, падмацаваная манумэнтальнасьцяй, абярнулася ў завяршальнасьць у дачыненьні да цэлае эпохі беларускае літаратуры, а нат нацыянальнае грамадзкасьці. Але-ж "Новая Зямля" больш, як які-небудзь іншы твор, мае ўсе правы на годнасьць завяршальнага помніка беларускае літаратуры /і наагул нацыянальнага/ адраджэнцтва".

Паколькі "Новая Зямля" паводля ўсіх сваіх мастацкіх асаблівасьцяў зьяўляецца творам рэалістычным, патолькі "Сымон Музыка" ёсьць паэмай рамантычнага стылю, і гэтак яго адназгодна ацаніла беларуская літаратурная крытыка[I9]. "Сымон Музыка" ў сваёй сяньняшняй форме зьяўляецца трэйцім варыянтам трымя наваротамі пісанай і двойчы перарэдагоўванай паэмы. Паэма ў першай рэдакцыі была друкаваная толькі часткамі перад і пасьля першае сьветавае вайны, тады ў I924 годзе была яна Коласам перарэдагаваная, але, паводля афіцыйнае весткі, ненадрукаваны яшчэ рукапіс гэтае другое рэдакцыі быў у аўтара ўкрадзены. Пасьля гэтага Колас піша "Сымона Музыку" ў трэйцім варыяньце, значна адменным ад пер-

шага й другога варыянту ўжо з прычынаў цэнзурнага характару, і паэма ў сваім апошнім выглядзе паяўляецца ў сьвет у I925 годзе.

"Сымон Музыка" ў сваей першай рэдакцыі меў падзагаловак "Казка жыцьця" і тым самым быў уключаны Коласам у ведамы ўжо нам цыкль ягоных алегарычных апавяданьняў, абазначаных супольным назовам "Казкі жыцьця". Хаця гэты падзагаловак у вапошнім варыяньце паэмы адсутнічае, аднак гэтае спачатнае абазначэньне яе, як "Казкі жыцьця", "і становіць сабою той першы ключ да разуменьня гэтае паэмы, карыстаючыся якім можна ня толькі адамкнуць дзьверы да скарбніцаў захаваных у ёй мастацкіх каштоўнасьцяў ..., але й знайсьці доступ да тайнікаў ейнае творчае гісторыі"[2I].

Паэма разьвівае пашыраную ў беларускай народнай творчасьці і ў сусьветнай літаратуры тэму аб мастаку самародку, які, будучы пакрыўджаным лёсам і пазбаўленым мастацкае адукацыі, напралом працярэблівае сабе шлях, собскімі сіламі разьвівае й праяўляе прыроджаны талент. Гэрой Коласавае паэмы Сымон, такі-ж мастак-самародак і сын беларускае вёскі, "няпрызнаны й неацэнены нікім", навет родным бацькам выгнаны з хаты, вандруе ў сьвет із сваей іскрыпкай, як музыка-жабрак, і на сваім шляху напатыкае вясковую дзяўчыну Ганну. Адразу між імі завязваецца нітка глыбокага й неразрыўнага каханьня, але ўпоперак дарогі да іхнага шчасьця становіцца ў канцы паэмы ўведзеная постаць - Дамінік, які спрычыняецца да нявылячальнай фізычнай і псыхічнай хваробы Ганны. У канцы паяўляецца Сымон і сваёй цудоўнай ігрой на іскрыпцы вяртае да нармальнага стану Ганну, зь якой разам ідзе ў шырокі сьвет і ўжо ніколі не разлучаецца. Апошнія глыбокія сэнсам словы паэмы падказваюць, што Сымон пакліканы выканаць вялікую народную місію і што роля ягоная яшчэ не закончаная.

Я разьвітаюся з Сымонам -
Тут круг замкнут адзін, а там
Сваім звычайным ходам-гонам
Пачнуцца новыя кругі -
Яшчэ далёкі берагі,
Аб іх раскажа повесьць вам,
Ужо ня я, а хто другі.
Пайшоў Сымон сваёй пуцінай,
Бо ён прыроджаны пясьняр.
Панёс ён людзям песень дар -
Агонь душы і сэрца жар,
Панёс пясьнярскай каляінай.

Рука ў руку зь ім і з ахвотай
Дзяўчына мілая ішла.
Пад сховам дзеўчага крыла
Гарнула далі пазалотай,
І не кранала іх журбота,
Не засмучала іх імгла.
І ўжо ў пуці, ідучы зь ею,
Як надыйшоў той час-пара,
Дакончыў казку пра лілею
І пра птушыну-песьняра.

Глыбокі і ўніклівы крытык "Сымона Музыкі" літаратуравед Адам Бабарэка, памерлы ў 1937 годзе ў бальшавіцкай ссылцы на сёмым годзе адбываньня яе, першы расшыфраваў алегарычны галоўны сэнс паэмы ў апублікаваным у БССР у 1927 годзе артыкуле "Паэма "Сымон Музыка" Якуба Коласа"[22], які быў у 1955 годзе перадрукаваны ў Мюнхэне, як уступ да Коласавае паэмы ў выданьні "Бацькаўшчына"[23]. Паводля ягонае, пазьней агульна прынятае вольнай беларускай літаратурнай крытыкай, інтэрпрэтацыі, "Сымон Музыка - гэта вобраз беларускага паэты адраджэнца, які сваю энэргію пясьнярскую аддаваў перадусім на змаганьне за нацыянальную й сацыяльную сьвядомасьць працоўнага люду беларускага"[24], а вобраз "лілеі-Ганны" - гэта "сымбалічны вобраз Маладой Беларусі"[25]. Але Бабарэка, даючы алегарычнае расшыфраваньне вобразаў Сымона і Ганны, ані словам не ўспамінае аб трэйцім вобразе рамантычнага "трыкутніка каханьня" - Дамініка. І гэта зусім зразумела ў бальшавіцкіх умовах, бо, як перадаюць беспасярэднія сьветкі, у цесным сяброўскім коле літаратараў у Менску постаць Дамініка ў той час разьбіралася й дыскутавалася, як алегарычны вобраз бальшавізму[26].

Гэткім чынам, антынародны бальшавізм /Дамінік/ авалодвае фізычнай сілай Маладую Беларусь /Ганна/ і прыводзіць яе ў стан летаргічнага сну, але адраджэнская паэзія /Сымон/ сваім жыватворчым узьдзеяньнем вяртае яе да жыцьця й адкрывае сьветлую будучыню перад ёй - такі алегарычны сэнс паэмы Коласа.

Але глыбока нацыянальная і адначасна антыбальшавіцкая накіраванасьць "Сымона Музыкі" выражаецца ня толькі ў ейным алегарычным сюжэце й вобразах галоўных гэрояў, але й пранізвае ўсю паэму із асаблівай выразнасьцю выступае ў частых у ёй лірычных устаўках і дыгрэсіях. З боку літаратурна-мастацкага, як твор глыбокага ідэйнага зьместу, стройнай кампазыцыйнай архітэктоні-

кі, прыгожых абразоў і апісаньняў, эмацыянальнай насычанасьці і дасканаласьці вершаванай формы, "Сымон Музыка" ўважаецца літаратурнай крытыкай за запраўдную пэрлу ня толькі Коласавай паэзіі, але і ўсяе беларускае літаратуры. Успамінаны Адам Бабарэка ў сваім артыкуле аб паэме прыйшоў да гэткага выраду:[27]

> "Сымон Музыка" гэты найлепшы і найкаштоўнейшы дар Якуба Коласа маладой беларускай мастацкай літаратуры адраджэньня, дар, які ніколі не памрэ ў народным сэрцы там, "дзе сам народ-пясьняр".

Затое бальшавіцкая літаратурная крытыка, якая ўзьнікла ў Беларусі фактычна толькі ў пачатку трыццатых гадоў, адмоўна ацаніла "Сымона Музыку", як твор нацыяналістычны і чужы савецкай рэчаіснасьці. Два першыя піянэры гэтае крытыкі, Л.Бэндэ і А.Кучар у супольна напісаным артыкуле гэтак ацанілі паэму[28]:

> "Паэма "Сымон Музыка" ў сымбалічнай форме выражае адраджэньне Беларусі ў вобразе дзяўчыны праз нейкую містычна-таёмную сілу. Пры тым у гэтым творы Я.Колас, які далёка ўжо адыйшоў ад жыцьця сялянскіх мас у надземнае прыгаство й таёмнасьць, - гэтую місію й ролю адраджэнца Беларусі, ролю адраджэнца краіны аддае мастаку /альбо інтэлігенцыі, якая здольна адрадзіць краіну/ - Сымону Музыку. Толькі мастак здольны абудзіць, ажывіць краіну ад цяжкай і кашмарнай хваробы. Між іншым, у гэтым творы, як і ў ранейшай творчасьці Я.Коласа, выступаюць тыпова-ідэялістычныя рысы гэтае творчасьці. Рэчаіснасьць выступае, як пасыўная. Ідэялістычныя рысы выступаюць і ў наданьні нейкай выключнай таёмнай сілы мастаку і мастацтву".

Пасьля гэтага прысуду, падхопленага і іншымі савецкімі крытыкамі, паэма была выкінутая з школьнае праграмы беларускае літаратуры, замоўчвалася літаратурнай крытыкай і на працягу 2I году ня перавыдавалася ў БССР. І толькі ў I946 годзе яна была ўпяршыню перавыдадзеная і пазьней, у I952 годзе, паўтораная ў IУ томе сямітомнага "Збору твораў" Коласа. У камэнтарах да твору, напісаных В.В.Івашынам і А.А.Семяновічам, неўспадзеўкі даведваемся, што "галоўная праблема паэмы - становішча народнага мастацтва ў капіталістычным грамадзтве" і што Колас разьвівае тэзу "аб немагчымасьці свабоднага разьвіцьця таленту ў капіталістычным грамадзтве"[29]. Гэтак, хвальгуючы запраўдны ідэялягічны сэнс паэмы і прамоўчваючы прыпісваныя ёй Л.Бэндэ і А.Кучарам "тыпова-ідэялістычныя рысы", абодвы камэнтатары "Сымона Музыкі" прыходзяць да ўзапраўды рэвэляцыйных вываду[30]:

"Значыць для таго, каб інтэлектуальныя здольнасьці чалавека маглі свабодна разьвівацца, а мастацтва дасягнула свайго росквіту, неабходна зьнішчыць капіталістычнае грамадзтва. Такі рэвалюцыйны вывад робіць Якуб Колас у сваёй паэме "Сымон Музыка".

"Сымон Музыка" быў апошнім творам духова яшчэ вольнага паэты. У гэтым творы Колас, хоць і зьвязаны цэнзурай і хоць у алегарычнай форме, змог аднак у цэлай шырыні выказаць нацыянальна-адраджэнскія ідэі і поўнасьцяй зьігнараваць бальшавіцкі ціск на літаратуру з мэтаю апяваньня апошняй савецкай сучаснасьці і яе дасягненьняў. Але ў тым самым 1925 годзе, у каторым выйшаў друкам "Сымон Музыка", ён піша і ў наступным 1926 годзе выдае новую повесьць "На прасторах жыцьця", дзеяньне якой разыгрываецца ў часе яе напісаньня. Гэтая повесьць становіць першы, і то вельмі выразны й раптоўны знак духовага заламаньня пісьменьніка й пачатак працэсу ягонай саветызацыі.

У повесьці паказваецца, як узгадаваная ў бальшавіцкім духу беларуская вясковая моладзь парывае із старымі традыцыямі і з энтузіязмам кідаецца ў вір новага савецкага жыцьця. У повесьці гэтае збальшавізаваньне моладзі паказанае галоўным чынам у яе бязбожніцкай акцыі, калі група камсамольцаў разбурае "цудоўны сьвяты калодзеж" і нішчыць крыж з Хрыстовым расьпяцьцем, пры якім мае адбыцца традыцыйны малебен з удзелам мясцовага праваслаўнага сьвятара. Бяссумлеву, Коласу было найлягчэй заманіфэставаць свае пазытыўныя дачыненьні да савецкай рэчаіснасьці заакцэнтаваньнем у творы антырэлігійнасьці, бо спасярод усіх беларускіх пісьменьнікаў Колас і раней, яшчэ ў пэрыяд нашаніўскі, найглыбей адчуваў крыўду, якую рабіла народу чужое яму нацыянальна духавенства, і найбольш войстра сьцьвярджаў горкую праўду, што праваслаўныя сьвятары ў сваей бальшыні былі аружжам русыфікацыі, а каталіцкія ксяндзы - палянізацыі.

Зь іншых зьменаў, якія запачаткаваліся ў часы бальшавізму, хаця і не канечна былі яго заслугай, паэта шырака адзначыў у гэтай повесьці толькі тыя дасягненьні часу, якія ўзапраўды былі пазытыўнымі. Гэта шырокія магчымасьці здабываньня асьветы для моладзі й ня менш шырокае карыстаньне ёю з гэтае магчымасьці, а так-жа вынаходніцтва й ініцыятыўнасьць моладзі ды ейны энтузіязм у працы для агульнае грамадзкае карысьці, што выразілася

ў повесьці ў васушэньні сіламі моладзі спрадвечнага Гнілога Балота й абярненьні яго ў ураджайную сенажаць. Гэта дае падставы ўважаць, што апісваючы толькі пазытыўныя дасягненьні бальшавіцкай сучаснасьці, а абмінаючы яе бакі нэгатыўныя, Колас у повесьці "На прасторах жыцьця" ня ўзыйшоў яшчэ на шлях камунізму, а толькі г.зв. нацыянал-камунізму. Ён не парваў яшчэ з традыцыямі мінулага, закарэненымі ў ягонай сьвядомасьці ў нашаніўскія часы. Ды і з боку бальшавікоў гэтая повесьць не атрымала поўнага прызнаньня, аб чым сьветчыць, між іншым, і савецкая энцыклапэдыя:[31]

> "Навет у повесьці "На прасторах жыцьця" на тэму рабфакаўскай моладзі Міцкевіч разглядвае апошнюю, як сваяродную прадаўжальніцу ідэяў і традыцыяў нашаніўства".

Бальшавіцкі ціск на Коласа ў другой палавіне дваццатых гадоў і духовае ламаньне паэты пад цяжарам гэтага ціску яшчэ выразьней адбіліся на ягонай паэме "На шляхох волі". Распачатая ў 1926 годзе і паступова разгортваная ў эпапэю на матар'яле першае сьветавае вайны, паэма была задуманая ў пляне нацыянальным і апазыцыйным да бальшавізму, што асабліва праявілася ў лірычных устаўках і ў актуальных заўвагах аб савецкай сучаснасьці.

У лірычным уступе да паэмы, надрукаваным у № 3 "Полымя рэвалюцыі" за 1927 год, паэта выказвае глыбокую трывогу, што перад ягоным творчым шляхам цяпер "устануць хмары чорным тлумам" і яго "сустрэнуць грозным шумам у падарожжы адзінокім". Аднак такая пэрспэктыва "адзінокага падарожжа" не палохае паэты, і ён цьвёрда заяўляе:

Дарога, знаю я, цяжкая,
Ды вольна будзе мне ў пуціне:
Злажу я песьню тэй краіне,
Што ў цьме дарог сваіх шукае,
І песьня водгульле спаткае,
І ў сэрцы сьлед яе ня зьгіне.
Вясьняны звон гудзе ў прасторы,
Скрозь полаг цьмы ірдзяцца зоры, -
"Ідзі-ж, ідзі!" - мне штось гукае...

У гэткім тоне і ў такой ідэйнай накіраванасьці пісалася паэма на працягу 1926-1929 гг. Яшчэ ў надрукаваным у № 6 "Полымя рэвалюцыі" за 1929 год XII-ым разьдзеле паэмы, у лірычным уступе да яго, паэта адкрыта прызнаецца, што ён ня можа й ня будзе пісаць паводля вымаганьняў савецкае крытыкі:

Парнас мой бедны! Ты бяз клёку,
Ты ад жыцьця стаіш здалёку,
Табе крычаць ужо - далоў!
І марна ўсё тваё стараньне,
Хоць ты аб сьценку біцца рад,
Каб мець найлепшы атэстат.
Але няма табе ні званьня
Ані пахвал, ані прызнаньня -
Сьпяваеш ты, ды неўпапад.
Няздолен ты папасьці ў жылу,
У песьнях тон патрэбны ўзяць,
"На ўсе сто процантаў", "на яць".
Таксама ты ня маеш сілы,
Каб ухіліцца ад ухілу
І тыпа нашых дзён падаць.
І страшна мне за лёс паэмы:
Мой крытык возьме срогі тон,
Ухілаў знойдзе ў ёй мільён
І нясугучнасьць самой тэмы,
Дакоры кіне, што я немы,
Глухі на зовы нашых дзён.
І скажа: "Досыць нам блуканьня
Па зьбітых, пройдзеных "шляхох",
Пішы аб сяньняшніх франтох!
Давай героіку змаганьня,
Сучаснасьць, волі гартаваньне,
Трыумфы новых перамог!"
Што я скажу яму на гэта?
Ён пусьціць зноў у вочы пыл
І іншы знойдзе тут ухіл...

Але ўжо ў наступным разьдзеле паэмы з пачатку 1930 году ёсьць каяньне, прыняцьці гэтых патрабаваньняў савецкай крытыкі, дэкларацыі паэты ўнесьці й сваю цагліну ў сацыялістычнае дудаўніцтва. Тут-жа Колас уводзіць і гэнага "тыпа нашых дзён" - бальшавіка Шкунды ды пераходзіць ад чыста беларускага сюжэту да маляваньня бальшавіцкае рэвалюцыі ў арміі й сталіцах Расеі. Друкаваньне паэмы абрываецца ў 1936 годзе, але намеру давесьці яе да канца паэта не пакідае. Другая сьветавая вайна застае Коласа за працай над паэмай, але ў часе пажару Менску згарэў дом паэты, а ў ім і рукапіс незакончанай паэмы[32]. Але і гэта ня зьнеахвоціла Коласа, і ён на цэлы год перад сьмерцяй вяртаецца да яе ўзноў, друкуючы ў "Полымі" нанава напісаныя разьдзелы XXVII і XXVIII[33] разам з выясьненьнем "Ад Аўтара" аб лёсе раней напісанай паэмы і аб тым, што цяпер "прыступіў да заканчэньня паэмы"[34].

x

Гады 1929-1930 былі пачаткам адкрытага і станоўчага наступу бальшавізму супраць беларускага нацыянальнага жыцьця ў БССР, у тым ліку і перадусім супраць беларускай літаратуры. Купала і Колас, як вядучыя яе прадстаўнікі й арганічна нацыянальныя паэты, сталіся аб'ектам найвастрэйшага ўдару. Пад цяжарам бальшавіцкага маральнага й фізычнага тэрору абрываецца цяпер поўнасьцяй свабодная ці, правільней, часткова свабодная творчасьць гэтых найвялікшых волатаў беларускага мастацкага слова. Для Коласа пачаткам гэтага новага пэрыяду зьяўляецца, пэўне-ж вымушанае, ягонае афіцыйнае пакаяньне ў форме ліста да Савецкай Беларусі, надрукаванага ў газэце "Савецкая Беларусь" 14 сьнежня 1930 году, у якім паэта асудзіў свае ранейшыя памылкі і заявіў, што ён "катэгарычна парывае з нацыянал-дэмакратызмам"[35]. Абодвых паэтаў, Коласа і Купалу, спаткаў цяпер аднолькавы лёс, але кажны зь іх зарэагаваў на новыя палітычныя абставіны ня зусім аднолькава.

Няўданая спроба фізычнага самагубства Купалы ў 1930 годзе, як пратэст супраць бальшавіцкага гвалту, ды вельмі праўдападобная ягоная самагубная сьмерць у 1942 годзе ёсьць найлепшым сьветчаньнем, што нацыянальная трагэдыя беларускага народу сталася ў такой-жа меры і трагэдыяй асабістай Купалы[36]. А тое, што Купала ў гэтым часе вельмі мала пісаў, даў прадукцыю мізэрнай мастацкай якасьці, выконваў фактычна толькі сацыяльныя заказы, бо тэмай ягоных прасавецкіх вершаў зьяўлялася амаль выключна бягучая хроніка савецкага жыцьця, а выладоўваў свой талент галоўна ў перакладаньні на беларускую мову чужых аўтараў, і то перадрэвалюцыйных, - усё гэта выразна прамаўляе за тым, што паэта байкатаваў савецкую запраўднасьць.[37]

Якуб Колас, у вадрозьненьне ад Купалы, і пасьля 1930 году і колькасна і якасна дае багатую літаратурную прадукцыю, у якой пазытыўна і зь няскрываным энтузіязмам апісвае савецкую запраўднасьць. У напісаным у 1930 годзе цыклі вершаў "Калгаснае", а так-жа ў выдадзенай у 1931 годзе повесьці "Адшчапенец" ён выхваляе калгасны лад і апраўдвае акцыю г.зв. "раскулачваньня" і "ліквідацыі кулацтва, як клясы". Новыя лірычныя вершы Коласа, зьмешчаныя ў зборніках "Нашы дні" /1937 г./ і "Пад Сталінскім

сонцам" /1940 г./, прысьвечаныя розным дасягненьням сацыялістычнага будаўніцтва. У 1938 годзе выходзіць у цыклю "палескіх" повесьцяў вялікая повесьць "Дрыгва" над якой неабходна асобна спыніцца.

Ня гледзячы на ейную палітычную тэндэнцыйнасьць, "Дрыгва" з боку мастацкага зьяўляецца, на наш пагляд, найлепшым творам Коласа празаічнага жанру. Сюжэт повесьці, скампанаваны на матарыяле сялянскіх паўстаньняў супраць Палякаў падчас савецка-польскай вайны 1920 году, паказаны ў бесьперапынным дзеяньні і руху і разгортваецца на фоне кароткіх, але маляўнічых і памастацку апрацаваных абразоў багатае палескае прыроды. Галоўная тэма апавяданьня - змаганьне з польскімі легіянэрамі партызанскага аддзелу дзеда Талаша, удала пераплятаецца і кампазыцыйна вяжыцца зь лініяй каханьня Мартына Рыля з Аўгіняй, якое аўтар адмаляваў з глыбокім лірызмам. Зарысоўка адмоўных пэрсанажаў грэшыць некаторай ненатуральнасьцю і карыкатурным шаблёнам, затое некаторыя тыпы дадатнія - сяляне і ў першую чаргу сам дзед Талаш паказаныя больш праўдзіва й рэалістычна. Гэта магчыма таму, што бальшавізм гэтых пэрсанажаў яшчэ паказаны павярхоўна й вонкава і ня шмат закранае іх псыхічных прыватных перажываньняў.

Паколькі Палякі выведзеныя аўтарам у "Дрыгве", як заклятыя ворагі беларускага народу, патолькі бальшавікі паказаныя ў выідэялізаваным сьвятле, як ягоныя шчырыя прыяцелі й абаронькі. Само-ж сялянства, зусім згодна з камуністычнай тэзай, прадстаўлена Коласам у клясавым разрэзе, як дзьве ўзаемна варожыя групы. Што ў "Дрыгве" аўтар перастараўся ў сваей тэндэнцыі папасьці ў тон тагачаснаму курсу бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі, сьветчыць выведзены ім зусім эпізадычны і кампазыцыйна навет лішні тып беларускага нацыяналістага Галыніча, як агента польскай буржуазіі. Вуснамі таго-ж Галыніча аўтар не паўстрымаўся перад дыскрымінацыяй гістарычнай ролі першых легальных беларускіх часапісаў "Нашай Долі" і "Нашай Нівы", прыпісваючы ім замаскаванае служэньне інтарэсам польскай буржуазіі й каталіцызму. Гэтае тэндэнцыйнае й беспадстаўнае абвінавачаньне вядучых ворганаў беларускага нацыянальнага адраджэньня яшчэ паўторыць Колас у закончанай у 1954 годзе повесьці "На ростанях". Нясмачнае ўражаньне ствараецца ў сувязі з тэй акалічнасьцю, што Колас сам у пэ-

рыяд часу, апісваным у "Дрыгве", быў такім-жа нацыяналістым, што і Галыніч, толькі бяз прычэпленага неўпапад да апошняга кляйма польскай агентурнасьці, а на ідэях "Нашай Долі" і "Нашай Нівы" сфармаваліся аснаўныя лініі сьветапагляду паэты.

Колас пісаў і драматычныя творы, хаця гэты жанр не адыграў у ягонай творчасьці паважнейшай ролі, што лірычная й эпічная паэзія або мастацкая проза. Яшчэ перад першай сьветавай вайной з пад ягонага пяра вышлі два кароткія драматычныя творы "Антось Лата" і "На дарозе жыцьця", пасьлей "Забастоўшчыкі", а цяпер, пасьля доўгага перарыву ў гэтым жанры, пісьменьнік драматызуе повесьць "Дрыгву" для сцэнічнай пастаноўкі, даючы ёй назоў "У пушчах Палесься", і выдае ў 1937 годзе вялікую драму "Вайна вайне", у якой разгортваецца дзеяньне на матарыяле першай сьветавай вайны і паказваецца працэс пераходу імпэрыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую. Падобна як і паэму "На шляхох волі", гэтую драму Колас пачаў пісаць у 1926 годзе і на тым самым гістарычным матарыяле - Першае Сьветавае вайны й пераходу імпэрыялістычнае вайны ў вайну грамадзянскую. Магчыма што ў задуме гэта быў проста сцэнічны варыянт паэмы "На шляхох волі". Драма, падобна як і паэмы "Сымон Музыка" і "На шляхох волі", некалькі разоў паэтам перарэдагоўвалася.

Гэтак у № 2 часапісу "Полымя рэвалюцыі" за 1927 год зьявіўся яе пачатак пад загалоўкам "Вайна да пабеднага канца", а ў №11-12 "Полымя" за 1931 год быў надрукаваны поўны тэкст драмы пад тымжа загалоўкам. Далей, у №10 "Полымя" за 1936 год зьявілася новая рэдакцыя драмы ўжо пад загалоўкам "Вайна вайне". А як паказвае дата пад тэкстам твору "1938", якая паявілася ў яго перакладзе на расейскую мову ў чацьвёртым томе "Собраний сочинений в четырех томах" Я.Коласа /Масква, 1952/, канчатковая рэдакцыя драмы была зробленая або закончаная ў гэным 1938 годзе. Усе гэтыя чатыры перарэдагоўваньні драмы ішлі ў кірунку яе саветызацыі й бальшавізацыі. З галоўнага гэроя, які перш быў звычайным для Коласа настаўнікам тыпу Лабановіча з повесьці "У палескай глушы", што далей то ўсё болей рабіўся стыхійны й нат сьведамы бальшавік. Бальшавізаваліся навет сяляне, вычырквaліся іхныя, зусім рэалістычныя, высказваньні й прыказкі рэлігійнага характару й наагул не даволі "ідэялягічна вытрыманыя" месцы. Гэтае некалькі-

разовае перарэдагоўваньне драмы — гэта адзін з найвымоўнейшых довадаў, як пісьменьнік быў змушаны пад прэсіяй бальшавіцкіх дзейнікаў прастасоўвацца да афіцыяльнага бальшавіцкага курсу.

Даволі плоднымі для Коласавай творчасьці былі і гады другой сьветавай вайны, якія паэта, эвакуаваўшыся зь Беларусі, правёў у Ўзбэкістане. За ваенны час Колас напісаў шмат вершаў на актуальныя палітычна-ваенныя тэмы, якія выйшлі асобнымі зборнікамі "Радзіме-Правадыру" /1941/, "Выбраныя вершы" /1942/ і "Голас зямлі" /1943/. Адначасна ён піша, выкарыстоўваючы тэматыку партызанскага змаганьня ў Беларусі супраць нямецкай арміі, дзьве паэмы: "Суд у лесе" /1943/ і "Адплата" /1945/.

Спасярод усіх твораў Коласа, напісаных пасьля повесьці "Дрыгва", савецкая літаратурная крытыка выносіць на першае месца ягоную паэму "Хата рыбака", якая пісалася на працягу сямёх гадоў /1940-1947/ і была прысьвечаная апісаньню жыцьця беларускага народу ў Заходняй Беларусі і яе далучэньне да БССР у 1939 г.[38]

Апошнім буйным творам Коласа зьяўляецца ўжо ўспамінаная повесьць "На прасторах жыцьця", закончаная ў 1954 годзе і будучая трэйцяй часткай ягонай "палескай" трылёгіі гэтага-ж назову. Свой пяцідзесяцігадовы літаратурны шлях замыкае Колас прадаўжэньнем, таксама ўжо ўспамінанай, паэмы "На шляхох волі", якая так і асталася незакончанай, ды наваротам да пісаньня алегарычных "казак жыцьця".

x

З гэтага кароткага агляду літаратурнай спадчыны Коласа ў яе храналягічным разрэзе выразна бачым, што гранічным і пераломным мамэнтам на шляху творчага разьвіцьця паэты быў трагічны для ўсяго беларускага народу 1930 год. Усе Коласавы творы, напісаныя перад гэтым 1930 годам, за выключэньнем некаторых, што коратка яго папярэдзілі, зьяўляюцца, падобна як і літаратурных сучасьнікаў паэты, арганічнай і неад'емнай часткай беларускай нацыянальнай літаратуры. Творы гэтага першага пэрыяду маюць вялізарную ўдзельную вагу ў гэтай літаратуры, у якой Колас, нараўні з Купалам, згуляў вядучую ролю. Затое творы, што паўсталі пасьля 1930 году, былі ўжо, у сілу палітычных абставінаў, сугучныя савецкім патрабаваньням, калі паэта быў змушаны выконваць

сацыяльныя заказы партыі. Калі падыйсьці да ацэны літаратурнай прадукцыі Коласа з гледзішча мастацкіх крытэрыяў, дык узноў-жа толькі ў гэным першым пэрыядзе паэта, яшчэ духова вольны, даў запраўдныя мастацкія пэрлы і палажыў для разьвіцьця беларускай літаратуры несьмяротныя заслугі. З гэнымі творамі ўжо ня могуць раўняцца творы другога пэрыяду, калі паэта быў змушаны тварыць згодна з накінутымі партыяй дырэктывамі і стацца нявольнікам г.зв. сацыялістычнага рэалізму.

Пералічаныя ў пачатку гэтага артыкулу высокія савецкія ўзнагароды Коласа й даверaныя яму высокія становішчы выдаюцца вельмі-ж нясумернымі да ягоных заслугаў для бальшавізму. Ды і заслугі тыя вельмі-ж моцна абцяжаныя ярка нацыянальным характарам творчасьці Коласа нашаніўскага пэрыяду й нядвузначнай антыбальшавіцкай накіраванасьцю ягонай творчасьці дваццатых гадоў. Гэтая нясумернасьць і дае падставы думаць, што ўсе гэтыя ўзнагароды й высокія адзначэньні беларускага паэты ня былі заплатай за ягоныя заслугі для бальшавізму, але тактычнай дэманстрацыяй дзеля выкарыстаньня вялікай папулярнасьці Коласа ў беларускім народзе для бальшавіцкае прапаганды й палітыкі. Калі-б, прыкладам, ня творы Коласа, напісаныя да мамэнту поўнае саветызацыі паэты, якія здабылі яму гэтую папулярнасьць і агульнае прызнаньне, як найвялікшага пасьля Купалы беларускага нацыянальнага паэты, тады-б і бальшавіком ня было-б ніякай патрэбы пераўвялічваць ягоных заслугаў для камунізму.

Бібліяграфічныя зацемкі

I. "Літаратура і Мастацтва", №34, Менск, I6.8.I956.

2. Там-жа.

3. "Літаратура і Мастацтва", №35, 25.8.I956.

4. Алесь Кучар, Літаратурна-крытычныя артыкулы, Менск, I953, б. II3.

5. "Очерк Истории Белорусской Советской Литературы", Масква, I954, б. 20I.

6. Л.Цанава. Всенародная партизанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков, Менск, I95I, т.II, б. 726. Пры-

раўнуй: Язэп Менскі. Чаму ды як была ўтвораная Беларуская ССР. "Беларускі Зборнік" Інстытуту для Вывучэньня Гісторыі й Культуры СССР, №I, Мюнхэн, I955, б. I3.

7. Ант.Адамовіч. Якуб Колас у супраціве саветызацыі. Інстытут для Вывучэньня Гісторыі й Культуры СССР, Мюнхэн, I955.

8. Л.Бэндэ. Матарыялы да нарысаў па гісторыі беларускае літаратуры. "Маладняк" №5, Менск, I93I, бач. I07.

9. Р.Склют у ўводным артыкуле да: Якуб Колас. "Новая зямля", Мюнхэн, I952, б. XIII-XIУ.

I0. МСЭ. Масква, I934, т.7, б. 403.

II. Антон Семяновіч. Казкі жыцьця. "Літаратура і Мастацтва", №38, I5.9.I956.

I2. Там-жа.

I3. "Беларусь", №I, I956.

I4. "Беларусь", №2, I956.

I5. "Беларусь", №6, I956.

I6. МСЭ, Масква, I934, г.УII, б. 403.

I7. Алесь Кучар, там-жа, бач. I54.

I8. Р.Склют, там-жа, б. XXIX-XXX.

I9. Ю.Бярозка. Сымон Музыка ў зборніку "Літаратурная творчасьць К.М.Міцкевіча", Масква, I926, б. 26-50; праф. А.Вазьнясенскі ў "Працах Акадэмічнае Канфэрэнцыі", Менск, I927, б. 35I-356; Е.Ф.Карский. Белорусы, т. III, выпуск 3, Петроград, I92I, б. 300; Ант.Адамовіч. Якуб Колас у супраціве саветызацыі. Інстытут для Вывучэньня Гісторыі й Культуры СССР. Мюнхэн, I955, б. I2-I4.

20. Працэс перарэдагоўваньня паэмы найшырэй дагэтуль паказаны ў вышэй цытаванай працы Ант.Адамовіча, бб. 39-52.

2I. Ант.Адамовіч, там-жа, б. I2.

22. Часапіс "Узвышша", №3, Менск, I927 г.

23. Якуб Колас. Сымон Музыка. Выдавецтва "Бацькаўшчыны", Мюнхэн, I955.

24. Адам Бабарэка. Паэма "Сымон Музыка" Якуба Коласа. Якуб Колас. Сымон Музыка, Мюнхэн, I955, б. XXII.

25. Там-жа, б. XXIУ.

26. Ант.Адамовіч, там-жа, б. 2I.

27. Адам Бабарэка, там-жа, б. XXXII.

28. Л.Бэндэ і А.Кучар. Матар'ялы да нарысаў па гісторыі беларускай літаратуры. "Маладняк", №6-7, Менск, 1931, б.109.

29. Я.Колас. Збор твораў, т. IУ, Менск, 1952, б. 496.

30. Там-жа, б. 496-497.

31. МСЭ, Масква, 1934, т. УII, б. 403-404.

32. Очерк Истории Белорусской Советской Литературы, Менск, 1954, б. 227.

33. "Полымя", №I і 8, 1956.

34. "Полымя", №I, 1956.

35. "Литературная Энциклопедия", т. УII, Масква, 1934, б.402.

36. Прыраўняй: Ст.Станкевіч. Купала праўдзівы й Купала схвальшаваны. "Беларускі Зборнік" Інстытуту для Вывучэньня СССР, кніга 4, Мюнхэн, 1956, бб. 67, 68, 70.

37. Прыраўняй: Ст. Станкевіч, там-жа, бб. 68-70.

38. А.Кучар, там-жа, бб. 221-225; "Очерк Истории Белорусской Советской Литературы", бб. 229-232.

П. Урбан

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАНЬНЕ ПАСЬЛЯ XX ЗЬЕЗДУ КПСС

XX зьезд КПСС зьвярнуў увагу савецкіх гісторыкаў на хвальшаваньне савецкай гісторыяпісяй гісторыі нерасейскіх народаў Савецкага Саюзу. Адначасна прапагандовая літаратура загаварыла шмат аб шанаваньні нацыянальных традыцыяў, культуры й гісторыі гэтых-жа народаў.

Ці гэта шчырае асьветчаньне Крэмля?

Гаворачы аб шанаваньні ў СССР нацыянальных традыцыяў, культуры й гісторыі, трэба зазначыць, што з пачаткам існаваньня Савецкага Саюзу савецкая гістарычная і прапагандовая літаратура заўсёды падчырквала свабоду разьвіцьця ў СССР нацыянальных традыцыяў, а разам з гэтым і гістарычнае навукі. Навет напярэдадні XX зьезду КПСС, у жніўні 1955 году, аб гэтай свабодзе яна адзывалася наступным панэгірыкам:

> "Савецкая гістарычная навука носіць шматнацыянальны характар. Базуючыся на прынцыпах раўнапраўнасьці й дружбы народаў, яна адносіцца з глыбокай пашанай да гісторыі й нацыянальных традыцыяў усіх народаў"1.

XX зьезд КПСС, аказваецца, перачырквае шматгадовыя прапагандовыя цьверджаньні савецкае навукі аб пашанаваньні нацыянальных традыцыяў і гісторыі нерасейскіх народаў Савецкага Саюзу. Як ня дзіўна, але ў сьвятле XX зьезду КПСС якраз Сталін стаўся прычынай зьнішчэньня свабоды й хвальшаваньня гістарычнае праўды. Варта яму было падняць адзін тост за "вялікі расейскі народ", каб гэтым зачараваць савецкіх гісторыкаў і пусьціць іх на шлях рамантычных мрояў. Спахапіўшыся цяпер, ні ў чым нявінная, як яна апраўдваецца, партыя паабяцала выправіць дапушчаныя памылкі згодна ленінскага запавету:

"У сваёй нацыянальнай палітыцы, - гаворыцца ў рэзалюцыі XX зьезду КПСС, - партыя выходзіла й выходзіць зь ленінскага палажэньня аб тым, што сацыялізм ня толькі не адкідае нацыянальных розьніцаў і асаблівасьцяў, але, наадварот, забясьпечвае развой і росквіт эканомікі й культуры ўсіх нацыяў і народнасьцяў".2

У творах Сталіна такім быў і сталінскі прынцып, вылажаны яшчэ ў 1929 годзе ў артыкуле "Нацыянальнае пытаньне і ленінізм".[3] Ня можна сказаць, каб на словах Сталін пярэчыў Леніну. Ды яшчэ так нядаўна Сталін вучыў савецкіх гісторыкаў, што[4]

"Кажная нацыя - незалежна - вялікая ці малая, мае свае задаткі, сваю спэцыфіку, уласьцівыя толькі ёй і якіх няма ў другіх нацыяў. Гэтыя асаблівасьці ёсьць тым укладам, які ўносіць кажная нацыя ў вагульную скарбніцу сусьветнай культуры, дапаўняючы й узбагачваючы яе. У гэтым сэньсе ўсе нацыі - малыя й вялікія - знаходзяцца ў ваднолькавым палажэньні, і кажная нацыя зьяўляецца раўназначнай усякай іншай нацыі".

Аднак, ні пераконлівы ленінізм Сталіна, ні ягоны ўспомнены гуманізм ня сталі перашкодай да ўзьнікненьня эгаістычнае веры ў гістарычную выбранасьць народу, як дайшоў да гэтага народ расейскі:[5]

"У гістарычным руху людзкога грамадзтва на долю вялікага расейскага народу выпала роля вядучай нацыі, зь імем каторай зьвязаны ўсе вырашальныя этапы ў гісторыі сусьветнай культуры".

Зьвярнуўшыся да традыцыі, у мове шаснаццатага стагодзьдзя гэта гучэла-б няйначай, як[6]:

"Масква - трэйці Рым, а чацьвертаму Рыму ня бываць!"

Гэта, пайменна, прывяло нацыянальнае пытаньне ў савецкай гістарычнай навуцы да сяньняшняга трагічнага стану. Пачынаючы ад разгрому школы М. Пакроўскага ў першай сярэдзіне трыццатых гадоў і ўлучна да цяперашняга часу, савецкая гістарычная навука займаецца разьлічанай на русыфікацыю пасьлядоўнай фальсыфікацыяй гісторыі нерасейскіх народаў, прыходзячы апошнімі гадамі да амаль поўнага ўтоесамленьня гісторыі нерасейскіх народаў СССР зь гісторыяй расейскага народу, а гісторыі СССР зь гісторыяй Расеі[7]. Для ілюстрацыі сказанага, зьвернем увагу хоць-бы на "Историю Белорусской ССР", выдадзеную ў 1954 годзе, выхад якое ў сьвет зьяўляецца, паводля апініі савецкіх крытыкаў, "значным здарэньнем у савецкай гістарычнай літаратуры"[8].

"История Белорусской ССР" мелася, згодна тых-жа крытыкаў, у першы раз насьвятліць гісторыю народу з самых раньніх год да рэвалюцыі 1917 году. Фактычна з гэтае гісторыі аўтары яе выкінулі полацкі й літоўскі пэрыяды гісторыі беларускага народу. Гэта ня выпадкова, але абумоўлена гэтак званым адзінствам гістарычнага працэсу ўсходняславянскай, рускай, народнасьці. У першы пэрыяд Беларусь нібы была заўсёды неразьдзельнай складовай часткай гэтай народнасьці й Кіеўскае Русі, а ў другі - паняволена ў сілу абставінаў лятувіскімі і польскімі феадаламі. Аднак аўтары ня выясьняюць крыніцаў бесьперапынных войнаў між Полпцкім княствам і Кіевам, запачаткаваных гвалтоўным і часовым далучэньнем Полацку да Кіева ў семдзесятых гадох дзесятага стагодзьдзя, а таксама ня выясьняюць факту, чаму ў "паняволенай" Беларусі літоўскага пэрыяду магла паўстаць высокая беларуская культура, якая спрычынілася ня толькі да зьбеларусізаваньня культурных слаёў Лятувісаў, але садзейнічала таксама культурнаму разьвіцьцю самое Масквы. Усенароднай ня можа стацца ў дзяржаве культура таго народу, які, паводля словаў аўтараў "Истории", праз стагодзьдзі цярпеў цяжкае прыгнечаньне. Аўтары ня хочуць таксама сьцьвердзіць і таго факту, што запраўднымі прычынамі заняпаду Беларусі былі якраз экспансія Масквы на Захад і выкарыстаньне Польшчай аслабленьня Беларусі, спрычыненага штогоднімі войнамі з Масквою. Наадварот, маскоўская экспансія, паводля іх, была вызваленьнем беларускага народу, чаго ён і дачакаўся, аказваецца, у канцы ХУIII стагодзьдзя. Паводля аўтараў "Истории БССР", расейскі пэрыяд у гісторыі беларускага народу быў самым шчасьлівым пэрыядам, бо толькі ён, аказваецца, даў народу магчымасьць самавызначыцца і разьвіць нацыянальную эканоміку й культуру. Дзіўныя вывады: поўнае эканамічнае выкарыстаньне Беларусі расейскай імпэрыяй, забарона ў краіне кодэксу беларускага заканадаўства - Літоўскага Статуту, абапёртага на народных традыцыях, беларускае мовы й друку мелі-б тады сьветчыць аб гэтых магчымасьцях эканамічнага й культурнага разьвіцьця!

Наагул з цэласьці нарысу гісторыі народу вынікае адмаўленьне ягонае самабытнасьці, як нацыі. Затое чырвонай ніткай праходзяць праз цэлы нарыс пошукі й "доказы" спрадвечных кроўных і культурных сувязяў беларускага народу з расейскім, а таксама

"заўсёдных імкненьняў" першага зьліцьця нацыянальна з другім.

Чытаючы падобную літаратуру, мімавольна напрашваецца пытаньне, як магла ў такім выпадку паўстаць беларуская, хоць і савецкая, нацыя, якая, паводля Сталіна, усё-ж такі павінна была быць аб'ектыўнай, гістарычнай катэгорыяй[9]. Няйначай Сталін памыляўся? Так, прынамся, выплывае зь цьверджаньняў усіх савецкіх гісторыкаў, якія займаюцца пытаньнямі гісторыі БССР. Прыкладам, у сваім артыкуле "Из истории Белорусской ССР" гісторык С.Якубоўская даказвае, што беларуская дзяржава паўстала дзякуючы нацыянальнай палітыцы партыі і, перадусім, дзякуючы Леніну й Сталіну. Супрацілялліся ўтварэньню свае дзяржавы беларускія нацыяналістыя з асяродзьдзя Беларускае Рады, прадаючы яе чужаземным імпэрыялістым і задушваючы ў сваім зародку нацыянальную свабоду беларускага народу[10]. Адным словам атрымоўваецца савецкі парадокс: папершае - выходзіць, што беларускае дзяржавы ня хочаць якраз беларускія нацыяналістыя, а ствараюць яе бальшавікі; падругое - калі ўжо прызнаецца, што сацыялістычныя нацыі не зьяўляюцца справай суб'ектыўнай волі партыі, але аб'ектыўнай неабходнасьцяй[11], дык пры чым тут тады ініцыятыва партыі, Леніна ці Сталіна?

Для лепшага зразуменьня сэнсу й мэтаў падобных савецкіх абсурдаў трэба тут прыпомніць адзін з характэрных прыкладаў савецкага хвальшаваньня гісторыі нерасейскіх народаў - гэта гісторыю формулы "найменшае зло", ці гісторыю апраўданьня савецкімі гісторыкамі расейскага імпэрыялізму.

Як ведама, формула "найменшае зло" зрадзілася ў колах ЦК ВКП/б/ у 1937 годзе[12] і была супрацьпастаўлена формуле "абсалютнае зло", якою М.Пакроўскі і ягоная школа характарызавалі каляніяльную палітыку царскае Расеі[13]. З прыходам у савецкую гістарычную літаратуру, гэтая формула імкнулася давесьці, што царская каляніяльная палітыка была для падбітых народзў дадатняй і навет вельмі карыснай. Бралася дапушчэньне, што ўсе народы меліся стацца ахвярай каляніялізму тэй ці іншай дзяржавы, які аказаўся-б большым злом для гэтых народаў, чымся каляніялізм расейскі. Магутная Расея, бяручы пад апеку народы, дала ім магчымасьць пазбавіцца феадальнае адсталасьці, разьвіць нацыянальную эканоміку й культуру, што ўзбагачвалася пад узьдзеяньнем "самае бага-

тае" культуры расейскага народу, а таксама паўстрымала экспансію каталіцызму й заходняе буржуазнае ідэялёгіі[14].

Аднак, хоць і найменшае зло, яно ўсётакі зьвязвалася з паняцьцем зла. Таму з пачаткам пяцідзесятых гадоў пачынаецца весьціся змаганьне зь "пережыткамі" гэтае формулы. Як і заўсёды пры такіх апэрацыях, у гэтае змаганьне ўцягваюцца аўтарытэты Леніна й Сталіна, марксістоўская дыялектыка грамадзкага разьвіцьця, пры гэтым тэрмін "прагрэс" апраўдвае ўсе народныя беды. Капіталістычная сыстэма, аказваецца, ёсьць прагрэсыўнай таму, што пры ёй праходзіць хуткае разьвіцьцё вытворчых сілаў і нарастаньне пралетарскае рэвалюцыі, але капіталізм можа паўстаць толькі ў дзяржаве, якая эканамічна аб'ядноўвае адносна вялікія тэрыторыі. З гэтага гледзішча каляніялізм апраўдваецца, ён апраўдваецца яшчэ й тым, што ў вялікай, шматнацыянальнай дзяржаве праходзіць хутчэй ліквідацыя нацыянальнае замкнутасьці і ломка патрыярхальных парадкаў - галоўных перашкодаў на шляху да камунізму. А так, як савецкі народ зьяўляецца на гэтым шляху, ён мусіць зразумець і быць удзячным за тыя ўслугі, якія для яго зрабіла расейская імпэрыя[15]. Такім чынам вынесенае пытаньне на арэну "навуковых дыскусіяў" атрымоўвае адабрэньне, і формула "найменшае зло", як нязгодная і "шкодная марксістоўска-ленінскай навуцы"[16], выкідаецца зь лексыкону савецкае гістарычнае навукі. Пачынаецца новая эпоха, мы-б яе назвалі, эпохай новае формулы "дабрадзейнасьці каляніялізму", якая мае за мэты:

> "На асновах шматлікіх гістарычных дадзеных, архіўнага матарыялу й дакумантаў паставіць на ўсю шырыню пытаньне прагрэсыўнасьці й дабрадзейнасьці далучэньня нерасейскіх народаў да Расеі".17

Ёсьць гэта аб'ектыўны закон гісторыі, які вызначыў расейскаму народу ролю вядучай нацыі ў сьвеце, ці толькі скрайні шавінізм - гэта менш важна, але справа ў тым, што падобнае "марксістоўскае" насьвятленьне гісторыі прывяло да ідэялізацыі гісторыі расейскага народу і ганебнага хвальшаваньня гісторыі іншых народаў Савецкага Саюзу.

Зьвернемся цяпер да "ленінскіх прынцыпаў" у нацыянальным пытаньні, якія сяньня высоўвае партыя. Як ведама, да рэвалюцыі 1917 году Ленін заўсёды выступаў супраць распадзелу Расеі на нацыянальныя адзінкі, матывуючы гэта тым, што

"Сцэнтралізаванае буйнае гаспадарства зьяўляецца вялікім гістарычным крокам наперад ад сярэднявяковай раздробленасьці да будучага сацыялістычнага адзінства ўсяго сьвету",[18]

а таксама адкідаў думку аб утварэньні навет культурна-нацыянальных аўтаноміяў[19]. З разьвіцьцём падзеяў і пад націскам нацыянальна-вызвольных рухаў была нарэшце абвешчана 15 лістапада 1917 году так званая "Дэклярацыя правоў народаў Расеі", якая давала права народам царскае Расеі на самавызначэньне ўключна з правам выхаду зь імпэрыі й утварэньня незалежных нацыянальных гаспадарстваў[20]. Ці аднак ня былі гэта часовая тактыка бальшавікоў і тыя ленінскія "праграмныя словы", каторых "ня выпадае палохацца"?[21] Прыпомнім коратка гісторыю абвешчаньня бальшавікамі Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі.

Пакідаючы ў баку пытаньне збройнага насаджэньня сацыялізму ў нацыянальных рэспубліках, прагледзім праўнае афармленьне БССР. Перадусім трэба адзначыць факт азнаямленьня бальшавікоў зь беларускім нацыянальна-вызвольным рухам таго часу, бо яны самі разагналі Першы Ўсебеларускі Кангрэс у Менску. Зь ім быў добра азнаёмлены й Ленін, аднак толькі пасьля годняга часу пасьля абвешчаньня "Дэклярацыі правоў народаў Расеі" бальшавікі ўспомнілі аб існаваньні беларускага народу і абвесьцілі 1 студзеня 1919 году дэкрэт аб утварэньні БССР, гэтым разам у межых Менскай, Смаленскай, Віцебскай, Магілеўскай, Горадзенскай і бальшыні Віленскай губэрняў, а таксама ў межах тых раёнаў іншых суседніх губэрняў, дзе бальшынёй пражывалі Беларусы[22]. З заняцьцем тэрыторыі Беларусі чырвонай арміяй, 27 лютага таго-ж году касуецца папярэдні акт і абвяшчаецца новы аб утварэньні гэтак званае ЛітБел ці Літоўска-Беларускай Савецкай Рэспублікі, якая мелася абняць толькі землі Віленскай і Менскай губэрняў. На гэтым "вырашэньне" нацыянальнае праблемы не заканчваецца: 1 жніўня 1920 году быў выдадзены новы дэкрэт аб утварэньні БССР, але гэтым разам на тэрыторыі толькі шасьцёх паветаў аднае Менскае губэрні!

Такім быў ленінскі прынцып разьвязаньня нацыянальнага пытаньня на практыцы. За яго ўхапілася партыя, падкрэсьліваючы ўсюды выступленьні Леніна супраць вялікадзяржаўнага расейскага шавінізму ў часе ўтварэньня СССР[23] і робячы із Сталіна ледзь не партызана супраць гэтага шавінізму[24]. Але ў той час Сталін так-

сама выступаў з прыгожымі ідэямі, хоць іх і стаптаў пасьля. Прыкладам, на Х зьезьдзе партыі ён якраз крануўся беларускага пытаньня, даючы адпор расейскім шавіністым. Сталін гаварыў:

> "Я маю запіску пра тое, што мы, камуністыя, быццамбы штучна ствараем беларускую нацыянальнасьць. Гэта няпраўда, беларуская нацыя існуе, у яе ёсьць свая мова, адменная ад расейскае, з прычыны чаго зразумець культуру беларускага народу можна толькі на роднай яму мове... Немагчыма ісьці супраць гісторыі".25

Праўда, гэтая рэпліка Сталіна не вярнула Беларусі страчанай тэрыторыі, але сьветчыць аб некаторых нацыянальных дамаганьнях беларускіх камуністых. З боку Леніна было-б таксама нетактоўным абараняць у вабставінах 1922-1923 гадоў расейскі шавінізм і выступаць за ўліцьцё ў РСФСР толькі што абвешчаных незалежных рэспублік. Гэта было-б простым вызавам да новае адкрытае контрэвалюцыі. У той час бальшыня камуністых нацыянальных рэспублік ня былі бязвольнымі наймітамі, але зьяўляліся таксама і патрыётамі сваіх народаў. Між іншага, да гэтага адважылася прызнацца цяпер і савецкая прэса, зазначаючы, што

> "Вялікую шкоду справе аб'еднаньня народаў прыносіў ухіл некаторых камуністых нацыянальных рэспублік да мясцовага нацыяналізму. Гэтыя камуністыя дамагаліся абмежаваньня кампэтэнцыі цэнтральных органаў Саюзу і ўсемагчымага аддзяленьня некаторых рэспублік".26

Наагул, падыходзячы крытычна да асьветчаньняў ХХ зьезду КПСС у справе нацыянальнае праблемы, прыходзіцца сьцьвердзіць ягоную пустаслоўнасьць. Так вынікае ўжо з дакладу акадэміка А. М.Панкратавай, партыйнага трыбуна ў савецкай гістарычнай навуцы, прачытанага на ХХ зьезьдзе КПСС. Выступаючы з пытаньнем палажэньня савецкае гістарычнае навукі, яна ня кінулася ў скрайнасьць, калі падыйшла да праблемы нацыянальнае гісторыі. Акадэмік Панкратава абмежавалася тут некаторымі заўвагамі што да ідэялізацыі гісторыкамі царскае каляніяльнае палітыкі, а таксама прынятага становішча што да нацыянальна-вызвольных рухаў калянізаваных народаў. Гэтыя рухі, як ведама, лічыліся дасюль рэакцыйнымі, антынароднымі ці проста чужой народам агентурай. Дыпляматычна абыйшоўшы маўчаньнем хвальшаваньне цэласьці гістарычнага працэсу, яна, хоць і ўспомніла, што трэба змагацца супраць вялікадзяржаўнага расейскага шавінізму і мясцовага нацыя-

налізму, прыйшла, аднак, да выводу, што "зьяўляецца зусім праўдзівым падчырківаньне гісторыкамі прагрэсыўнасьці прылучэньня нерасейскіх народаў да Расеі", і не забылася папярэдзіць народы, што яны ўжо маюць "цэнныя працы зь гісторыі", выдадзеныя ў вапошніх гадох[27]. Што шэтыя працы, аднак, хвальшыва насьвятляюць культуру й гісторыю народаў і патрабуюць грунтоўнае перапрацоўкі, - гэтага Панкратава сказаць не адважылася.

Таму было-б вельмі рана рабіць вывад з пары, вырваных з хаосу, асьветчаньняў аб вялікай зьмене савецкай палітыкі ў нацыянальным пытаньні, тым больш, што пярэчыць гэтаму пасьлязьездаўская савецкая літаратура, адкрыта заяўляючы, што ўжо "шматнацыянальнае савецкае гаспадарства забясьпечыла развой эканомікі й культуры ўсіх нацыяў і народнасьцяў"[28].

Грунтоўны перагляд нацыянальнае гісторыяпісі патрабуе сумленных гісторыкаў і свабоды творства. Аднак гэтая свабода застаецца задушанай, аб чым на кажным кроку сьветчаць партыйныя настаўленьні, што савецкія гісторыкі не павінны выходзіць з рамак марксістоўска-ленінскай ідэялёгіі; гэта значыць што яны павінны трымацца этапавай палітыкі партыі[29]. Грунтоўны перагляд нацыянальнае гісторыяпісі, калі-б у запраўднасьці да гэтага дайшло, мусіў-бы пацягнуць за сабой таксама рэгабілітацыю засуджаных у свой час гісторыкаў нацыянальных рэспублік. Яны, аднак, і надалей застаюцца ў ліку "буржуазных нацыяналістых", тым часам, як Панкратава, каторая першая абвіняла іх у "буржуазным нацыяналізьме", выслаўляючы Сталіна і геній расейскага народу,[30] застаецца зноў заслужанай камуністкай і аўтарытэтам у пытаньнях гісторыі.

Яскравым пацьверджаньнем палітычнае махінацыі партыі ў нацыянальным пытаньні можа служыць аднабаковая рэгабілітацыя М. Пакроўскага. Яна больш была абумоўлена антысталінскай палітыкай партыі, чымся аб'ектыўнымі меркаваньнямі, бо Пакроўскі ў свой час выступаў супраць культу асобы ў гісторыі[31]. Гэтак, здымаючы з Пакроўскага кляймо "буржуазнага вучонага"[32], партыя, аднак, пакінула за ім найбольшыя грахі "памылковай інтэрпрэтацыі асноўных пытаньняў расейскага гістарычнага працэсу й сутнасьці самой гістарычнай навукі"[33]. Што да апошняга, дык Пакроўскі, выходзячы з марксістоўскага пагляду на гісторыю, пайменна партыйнасьці

гістарычнае навукі, называў яе проста палітыкай, адыйдзенаю ў прошласьць[34]. "Памылковая інтэрпрэтацыя" Пакроўскім расейскага гістарычнага працэсу заключалася ў тым, што ён прытрымоўваўся нармандзкае тэорыі ўзьнікненьня Кіеўскае Русі і адмаўляў неразрыўнасьць гістарычнага працэсу Расеі, нібы запачаткаванага яшчэ з часоў Кіеўскае Русі[35], як гэта намагаюцца даказваць савецкія гісторыкі. З другога боку Пакроўскі срога асуджаў каляніяльную палітыку Расеі, адзываючыся пра яе наступна:

> "Расейскую імпэрыю называлі "турмою народаў". Мы знаем цяпер, што на гэты назоў заслугоўвала ня толькі гаспадарства Раманавых, але і яго папярэдніца, айчына нашчадкаў Каліты. Ужо маскоўскае вялікае княства, ня толькі маскоўскае царства, было "турмою народаў". Вялікарасея пабудавана на касьцях іншых народаў, і ці апошнія задаволены тым, што ў жылах Вялікарасейцаў цячэ 80% іхняе крыві? Толькі канчатковае зьнішчэньне вялікарасейскага прыгнёту тэй сілай, каторая змагалася й змагаецца з усялякім прыгнечаньнем, магло паслужыць некаторай адплатай за ўсе крыўды, якія спрычыніла ім гэтая няволя".[36]

Падобнае сьцьверджаньне гістарычнае праўды ніколі ня будзе прызнана савецкай гістарычнай навукай, хоць яна час ад часу паслугоўваецца тэрмінам "турма народаў".

Што азначае пастулят "падкрэсьліваць прагрэсыўнасьць прылучэньня нерасейскіх народаў да Расеі"? Ня ёсьць гэта апраўданьнем каляніяльнае палітыкі? У гэтым сэньсе якраз і гаварыла акадэмік Панкратава на XX зьезьдзе КПСС, ды й далей працуюць у гэтым кірунку савецкія гісторыкі. Прыкладам, у трэйцім нумары часапісу "Вопросы истории" за гэты год паявілася пара артыкулаў аб "ленінскай нацыянальнай палітыцы" партыі. У іх разьбіраюцца і крытыкуюцца некаторыя палажэньні савецкіх гісторыкаў што да гісторыі народаў Каўказу і Сярэдняй Азіі. Гэтыя крытыкі, сьцьвярджаючы простае хвальшаваньне савецкай гісторыяпісяй гісторыі гэтых народаў, з свайго боку пачынаюць зноў шукаць матываў дабрадзейнасьці і прагрэсыўнасьці каляніялізму. Для іх прыродныя імкненьні народаў да свабоды застаюцца малаважнымі. Тое важнае, што гэтыя народы "акрэплі" эканамічна і "асвоілі прагрэсыўную расейскую думку й культуру"[37]. Ранейшая тэза: пры разглядзе каляніялізму ня трэба абмяжоўвацца да чыста нацыянальных супярэчнасьцяў. Трэба ахапляць цэласьць усіх зьяваў гістарычнага працэсу грамадзтва, бо народы салідарызуюцца і ўзаемна дапаўняюць

сябе культурна, ня гледзячы на каляніяльную палітыку тае ці іншае дзяржавы[38]. Трэйці артыкул А. Пікмана "О борьбе кавказских горцев с царскими колонизаторами", зьмешчаны ў гэтым самым нумары ўспомненага часапісу, у якім аўтар намагаўся разьбіць неабаснаваныя імкненьні савецкіх гісторыкаў паказаць антынародны характар вызвольнага змаганьня горцаў у XIX стагодзьдзі, пасьпеў атрымаць характарыстыку "лёгкаважнага й дагматычнага падыходу да спрэчных пытаньняў", а паднятая ў ім праблема назвалася "штучна высунатай на першы плян"[39]. Не ўсьцераглі аўтара ад нападаў ні казённая цытата аб тым, што "партыя вучыць з пашанай адносіцца да змаганьня паняволеных народаў за дзяржаўны сувэрэнітэт і нацыянальную незалежнасьць"[40], ні спасыланьне на Маркса й Энгельса ў паказаньні дадатных рысаў нацыянальна-вызвольных рухаў.

Значыцца, аб расейскім каляніялізьме можна гаварыць толькі як аб абстрактным каляніялізьме, не закранаючы яго сутнасьці, бо гэта, як даў зразумець адзін з прадстаўнікоў вышэйшае партыйнае школы ў часе канфэрэнцыі чытачоў часапісу "Вопросы истории", што праходзіла ў Маскве ў канцы студзеня бягучага году, "ня будзе садзейнічаць умацаваньню дружбы народаў"[41]. Пад узьдзеяньнем новага лёзунгу нацыянальнае роўнасьці, некаторыя ўкраінскія працаўнікі культуры, як і беларускія ды іншыя, пачалі дамагацца шанаваньня нацыянальнае культуры й ачышчэньня яе ад "ранейшых расейскіх уплываў". Гэты акт занепакоіў Маскву й справа была вынесена на разгляд партыйнай арганізацыі Саюзу ўкраінскіх пісьменьнікаў, якая на сьаёй зборцы, што праходзіла 3 сьнежня, асудзіла падобныя дамаганьні, прымусіла ініцыятараў гэтых дамаганьняў прызнаць іхнюю няправільнасьць, а саміх выключыла з партыі, як гэта сталася з В.Швэцам, або срога папярэдзіла, як гэта адносіцца да камуністага А.Малышко. Гэтыя пакараньні яны атрымалі за "свае антыпартыйныя, хуліганскага характару выказваньні, накіраваныя на разрыў дружбы між народамі". Адначасна партыйная арганізацыя сьцьвердзіла дабрадзейны ўплыў расейскае культуры на ўкраінскую, "неразьдзельную сувязь украінскае літаратуры зь літаратурай вялікага расейскага народу"[42].

Калі йдзе пра крытычныя заўвагі што да гісторыяпісі беларускага й украінскага народаў, дык тут заўважаецца тактычнае маўчаньне, калі ня лічыць паасобных дамаганьняў культурных працаў-

нікоў Беларусі й Украіны. Аднак гэтыя дамаганьні застаюцца толькі дамаганьнямі, і мабыць часовымі, як мы бачылі з прыкладу прасьледваньня гэтых дамаганьняў на Украіне. На гэтыя дамаганьні рэспубліканскія міністэрствы культуры або не рэагуюць зусім, або супрацьдзеюць. Прыкладам, культурныя працаўнікі Беларусі скардзяцца на тое, што іхныя дамаганьні аб ахове помнікаў нацыянальнае культуры ў краіне, аб дбаньні пра чысьціню мовы ў радыяперадачах, у прэсе й перакладах, аб павялічэньні тыражу беларускіх выданьняў у рэспубліцы, аб увядзеньні беларускага рэпэртуару ў опэрах і тэатрах ды іншыя глухнуць у міністэрствах. Такое становішча яны выясьняюць толькі тым, што ў міністэрствах паранейшаму сядзяць "бюракраты, тыпу чыноўнікаў-"выканаўцаў", якія прызвычаіліся працаваць толькі па "установках", "указаньнях" і прывучыліся, такім чынам, "не сметь своего суждения иметь"[43].

Наадварот, ёсьць шмат сымптомаў далейшага хвальшаваньня гісторыі гэтых народаў, прынамся гісторыі беларускага народу. Прыкладам, у рэцэнзіі на "Историю Белорусской ССР" польскага гісторыка Г. Лаўмянскага, зьмешчанай у пасьлязьездаўскіх "Весьцях Акадэміі навук БССР", падкрэсьліваецца ўсё тая самая "цэннасьць" кнігі і "праўдзівае адлюстраваньне ў ёй цэласьці гісторыі беларускага народу"[44]. Можна сказаць, што гэта прыватны пагляд польскага гісторыка на фальсыфікат гісторыі Беларусі, аднак застаецца той вымоўны факт, што падобныя рэцэнзіі зьмяшчаюцца на балонках беларускіх акадэмічных выданьняў і, такім чынам, атрымоўваюць адабрэньне з боку Беларускае акадэміі. Бязь ніякіх засьцярогаў цэннасьць кнігі прызнаў таксама дырэктар Інстытуту гісторыі Акадэміі навук БССР І. Краўчанка, падаючы свае заўвагі аб дасягненьнях Інстытуту карэспандэнту газэты "Советская Белоруссия"[45]. Ёсьць таксама і жывое, сьвежае хвальшаваньне гэтае гісторыі. Гэтак ужо ў гэтым годзе выйшаў новы фальсыфікат "Белорусская ССР" пад рэдактарствам таго самага І. Краўчанкі, Н. Раманоўскага і Т. Хадкевіча. У гэтым фальсыфікаце паранейшаму сьцьвярджаецца, што ў нацыянальным змаганьні беларускага народу "заўсёды верным сябрам і надзейным саюзьнікам быў вялікі расейскі народ" ды падкрэсьліваецца, што "буйным паваротам у гістарычным лёсе беларускага народу зьяві-

лася ўзьеднаньне Беларусі з Расеяй"[46].

На хвальшаваньне гісторыі накіраваны таксама падобныя рэвэляцыі, якія паяўляюцца на бачынах літаратурных выданьняў. Возьмем хоць-бы артыкул І. Баса "Да пытаньня аб аўтарстве "Энэіды навыварат", зьмешчаным у "Літаратуры і мастацтве". У ім гісторык літаратуры І. Бас кранаецца пытаньня Беларусаў Смаленшчыны. У працэсе крытычнага разбору аўтарства "Энэіды навыварат" Бас паклікаецца на паказаньне ўнука аўтара паэмы /"Смоленский Вестник", 1890, №10/ наступнага зьместу: "Энэіда" на смаленскай беларускай гаворцы была напісана Вікеньціем Паўлавічам Равінскім і хоць нідзе ня была надрукавана, але хутка ў рукапісах разыйшлася па ўсёй губэрні". Паказаньне, здавалася-б, не павінна патрабаваць камэнтараў, чаму паэма ў смаленскай беларускай мове была напісана ў Смаленску й хутка распаўсюдзілася там. Аднак аўтар артыкулу мусіць трымацца накінутага пагляду на гісторыю собскага народу. Хвальшуючы гістарычную праўду й паказаньне кроўнага смалянчука, ён прыходзіць да такога абсурднага выснаву:

> "Хоць А.П.Равінскі стала жыў на Смаленшчыне, ён быў знаёмы і зь Беларусяй, якую абыйшоў пешшу разам з сваім палком у часе айчыннай вайны ў 1812 г. У Беларусі ён бываў і пазьней. Апрача таго, трэба улічаць і такую акалічнасьць: у гады жыцьця Равінскага ў заходняй частцы Смаленшчыны было многа Беларусаў, з жыцьцём і мовай якіх Равінскі быў добра знаёмы".[47]

З гэтага выснаву вынікае, што быццам-бы Смаленшчына не належыць этнаграфічна й культурна да Беларусі. Аднак яшчэ так нядаўна, пры першым абвешчаньні БССР, Смаленшчына была ўлучана ў Беларускую Савецкую Рэспубліку, прызнавалася неразьдзельнай этнаграфічнай часткай Беларусі ў першым выданьні "Большой Советской Энциклопедии" /т. 5, 1930/ і ў іншых выданьнях гістарычнай літаратуры, выйшаўшай да 1930 году.

У сёмым нумары часапісу "Беларусь" за бягучы год быў зьмешчаны ўрывак "Бой на Прыпяці" з раману М.Саковіча. Ад рэдакцыі гэтага часапісу была памешчана заўвага наступнага зьместу:

> "Аднэй зь яркіх старонак гісторыі ўзброенай барацьбы беларускага народу за сваю незалежнасьць і за далучэньне да расейскае дзяржавы зьявілася паўстаньне 1506-1508 гг. Пачалося яно ў Тураве і хутка дакацілася да Менску і Воршы, прычыніўшы вялікія страты польска-літоўскім /літоўскі ў сэньсе лятувіскі - П. У./ магнатам".48

Гэта запраўдная рэвэляцыя гісторыі народу! Сумленны гісторык сказаў-бы, што ў той час на тэрыторыі беларускае дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага ня было ні аднаго польскага магната. Яшчэ статут 1588 г. забараняў ім набываць тут землі. Ён сказаў-бы, што "паўстаньне" князя Міхайлы Глінскага, ня 1506, але 1507-1508 гадоў, было прыватнай авантурай, а не паўстаньнем народу супраць прыгнечаньня польскіх і "літоўскіх" феадалаў. Князь Міхайла Глінскі /між іншым каталік, а не праваслаўны - на праваслаўі ён хацеў зайграць у часе свайго бунту/, будучы дворным маршалам пры вялікім князю Аляксандру /пам. у 1506 годзе/, энэргічным і ўлюбенцам вялікага князя, займаў вялікае палітычнае становішча ў вялікакняжай Радзе Паноў. Гэтым ён нажыў сабе ворагаў у васобе троцкага ваяводы й земскага маршала Яна Заберазінскага і ягоных прыхільнікаў. Пры жыцьці Аляксандра гэтая спрэчка арбітравалася самым вялікім князем пад загрозай сьмяротнага пакараньня абедзьвюх партыяў[49]. У 1505 годзе яна была вынесена на Берасьцейскі сойм, што адбыўся ў сакавіку месяцы, на якім прайграў бок ваяводы Заберазінскага. Сам Заберазінскі і ягоныя прыхільнікі, як віленскі біскуп Войцех, былі пазбаўлены сваіх займаных у дзяржаве становішчаў[50]. Пасьля гэтага спрэчка яшчэ больш завайстрылася, дайшоўшы пры новым вялікім князю Жыгімонту Старым да кульмінацыйнага пункту. Князь Глінскі дамагаўся ад Жыгімонта палагоджаньня справы, зварочваўся таксама да ягонага брата Ўладыслава, караля Вугоршчыны й Чэхіі, але пры такіх далікатных абставінах яна зацягвалася. Гэта прымусіла князя Глінскага дзеіць самастойна, тым больш, што палітычнае становішча Яна Заберазінскага павышалася ў дзяржаве, а князя Глінскага падала. Ён забівае свайго праціўніка, зьвязваючыся адначасна з маскоўскім вялікім князем, і падымае паўстаньне ў сваёй воласьці Тураве[51]. Аднак, не падтрыманы іншымі беларускімі гарадамі й насельніцтвам, змушаны быў пакінуць Беларусь і падацца да Масквы.

Аднак, гэтыя гістарычныя папраўкі для нас менш важныя. Справа ў тым, што аўтары ўспомненае заўвагі карыстаюцца, як і аўтары "Истории БССР", дзіўным асьветчаньнем: "аднэй зь яркіх старонак гісторыі ўзброенай барацьбы беларускага народу за сваю незалежнасьць і за далучэньне да расейскай дзяржавы!..." Як

можна адначасна змагацца і за сваю незалежнасьць і за сваю залежнасьць ад другое дзяржавы!? Мабыць Беларусы пачуваліся тады кроўнымі Расейцамі, чаму аднак пярэчыць гісторыя іхняга шматвяковага змаганьня з тэй-жа самай Масквою. Як выглядае, гэта ёсьць той савецкі парадокс, падсоўваны народам: змагацца за сваю нацыянальную незалежнасьць і за ўліцьцё ў чырвоную імпэрыю. Прынамся ён абараняецца партыяй і ў далейшым, што можна бачыць з артыкулу "Коммунистическая партия - вдохновитель и вождь советского народа". У ім цынічна канстатуецца:

> "Камуністычная партыя, ажыўляючы бесьперапынна ленінскую нацыянальную палітыку, зьявілася натхніцелем і арганізатарам дружбы народаў СССР. Пайменна, у СССР першы раз, і не фармальна, а на справе, забясьпечана роўнасьць нацыянальнасьцяў, усім бяз выключэньня сябром грамадзтва забясьпечаны правы на працу, навучаньне й адпачынак, на ўдзел у кіраваньні дзяржавай, свабода слова, друку, свабода сумленьня".52

Выходзіць, такім чынам, што "ленінская нацыянальная палітыка" партыі супадае з сталінскім прызнаньнем вядучай ролі расейскага народу, якому, як народу "больш прагрэсыўнаму", дазволена ня толькі кіраваць гісторыяй сьвету, але таксама "будаваць савецкую сацыялістычную культуру на асновах багацейшае культуры расейскага народу"[53]. Савецкая-ж культура народаў СССР застаецца, як аб гэтым гаворыцца ў дзявятым нумары часапісу "Коммунист" з гэтага году, сацыялістычнай зьместам і толькі нацыянальнай формай, значыцца моўнай[54]. Гэтая культура ці савецкі сацыялістычны рэалізм прывялі да расейскага культурнага рэалізму, ды што горш - да нявольніцкага прыхіленьня перад сваім гаспадаром. Аб гэтым сьветчыць кажная праца зь гісторыі, кажны літаратурны твор савецкіх аўтараў, у якіх толькі й аддаецца даніна ды вядзецца праслаўленьне расейскай культуры, народу і ягонай гісторыі.

Было-б на месцы зьвярнуць увагу тут на сумны факт, што пагражае навет моўнай культуры нерасейскіх народаў СССР. Русыфікацыя праз школы заўсёды была нармальным зьявішчам у Савецкім Саюзе, але XX зьезд КПСС і ягоная "ленінская нацыянальная палітыка" пастанавілі надаць ёй яшчэ больш інтэнсыўны характар. Гэтак праз увесь бягучы год у настаўніцкай рэспубліканскай прэсе дыскутавалася пытаньне "лепшага спосабу" выкладаньня расейскае мовы ў сярэдніх і вышэйшых школах. Гэтыя "вольныя дыскусіі й пра-

пановы" прывялі да скліканьня агульнае міжрэспубліканскае канфэрэнцыі, што адбылася ў канцы жніўня г. г. у Ташкеньце. Канфэрэнцыя праходзіла пад такім лёзунгам:

> "Вывучэньне расейскае мовы мае глыбока жыцьцёвае, вялікае практычнае значаньня для ўсіх братніх народаў. Расейская мова стала для ўсіх савецкіх народаў другой роднай мовай, адным з важнейшых сяродкаў умацаваньня дружбы народаў, культурнага абмену, пад'ёму нацыянальных культураў і навукі, сяродкам слоўнікавага абагачэньня ўсіх моваў".55

На гэтай канфэрэнцыі таксама былі высунутыя канкрэтныя прапановы ў справе перабудовы падручнікаў і мэтодыкі выкладаньня расейскае мовы, прытарнаваных да моўных асаблівасьцяў кажнага народу, стварэньня спэцыяльнае інспэктуры пры міністэрствах асьветы кажнае рэспублікі, а таксама раённае інспэктуры ў раёнах для кантраляваньня выкладаньня расейскае мовы ў вышэйшых навуковых установах і ў сярэдніх школах у раёнах. Побач з гэтым было паднятае пытаньне аднаўленьня пры міністэрствах кажнае рэспублікі спэцыяльных аддзелаў расейскае мовы й рэарганізацыі моўных ды літаратурных факультэтаў. Для падрыхтоўкі прафэсуры й інспэктараў будзе створаны пры Акадэміі навук СССР спэцыяльны інстытут расейскае мовы і будзе выдавацца ад 1957 году адпаведны часапіс "Русская речь"[56].

Такія крокі партыі гавораць выразна пра тое, куды хіліцца ейная нацыянальная палітыка. Што-ж тады значыць савецкае разгалошваньне аб праўдзівай пастаноўцы нацыянальнага пытаньня і нацыянальных асаблівасьцяў сацыялістычных нацыяў і іхніх культураў?

На нашу думку - гэта толькі чарговы палітычны крок Крэмля. Цяперашняе партыйнае асьветчаньне ў справе нацыянальнага пытаньня было спрычынена часткова нутранай рэакцыяй на задалёка зайшоўшую безаглядную русыфікацыю. Прыродных імкненьняў народаў да самавызначэньня ня можа задушыць ні марксістоўская казуістыка, ні крывавы тэрор у дзяржаве. Прыспаныя гэтым тэрорам, яны заўсёды жывуць у народзе і пры найменшым адпружаньні выяўляюцца ў той ці іншай форме дамаганьняў і супраціву. Аб гэтай жывучасьці й нарастаньні нацыянальных супярэчнасьцяў у Савецкім Саюзе сьветчыць таксама сама партыйная маськіроўка. Гэтак нейкі Сьмірноў, выслаўляючы "ленінскую нацыянальную палітыку" партыі, ня мог не

сканстатаваць таго факту, што "ў СССР сустракаецца яшчэ простае праяўленьне нацыяналістычных настрояў"[57]. Ён намагаецца іх выясьніць "перажыткамі капіталізму ў сьвядомасьці людзей", "замежнай агентурай", якая, імкнучыся разьбіць дружбу й брацтва савецкіх народаў, "прабуе ажыўляць нацыяналістычныя забабоны, распаляць міжнацыянальную варожасьць"[58]. Такімі выясьненьнямі прыкрывалася савецкая прапаганда на працягу колькіх дзесяткаў гадоў, ды й цяпер яна адзываецца падобна аб падзеях у Польшчы і Вугоршчыне. Аднак факт нацыянальнага супраціву застаецца жывым і дзейным.

Складаная праблема дачыненьняў Савецкага Саюзу з краінамі так званай народнай дэмакратыі. Здушыўшы палітычную свабоду гэтых народаў, савецкі сацыялізм ня можа аднак перамагчы іхнага народнага духу. Як доказ мы маем частыя народныя забурэньні ў гэтых краінах, гісторыю цітаўскага сэпэратызму, супраціў і частыя выказваньні камуністычнае прэсы аб нацыянальным камунізьме. Таксама Савецкі Саюз зорка цікуе за іншымі ахвярамі, і перш за ўсё ў васобе каляніяльных народаў, што вядуць змаганьне за сваё самавызначэньне.

Усё гэта разам узятае прымусіла партыю зьмяніць, праўдзівей паднавіць, пастуляты сваей нацыянальнай палітыкі з намерам пацешыць гэтым адных, паўстрымаць рэакцыю другіх, вабячы ёю трэйціх. Імкнучыся да гэтых мэтаў, партыйная прапаганда Савецкага Саюзу загаварыла раптам пра розныя шляхі да камунізму, уключна навет з заваяваньнем улады праз парлямант. Тэма незачэпнасьці нацыянальных асаблівасьцяў сацыялістычных нацыяў і іхніх культураў сталася штодзённай тэмай савецкае прэсы. Тут партыя навет гатовая перакрочыць межы навукі сваіх карыфэяў і цьвердзіць тое, што нацыянальныя культуры павінны быць як формай, так і зьместам нацыянальнымі[59]. Ведама, што гэта нічога іншага, як партыйная гульня словамі, бо побач падобных асьветчаньняў і ў вадным і тым-жа самым артыкуле яна не забываецца папярэдзіць народы Савецкага Саюзу аб тым, што іхняя культура мусіць застацца такой, якой яна была дасюль - сацыялістычнай зьместам і толькі нацыянальнай формай. Гэтае выключэньне для нерасейскіх народаў Савецкага Саюзу савецкая прапаганда выясьняе тым, што быццам-бы савецкія нацыі, маючы поўную свабоду ўсебаковага разьвіцьця, ужо пазбавіліся на-

цыянальнай абмежаванасьці і сталіся нацыямі новага складу - сацыялістычнымі нацыямі[60].

Таму моцна будзе расчараваны той, хто думае, што XX зьезд КПСС прынёс грунтоўныя зьмены ў нацыянальных узаемадачыненьнях СССР. Мы бачылі з нарысу, што савецкая палітыка працуе ня ў кірунку праўдзівага разьвязаньня нацыянальнага пытаньня, але ў кірунку зьнішчэньня ўсялякіх нацыянальных праяваў, у кірунку штучнага зьляпеньня савецкае нацыі расейскае культуры, калі ходзіць пра нацыі СССР, і ў кірунку вынішчэньня нацыянальнае самабытнасьці, калі ходзіць пра ўсе народы савецкага блёку. Ня йначай разумеў савецкую палітыку і "праўдзівае разьвязаньне нацыянальнае праблемы" Н. Булганін, зазначаючы пад час свайго пабыту ў Варшаве ў дзень дзясятай гадавіны сацыялістычнай Польшчы, што:

> "Мы, марксісты-ленінцы, лічылі і лічым, што кажная краіна дносіць сваё новае ў гістарычную практыку будаўніцтва сацыялізму, што ў інтарэсах гэтага будаўніцтва неабходна разьвіваць сацыялістычны дэмакратызм. Але мы ня можам праходзіць побач спробаў аслабіць інтэрнацыянальныя сувязі сацыялістычнага лягеру пад штандарам так званых "нацыянальных асаблівасьцяў", спробаў толькі падарваць народна-дэмакратычныя гаспадарэтвы пад штандарам уяўнага "расшырэньня дэмакратыі".61

Ня прыходзіцца зьмерваць межы "сацыялістычнага дэмакратызму" і магчымасьцяў "унясеньня нацыянальных асаблівасьцяў у гістарычную практыку будаўніцтва сацыялізму". Яны з усёй дакладнасьцяй зьмераныя практыкай крывавага здушэньня паўстаньня вугорскага народу.

На гэтых прынцыпах будзе разьвівацца савецкая гістарычная навука і ў далейшым.

Бібліяграфічныя зацемкі

I. "Вопросы истории", I955, № 8, б.4.

2. "Правда", 25.II.I956.

3. И.Сталин. Национальный вопрос и ленинизм, Госполитиздат, I95I.

4. "Большевик", I948, №7, б.2; "Вопросы истории", I949, №I2, б. 86.

5. "Вопросы истории", I949, №3, б.30.

6. История СССР - Учебник для 8 класса средней школы, Масква, I956, вып. I5, б. I36.

7. Очерки истории исторической науки в СССР, Масква, I955, т.I; Очерки истории СССР - Период феодализма, Масква, I953, ч. I-II; История СССР - Учебник для средней школы, Масква, I955, вып. I4, ч.I-III; Наша Великая Родина, Масква, I955, вып.3; "Истории" паасобных рэспублік, прыкладам "История Белорусской ССР", Менск, I954, т.I.

8. "Вопросы истории", I955, №2, б. II6-I23.

9. И.Сталин. Соч., т.II, б. 339; "Вопросы истории", I953, №I, б. I9.

I0. "Известия АН СССР. Серия истории и философии", т.У, №6 /I928/, б. 542-546.

II. "Вопросы истории", I953, №I, б. I9.

I2. Там-жа, I95I, №4, б.44.

I3. Там-жа, I95I, №4, б.44-48; №II, б. 83-86.

I4. Там-жа.

I5. Там-жа, I952, №I0, б.7.

I6. Там-жа, №8, б.5-6.

I7. З рэзалюцыі паседжаньня Навуковага савету Інстытуту гісторыі АН СССР /26-28 кастрычніка I952 г./, "Вопросы истории", I952, №II, б. I52.

I8. Ленин. Соч., т. ХУII /Масква-Ленінград, I929/, б.I54.

I9. Там-жа, б. 92-95; I44-I53.

20. Образование СССР - Сборник документов I9I7-I924 гг., Масква-Ленінград, I949, №I.

2I. Ленин. Соч., т.ХУII /Масква-Ленінград, I929/, б. 9I.

22. Образование СССР - Сборник документов 1917-1924 гг., Масква-Ленінград, 1949, №№ 74-75.

23. "Коммунист", 1956, №9, б.22-25; "Вопросы истории", 1956, №3, б. 13-24.

24. "Вопросы истории", 1956, №3, б.13-24.

25. Там-жа, 1953, №1, б.19; Сталин. Соч., т.5, б. 48-49.

26. Там-жа, 1956, №3, б.22.

27. "Правда", 22.II.1956.

28. "Коммунист", 1956, №5, б.9-10.

29. "Правда", за 15, 18, 22 лютага і 5 травеня 1956 г.; "Коммунист", 1956, №5, б. 12-13; "Вестник Академии наук СССР", 1956, №6, б. 3-50.

30. А. Панкратова. Развитие исторических взглядов М.Н.Покровского. Сборник "Против исторической концепции М.Н.Покровского, Масква-Ленінград, 1939, б.5-69; Великий Русский Народ, Госполит-издат, 1952.

31. Против исторической концепции М.Н.Покровского, Масква-Ленінград, 1939, б. 55.

32. "Вопросы истории", 1956, №2, б. 212.

33. Там-жа, №1, б.4.

34. Против исторической концепции М.Н.Покровского, М.-Л., 1939, б. 21.

35. М.Н.Покровский. Русская история с древнейших времен, Масква, 1933, вып. 8, т.I, б. 119.

36. Там-жа, б. 249-250.

37. "Вопросы истории", 1956, №3, б. 84-95, 167-170.

38. Там-жа, 1951, №4, б. 45; №11, б. 85.

39. "Вестник Московского университета", 1956, №4, б. 146.

40. "Вопросы истории", 1956, №3. б. 75.

41. Там-жа, №2, б. 211.

42. "Правда", 4.12.1956, б.2.

43. "Літаратура і мастацтва", 17.II.1956.

44. "Весьці Акадэміі навук БССР. Сэрыя грамадзкіх навук", 1956, №1, б. 131-134.

45. "Советская Белоруссия", 6.7.1956.

46. "Зьвязда", 11.10.1956.

47. "Літаратура і мастацтва", 23.6.1956.

48. "Беларусь", 1956, №7, б. 24.

49. Акты Литовской Метрики, Варшава, 1897, вып.II, т.I, №661.

50. M. Stryjkowski, Kronika Polska, Litewska etc., Кракаў, 1844, т.II, кн. 22, б. 321-322; Акты Западной России, СПб, 1846, т. I, № 213.

51. S. Herberstein. Rerum Moscoviticarum Commentarii. Historiae Ruthenicae Scriptores, Бэрлін-Пэтэрсбург, 1841-1842, т.I, б. 71-73.

52. "Правда", 6.УI.1956.

53. "Вопросы истории", 1949, №3, б. 152.

54. "Коммунист", 1956. №9, б. 74-91.

55. "Литературная газета", I.IX.1956.

56. Там-жа.

57. "Зьвязда", 12.IУ.1956.

58. Там-жа.

59. Гл. артыкул А.Ягорава "О национальных особенностях искусства" /"Коммунист", 1956, №9, б. 74-91/.

60. Там-жа.

61. "Советская Белоруссия", 22.7.1956.

А. Л е б е д з ь

ДА ПЫТАНЬНЯ ГІДРАТЭХНІЧНАГА БУДАЎНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ

Дырэктывы ХХ зьезду КПСС для шостага пяцігодняга пляну разьвіцьця гаспадаркі СССР закранулі й Беларусь.

Плянам прадугледжана заканчэньне будаўніцтва Віцебскай ГЭС на Заходняй Дзьвіне, перабудову існуючай асушальнай сеткі на плошчы I70 тыс. га ды збудаваньне новай асушальнай сеткі на плошчы 238 тыс. га[I]. Нельга сказаць, каб у Беларусі да гэтага часу не праводзілася гідратэхнічнае будаўніцтва, аднак яго памеры ў савецкі пэрыяд былі вельмі нязначныя. Пытаньне гідратэхнічнага будаўніцтва ў Беларусі закраналася і на XIX зьезьдзе КПСС, а галоўная ўвага прысьвячалася працам асушаньня балотаў, перадусім у раёнах Палескае нізіны.

У Беларусі, а пераважна на Палесьсі, асушальныя працы вяліся з даўных часоў, аднак адчувальных практычных вынікаў яны давалі мала, бо паасобным земляўладальнікам, што каналізавалі свае землі, не хапала сяродкаў на рэгуляваньне рэкаў. У другой палове XIX стг. былі зарганізаваныя дзьве экспэдыцыі. У I872 г. экспэдыцыя генэрала Жылінскага пачала працаваць над складаньнем праекту асушальных працаў, а ў I873 г. прыступіла да працы "Заходняя экспэдыцыя асушэньня балотаў". У гэтай экспэдыцыі бралі ўдзел навукоўцы А.Ваейкоў, Г.Панфільеў і П.Нікіцін. Да канца XIX стг. экспэдыцыя генэрала Жылінскага праклала 4.600 км. галоўных і бакавых каналаў.

Такім чынам было асушана 3,I мільёны гэктараў зямлі, у тым ліку 578 тыс. га лясоў, атрымана 380 тыс. га новых сенажацяў і I25 тыс. га новай ворнай зямлі[2]. У I878-I89I гг. праводзіліся працы над выпраўленьнем і ачышчэньнем рэчышча Прыпяці ды над

умацаваньнем яе берагоў.

У савецкі пэрыяд асушальныя працы праводзіліся таксама, але вельмі слабымі тэмпамі. Дастаткова сказаць, што да 1941 г. ў Беларусі было асушана толькі 159.000 га[3].

У 1941 г. была прынятая пастанова аб правядзеньні мэльярацыйных працаў у Беларусі, разьлічаных на 15 гадоў, якімі прадугледжвалася асушэньне 4 мільёнаў га балотаў і забалочаных земляў у басэйнах Заходняе Дзьвіны, Дняпра, Сожу, Нёмана, Прыпяці ды Пінскіх балотаў. Аднак гэты плян так і застаўся ня выкананым. Спачатку перашкодзіла II сьветавая вайна, а пасьляваенны пэрыяд у гідратэхнічным будаўніцтве, ня гледзячы на тое, што ў іншых раёнах СССР праводзіліся працы вялікіх памераў /Волга-Дон ды інш./, амаль не закрануў тэрыторыі Беларусі.

Вельмі важнае значаньне для Беларусі мелі гідратэхнічныя працы, зьвязаныя з рэканструкцыяй і палепшаньнем рачных шляхоў зносін.

Пачатак гэтых працаў у Беларусі трэба аднесьці да 1775 г., калі было пачатае будаўніцтва Днепра-Бускага каналу. У канцы XIX стг. у Беларусі ўжо йснавалі наступныя водна-транспартныя сыстэмы: Днепра-Буская, Бярэзінская й Агінская.

Гэтыя сыстэмы свайго часу адыгралі важную ролю ў разьвіцьці эканомікі Беларусі, не малое значаньне маюць яны й цяпер. У сувязі з плянаваным у недалёкай будучыні гідратэхнічным будаўніцтвам вялікага абыйма, лічым патрэбным зьвярнуць крыху ўвагу на ўспомненыя сыстэмы.

I. Днепра-Буская сыстэма

Дняпро, што перасякае Беларусь з паўночнага ўсходу на поўдзень, з даўных часоў быў важным гандлёвым шляхам. Працы над будаўніцтвам Днепра-Бускага каналу былі пачатыя ў 1775 годзе, але хутка спыніліся й толькі ў 1837 г. зноў былі адноўленыя. Будаваньне каналу закончылася ў 1841 г.[4]. Гэты канал, вядомы ў Эўропе як Брэст-Літоўскі або Königskanal, злучае Дняпро зь Віслай і такім чынам - Чорнае мора з Балтыцкім. У склад сыстэмы ўваходзяць:

1. Рака Прыпяць - прыток Дняпра,
2. " " Піна - прыток Прыпяці,

3. Днепра-Бускі канал,
4. Рака Мухавец - прыток Зах. Бугу,
5. Зах. Буг - прыток Віслы.

Штучная частка гэтага шляху - гэта Днепра-Бускі канал, глыбінёй 2,3 м[5], даўжынёй 92,8 км[6], з 22 шлюзамі. У часе II сьветавай вайны ўладжаньні каналу былі зьнішчаныя, адбудавалі іх толькі ў 1946 годзе. У часе аднаўляльных працаў канал быў паглыблены й заместа 22 шлюзаў было пакінута толькі 10[7].

Гэтае воднае злучэньне набывае цяпер у сыстэме камуністычнага блёку дзяржаваў асабліва важнае, ня толькі эканамічнае, але й стратэгічнае значаньне, бо яно злучае нутраным водным шляхам Беларусь, а значыць СССР, з сыстэмай рачных шляхоў зносін Польшчы.

2. Бярэзінская сыстэма

Рака Бярэзіна, прыток Дняпра, мела таксама здаўна вялікае значаньне, як частка гандлёвага воднага шляху. Яшчэ пры Жыгімоньце Аўгусьце была на гэта зьвернута ўвага ды быў складзены праект злучэньня ракі Вяльлі зь Бярэзінай[8].

Другое ня менш важнае значаньне Бярэзіны - гэта яе стратэгічнае палажэньне: стромкія, а мясцамі нізінныя й балотныя берагі ды значная глыбіня рабілі яе добрай лініяй абароны.

Будаваньне Бярэзінскай сыстэмы мела мэтай злучыць Дняпро з Заходняй Дзьвіной і, такім чынам, Дняпро з Балтыцкім морам. Працы над будаваньнем каналу пачаліся ў 1797 годзе й закончыліся ў 1804[9].

Бярэзінская сыстэма ўлучае ў сябе:

1/ раку Бярэзіну,
2/ возера Пелік,
3/ Сяргучаўскі канал,
4/ раку Сяргуч,
5/ Бярэзінскі канал
6/ возера Манец, Плаўе, Бярэшта,
7/ раку Бярэшту,
8/ Вярэбскі канал,
9/ раку Эсу,
10/ возера Прошу,
11/ Лепельскі канал I,
12/ Лепельскае возера,
13/ Лепельскі канал II,
14/ раку Верхнюю Вулу,
15/ Чашніцкі канал,
16/ раку Вулу.

У гэтую сыстэму ўваходзілі наступныя штучныя збудаваньні:

I. Бярэзінскі канал даўжынёй 7,4 км.
2. Вярэбскі " " 2,I "
3. Лепельскі I " " I,0 "
4. Лепельскі II " " 0,25 "
5. Сяргучаўскі " " 9,5 "
6. Чашніцкі " " I,0 "

Агульная даўжыня ўсіх каналаў - 2I,25 км. Сыстэма мае 9 шлюзаў, шырыню каналаў 20 м. і шырэй ды глыбіню ня менш I,4 м[I0]. Даўжыня сыстэмы ад Барысава на Бярэзіне да Вулы на Дзьвіне - I57 км[II]. Бярэзінская сыстэма ў свой час мела вялікае значаньне ў разьвіцьці гандлю й прамысловасьці, зднак разьвіцьцё чыгуначчных шляхоў прывяло яе да ўпадку. Ужо ў канцы XIX стг. Бярэзінская сыстэма абслугоўвала толькі мясцовае суднаходства ды сплаў лесу ў Рыгу.

3. Агінская сыстэма

Гэтая сыстэма злучае Нёман з Дняпром. Канал быў збудаваны гэтманам Агінскім у I770 г. і названы ягоным імям. Ён праходзіць між ракой Ясёлдай /прыток Прыпяці/ і ракой Шчарай /прыток Нёману/, цераз вазёры Вілько й Выгаоўскае. Даўжыня каналу разам з вазёрамі 55 км, а бязь іх 5I км[I2]. Хутка пасьля збудаваньня сыстэма была заняпаўшы і толькі ў I797 г. канал быў адноўлены ды ў I804 г. было адкрытае суднаходзтва[I3].

Гідратэхнічнае будаўніцтва ў Беларусі ў савецкі пэрыяд, апрача працаў над асушэньнем балотаў у раёнах Палескай нізіны, амаль не праводзілася. Аднак у пэрспэктыўных плянах будаўніцтва Беларусь займае не апошняе месца. Неабходна адцеміць, што ў плянах стварэньня адзінай нутраной глыбакаводнай сеткі шляхоў зносін СССР, тэрыторыю Беларусі павінны перацяць шляхі, што злучаюць Чорнае мора з Балтыцкім і Белым марамі. У пляны гідратэхнічнага будаўніцтва ўлучаны Дняпро з прытокамі Прыпяць і Бярэзіна, Заходняя Дзьвіна й Нёман. Да гэтага часу савецкае кіраўніцтва галоўную ўвагу зьвяртала на рэканструкцыю Волгі ў пляне ажыцьцяўленьня праекту "Вялікай Волгі"; цяпер мае ажыцьцяўляцца праект "Вялікага Дняпра" і ў сувязі з гэтым праектам у недалёкай будучыні маюць пачацца вялікія працы й на тэрыторыі Беларусі, на якія мы й зьвернем нашу ўвагу.

4. Балтыцка-Чорнаморскі водны шлях

Злучэньне Чорнага мора з Балтыцкім прыцягвала ўвагу вучоных ужо даўно. А.Ваейкоў, вядомы расейскі геаграф, вывучаючы пытаньні разьвіцьця водных шляхоў Расеі, у часе першай сьветавай вайны, пісаў наступнае:

> "Нельга сумлявацца, што пасьля заканчэньня вайны /вайны 1914 г. - А.Л./ для Расеі пачнецца час хуткага эканамічнага росквіту ... думаю, што ў Расеі павінны быць збудаваныя галоўныя водныя шляхі, якія паводля свайго значаньня хіба ня шмат чым будуць розьніцца ад Суэскага й Панамскага каналаў" 14.

А.Ваейкоў, гаворачы гэта, меў на ўвазе праект Днепра-Дзьвінскага злучэньня. Ён даваў яму наступную ацэну:

> "... калі дапусьціць заглыбленьне для кабатажных суднаў у 2 сажні /4,26 м - А.Л./, гэта дасьць магчымасьць бесьперапыннай сувязі між морамі Паўночным і Балтыцкім на поўначы, Чорным і Міжземным на паўдні..."
>
> "... У гэтым дачыненьні Днепра-Дзьвінскі шлях, як транзытны шлях між двума морамі - адзіны свайго тыпу".15

Так ацэньвалі гэты водны шлях яшчэ да рэвалюцыі. Гэтыя ідэі й ляглі ў васнову схэмы г.зв. "Вялікага Дняпра". Першай схэмай, прапанаванай у 30-х гадох, прадугледжвалася злучэньне Дняпра зь Ленінградзкай вобласьцяй[16]. Гэтая схэма ў наступных гадох атрымала пэўныя, ня прынцыповага характару, зьмены й такім чынам паўстала схэма 1940 году.

Гэтая схэма "Вялікага Дняпра" прадугледжвае злучэньне Дняпра з Заходняй Дзьвіной вышэй Воршы і далей злучэньне з ракой Ловаціяй ды цераз Ільмень з ракой Волхавам і возерам Ладога[17]. Такім чынам, гэтае злучэньне прадугледжвае выхад па Дняпры ў Балтыцкае мора цераз Заходнюю Дзьвіну, а таксама цераз Ловаць, Волхаў і Няву ды ў Белае мора цераз Беламорска-Балтыцкі канал. Пасьля захопу Савецкім Саюзам прыбалтыцкіх дзяржаваў значаньне гэтага праекту яшчэ больш узрасло і, ня гледзячы на наяўнасьць Бярэзінскай сыстэмы, што злучае Дняпро з Заходняй Дзьвіной, перавагу даецца якраз апошняму варыянту 1940 году. Тэхнічныя дадзеныя гэтага праекту нам невядомыя, аднак вядома, што для ажыцьцяўленьня яго будуць патрэбныя вялізарныя працы.

Дняпро наагул грае важную ролю ў жыцьці Беларусі, ажыцьцяў-

леньне-ж праекту падыме ягонае значаньне ня толькі для СССР у цэлым, але й для Беларусі, ня гледзячы на тое, што фактычна яна зьяўляецца як-бы транзытнай тэрыторыяй гэтага воднага шляху.

Ажыцьцяўленьне праекту пачалося зь нізу Дняпра. Першым гідравузлом на Дняпры быў Днепрагэс, другім - Кахоўскі гідравузел, будаўніцтва якога ўжо закончылася. Дырэктывамі XX зьезду КПСС да шостага пяцігоднага пляну прадугледжваецца будаўніцтва Крамянчуцкага й Днепрадзяржынскага гідравузлоў; заплянавана таксама пачаць будаўніцтва Канёўскага гідравузла. Праўдападобна ў наступнай пяцігодцы будзе збудаваны ў раёне зьліцьця Дзясны з Дняпром Кіеўскі гідравузел, што будзе ўваходзіць у схэму Вялікага Дняпра. Такім чынам шостая пяцігодка - гэта зваротны пункт у справе ажыцьцяўленьня праекту Вялікага Дняпра і, відаць, у далейшым будаўніцтва будзе канцэнтравацца ўжо на тэрыторыі Беларусі. Наагул гэтай сыстэмай прадугледжана на Дняпры I4 гідравузлоў, у тым ліку 6 гідравузлоў на тэрыторыі БССР. Гэтая каскада гідравузлоў верхняга цячэньня Дняпра будзе складацца з наступных[I8]:

I. Любецкі,
2. Рэчыцкі,
3. Жлобінскі,
4. Беляхоўскі,
5. Магілеўскі,
6. Аршанскі

гідравузлы і далей, ужо на тэрыторыі РСФСР, Смаленскі й Дарагабускі гідравузлы.

Усе гэтыя гідравузлы, апрача транспартных уладжаньняў, будуць мець і гідраэлектрастанцыі адносна невялікай магутнасьці. У будучыні, з заканчэньнем будаўніцтва гідравузлоў, Дняпро на тэрыторыі БССР ператворыцца ў васноўную водную магістраль зь сеткай буйных вадасховішчаў. Яшчэ ня ведама, дзе мае быць пракапаны канал, што мае злучыць Дняпро зь Дзьвіной, аднак прадугледжанае плянамі 6 пяцігодкі будаўніцтва Віцебскага гідравузла, першага буйнага аб'екту гідратэхнічнага будаўніцтва ў Беларусі - гэта ўжо бязумоўна пачатак ажыцьцяўленьня схэмы Вялікага Дняпра. Дамба Віцебскага гідравузла будуецца вышэй ад Віцебску. Разьведвальныя працы пачаліся яшчэ ў I948 г. У сыстэму гідравузла ўваходзіць дамба з транспартнымі ўладжаньнямі й гідраэлектрастанцыя. Тут паўстане вадасховішча плошчай 807 кв. км і абыймом

2,5 мільярдаў куб.м.[19]. Як паведамляе кіраўнік праекту А.Аванян, падпор вады дамбай пашырыць свой уплыў на 150 км. на Зах. Дзьвіне і больш чым на 100 км. на яе прытоках Касплі й Усьвячы. Кургінскім ярам вада пойдзе ў возера Вымна, Плаў, Васьлепна і ў раку Лужасьнянку[20]. У Латвіі на Дзьвіне ўжо збудаваны Кегумскі гідравузел і ў шостай пяцігодцы мае паўстаць Плявінскі гідравузел. Такім чынам, рэканструкцыя Дзьвіны фактычна ўжо пачалася. Рэканструкцыя верхняга Дняпра й стварэньне вадасховішчаў у значнай ступені будзе садзейнічаць разьвіцьцю ў Беларусі мясцовага рачнога транспарту, што, бязумоўна, будзе мець важнае значаньне для разьвіцьця эканомікі рэспублікі.

5. Рэканструкцыя Днепра-Бускай сыстэмы злучэньня

Аднаўляльныя й рэканструкцыйныя працы на Днепра-Бускім канале пачаліся пасьля заняцьця Саветамі Заходняй Беларусі. Савецкі ўрад імкнуўся зьвязаць Польшчу водным шляхам з Савецкім Саюзам і таму прыдаваў гэтым працам вялікае значаньне. Савецкія аўтары не называюць працаў на Днепра-Бускай сыстэме рэканструкцыйнымі ці аднаўляльнымі; яны лічаць гэты шлях новазбудаваным і самае будаўніцтва залічаюць да вельмі важных:

> "Да найбольш буйных збудаваньняў належыць ...Днепра-Бускае злучэньне, будаваньне якога было закончана ў 1940 годзе".21

Пасьляваенны пэрыяд характарызуецца ўзмацненьнем працаў як транспартнага, так і асушальнага значаньня ў гэтых раёнах. Апрача паглыбленьня рэчышча на шматлікіх рэках верхняга Дняпра, у вялікім маштабе праводзіліся г.зв. выпраўляльныя працы, што забясьпечваюць падтрыманьне габарытных глыбіняў на малых рэках, якія, паводля часапісу "Речной транспорт", даюць лепшыя вынікі, чымся землячэрпаньне[22].

Вялікія працы былі праведзеныя ня толькі на самым канале, але і ў верхнім басэйне Дняпра, на Бугу й Прыпяці. Шэраг вазёраў быў злучаны з рэкамі й каналамі мясцовага значаньня[23]. Па рэках Прыпяці й Стыры адчынена суднаходзтва амаль на ўсёй даўжыні, а па рацэ Стаходзе - да Любяшова[24]. Трэба адцеміць, што працы ў раёне ракі Прыпяці, зьвязаныя з асушальнымі плянамі, вядуцца ў комплексе з разьвязаньнем транспартных заданьняў.

У плян асушальных працаў, зацьверджаны XIX зьездам камуністычнай партыі, уваходзілі працы над чышчэньнем і паглыбленьнем рэчышча Прыпяці; прадугледжвалася выпростваньне рэчышчаў прытокаў, будаваньне дамбаў, рэгуляваньне й г.д. Асаблівая ўвага прысьвячалася збудаваньню вадасховішчаў для адцягваньня вады ў пэрыяд паводак.

Паводля С.Казакова гэтыя працы маюць стратэгічную мэту. Ён піша:

> "Прадугледжваецца, зразумела, і магчымасьць выкарыстаньня вадасховішчаў на выпадак вайны, калі, выпускаючы ваду зь іх, можна йзноў затапіць Палесьсе й зрабіць тэрыторыю яго недаступнай для праціўніка".25

Такія стратэгічныя мерапрыемствы савецкае кіраўніцтва добра ведае і навет мае для іх спэцыяльны вайсковы тэрмін - "забалочваньне", што азначае:

> "Адзін зь відаў вадзяное загароды, створанай у кірунку праціўніка; ужываецца галоўным чынам для ўзмацаваньня абаронных палосаў перад пярэдняй ускраінай абароны на сутыках і бакох, а часамі й унутры абароны". 26

Бясспрэчна, што як і ўва ўсіх наагул аб'ектах будаўніцтва ў БССР, стратэгічныя меркаваньні ў гідратэхнічным будаўніцтве маюць першараднае значаньне.

Значаньне Днепра-Бускага злучэньня з кажным годам павялічваецца, а з заканчэньнем будаўніцтва ў Польшчы глыбокаводнага шляху "Усход-Захад", прадугледжанага пяцігоднімі плянамі разьвіцьця Польшчы, гэтае значаньне яшчэ больш узрасьце. Водны шлях "Усход-Захад", які павінен будзе зьвязаць усе буйныя прамысловыя цэнтры Польшчы й адначасова злучыцца з воднай сыстэмай СССР і Ўсходняй Нямеччыны, а таксама амаль з усімі краямі сатэлітамі, - гэта складанае й вялізарнае збудаваньне, працугледжанае ня толькі для эканамічных, але й для стратэгічных мэтаў.

Такім чынам, у выніку, пасьля ажыцьцяўленьня праекту Вялікага Дняпра, Беларусь будзе перацінацца сеткай транзытных рачных шляхоў зносін з магутнымі грузапатокамі: з паўдня на поўнач і паўночны захад па Дняпры й Заходняй Дзьвіне ды з захаду на ўсход па Днепра-Бускім водным злучэньні.

Як відаць з вышэйшага, у шостай пяцігодцы будуць выконвацца вялікія працы над асваеньнем Дняпра ды, відаць, у наступнай

пяцігодцы, на тэрыторыі Беларусі будзе разгорнутае гідратэхнічнае будаўніцтва ў вялізарных памерах. Выкананьне гэтых працаў зразумела створыць вельмі спрыяльныя ўмовы таксама й для разьвіцьця эканомікі Беларусі, што было-б вельмі дадатным зьявішчам, калі-б гэта ўсё было накіравана на дабро народу. Аднак, ясна сабе прадстаўляючы палітыку ЦК КПСС, у гэтым можна ня толькі глыбака сумлявацца, але й быць упэўненым, што жыцьцёвы ўзровень беларускага народу ад гэтых мерапрыемстваў не падымецца.

Прымусовая-ж праца, звычайна ўжываная ў вялікіх памерах на падобнага тыпу будаўніцтвах, надае гэтым будаўніцтвам характар катаргі, на якую ў першую чаргу будуць накіраваныя Беларусы.

Бібліяграфічныя зацемкі

I. "Правда", I5.I.I956.

2. G. Kazakov, The I952 Plan for the Draining of the Pripet Marshes, New York, I953, p.23.

3. Тамсама, б. 24.

4. Schweizer Lexikon, Zürich, I946, Band III, S.I064.

5. Ibid.

6. БСЭ, т. I4, выд. II, б. 575.

7. Тамсама.

8. В.П.Семенов. Россия, СПб, I905, т. IX, б. 3I9.

9. Тамсама.

I0. Советская Военная Энциклопедия, Масква, I933, т. II, б. 377, 378.

II. Stuckenberg, Kanäle des Russischen Reiches.Брокгауз и Ефрон, СПб, I89I, т. IIIа, б. 5II.

I2. Брокгауз и Ефрон, т. XXI а, СПб, I897, б. 690.

I3. В.П.Семенов. Россия. СПб, I905, т. IX, б. 320.

I4. А.И.Военков. Воздействие человека на природу. Масква, I949, б. 2I6.

I5. Тамсама, б. 2I7.

I6. МСЭ, Масква, I935, т. III, б. 864.

I7. Политический словарь, Масква, I940, б. 65.

I8. "Гудок", 9.III.I956.

19. "Советская Белоруссия", I.У.1956.

20. "Советская Белоруссия", 24.УII.1956.

21. "Плановое хозяйство", №6, Масква, 1951, б. 45.

22. "Речной транспорт", №2, Масква, 1953, б. 28-33.

23. БСЭ, Масква, 1951, т. IX, б.48.

24. Тамсама, б. 50.

25. C. Kazakow. The 1952 plan for the draining of the Pripet marches. New York, Moscow, pp. 272, 273.

26. БСЭ, т. ХУI, Масква, б. 273, 272.

А. Яловіч

ТАРФЯНЫЯ РЭСУРСЫ БССР І ІХ ЭКСПЛЯАТАЦЫЯ

Геаграфічнае палажэньне й прыродныя ўмовы Беларусі садзейнічалі ўтварэньню й разьвіцьцю на яе тэрыторыі розных тыпаў тарфянікаў. Мохавыя балоты й тарфянікі паўсталі ў выніку працэсаў забалочваньня й затарфоўваньня вадаёмаў і сухіх месцаў.

На тэрыторыі БССР пашыраны ў васноўным сучасныя тарфянікі, што пачалі ўтварацца ў пасьляледавіковы перыяд. Аднак забалочваньне вадаёмаў і адклад у іх торфаў праходзілі таксама й у міжледавіковыя эпохі. Гэтыя адклады торфу пры наступе новага ледавіка былі пахаваныя пад тоўстым слоем лёду, а пасьля пад марэнавымі астаткамі, што складаліся зь пяску, гліны й валуноў. Пахаваныя міжледавіковыя тарфянікі былі знойдзены ў Лоеве на Дняпры, у Муравe на Беразіне, у Лескавічах на беразе Прыпяці, ля вёскі Мікуліна й Дзісьненкава недалёка Віцебску ды ў іншых мясцовасьцях[1]. Гэткіх тарфянікаў на тэрыторыі БССР ёсьць куды больш чымся ў іншых частках СССР. Аднак яны яшчэ мала даследаваныя і запасы іх не аблічаныя. Ня вылучаецца магчымасьць, што запраўдныя запасы тарфянай масы пахаваных тарфянікаў БССР акажуцца вельмі вялікімі й рэнтабільнымі для эксплятацыі.

Сучасныя тарфянікі знаходзяцца па ўсёй тэрыторыі БССР. Утварэньне й будова іх залежа ад геаграфічнага палажэньня, кліматычных умоваў, глебы ды цэлагашэрагу прычынаў мясцовага характару. У сувязі з гэтым на тэрыторыі БССР знаходзяцца больш буйныя тарфянікі ў параўнаньні з дробнымі тарфянікамі паўночных і прытундравых раёнаў СССР.

Тарфяныя балоты БССР падзяляюцца на тры групы: вярховыя, нізінныя й пераходныя. У паўночнай частцы БССР знаходзяцца вярхо-

выя тарфянікі, у цэнтральнай - сустракаюцца й нізінныя, а на поўдні нізінныя тарфянікі пераважаюць.

Паводля торфатварэньня й характару тарфяных слаёў гэтыя тарфянікі таксама падзяляюцца на некалькі тыпаў.

I тып. Тарфяныя балоты, што ляжаць на вадаразьдзелах і на шырокіх тэрасах зоны стара-алювіяльных пяскоў. Тарфяны пласт у іх дасягае нярэдка да 6 м.; зьнізу ён складаецца з падвеевага торфу, зьверху пераважае торф утвораны з драўніны сасны разам з падвеем і сфагнумам.

II тып. Тарфянікі вазёрнага паходжаньня. Ляжаць пераважна ў межах канцова-марэнавага ляндшафту й другое тэрасы стара-алювіяльных пяскоў. У васноўным - гэта сфагнавыя тарфянікі із слаба раскладзеным торфам /каля 20%/. Таўшчыня пласту - да 6 м.

III тып. Сфагнавыя, даволі пністыя, тарфянікі, што ляжаць у раёнах залягання стара-алювіяльных пяскоў. Верхні слой таўшчынёй I-I,5 м. складаецца із сфагнавага нераскладзенага торфу, пад ім ідзе пласт саснова-сфагнава-падвеевага торфу, ніжэй - чаротава-дрэўны торф, што паступова пераходзіць у гіпнавы торф.

IУ тып. Сфагнавыя тарфянікі, што прылягаюць да крутых адхонаў. Паўсталі яны ў умовах разьдзеленага рэльефу на 2-ой і 3-яй тэрасах у раёне пашырэньня стара-алювіяльных адкладаў.

Апрача гэтага ў БССР сустракаюцца таксама й іншыя тарфянікі. Сфагнавыя тарфянікі, што займаюць прырэчныя тэрасы, маюць глыбіню ад I,5 да 3 мэтраў і больш. Паўдзённая мяжа суцэльнага пашырэньня розных сфагнавых тарфянікаў праходзіць прыблізна па Прыпяці[2].

Значная глыбіня тарфянікаў БССР сьветчыць аб іхнай старасьці. Аднак-жа толькі паводля глыбіні нельга дакладна вызначыць век тарфяніка, бо адкладаньне тарфянай масы адбывалася неаднолькава ў паасобныя пэрыяды часу, калі зьмяняліся геаграфічныя й кліматычныя ўмовы. Сучасныя тарфянікі БССР, як ужо ўспаміналася, пачалі ўтварацца ў пасьляледавіковы пэрыяд. Іхны прыблізны век можна лічыць на I0 тысяч гадоў[3]. Зразумела, гэта датычыць у васноўным ніжняга пласту; пласты, што ляжаць вышэй, утварыліся пасьлей /8-6-4 тыс. гадоў/. Для дакладнейшага вызначэньня веку паасобных тарфяных пластоў і розных тыпаў торфу ёсьць адумысловыя схэмы й дыяграмы, разгляд якіх, аднак, не ўваходзіць у плян гэтага артыкулу.

Важна адзначыць, што навуковае дасьледваньне балотаў Беларусі пачалося ўжо больш за сто гадоў таму. У пачатку XX стг. дасьледавальныя працы праводзілі В.Сукачоў і В.Дактуроўскі. У 1935 г. В.Дактуроўскі выдаў сваю працу "Тарфяныя балоты", у якую ўвайшлі дадзеныя гэтых дасьледаваньняў. Працы над вывучэньнем балотаў, як прыродных рэсурсаў, у больш шырокіх памерах пачалі праводзіцца толькі пасьля 1930 г. у сувязі з намерамі Саветаў выкарыстаць торф як энэргетычную базу для электрастанцыяў.

У цягу першай пяцігодкі /1928-31 гг/ дасьледаваньне тарфяных балотаў з мэтай удакладненьня запасаў торфу ў іх, а таксама ўліку разьмеркаваньня тарфянікаў на тэрыторыі БССР, праводзіліся яшчэ ў малых памерах. Паводля матар'ялаў Наркомзему РСФСР на I студзеня 1932 г. былі наступныя дадзеныя аб плошчы тарфянікаў і запасах торфу ў БССР: плошча балотаў /паводля дапушчэньняў/ - I.500 тысяч га, запас торфу ў іх у паветрана-сухім стане /паводле дапушчэньняў/ - I.944 мільёны тонаў, запас падсьцілачнага торфу ў паветрана-сухім стане /паводля дапушчэньняў/ - 135 мільёнаў тонаў, агульная плошча зарэгістраваных тарфяных балотаў - 642 тыс. га, з гэтага дасьледаваных - 130 тыс. га, дзе запасы торфу /у паветрана-сухім стане/ складалі 831 міл. тонаў і падсьцілачнага торфу /паветрана-сухога/ - 58 міл. тонаў.

Гэтыя лікавыя дадзеныя сьветчаць аб тым, што тарфяныя рэсурсы БССР паранейшаму заставаліся слаба вывучанымі, ня гледзячы на тое, што паводля пляну I пяцігодкі яны лічыліся асновай энэргетыкі краю, а паводля пляну II пяцігодкі здабыча торфу да 1937 г. павінна была здвоіцца[4].

Дасьледваньні, праведзеныя ў 1932-36 гг., дазволілі да пэўнай ступені ўдакладніць дадзеныя аб тарфяных багацьцях БССР. Паводля стану на I.I.1937 г. агульныя запасы торфу рэспублікі вызначаліся на 2,67 мільярды тонаў[5].

У 1939 г. торф ужо складаў 67,5% усяго паліўнага пляну. На далучаных да БССР у тым-жа годзе землях Заходняе Беларусі было таксама шмат тарфянікаў, і, такім чынам, агульная іх плошча ў БССР значна збольшылася. Кіраўніцтва тарфянай прамысловасьці, Менскі Навукова-Дасьледчы Інстытут балотнае гаспадаркі й Інстытут торфу пры Акадэміі Навук БССР вялі цяпер працу над дасьледваньнем і ўлікам тарфянікаў на ўсёй тэрыторыі БССР. Паводля

стану на I.I.1950 агульная плошча тарфяных балотаў займала больш за 2 мільёны га, г.зн. прыблізна 10% усяе тэрыторыі БССР, а запасы торфу вызначаліся прыблізна на 4 мільярды тонаў[6].

Паасобныя тарфянікі БССР маюць даволі вялікія памеры. З усяе колькасьці тарфяных балотаў 40% прыпадае на тарфянікі плошчай ад I тыс. да 5 тыс. га і каля 20% на большыя чымся 5 тыс. га кажны. Такім чынам прыблізна 60% усяе плошчы тарфяных балотаў БССР - гэта ў васноўным канцэнтраваныя тарфяныя масывы. Нязьлічоная колькасьць дробных тарфяных балотаў, што знаходзяцца на землях сельскагаспадарскага прызначэньня, у лясным фоньдзе і г.д., эксплятацыя якіх лічыцца яшчэ маларэнтабільнай, паранейшаму застаюцца яшчэ толькі арыентацыйна ўлічанымі ды мала дасьледванымі.

Прырост тарфяніка ў розных яго частках - неаднолькавы й залежыць ад батанічнага складу балотнай расьліннасьці, вільгаці, кіслотнасьці, ступені зацяненьня паверхні тарфяніка дрэўнай расьліннасьцяй, тэмпэратурных хістаньняў, тыпу тарфянага балота і г.д. У меру разьвіцьця тарфянага балота ў верхняй частцы адбываецца гадовы прырост расьліннае масы. Мёртвыя расьлінныя рэшткі ператвараюцца паступова ў торф. У ўмовах БССР пласт торфу таўшчынёй у I мэтр у верхняй частцы тарфяніка адкладаецца за 200 гадоў, на сярэдняй глыбіні - за 300 гадоў, а ў ніжэйшай частцы - толькі за 700 і больш гадоў. Гадавы прырост расьліннае масы тарфянікаў БССР складае ад I да 3,5 тонаў на адзін гэктар іхнае плошчы. Такім чынам натуральны гадавы прырост тарфяной масы ўсіх тарфяных балотаў БССР /2 міл. га/ можна лічыць ад 2 да 7 мільёнаў тонаў, што можа ў значнай ступені забясьпечыць усе сучасныя патрэбы ў торфе ў БССР.

У "Вестках Акадэміі Навук БССР" у 1955 г. быў надрукаваны артыкул навуковых супрацоўнікаў акадэміі В.Ракоўскага, В.Позьняка і В.Шыманскага, дзе аўтары далі наступную агульную характарыстыку торфаў БССР. Цеплатворная здольнасьць торфу сярэдняй ступені раскладу хістаецца ад 5.400 да 5.600 калёрыяў на арганічную масу. Больш высокую цеплатворную здольнасьць мае гіпнавы торф /5.700 - 5.800 кал/. Попельнасьць торфу, г.зн. яго мінэральная складовая частка, хістаецца для торфаў вярховага тыпу балот ад I,II% да 4%, для нізіннага тыпу - ад 4% да 12%. По-

пел нізінных чаротавых торфаў мае ў сабе ад 40,5% да 53,8% вокісу кальцыя, драўняных торфаў - ад 34% да 47%, асокавых - ад 27,3 да 38%. Элемэнтарны склад арганічнай масы паасобных тыпаў торфу наступны: вуглярод - 50-60%, вадарод - 5-6%, азот - I-3,5%, кісларод - 29-43,6%. З павышэньнем ступені раскладу торфў наглядаецца збольшаньне колькасьці вуглярода й зьменшаньне кісларода.

x

У I930 г. было здабыта ў БССР 256 тыс. тонаў торфу, у I931г. - 577,I тыс. тонаў. На I932 г. /пачатак II пяцігодкі/ здабыцьцё торфу плянавалася павысіць да I,5 мільёнаў тонаў, фактычнаж было здабыта толькі 745,5 тыс. т., г.зн. толькі 50% пляну[8]. Да канца II пяцігодкі прадугледжвалася плянам давесьці здабываньне торфу да I0 міл. тонаў у год, а ў практыцы здабывалася /I936-37 гг./ ня больш 3-4 міл. тонаў[9]. Трэба адцеміць, што цэлы шэраг электрастанцыяў і прамысловых прадпрыемстваў, асноўных спажыўцаў торфу, якія плянавалася пабудаваць, у I937 г. збудаванымі ня былі. Удзельная вага торфу ў паліўным балянсе БССР павялічвалася з году ў год і ў I939 г. яна дасягнула ў прамысловасьці 67,5% усяго ўжыванага паліва[I0].

У цягу II і III пяцігодак тарфяная прамысловасьць БССР паступова рэарганізавалася. У шматлікіх мясцох заместа саматужных торфараспрацовак з прымітыўным абсталяваньнем былі створаныя тарфяныя гаспадаркі з сучаснымі машынамі, што пазвалялі мэханізаваць шматлікія вытворчыя працэсы торфаздабываньня ды хутка збольшыць здабычу торфу. Перад другой сьветавай вайной гадавое здабыцьцё торфу дасягнула 4 міл. тонаў[II].

У часе другое сьветавае вайны тарфяная прамысловасьць БССР моцна пацярпела. Шматлікія тарфяныя гаспадаркі й прадпрыемствы былі разбураныя, а іх абсталяваньне зьнішчанае. Пяцігадовым плянам /I946-I950/ прадугледжвалася поўнае аднаўленьне торфараспрацовак, а навет збольшаньне здабываньня торфу ў I950 г. на 30% у параўнаньні з даваенным узроўнем. У першыя гады У пяцігодкі ў БССР гадова здабывалася 5-6 міл. тонаў торфу[I2].

Ня гледзячы на тое, што за першую пасьляваенную пяцігодку тарфяная прамысловасьць БССР была адбудаваная й значна папоўне-

ная новымі машынамі, торфараспрацоўкі ў У пяцігодцы вяліся паранейшаму зь вялікімі недахопамі як у паасобных прадпрыемствах, так і ў цэлай сыстэме Беларускага торфатрэсту. З гэтае прычыны ў часапісе "Торфяная промышленность" адзначалася наступнае:

I/ Нявыкананьне пляну здабычы торфу ў 1952 г. прадпрыемствамі Беларускага торфтрэсту выясьняецца тым, што кіраўнікі іх недастаткова выкарыстоўвалі існуючыя для гэтага магчымасьці.

2/ Паводля стану на I сакавіка 1953 г. у Беларускім торфатрэсьце ня быў выкананы каляндарны плян рамонту машын.

3/ У 1952 г. прадпрыемствы ня поўнасьцяй выкарысталі розныя машыны. На бальшыні прадпрыемстваў кепска быў наладжаны збор кускавога торфу, у выніку чаго гадавы плян быў выкананы толькі на 39,9%. Асноўныя прычыны гэтага - нізкая якасьць падрыхтоўкі тарфяных палёў, доўгія прастоі машынаў з-за адсутнасьці гатовага да збору торфу, а таксама з-за дажджлівае пагоды[13].

З гэтага выглядае, што бальшыня буйных і мэханізаваных торфапрадпрыемстваў БССР у першыя гады У пяцігодкі працавала значна горш, чымся навет у IУ пяцігодцы, калі плян здабываньня торфу ў паасобныя кварталы й гады выконваўся на 100%, за што працаўнікі тарфянай прамысловасьці БССР атрымоўвалі навет грашовыя прэміі.

Далей у часапісе адзначалася, што ў 1954 г. Беларускі торфатрэст ня выканаў пляну капітальнага будаўніцтва на торфапрадпрыемствах трэсту, кепска быў пастаўлены гаспадарчы разьлік. Былі прадпрыемствы, што ня выконвалі заданьняў абніжэньня сабекошту, у іншых дапускаліся перарасходы паліва й матар'ялаў. Пры здабываньні торфу экскаватарамі, сушэньне яго заставалася ўсё яшчэ нямэханізаваным.

Як дасягненьне за гэты час, адзначаецца той факт, што да пачатку 1955 г. былі ўжо складзеныя й выдадзеныя карты тарфянага фонду БССР, дзе ўдакладнялася плошча тарфянікаў і запас у іх торфу[14].

У 1955 г. здабыча торфу ў БССР дасягнула 7 міл. тонаў, з чаго 47% прыпадала на торф здабыты фрэзарным мэтадам, а нямэханізаванае здабываньне скарацілася да 15%[15].

Трэба адзначыць, што колькасьць здабыванага торфу ў пэрыяд пятай пяцігодкі яшчэ не забясьпечвала поўнасьцяй усіх патрэбаў

краіны ў тарфяным паліве й сыравіне. Паводля пляну шостай пяцігодкі прадугледжваецца далейшы рост здабываньня торфу. Пад 1960 год агульная здабыча торфу павінна /па пляну/ скласьці больш за 10 міл. тонаў у год. У гэтым часе здабываньне торфу фрэзарным мэтадам павінна заняць 60-70% агульнага абыйма гадавое здабычы[16]. Такое збольшаньне абыйма здабываньня торфу прадугледжваецца правесьці пры дапамозе далейшай мэханізацыі вытворчых працэсаў, а таксама ператварэньнем бальшыні элеватарных машынаў у багерна-элеватарныя ды іншымі рацыяналізатарскімі мерапрыемствамі. У шостай пяцігодцы прадугледжваецца таксама давесьці выпрацоўку тарфянага брыкету да 260 тыс. тонаў, г.зн. у 2,8 разы больш, чымся ў 1955 г.[17].

Максымальнаму ўкараненьню фрэзарнага мэтаду здабываньня торфу ў БССР садзейнічаюць тыя абставіны, што тут 80% тарфянікаў - гэта бяспністыя або малапністыя масывы, якія забясьпечваюць найбольш высокі працэнт здабычы добраякаснага тарфянага паліва.

На працягу ўсяго даваеннага часу ды ў першыя гады пасьля вайны сэзон здабываньня элеватарнага й экскаватарнага торфу пачынаўся на бальшыні прадпрыемстваў БССР 5-10 красавіка й заканчваўся 18-25 жніўня. Такім чынам на сэзон прыходзілася ад 110 да 120 дзён. Да 1955 г. на электрыфікаваных торфапрадпрыемствах праца аграгатаў здабываньня кусковага торфу вялася на дзьве зьмены, потым пачала плянавацца на тры зьмены, прадугледжваючы час для тэхнічнага догляду за машынамі. Да 1955 г. у бальшыні прадпрыемстваў плянавалася 21 цяклявых збораў фрэзарнага торфу. Цяпер гэта прызнаецца за перастарэлыя нормы й быў запрапанаваны наступны плянавы лік цыкляў: у вобласьцях Магілеўскай, Маладэчанскай, Горадзенскай і Гомельскай па 24 цыклі для нядрэнаваных тарфяных палёў і 26 цыкляў для дрэнаваных; у Берасьцейскай вобласьці адпаведна 25 і 27 цыкляў, у Віцебскай - 22 і 24 цыклі. Пачаткам сэзону здабываньня торфу фрэзарным мэтадам пастаноўлена лічыць у Берасьцейскай вобласьці 5 траўня, у Віцебскай - 15 траўня, а ўва ўсіх іншых вобласьцях - 11 траўня; канцом-жа сэзону ўва ўсіх вобласьцях лічыцца 5 верасьня. Першачарговае заданьне работнікаў тарфянай прамысловасьці - гэта зьменшаньне вільгаці пласту пад фрэзаваньне, даводзячы яе на нізінных тарфяніках да 70% і на вярховых - да 80%.

Толькі на самых торфапрадпрыемствах Міністэрства мясцовай і паліўнай прамысловасьці ёсьць 2.800 га выпрацаваных кар'ераў, у якіх застаўся яшчэ больш за I м. глыбіні пласт торфу высокай якасьці, дзе можна было-б здабыць яшчэ каля 7 міл. тонаў. Гэта сьветчыць аб тыповай для савецкіх умоваў нерацыянальнасьці ў гаспадарцы. На працягу 20 гадоў прыймаліся розныя мерапрыемствы для давядзеньня здабычы торфу да такіх памераў, каб можна было пакрыць поўнасьцяй запатрабаваньні на яго. Аднак усе спробы ў гэтым кірунку ня далі яшчэ належных вынікаў. Прыкладам у 1955г. толькі для дзяржаўных прадпрыемстваў не хапіла 400 тыс. тонаў торфу[18], ня лічачы патрэбаў дробных каапэратыўных арганізацыяў і насельніцтва. Гэтую нястачу трэба было пакрыць іншым палівам - вуглём, нафтай і інш. - прывожаным у БССР зь іншых раёнаў СССР.

Роля торфу, як мясцовай энэргетычнай і сыравіннай базы, будзе паступова павышацца, а ў сувязі з гэтым узрасьце й інтэнсыўнасьць эксплятацыі тарфяных запасаў. У выпадку, калі-б здабываньне торфу пасьля 1960 г. збольшылася яшчэ ў некалькі разоў, то і тады запасы торфу ў БССР яшчэ ня хутка будуць вычарпаныя. На аднаго жыхара БССР выпадае 0,2 га плошчы тарфянікаў, г.зн. каля 300 тонаў торфу, а здабываецца яго цяпер толькі адна тона ў год.

x

Да 1930 г. здабываньне торфу было яшчэ слаба мэханізаванае. Ужываўся тады, галоўным чынам, машынафармавальны й рэзальны мэтад здабываньня[19]. З 1924 г. пачалі ўжываць гідраўлічны мэтад, пры якім моцным струменем вады /пад ціскам 15-20 атмасфэраў/ раздробніваюцца тарфяныя залежы; плыўкая тарфяная маса перапрацоўваецца /мелецца/ машынамі, а пасьля адводзіцца трубаправодамі на сушыльныя пляцоўкі, дзе разьліваецца роўным слоем; дасягнуўшы плястычнага стану, гэтую масу фармуюць у кавалкі. Буйныя гідрараспрацоўкі торфу пачалі праводзіцца пасьля 1928 г. Гэты мэтад увесь час удасканальваецца[20].

За апошнія 20 гадоў у тарфянай прамысловасьці БССР пачалі ўжываць больш новыя машыны для здабываньня торфу ды таксама для падрыхтоўкі тарфяных залежаў пад эксплятацыю. На некаторых торфараспрацоўках торф выймаецца з залежаў багерна-экскаватарнымі

машынамі. Пасьля другое сьветавае вайны пачаў пашырацца фрэзарны мэтад здабываньня торфу: фрэз-тарфяныя машыны паслойна фрэзуюць тарфяныя залежы й адначасова фармуюць раздробленую масу ў кавалкі рознае формы, або транспартуюць яе за межы фрэзавальнае пляцоўкі. У меру пашырэньня фрэзарнага мэтаду, зьменшваецца ўжываньне экскаватарнага й гідраўлічнага здабываньня.

Інстытут торфу Акадэміі Навук БССР сканструяваў і выпрабаваў машыну МКТ-I для здабываньня крошкавага торфу, зь якога прадукуецца высокакалярыйны газ.

Быў таксама змадэрнізаваны бульдозэр Д-159, сканструяваны лопасьцявы культыватар для рыхленьня тарфяных залежаў, прызначаных на падсьцілку, ды распрацаваныя новыя буравальныя інструманты для разьведкі тарфяных палёў[21].

Пры здабываньні кавалкавага торфу кар'ерным шляхам асушаецца толькі верхні пласт тарфяніка пры дапамозе даволі рэдкай сеткі няглыбокіх каналаў. Аднак-жа такія каналы не забясьпечваюць належнага асушэньня тарфяных палёў, прызначаных для здабываньня торфу фрэзарным шляхам. У гэтым выпадку неабходна асушыць усю таўшчыню тарфянага пласту шляхам стварэньня розных дрэнавальных сыстэмаў. Праф. А.Брудастаў прапануе праводзіць доннае асушваньне тарфяных масываў глыбокімі тальвэгавымі каналамі, урэзанымі ў мінэральнае дно. Акадэмія Навук БССР вызначыла наступныя нормы для глыбокага асушваньня нізінных тарфянікаў: пры шырыні пляцовак 80 м. глыбіня каналаў мае быць ад 2 да 2,2м.; пры шырыні 100 м. - ад 2,2 да 2,5 м.[22]. Апошнімі часамі гэткія тарфянікі асушваюцца таксама пры дапамозе пракладаньня густой сеткі няглыбокіх каналаў што 40-80 м. і дрэнаў што 10 м. адна ад другой, глыбінёй 1,2 - 1,4 м. Такая асушальная сетка пачала шырока ўжывацца ў тарфянай прамысловасьці БССР, асабліва ў мясцох, дзе торф здабываецца фрэзерным шляхам. У такіх мясцох, дзе дрэнаж пракладзены правільна, тарфянікі асушваюцца значна хутчэй ды ствараюцца пры гэтым спрыяльныя ўмовы для мэханізацыі працэсаў здабываньня, сушэньня й зьбіраньня торфу. Аднака-ж практыка паказала, што тэрмін службы такіх дрэнаў невялікі - ад 1 да 3 гадоў. Пасьля гэтага частка зь іх робіцца поўнасьцяй няпрыгоднымі, іншыя-ж моцна абніжаюць сваю працаздольнасьць. Апрача гэтага, дрэны псуюцца пад ціскам цяжкіх машынаў, асаблі-

ва на глыбокіх верхавых тарфяніках зь нізкай ступеняй раскладу торфу. У выніку - на эксплятаваных тарфяных палёх даводзіцца праводзіць паўторны дрэнаж. Належнае асушэньне тарфяных балотаў сталася асабліва неабходным пры збольшаньні здабываньня торфу мэханізаваным шляхам. Пры асушальных працах ужываюцца цяпер розныя машыны /каналакапальныя, дрэнажныя, дыскавыя, ДНВ-5 і інш./[23]

Інжынер Галоўторффонду А.Басалаеў у сваім артыкуле "Выкарыстаньне тарфяных пакладаў на торфапрадпрыемствах БССР" адцеміў наступнае: у БССР усяго ўлічана каля 16 тыс. га выпрацаваных тарфяных масываў. На бальшыні зь іх стан выпрацаваных кар'ераў значна горшы, чымся гэта прадугледжвалася праектамі ці гадавымі плянамі. З 81 дзейнага тарфянага прадпрыемства ў 1953 г. плянавы каэфіцыент выкарыстаньня залежаў быў вытрыманы толькі на пяцёх прадпрыемствах. У шматлікіх прадпрыемствах на выпрацаваных плошчах тарфяных пакладаў засталося каля 30-50% першапачаткавага торфу. На прадпрыемстве "Бялецкае" ў працягу 5 гадоў /1949-1953 гг./ эксплятацыя тарфяных пакладаў вялася без належнага асушэньня тарфяных масываў. За гэты час там здабыта 446 тыс. тонаў торфу, а было пакінута 830 тыс. куб.мэтраў пакладу, зь якога можна было яшчэ атрымаць каля 130 тыс. тонаў торфу. На старым торфапрадпрыемстве "Большэвік" Гомельскай вобласьці ў свой час былі створаныя нармальныя ўмовы для працы багерных і багерна-элеватарных машын. Аднака-ж, зь цягам часу, магістральныя каналы, пры атсутнасьці капітальнага рамонту, разбурыліся і хуткае адвядзеньне вясеньніх і летніх паводкавых водаў ня было забясьпечанае. У выніку гэтага ў некаторых кар'ерах узровень вады быў такім высокім, што пры экскавацыі даводзілася пакідаць ніжнія пласты торфу.

Рабаўніцкая распрацоўка тарфяных масываў наглядаецца пры здабаваньні торфу сельскім насельніцтвам. Прыкладам гэтага можа служыць тарфяны масыў "Алешкіцы" Горадзенскай вобласьці, плошчай каля 1.000 га, які ўвесь парыты паасобнымі ямамі. На ім нельга было знайсьці незакранутае пляцоўкі плошчай 50 га для арганізацыі прадпрыемства магутнасьцяй 7-10 тыс. тонаў.

Торфапрадпрыемствы сыстэмы Белпрамсавету маюць вялікія гадавыя даходы з эксплятацыі торфу, аднак патрэбных працаў для асушэньня распрацоўваных тарфянікаў не праводзяць.

x

Ня гледзячы на ўсе вышэйуспомненыя факты, нельга, аднак, не адцеміць, што тарфяная прамысловасьць БССР, паступова разьвіваючыся, дасягнула за гэты час даволі высокіх паказьнікаў, як у дачыненьні абыйма здабыванага торфу, так і ў дачыненьні мэханізацыі працаў на торфапрадпрыемствах. Цяпер тарфяная прамысловасьць у некаторых вобласьцях БССР знаходзіцца ў ліку вядучых галінаў прамысловасьці. Торфу належыць там галоўнае месца ў энэргетычным і паліўным балянсе. У мясцох, дзе знаходзяцца найбольш канцэнтраваныя тарфяныя масывы, былі створаныя буйныя мэханізаваныя торфапрадпрыемствы, збудаваныя торфабрыкетныя заводы. Ніжэй падаем сьпіс найбольш буйных торфапрадпрыемстваў, багатых запасамі торфу:

I/ Менская вобласьць - "Чырвоны сьцяг", "Смалявічы", імя С.Орджонікідзе, некалькі торфабрыкетных заводаў, у тым ліку адзін із самых буйных у БССР - завод Усяж[24].

2/ Магілеўская вобласьць - "Рэдкі Рог" і "Туголіца" /Бабруйскі раён/, "Татарка" й "Свабода" /Асіпавіцкі раён/, "Чырвоная Беларусь" і "Гардзілева" /Быхаўскі раён/, "Грэбнёва" /Магілеўскі раён/, "Вялікі мох" /Клімавіцкі раён/, "Калектыўная праца" /Крычаўскі раён/ і інш.[25].

3/ Гомельская вобласьць - "Бялецкае" /Рагачоўскі раён/, "Лукаўскае" /Жлобінскі раён/, "Бальшавік" /Уваравіцкі раён/, "Давідаўка" /Гомельскі раён/ і інш.[26].

4/ Маладэчанская вобласьць - у канцы пятай пяцігодкі было ўведзена ў дзеяньне Бярэзінскае торфапрадпрыемства[27].

5/ Віцебская вобласьць - у часе першай пяцігодкі было збудавана буйнае мэханізаванае торфапрадпрыемства "Асінторф" і шэраг іншых[28].

Згодка з плянам шостай пяцігодкі мае быць збудавана ў БССР 5 новых торфабрыкетных заводаў: I/ Усьвіж-Бук /Віцебская вобл./, 2/ Лукаўскі /Гомельскай вобл./, 3/ адзін завод у Берасьцейскай вобл., 4/ Верцялішкі /Гарадзенская вобл./ і 5/ Бярэзінскі /Маладэчанская вобл./.

Усе тарфяныя багацьці БССР твораць Дзяржаўны тарфяны фонд,

які падлягае рэспубліканскай арганізацыі "Галоўторффонд". Асноўныя функцыі гэтай арганізацыі наступныя:

I. улік тарфяных рэсурсаў;

2. аддаваньне ў эксплятацыю адпаведных тарфяных масываў розным дзяржаўным і каапэратыўным арганізацыям, што займаюцца здабываньнем торфу;

3. праводжаньне дзяржаўнае кантролі ў дачыненьні захоўваньня правілаў і плянаў эксплятацыі тарфяных пакладаў.

Калгасы могуць таксама займацца эксплятацыяй тарфяных багацьцяў, што знаходзяцца на замацаваных за імі землях сельскагаспадарскага карыстаньня ды на пляцоўках, прызначаных для гэтае мэты. Распрацоўка торфу калгасамі ў бальшыні выпадкаў вядзецца саматужна. Колькасьць гадавога здабываньня торфу калгасамі для із собскага ўжытку - даволі вялікая, аднак дакладнага ўліку няма.

Калі эксплятацыя тарфяных рэсурсаў будзе і ў далейшым вясьціся нерацыянальна й парабаўніцку, дык гэта прывядзе да хуткага зьменшаньня запасаў торфу. Пры ўмовах-жа правільнай эксплятацыі, тарфяныя рэсурсы БССР сваімі памерамі дастатковыя для таго, каб поўнасьцяй забясьпечыць патрэбы краю ў тарфяным паліве й сыравіне ў цягу шматлікіх дзесяцігодзьдзяў.

Бібліяграфічныя зацемкі

I. В.Доктуровский. Торфяные болота, Масква, I935, б. I42-I43.

2. Тамсама, б. I45-I5I.

3. "Природа", Масква, I953, №I0, б.88.

4. В.Доктуровский, цыт. праца, б.5-6.

5. БСЭ, Масква, I946, т. 54, б. 60I-602.

6. БСЭ, I950, т. 4, б. 496-497; Баранский. Экономическая география СССР, Масква, I954, б. 292-293.

7. В.Доктуровский, цыт. праца, б. 209-2II.

8. Социалистическое строительство СССР, изд. Госплана СССР, I934, т.8, б.96.

9. БСЭ, I946, т.54, б. 60I-602.

I0. БСЭ, I950, т.4, б.496-497.
II. "Торфяная промышленность", Масква, I955, №3, б. 3.
I2. Тамсама, I955, №2.
I3. Тамсама, I953, №3, 4 і 7.
I4. Тамсама, I955, №I.
I5. Тамсама, I955, №2.
I6. Тамсама, I955, №4.
I7. "Звязда", Менск, 29.I.I956.
I8. Тамсама.
I9. Социалистическое строительство СССР, б. 97.
20. МСЭ, Масква, I93I, т.2, стр. 495-496.
2I. "Торфяная промышленность", I955, №2.
22. Тамсама.
23. Тамсама, I954, №4.
24. БСЭ, I954, т.27, б.548.
25. БСЭ, I954, т.28, б.22-23.
26. БСЭ, I952, т.I2, б.I8.
27. БСЭ, I954, т.28, б.I4I-I42.
28. БСЭ, I95I, т.8, б.I95-I96.

Т. Даўлечын

ЗЬМЕНЫ Ў САВЕЦКІМ ПРАЦОЎНЫМ ПРАВЕ

Прававы нігілізм і занядбоўваньне элемэнтарных прынцыпаў норматворчай дзейнасьці, што зь яго выцякае, прывялі да таго, што цяпер пазытыўнае права Савецкага Саюзу знаходзіцца ў скрайна хаатычным стане.

Асабліва запушчана галіна працоўнага права. Паводля сьветчаньня савецкіх юрыстых у 180 артыкулах фармальна дзейнага Кодэксу законаў аб працы РСФСР[x/] практычна ўжываюцца толькі два: арт. 47-ы - аб парадку звальненьня работнікаў і службоўцаў ды арт. 83-ці - аб матар'яльнай адказнасьці работнікаў і службоўцаў за шкоду прычыненую маемасьці прадпрыемства ці ўстановы[1]. Іншыя пытаньні рэгулююцца шматлікімі паасобнымі нарматыўнымі актамі, колькасьць якіх налічваецца тысячамі[2]. Пры гэтым такія нарматыўныя акты выдаюцца Саветам Міністраў, міністэрствамі й ведамствамі, нярэдка з парушэньнем кампэтэнцыяў законадаўчых ворганаў, ды часта супярэчаць адзін аднаму. Яны, за рэдкімі выняткамі, ня публікуюцца й іх ведае толькі абмежаванае кола практычных работнікаў установаў і прадпрыемстваў. Ні жыхарству, ні юрыстым-навуковым работнікам яны не даступныя. Апошнія, ня маючы нарматыўнага матар'ялу, ня могуць навукова распрацоўваць праблемы працоўнага права[3].

Калі мець на ўвазе, што ў Савецкім Саюзе адвакаты павінны весьці працоўныя справы бясплатна, у парадку г.зв. грамадзкай нагрузкі, якая ня можа іх падбадзёрваць да вядзеньня такіх справаў, дык ня цяжка сабе ўявіць тое самахвальства, сьведамае й нясьведамае парушаньне правоў працоўных, валакіту й бюракратызм

у судовых і адміністрацыйных установах, паведамленьнямі аб якіх аж роіцца ў савецкай прэсе. Пры гэтым савецкая прэса адкрыта піша, што парушэньні законаў аб працы найчасьцей дапушчаюцца ў выніку таго, што адказныя кіраўнікі, а ў тым ліку й кіраўнікі аддзелаў кадраў, ня ведаюць працоўнага законадаўства[4].

Сучаснае працоўнае законадаўства Савецкага Саюзу ня толькі хаатычнае сваёй формай, але й рэакцыйнае паводля свайго зьместу. Зьмены, праведзеныя ў гэтай галіне ў цягу апошніх 25 гадоў, былі ў бальшыні сваёй адхіленьнем ад нормаў Кодэксу законаў аб працы з 1922 г. і значна пагоршылі палажэньне працоўных.

Апошнія зьмены ў гэтай галіне, што сталіся агульнавядомымі, ня былі накіраваныя на ўпарадкаваньне працоўнага законадаўства й не мяняюць яго рэакцыйнага характару. Яны маюць іншыя, чужыя праву, мэты, да якіх мы вернемся ніжэй. Тут адзначым толькі тое, што гэтыя зьмены ня вырозьніваюцца ні радыкальнасьцяй, ні пасьлядоўнасьцяй, ні прагрэсыўным характарам. Яны не падымаюцца вышэй за ўзровень нормаў Кодэксу законаў аб працы з 1922 г., а часта навет знаходзяцца яшчэ ніжэй за іх. Вынятку ня робіць і Закон аб пэнсіях, які, хоць паводля формы і прадстаўляе крок наперад у параўнаньні зь існуючым законадаўствам аб пэнсіях, Усё-ж паводля зьместу стаіць ніжэй за нормы Кодэксу законаў аб працы з 1922 г.

Трэба адцеміць, што ініцыятарам гэтых зьменаў ня быў XX зьезд КПСС, як гэта некаторыя думаюць. Трыбуна зьезду была толькі выкарыстаная для дэклярацыі аб надыходзячых зьменах працоўнага законадаўства для прапагандовае мэты, разьлічанае на грамадзкую апінію ўнутры СССР і за межамі. На самай справе з прынцыповага гледзішча ня было ніякай неабходнасьці ставіць гэтыя пытаньні на зьезьдзе. Папершае - яны ня маюць характару вызначэньня новай палітыкі ў галіне працы. Тут ішло толькі аб аднаўленьне нормаў, што былі скасаваныя ў трыццатых гадох. Падругое - кароткі прамежак часу, у цягу якога быў прыняты, прыкладам, такі закон, як закон аб дзяржаўных пэнсіях, сьветчыць аб тым, што праект яго быў падрыхтаваны задоўга да зьезду. Урэшце шэраг пастановаў у галіне працы было прынята яшчэ да XX зьезду.

Гэта пацьвярджае й даклад Хрушчова на зьезьдзе, у якім ён паведаміў дэлегатаў аб прынятых пастановах аднавіць 6-гадзінны

працоўны дзень для падросткаў ад I6 да I8 гадоў, скараціць да 6-ці гадзін працоўны дзень для работнікаў і службоўцаў у перадсьвяточныя й перадвыхадныя дні ды аб упарадкаваньні пытаньняў забясьпечаньня пэнсіямі[5].

Цяпер разгледзім коратка тыя мерапрыемствы, што Саветы правялі ў галіне працоўнага права ў вапошні пэрыяд.

Аб рэжыме працоўнага дня ў установах. Менш, чымся праз паўгоду пасьля сьмерці Сталіна, у канцы жніўня I953 году ўрад Маленкава выдаў пастанову "Аб рэжыме працоўнага дня ў установах", мэтай якое было выкараненьне распушчанасьці й бяскультурнасьці, што пануюць у савецкіх установах. Пастанова адзначала парушаньне нармальнага рэжыму працоўнага дня, як аднаго з буйных недастаткаў у працы савецкіх установаў у цэнтры й на мясцох. У ёй гаварылася, што кіраўнікі міністэрстваў ды іншых установаў нярэдка пачынаюць свой працоўны дзень із спазьненьнем на 2-3 гадзіны. Потым, пасьля некалькіх гадзін працы, яны пачынаюць даўгі абедні перапынак, а пасьля працягваюць бесканцовыя паседжаньні ў ночныя гадзіны; без патрэбы затрымоўваюць частку супрацоўнікаў на працы, выклікаюць іх на працу ў непрацоўны час. У выніку адсутнасьці кіруючых працаўнікоў установаў у першай палове працоўнага дня супрацоўнікі апарату ня могуць разьвязваць шматлікіх пытаньняў, а ў другой палове дня пануе мітусьня, пасьпех, штурмоўшчына. Начныя паседжаньні даюць справе мала карысьці, яны замяняюцца ў пустую гаварыльню. Пры такіх парадках супрацоўнікі апарату ня маюць неабходнага часу для культурнага й палітычнага росту ды павышэньня кваліфікацыі, а таксама ня могуць прысьвячаць належнае ўвагі сям'і й выхаваньню дзяцей. Апрача гэтага начная праца адмоўна ўплывае на здароўе работнікаў і абніжае іхную працаздольнасьць.

Каб вызбыцца гэтых заганаў, зь I-га верасьня I953 г. быў уведзены наступны рэжым працоўнага дня: у установах і арганізацыях саюзнага й рэспубліканскага значаньня, што знаходзяцца ў Маскве, працоўны дзень пачынаецца ў 9 гадзін раніцы й заканчваецца ў 6 гадзін вечара з аднагадзінным перапынкам на абед; у установах і арганізацыях мясцовага значаньня, што знаходзяцца ў Маскве, працоўны дзень пачынаецца ў I0 гадзін раніцы й заканчваецца ў 7 гадзін вечара з гадзінным перапынкам на абед.

Міністрам і кіраўніком установаў катэгарычна забараняецца выклікаць супрацоўнікаў на працу ў непрацоўны час ды прадоўжваць працоўны дзень. Яны забавязаныя срога захоўваць вызначаны рэжым працоўнага дня.

У тых выпадках, калі праца ў непрацоўны час выклікаецца скрайнай неабходнасьцяй, установы мусяць выплочваць супрацоўнікам з нармаваным працоўным днём за надлічбовыя гадзіны дадатковую заплату згодна зь дзейным працоўным законадаўствам, не дапушчаючы пры гэтым перарасходу фонду заработнае платы.

Саветам міністраў саюзных рэспублік паручалася ўпарадкаваць рэжым працоўнага дня ў установах рэспубліканскага й мясцовага значаньня. Няма сумлеваў у тым, што саветы міністраў саюзных рэспублік выдалі для сваіх тэрыторыяў аналягічныя пастановы.

Сакратар'ят ВЦСПС 2.4.1954 г. выдаў пастанову, якой абмяжоўвае прыцягваньне работнікаў і службоўцаў да дыжурстваў на прадпрыемствах і ў установах пасьля заканчэньня працоўнага дня, у выхадныя й сьвяточныя дні. Такія дыжурствы дапушчаюцца толькі ў вылучных выпадках і толькі пасьля ўзгадненьня з прафсаюзнай арганізацыяй; забараняюцца доўгія дыжурствы, а таксама прыцягваньне работнікаў да дыжурстваў часьцей за адзін раз у месяц[6].

Прадметам гэтай пастановы саюзнага ўраду было вялікае й паважнае пытаньне, што тычылася ня толькі інтарэсаў шматміліённай арміі службоўцаў, але, ускосна, і інтарэсаў усяго жыхарства. Бюракратызм і цяганіна ў савецкіх установах, някультурнасьць урадаўцаў у дачыненьні да наведвальнікаў - гэта тое зло, для выкараненьня якога робяцца цяпер спробы. Аднак пастанова Савету Міністраў пробуе разьвязаць гэтае пытаньне мэтадам сталінскага пэрыяду, груба ігнаруючы прынцыпы праватворчай дзейнасьці. Пастанова гэтая, як і шматлікія іншыя, нідзе ня была апублікаваная, аб ёй можна было даведацца толькі зь пераказаў прэсы[7]. Яна бюракратычна й цэнтралізаваным шляхам вызначае час пачатку й канца працоўнага дня ў установах, касуючы гэтым самым папярэдні парадак, згодна якога гэтае пытаньне разьвязвалася мясцовымі саветамі[8]. Пастанова захоўвае надалей 8-гадзінны працоўны дзень для службоўцаў у ўстановах, уведзены ў 1940 годзе, а гэтым самым яшчэ раз пацьвярджае адыход ад нормаў Кодэксу законаў аб

працы, які прадугледжваў для гэтае катэгорыі працоўных 6-гадзінны працоўны дзень[9].

Нельга сумлявацца, што гэтая пастанова й выданыя на аснове яе пастановы саветаў міністраў саюзных рэспублік прывялі да вялікіх зьменаў у грамадзкім жыцьці: перабудовы рэжыму працы гарадзкога й прыгараднага транспарту, прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня, гандлёвых і камунальных прадпрыемстваў, працы тэатраў ды іншых спэктаклявых арганізацыяў, вячорных навучальных установаў і інш., што патрабавала шмат працы й не абыйшлося без матар'яльных затратаў. Тымчасам, судзячы паводля прэсы, вынікі іх больш чымся сумлеўныя. Папярэднія заганы існуюць і далей. Прыкладам, менш чымся 3 месяцы пасьля выданьня пастановы паведамлялася ў прэсе, што ў Бранску запрошаныя на паседжаньне абласнога выканкому кіруючыя работнікі й спэцыялістыя чакалі свайго выкліку ў залю паседжаньняў ад 5 да 7 гадзін[10]. Паранейшаму працягваюцца начныя дыжурствы службоўцаў у ўстановах[11]. Начныя паседжаньні з усімі іх пасьлядоўнасьцямі адбываюцца й надалей.

Аб адпачынку й працоўным дні для падросткаў. Прэзыдыюм Вярхоўнага Савету СССР 15 жніўня 1955 г. выдаў загад "Аб адпачынку й умовах працы падросткаў"[12], які рэгулюе працягласьць адпачынкаў і даўжыню працоўнага дня для падросткаў. Гэтым загадам для падросткаў ад 14 да 16 гадоў зь 1 студзеня 1956 г. вызначаецца 4-гадзінны працоўны дзень, заместа існуючага да гэтага часу 6-гадзіннага. Згодна артыкулу 135 Кодэксу законаў аб працы праца падросткаў маладзейшых за 16 гадоў наагул забаранялася. У выняткових выпадках інспэктары працы маглі даваць дазвол на працу падросткам не маладзей 14 гадоў, але працоўны дзень для іх ня мог перавышаць 4 гадзін /арт. 136/. Аднак загадам Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР з 2 кастрычніка 1940 г.[13] "Аб дзяржаўных працоўных рэзэрвах" гэтая забарона была практычна скасаваная, а загадам з 14.7.1942 для падросткаў ад 14 да 16 год вызначаўся 6-гадзінны працоўны дзень. Такім чынам, загад з 15 жніўня 1955 году толькі аднавіў закон, што існаваў да 1942 году.

Гэтым-жа самым загадам для падросткаў ад 16 да 18 год вызначаецца 7-гадзінны працоўны дзень. Артыкул 95 Кодэксу прадугледжваў для гэтае групы падросткаў 6-гадзінны працоўны дзень.

Такім чынам цяпер гэты працоўны дзень даўжэйшы на адну гадзіну.

Артыкул II4 Кодэксу прадугледжваў для падросткаў да 18 год на адпачынак 24 працоўныя дні з далічэннем сьвяточных і выхадных дзён, што прыпадаюць у гэтым часе: практычна, такім чынам, на адпачынак выпадаў адзін месяц. Савет народных камісараў СССР сваёй пастановай з I2.7.I940 г. скараціў адпачынак для падросткаў I6-I8 год да 2-х тыдняў. Паводля загаду з I5 жніўня I955г адпачынак для падросткаў да I8 год быў прадоўжаны да аднаго каляндарнага месяца, г.зн. так, як было да I940 году.

Зьвяртае на сябе ўвагу ілжывы характар матываваньня загаду з I5 жніўня I955 г., які пачынаецца словамі: "З мэтай далейшага палепшаньня ўмоваў працы, адпачынку й навучаньня моладзі ў веку да I8 год ..." У запраўднасьці ня толькі аб далейшым, але наагул ні аб якім палепшаньні ўмоваў працы падросткаў не магло быць мовы, калі яшчэ ня былі поўнасьцю адноўленыя правы, што існавалі да I940 году.

Другім загадам Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР у гэтым пытаньні, выданым 26 траўня I956 г.[I4] для падросткаў I6-I8 год вызначаўся 6-гадзінны працоўны дзень. У гэтым выпадку таксама ня было "далейшага палепшаньня ўмоваў працы..." як гэта гаварылася ў тэксьце загаду, бо ён толькі аднаўляў умовы, што існавалі да I940 г., але ня больш.

У пытаньні заплаты за працу падросткаў I6-I8 год пры 6-гадзінным працоўным дні Саветам Міністраў СССР была выдадзена пастанова з 26 траўня I956 г.[I5]. У ёй на падставу хадзя й таворыцца, што заплата за працу падросткаў за скарочаны працоўны дзень ідзе як за поўны працоўны дзень работнікаў адпаведнае катэгорыі, г.зн. дарослых, аднак другі абзац пастановы моцна яе абмяжоўвае, зазначаючы, што праца падросткаў I6-I8 год на акордных працах аплочваецца паводля акордных расцэнак для дарослых работнікаў з даплатай па тарыфнай стаўцы за I ці 2 гадзіны ў залежнасьці ад даўжыні працоўнага дня для дарослых работнікаў. Зразумела, што ад падросткаў нельга патрабаваць, каб яны выпрацоўвалі столькі, колькі выпрацоўваюць дарослыя работнікі. Што да даплаты за I ці 2 гадзіны па тарыфнай стаўцы, дык трэба сказаць, што тарыфныя стаўкі складаюць толькі 40-55% фактычнай заработнай заплаты работнікаў[I6]. Такім чынам падростак

за час панад 6 гадзін будзе выплочвацца толькі палову таго, што атрымоўваюць дарослыя работнікі. Значыць, аб роўным аплочваньні працы падросткаў за скарочаны працоўны дзень нароўні з поўным працоўным днём ня можа быць мовы.

Аб скарачэньні працоўнага дня перад выхаднымі й сьвяточнымі днямі. Прэзыдыюм Вярхоўнага Савету СССР 8 сакавіка 1956 г. выдаў загад "Аб скарачэньні даўжыні працоўнага дня для работнікаў і службоўцаў у перадвыхадныя й перадсьвяточныя дні"[17], які вызначае ў гэтыя дні 6-гадзінны працоўны дзень. Назоў загаду сфармуляваны прапагандова, як быццам ён пашыраецца на ўсіх работнікаў і службоўцаў незалежна ад даўжыні працоўнага дня. У запраўднасьці-ж ён тычыцца толькі работнікаў і службоўцаў, працоўны дзень якіх перавышае 6 гадзін. У пастанове Савету Міністраў СССР, выданай у разьвіцьці загаду, гаворыцца, што "для асобаў, якія маюць 6-гадзінны й меншы працоўны дзень, даўжыня працоўнага дня ў перадвыхадныя й перадсьвяточныя дні не зьмяняецца"[18]. Згодна з гэтай пастановай праца ў перадвыхадныя й перадсьвяточныя дні можа весьціся бясь перапынку. Няма сумлеву, што гэта станецца правілам, незалежна ад таго, ці работнікі й службоўцы гэтага жадаюць ці не, бо гэтым шляхам выкройваецца 42-гадзінны тыднёвы бесьперапынны адпачынак прадугледжаны арт. 109 Кодэксу законаў аб працы, які быў скарочаны ў 1940 г. да 39 гадзін.

У цэлым шэрагу галінаў працоўны дзень перад днямі адпачынку й сьвятаў не скарочваецца. Гэта датычыць прадпрыемстваў зь бесьперапыннай вытворчасьцяй ды іншых працаў, дзе немагчыма, з гледзішча на ўмовы вытворчасьці, скараціць працоўны дзень, а таксама й сэзонных працаў. Гэтыя галіны й віды працаў вызначаюцца саветамі міністраў саюзных рэспублік і міністэрствамі ў паразуменьні з прафсаюзнымі арганізацыямі. Работнікам і службоўцам у гэтых галінах, якія працуюць 8 гадзін у дзень, за кажныя 4 перадвыхадныя й перадсьвяточныя дні даецца дадаткова адзін дзень адпачынку. На сэзонных працах дапушчаецца падсумоўваньне такіх дзён за ўвесь сэзон і атрымоўваньне дадатковых дзён адпачынку ў міжсэзонны пэрыяд. У пастанове Савету міністраў гаворыцца толькі аб работніках і службоўцах з 8-гадзінным працоўным днём. Там, дзе працоўны дзень 7 гадзін, адзін дадатковы дзень адпачынку

даецца, відавочна, за 8 поўнасьцяй адпрацаваных перадвыхадных і перадсьвяточных дзён.

У загадзе зусім не гаворыцца, ці плоціцца работнікам і службоўцам за скарочаны перадвыхадны й перадсьвяточны працоўны час. Пастанова Савету міністраў разьвязвае гэтае пытаньне пасавецку. Работнікам і службоўцам, што атрымоўваюць сталую заплату, за гэтыя дні плоціцца, як за поўны працоўны дзень. Работнікам-жа на акордных працах заплата даецца паводля выкананай працы. Такім чынам, для больш за 75% работнікаў, што працуюць акордна[19], за скарочаны час перад выхаднымі й сьвяточнымі днямі ня плоціцца. Яны павінны скарачэньне свайго заработку кампэнсаваць больш інтэнсыўнай працай. У пастанове Савету міністраў гаворыцца, што кіраўнікі прадпрыемстваў павінны забясьпечыць работнікам умовы для больш прадукцыйнай працы. Але гэта толькі агульныя словы, а не прававая норма. Папершае, не зразумела, што значыць "забясьпечыць умовы", дзе мяжа між забясьпечаньнем і незабясьпечаньнем? Падругое, якія могуць быць вынікі, калі "ўмовы" адміністрацыяй не забясьпечаныя? Можа работнік у гэткім выпадку патрабаваць даплаты за скарочаны працоўны час? Пастанова Савету міністраў не дае яму такога права.

У сувязі з загадам з 8 сакавіка 1956 г. у саюзных рэспубліках былі выпрацаваныя складаныя правілы рэгуляваньня працоўнага часу ў розных галінах народнае гаспадаркі. Прыкладам, Савет міністраў Узбэкскай ССР зацьвердзіў парадак працы прадпрыемстваў гандлю й грамадзкага харчаваньня[20], які дыфэрэнцыйна рэгулюе разьмеркаваньне працоўнага дня ў паасобных галінах.

Аб пабольшаньні адпачынку ў выпадку цяжарнасьці й родаў. З тым-жа ілжывым матываваньнем "з мэтай далейшага палепшаньня ..." пачынаецца загад Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР з 26 сакавіка 1956 г. "Аб пабольшаньні адпачынку ў выпадку цяжарнасьці й родаў". Згодна з гэтым загадам ад 1 красавіка 1956 г. адпачынак вызначаецца на 56 дзён да і 56 дзён пасьля родаў, значыць разам 112 дзён. Такім чынам была адноўленая норма арт.132 Кодэксу законаў аб працы, якая прадугледжвала адпачынак у выпадку цяжарнасьці й родаў у цягу 8 тыдняў да і 8 тыдняў пасьля родаў. Пастановай СНК, ЦК ВКП/б/ і ВЦСПС /Усесаюзны Цэнтральны Савет Прафэсыйных Саюзаў/ з 28 сьнежня 1938 г. даўжыня гэтых

адпачынкаў была скарочаная да 63 дзён у суме, а пасьля ў 1944г. збольшаная да 77 каляндарных дзён. У выпадку ненармальных родаў ці нараджэньня двайні адпачынак пасьля родаў пабольшваецца на 14 дзён. Цяпер у гэткіх выпадках адпачынак пабольшваецца таксама на 14 дзён і складае 70 каляндарных дзён /пасьля родаў/. Загад з 26 сакавіка 1956 г. і надалей захоўвае правіла, згодна якога дапамога ў выпадку цяжарнасьці й родаў выплочваецца толькі ў тым выпадку, калі жанчына, да надыходу права на адпачынак на гэтай аснове, адпрацавала на дадзеным прадпрыемстве ці ўстанове ня менш за тры месяцы бесьперапынна.

Аб павышэньні заработнай платы нізкааплочваным работнікам і службоўцам. Савет міністраў СССР, ЦК КПСС і ВЦСПС выдалі супольную пастанову з 8 верасьня 1956 г.[22] аб павышэньні заработнай платы нізкааплочваным работнікам і службоўцам.

Паводля Кодэксу законаў аб працы з 1922 г. памеры платы за працу вызначаліся супольнай згодай між працадаўцам і працаўніком, пры захаваньні абавязкавага мінімуму, вызначанага дзяржаўнымі ворганамі[23]. Абавязкавыя мінімумы платы для розных катэгорыяў работнікаў публікаваліся штогадова да 1928 г. Потым гэтую практыку спынілі й памеры платы пачалі вызначаць дзяржаўныя ворганы аднабаковым актам у форме зацьверджаньня тарыфаў, тарыфных сетак, тарыфна-кваліфікацыйных даведнікаў ці службовых акладаў.

Дзяржава вызначала памеры заработнай платы для розных галінаў і катэгорыяў работнікаў і службоўцаў толькі ў залежнасьці ад важнасьці іх з гледзішча бягучай гаспадарскай палітыкі, зусім ігнаруючы ня толькі маральна-этычныя прынцыпы, але й мінімум для пражыцьця. У сувязі з гэтым у канцы трыццатых гадоў паўсталі вялікія розьніцы ў плаце між нізкааплочванымі й высокааплочванымі работнікамі й службоўцамі. У той час як аклады некаторых катэгорыяў службоўцаў і спэцыялістых ды заработак кваліфікаваных работнікаў складалі тысячы рублёў, дык нізкіх катэгорыяў - 96 руб. у месяц брутто /для прыбіральніц і інш./. Хаця яны былі потым крыху збольшаныя, усё-ж яшчэ ў сельскіх мясцовасьцях яны складаюць ня больш 180-200 рублёў, у гарадох і работніцкіх селішчах - 200-250 рублёў.

Пастанова з 8 верасьня 1956 г. павышае мінімальныя памеры

тарыфных і службовых акладаў да 300-350 рублёў у месяц для работнікаў і службоўцаў, што працуюць беспасярэдня на прамысловых прадпрыемствах, будаўніцтвах, прадпрыемствах транспарту й сувязі. Сюды належаць, папершае, нізкааплочваныя работнікі на прадпрыемствах і будаўніцтве, незалежна ад таго, ці яны знаходзяцца ў гарадох, работніцкіх селішчах ці ў сельскай мясцовасьці; падругое - службоўцы ў установах і канцылярыях гэтых прадпрыемстваў. Дакладныя памеры тарыфных ставак і службовых акладаў між 300 і 350 рублямі для гэтых работнікаў і службоўцаў у паасобных галінах павінны вызначацца міністрамі, кіраўнікамі ведамстваў і саветамі міністраў саюзных рэспублік, узгадняючы гэта зь Дзяржаўным камітэтам Савету Міністраў СССР у справе працы й заработнае платы ды з ВЦСПС.

Работнікам і службоўцам, занятым на прадпрыемствах іншых галінаў народнае гаспадаркі, апрача пералічаных вышэй, прыкладам, на прадпрыемствах камунальнае гаспадаркі, малодшаму пэрсаналу абслугі і работнікам аховы ўсіх прадпрыемстваў /у тым ліку й прамысловых прадпрыемстваў, будаўніцтваў, прадпрыемстваў транспарту й сувязі/, а таксама ўсім службоўцам установаў і арганізацыяў мінімальная заработная плата была вызначаная ў памеры 300 рублёў у гарадох і работніцкіх селішчах ды 270 рублёў - у сельскіх мясцовасьцях.

Усялякія даплаты, як за выкананьне й перавыкананьне нормаў прадукцыі для акордных работнікаў, за звышгадзінную працу, дадаткі за выслугу гадоў і г.д. павінны выплочвацца звыш гэтых ставак. Калі ўлічыць, што гэтая пастанова датычыць галоўным чынам дробных службоўцаў аплочваных месячна, а таксама тых работнікаў, што ў бальшыні сваёй аплочваюцца пачасова, дык дапаўняльныя платы ня ўплываюць істотна на рост заработнай платы вышэй вызначаных мінімумаў.

У выніку новыя тарыфныя стаўкі й аклады сваім рэальным значэньнем, г.зн. колькасьцяй прадуктаў і тавараў прамысловасьці, якую можна за іх купіць, не дасягаюць навет, калі-б узяць для прыкладу, памераў дабрачыннай дапамогі, выдаванай Мюнхэнскай гарадзкой управай для патрабуючых асобаў /Дабрачынная дапамога ў Мюнхэне на сям'ю з трох чалавек складае 138 ням. марак у месяц плюс аплочваньне кватэры й коштаў аграваньня/[24].

Колькасьць людзей, што жыве ў СССР на такой зарабатнай плаце, дасягае, паводля розных ацэнак, 6-8 міліёнаў чалавек[25], ці йнакш I2-I8% агульнае колькасьці асобаў наёмнае працы. Пры гэтым павышэньне мінімуму заработнае платы да 270-300-350 рублёў мела быць праведзенае ад I студзеня I957 г.

Характэрна, што законы, якія пагоршваюць палажаньне працоўных у СССР уваходзяць у сілу заўсёды безадкладна[26]. У дадзеным выпадку мы маем адваротнае. Гэтага нельга выясьніць і буджэтна-фінансавымі меркаваньнямі, бо зацьверджаны буджэт СССР на I956 год прадугледжвае рэзэрвы /перавагу даходаў над расходамі/ ў суме 23 міліярдаў рублёў, а на выплату павышаных ставак за 4 месяцы гэтага году патрэбна было-б менш за 3 міліярды рублёў.

Закон аб дзяржаўных пэнсіях. Зь I кастрычніка I956 г. увайшоў у сілу Закон аб дзяржаўных пэнсіях, прыняты 5-й сэсіяй Вярхоўнага Савету СССР чацьвертага скліканьня[27]. Гэты закон замяніў сабой шматлікія нарматыўныя акты, што выдаваліся ў розныя часы ў справе забясьпечаньня пэнсіямі работнікаў і службоўцаў. Аднак яшчэ цэлы шэраг старых пастановаў у гэтай справе застаецца дзейным і надалей. Новы закон не пашыраецца на генэралаў, адміралаў, ахвіцэраў, вайскоўцаў шэраговага, сержанцкага й старшынскага складу звыштэрміновай службы ды на прыраўнаных да іх асобаў, а таксама на іхныя сем'і /арт. 52 закону/, далей на настаўнікаў, працаўнікоў мэдыцыны й інш., што атрымоўваюць пэнсіі за выслугу гадоў /арт. 58/, на працаўнікоў навукі й іхныя сем'і ды на пэрсанальных пэнсіянэраў /2 абзац арт. 60/.

У справе забясьпечаньня пэнсіямі работнікаў і службоўцаў да гэтага часу існавалі вялікія розьніцы. Дастаткова згадаць, што памеры пэнсіяў старасьці паводля агульных нормаў былі ад 50 да 240 руб. у месяц ў гарадох і да I80 руб. у сельскіх мясцовасьцях; у той-жа час асноўным кадравым работнікам, кіруючым і інжынерна-тэхнічным працаўніком вугольнай, мэталюргічнай, хімічнай, нафтавай, абароннай, мясной, авіяцыйнай, суднабудаўнічай, электратэхнічнай ды некаторых іншых галінаў прамысловасьці пэнсіі старасьці выплочваліся ў памеры да 65% тарыфнай стаўкі або службовага акладу без абмежаваньня максімумам і дасягалі вялікіх сумаў[28]. Як правіла пэнсіі старасьці вызначаліся мужчынам пры дасягненьні 60 год, жанчынам - 55 год, у той-жа час працоў-

нікам сыстэмы міністэрства будаўніцтва прадпрыемстваў мэталюргічнай і хімічнай прамысловасьці пэнсіі вызначаліся - мужчынам і жанчынам пры дасягненьні - 50 год, у нафтавай прамысловасьці - 55 год, працаўніком цэнтральнага апарату міністэрства чорнай мэталюргіі - 50 год, працаўніком міністэрства хімічнай прамысловасьці - мужчынам 60 год, жанчынам - 55 год[29].

Новым законам вызначана для ўсіх галінаў народнае гаспадаркі ў залежнасьці ад цяжкасьці й шкоднасьці працы 3 векі, што даюць права на пэнсію старасьці: 60, 55 і 50 год для мужчын ды 55, 50, 45 год для жанчын, зразумела, пры наяўнасьці неабходнага працоўнага стажу, які быў вызначаны дыфэрэнцыйна ў залежнасьці ад роду ды ад шкоднасьці й цяжкасьці працы.

На першы пагляд здаецца, што гэта вялікі прагрэс у параўнаньні з законадаўствам заходня-эўрапэйскіх краёў, дзе век на права пэнсіі вышэйшы, чымся ў СССР: у ЗША для мужчын і жанчын 65 год, у Ангельшчыне для мужчын 65, для жанчын 60 год і ў шэрагу краёў - аднолькавы век для мужчын і жанчын, прыкладам, у Францыі 60 год, у Швэцыі 67 год, у Зах. Нямеччыне 65 год, а для мужчын на падземных працах 50 год[30].

Тым ня менш, аб прагрэсе гаварыць тут нельга. Папершае, найбольш нізкі пэнсійны век у СССР - 45 год - вызначаны для жанчын, што працуюць на падземных працах, на працах із шкоднымі ўмовамі і ў гарачых цэхах, а 50 год - для жанчын на працах зь цяжкімі ўмовамі. Ужо сам факт дапушчэньня жанчын да такіх працаў гаворыць сам за сябе й не патрабуе камэнтараў. Гэта - крок назад у параўнаньні з савецкім-жа працоўным законадаўствам першага пэрыяду савецкай улады. Прыняты ў 1922 г. Кодэкс законаў аб працы забараняў наагул ужываньне жаночае працы "у асабліва цяжкіх, шкодных для здароўя вытворчых і падземных працах[31]. Падругое, як відаць з наступных дадзеных сярэдняя даўжыня жыцьця ў Савецкім Саюзе шмат ніжэйшая, чымся ў заходніх краёх.

Краі	Сярэдняя даўжыня жыцьця	
	мужчын	жанчын
Нарвэгія	69,25	72,65
Швэцыя	69,04	71,58
Ангельшчына	67,06	72,35
Канада	66,33	70,83
ЗША	65,47	70,96
Францыя	63,90	69,30[32]
СССР /1938-40 гг./	46,70[33]	-----

Ясна, што вызначэньне ў СССР такога пэнсійнага веку, як у заходніх краёх, практычна немагчымае, бо яно рабіла-б беспрадметным самое законадаўства.

Новы закон пашырыў кола асобаў, якім належыцца пэнсійнае забясьпечаньне. Апрача работнікаў, службоўцаў і вайскоўцаў правам на пэнсію карыстаюцца таксама студэнты вышэйшых, сярэдніх спэцыяльных навучальных установаў, школаў і курсаў для падрыхтоўкі кадраў, а таксама іншыя грамадзяне, калі яны сталіся інвалідамі ў сувязі з выкананьнем дзяржаўных і грамадзкіх абавязкаў, прыкладам, пры ратаваньні людзкога жыцьця, пры ахоўваньні правапарадку. Памеры пэнсіяў для гэтых асобаў і іх сем'яў у выпадку страты карміцеля павінны быць вызначаныя асобна Саветам Міністраў СССР /арт. 60/.

Пашырылася таксама кола асобаў, якія маюць права на пэнсію ў выпадку страты карміцеля. Паводля старога законадаўства на пэнсію мелі права дзеці, браты й сёстры памерлага, бацькі й жонка пры наяўнасьці вызначаных умоваў. Цяпер такім правам карыстаюцца таксама ўнук, дзед і бабка памерлага.

Новы закон захоўвае тры тыпы пэнсіі, якія існавалі й раней: пэнсія старасьці, пэнсія інвалідзтва і пэнсія на выпадак страты карміцеля. Памеры пэнсіяў ува ўсіх выпадках вызначаюцца ў залежнасьці ад ступені цяжкасьці працаў, якія выконваў работнік ці службовец, ад вышыні ягонае заработнае платы, ад стажу працы й сямейнага палажэньня.

Пэнсія старасьці вызначаецца ў гарадох ад 300 да 1200 руб., а ў сельскіх мясцовасьцях - ад 255 да 1020 руб. у месяц. Пры

заработнай плаце да 350 рублёў пэнсія вызначаецца ў памеры поўнага заработку, але ня ніжэй 255 ці 300 рублёў. Як мы бачылі вышэй, гэты мінімум для 6-8 міліёнаў работнікаў і службоўцаў становіць сабой аднначасова й максімум. Пры сучасных цэнах на прадукты й прамысловыя тавары ў СССР гэтага мінімуму хопіць толькі для поўгалоднага існаваньня.

Што да максімуму пэнсіі старасьці /1200 руб./, дык ён даступны толькі для тых, хто перад выхадам на пэнсію атрымоўваў ня менш за 2400 рублёў у месяц. Калі-ж пэнсіянэр мае права на дадаткі за бесьперапынны ці агульны /30 і 35 гадовы/ стаж і дадатак на аднаго непрацаздольнага /на ўтрыманьні/ сябру сям'і, кажны па 10%, дык максімум можа быць дасягнуты пры заработнай плаце ў 2000 руб. Калі ўлічыць, што сярэдні заработак у СССР ува ўсіх катэгорыях працы з дадаткамі амаль не перавышае 600 рублёў у месяц, дык максімальная пэнсія старасьці - гэта прывілей толькі савецкай арыстакрацыі.

Але асноўная маса пэнсіянэраў - гэта ня тыя, што атрымоўваюць пэнсію старасьці, а пэнсіянэры інвалідзтва і ў выпадку страты апякуна. Колькасьць пэнсіянэраў апошніх групаў у некалькі разоў перавышае пэнсіянэраў старасьці. Узровень забясьпечаньня гэтых асоб і пасьля новага закону застаецца шмат ніжэйшым за мінімум, што патрэбны для існаваньня. Максымальныя пэнсіі інвалідзтва вызначаюцца для інвалідаў ад калецтва пры працы ці ад прафэсыйных хваробаў: I група інвалідзтва - 1200 руб., II група - 900 руб. і III група - 450 руб.; для інвалідаў ад агульных хваробаў: I група - 900 руб., II група - 600 руб. і III група - 400 руб. Пры гэтым скаля росту пэнсіі ў залежнасьці ад вышыні заработнае платы складзеная такім чынам, што для атрыманьня максімуму ў 1200 руб. з улікам 15% дадатку неабходна, каб работнік і службовец атрымоўваў да інвалідзтва каля 6000 руб. у месяц, для максімуму ў 900 рублей - больш за 4000 руб. у месяц. Такім чынам гэта мае практычнае значаньне толькі для невялікае колькасьці высокааплочваных асобаў.

Мінімальныя пэнсіі інвалідзтва і ў выпадку страты апякуна - 160 руб. у месяц. Гэты мінімум пашыраецца на інвалідаў працы ад агульных хваробаў, на жаўнераў тэрміновае службы, што сталіся інвалідамі ня пры выконваньні службовых абавязкаў, на сем'і

памерлых работнікаў і службоўцаў, а таксама на сем'і жаўнераў тэрміновае службы. У сельскіх мясцовасьцях ува ўсіх выпадках пэнсіі зьніжаюцца на 15%, як максімум так і мінімум. Гэта значыць, што мінімальная пэнсія ў сельскіх мясцовасьцях - 136 руб. у месяц. Зразумела, што ў параўнаньні з папярэднім мінімумам - 50 руб. - гэта ўжо вялікае павышэньне, але тым ня менш, гэтае сумы хапае толькі каб купіць адну пару простых жаночых туфляў ці пары мужчынскага бяльля й аднае баваўнянае кашулі. Жыхар Туркестану зможа купіць за гэтыя грошы 15-18 кг. найбольш таннага, ці 9-10 кг. добрага рысу[34].

Ня гледзячы на вялікую прапаганду навокал закону аб пэнсіях, у якой савецкая прэса апэруе паасобнымі прыкладамі, якія, быццам, сьветчаць аб шматразовым пабольшаньні пэнсіяў паводля новага закону, усё-ж статыстычныя дадзеныя, што прасочваюцца ў прэсе, пярэчаць гэтаму. Паводля гэтых дадзеных пэнсіі сярэдніх памераў павысіліся агульна на 50-55% у параўнаньні з папярэднімі[35]. Гэта пацьвярджаецца й сумай дадатковых асыгнаваньняў на выплату пэнсіяў паводля новага закону, якая складае 13 міліярдаў рублёў[36]. Тут трэба браць на ўвагу й пашырэньне кантынгенту асобаў, што маюць права на пэнсійнае забясьпечаньне паводля новага закону.

На заканчэньне неабходна адцеміць, што яшчэ ніхто ня можа сказаць, якую форму атрымае на практыцы практычная рэалізацыя гэтага закону. Згодна з арт. 15 закону пэнсіянэрам, што яшчэ працуюць, пэнсія старасьці выплочваецца толькі вышынёй 150 руб. у месяц пры заработку да 1000 руб., ня лічачы пэнсіі; калі-ж заработак перавышае 1000 руб., дык пэнсія наагул ня выплочваецца. Значныя абмежаваньні ўведзеныя таксама для працуючых пэнсіянэраў інвалідзтва. Напярэдадні ўваходу ў сілу Закону аб дзяржаўных пэнсіях у газэце "Труд"[37] быў вялікі артыкул аднаго пэнсіянэра аб карысьці працы для пэнсіянэраў. Няма сумлеваў, што гэта ня выпадкова, і што артыкул быў заказаны. Такім чынам, пры праводжаньні закону ў жыцьцё, ня выключаюцца й неспадзеўкі.

Адкліканьне некаторых законаў аб прымусовай працы. Значныя зьмены ў працоўнае законадаўства ўнёс загад Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР з 25 красавіка 1956 г. "Аб адкліканьні судовай адказнасьці работнікаў і службоўцаў за самавольнае пакі-

даньне прадпрыемстваў і ўстановаў ды за прагул без уважлівых прычынаў"[38]. Назоў загаду адлюстроўвае толькі невялікую й няістотную частку ягонага зьместу; гэткі назоў быў выбраны, бязумоўна, дзеля прапагандовых мэтаў, каб злагодзіць тое цяжкае ўражаньне, якое выклікаў свайго часу загад Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР з 26 чэрвеня 1940 г. аб вызначэньні крымінальнай адказнасьці для работнікаў і службоўцаў за прагул ці самавольнае пакіданьне працы[39].

У запраўднасьці загад з 26 чэрвеня 1940 г. быў даўно ўжо нядзейным законам: у часе вайны ён ня ўжываўся, бо адумысловымі законамі была вызначаная больш цяжкая адказнасьць для работнікаў і службоўцаў за парушаньне працоўнае дысцыпліны; у пасьляваенныя гады ён ужываўся таксама вельмі рэдка, а загадам Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР з 14 ліпеня 1951 г. крымінальная адказнасьць за прагул была адкліканая, за выняткам неаднаразовага й працяглага прагулу[40]. Але загад гэты ня быў апублікаваны і толькі паводля няясных нацёкаў у правінцыянальнай прэсе можна было аб ім дадумацца.

Загадам з 25 красавіка 1956 г. была адкліканая крымінальная адказнасьць як за самавольнае пакіданьне прадпрыемстваў і ўстановаў, гэтак і за неаднаразовы ці працяглы прагул бяз уважлівых прычынаў із зьняцьцем судзімасьці з грамадзян суджаных за гэта раней. Цяпер работнікі й службоўцы за прагул бяз уважлівых прычынаў могуць падлягаць дысцыплінарнаму спагнаньню на аснове правілаў нутранага парадку ці адумысловых уставаў аб дысцыпліне. Ня гледзячы на гэта, абвінавачаны ў прагуле можа быць пазбаўлены права на атрыманьне працэнтнага дадатку за выслугу гадоў на тэрмін да 3-х месяцаў; яму можа быць таксама абніжана аднаразовая ўзнагарода за выслугу гадоў на 25%; урэшце, яго могуць звольніць, з зацемкай у працоўнай кніжцы, што звольнены за прагул бяз уважлівых прычынаў. У гэткім выпадку работнік ці службовец траціць стаж бесьперапыннай працы, а апрача таго права на дапамогу ў выпадку часовае непрацаздольнасьці ён можа здабыць толькі пасьля таго, як адпрацуе ня менш за 6 месяцаў на новым месцы працы.

Аднак, згодна пастановы Пленуму Вярхоўнага суду СССР з 11 студзеня 1952 г., звальненьне дапушчаецца толькі пры сыстэма-

тычным парушаньні правілаў нутранога працоўнага парадку і з умовай, што ўжытыя ў дачыненьні да парушальніка іншыя дысцыплінарныя спагнаньні не далі належных вынікаў, дзеля чаго далейшае пакіданьне работніка на працы супярэчыць інтарэсам вытворчасьці.[41]

Дысцыплінарныя спагнаньні накладае дырэктар прадпрыемства або кіраўнік установы, які можа, заместа спагнаньня перадаць матар'ялы аб прагуле на разгляд таварыскага суду.

Больш істотнае - гэта аднаўленьне загадам з 25 красавіка 1956 г., прадугледжанага Кодэксам законаў аб працы з 1922 г.[42], права работніка й службоўца на звальненьне з працы на собскае жаданьне. Згодна арт. 5 гэтага загаду работнік ці службовец, які жадае пакінуць працу, павінен толькі папярэдзіць аб гэтым адміністрацыю прадпрыемства ці ўстановы за два тыдні наперад. Гэта адказвае тэрміну для папярэджаньня з боку адміністрацыі работніка ці службоўца пры звальненьні яго не зь ягонае віны[43].

Пры звальненьні на собскае жаданьне работнік і службовец трацяць таксама стаж бесьперапыннай працы, права на дапамогу ў выпадку часовае непрацаздольнасьці здабываюць ізноў толькі пасьля адпрацаваньня 6 месяцаў на новым месцы працы.

Ня менш важнае і адкліканьне загаду Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР з 19 кастрычніка 1940 г. "Аб абавязковым пераводзе інжынераў, тэхнікаў, майстроў, службоўцаў і кваліфікаваных работнікаў з адных прадпрыемстваў і ўстановаў у іншыя"[44]. У тэксьце загаду з 25 красавіка 1956 г. ніякае пастановы аб гэтым няма, а толькі ў арт. 8 між іншымі адкліканымі загадамі ўспамінаецца й загад з 19 кастрычніка 1940 г.

Неабходна адцеміць, што з выданьнем загаду з 25 красавіка 1956 г. яшчэ далёка ня зьліквідаваная юрыдычная аснова прымусовае працы ў СССР. Ён адклікае толькі тыя нормы аб прымусовай працы, практычнае значаньне якіх з тых ці іншых меркаваньняў было меншае, чымся прапагандовае значаньне адкліканьня іх. Яшчэ застаюцца ў сіле: загад з 2 кастрычніка 1940 г. аб прымусовым наборы падросткаў у школы дзяржаўных працоўных рэзэрваў[45]; пастанова Савету Міністраў СССР і ЦК КПСС аб наборы вучняў у школы ФЗО мэханізацыі сельскай гаспадаркі[46]; загад з 28 сьнежня 1940 г. аб крымінальнай адказнасьці вучняў рамесьніцкіх, чыгуначных і ФЗО школаў за парушэньне дысцыпліны й самавольнае па-

кіданьне школы[47]; яшчэ ў сіле парадак,паводля якога ўсе асобы, што закончылі вышэйшыя й сярэднія спэцыяльныя навучальныя ўстановы, павінны адпрацаваць паводля інструкцыяў адпаведных міністэрстваў ня менш за тры гады[48].

Утварэньне Дзяржаўнага камітэту Савету Міністраў СССР для справаў працы й заработнай платы.

Неабходна адцеміць важнае мерапрыемства ў галіне працы, якое было праведзена апошнімі часамі. Гэта - ўтварэньне Дзяржаўнага камітэту Савету Міністраў СССР для справаў працы й заработнае платы. Пасьля зьліцьця народнага камісарыяту працы СССР з Усесаюзным Цэнтральным Саветам Прафэсыйных Саюзаў /ВЦСПС/, якое адбылося ў чэрвені 1933 г.[49], усе функцыі наркомпрацы былі перададзеныя прафсаюзным ворганам у цэнтры й на мясцох. З тых часоў ня было дзяржаўнага воргану для справаў працы. ВЦСПС, будучы грамадзкай арганізацыяй і ня маючы патрэбнага аўтарытэту, ня выконвае заданьняў у разьвязваньні шматлікіх і складаных пытаньняў працы, а ў выніку ў гэтай галіне паўстаў вялікі хаос.

Загад Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР з 24.5.1955 г. аб утварэньні Дзяржаўнага камітэту для справаў працы й заработнае платы[50] ставіць для гэтага камітэту наступнае заданьне: узмацненьне дзяржаўнага кантролю за працай міністэрстваў і ведамстваў ды палепшаньне дзейнасьці іх у галіне працы й заработнай платы. Аднак да гэтага часу яшчэ невядома, якія канкрэтныя функцыі ўскладзеныя на гэты камітэт.

Мы пералічылі асноўныя мерапрыемствы савецкага рэжыму ў пытаньнях працы за апошнія тры гады. Нельга даць адзінага адказу на пытаньне, якія матывы ляглі ў васнову гэтых мерапрыемстваў.

Няма сумлеву, што такія мерапрыемствы, як пастанова Савету міністраў СССР з жніўня 1953 г. "Аб рэжыме прыцоўнага дня ў установах" і загад Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР з 24.5. 1955 аб ўтварэньні Дзяржаўнага камітэту Савету міністраў для справаў працы й заработнае платы былі выкліканыя нутранадзяржаўнымі меркаваньнямі. У вадным выпадку - імкненьнем упарадкаваць моцна разладжаны рэжым працоўнага часу ў установах, падняць дысцыпліну працы, палепшыць працу дзяржаўнага апарату, у другім - неабходнасьцяй стварэньня аўтарытэтнага дзяржаўнага

органу для кіраўніцтва й кантролю ў справах працы й заработнае платы.

Што да іншых зьменаў у працоўным законадаўстве, дык для іх падаюцца розныя прычыны. Афіцыйнае-ж паясьненьне, якое падаецца ўва ўсіх загадах і пастановах, што быццам гэтыя мерапрыемствы праводзяцца з мэтай далейшага палепшаньня долі працоўных, ня можа быць разгляданае паважна, бо яно пярэчыць запраўднасьці. Як ужо гаварылася вышэй, яны не прадстаўляюць сабой палепшаньня, а ў найлепшым выпадку яны толькі аднаўляюць абрэзаныя ў трыццатых гадох правы работнікаў і службоўцаў. Даказваньне, што гэтыя загады й пастановы адхілілі тыя абмежаваньні ў правох работнікаў і службоўцаў, што былі ўведзеныя свайго часу з надзвычайных меркаваньняў у вабліччы ваеннай небясьпекі й насілі часовы характар[51], таксама гучыць непераканальна. У гэткім выпадку гэтыя абмежаваньні мусілі быць адкліканыя ў 1945г., а не цераз 10-11 гадоў.

Некаторыя замежныя назіральнікі адкліканьне крымінальнай адказнасьці за парушэньне працоўнай дысцыпліны гатовыя зьвязваць з агульнай тэндэнцыяй, накіраванай на зьмякчэньне крымінальнай рэпрэсіі за малаважныя праступкі ў СССР[52]. У запраўднасьці-ж няма асноваў гаварыць аб існаваньні такое тэндэнцыі. У загадзе Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР з 27 сакавіка 1955 г. аб амнэстыі хаця й ёсьць абяцаньне аб гэтым, аднак на практыцы ніякіх істотных зьменаў да гэтага часу не заўважаецца. Суды паранейшаму засуджваюць за такія праступкі, як кражу самакату, на 5 гадоў зьняволеньня[53].

На нашу думку прычынаў гэтых мерапрыемстваў трэба шукаць у іншай плошчы, а менавіта, у "вонкавай палітыцы, праводжанай калектыўным кіраўніцтвам, выходзячы зь ленінскіх запаветаў аб мірным суіснаваньні краёў з розным грамадзкім ладам", аб якой гаварыў Мікаян на XX зьезьдзе партыі[54]. Зразумела, нельга адмаўляць таго, што нутранапалітычныя меркаваньні ў нейкай меры зрабілі неабходным правядзеньне гэтых мерапрыемстваў, аднак наважвальнае значаньне ў выбары мамэнту для іх мелі вонкавапалітычныя меркаваньні. Калі-б ня было вонкавапалітычнай неабходнасьці, савецкі рэжым абыйшоўся-б, прынамсі ў бліжэйшым часе, бяз гэтых мерапрыемстваў. Аб гэтым сьветчыць той факт, што

зьмены закранулі ня ўсе балючыя пытаньні ў галіне права, а толькі найбольш эфэктоўныя з гледзішча прапаганды.

Зьвернемся да фактаў. Пасьля I4-гадовага перапынку Савецкі Саюз у красавіку I954 г. ізноў вярнуўся ў Міжнародную арганізацыю працы /МАП/, зь якой ён быў змушаны выйсьці ў I940 г. у сувязі з выключэньнем яго зь Лігі Нацыяў. На колькі ён будзе добрасумленна супрацоўнічаць у інтарэсах усеагульнага сацыяльнага прагрэсу ў МАП, якую ён да гэтага часу лічыў толькі паслухмянай прыладай манапалістычнага капіталу, пакажа будучыня. А тымчасам ён робіць высілкі для заваёвы даверу гэтай арганізацыі. Навучаны горкай практыкай свабодны сьвет пачаў цяпер больш асьцярожна адносіцца да праніканьня савецкае дыктатуры ў яго асяродзьдзе. Пазволім сабе прывесьці некаторыя паралелі. У той час, як паява кіраўніка працоўнага фронту нацыянал-сацыялістычнае Нямеччыны Робэрта Лея ў I933 г. у МАП выклікала пратэст прадстаўнікоў сацыялістычных прафсаюзаў, савецкія прадстаўнікі праз нейкі час былі прынятыя імі прыхільна. Аднак цяпер на ўсіх канфэрэнцыях МАП, у якіх бралі ўдзел прадстаўнікі Савецкага Саюзу, ім прыйшлося выслухоўваць закіды аб адсутнасьці ў СССР свабоды для прафсаюзаў, аб існаваньні прымусовае працы, аб тым, што прадстаўнікі прадпрыемстваў і прафсаюзаў залежныя ад савецкага ўраду й г.д.

Асабліва моцны супраціў выклікалі на 39-й Генэральнай канфэрэнцыі МАП у чэрвені I956 г. у Жэнэве прэтэнзіі Савецкага Саюзу й яго сатэлітаў на роўнапраўнасьць у МАП. Прадстаўнікі свабодных краёў, у прыватнасьці прадстаўнік прадпрыемцаў і прадстаўнікі ўраду Нямеччыны, паклікаючыся на статут МАП, які прадугледжвае трохбаковае прадстаўніцтва краёў /два прадстаўнікі ад ураду й па аднаму ад прадпрыемцаў і ад працоўных/, заявілі аб нясумяшчальнасьці прадстаўніцтва СССР із статутам МАП, так як усе яго прадстаўнікі залежныя ад савецкага ўраду[55]. Цяжка з гэтым не згадзіцца. У запраўднасьці нельга-ж лічыць паважна незалежным ад савецкага ўраду прадстаўніком прадпрыемцаў Г.А. Сургучава - дырэктара заводу "Красный пролетарий", або прадстаўніком працоўных Л.Н.Салаўёва, заступніка старшыні ВЦСПС, арганізацыі, якое роля зводзіцца да паслухмянае прылады савецкага ўраду пры эксплятацыі працоўных.

У сувязі з такой сытуацыяй Савецкі Саюз змушаны ісьці цяпер на крыху большыя палітычныя ўступкі, чымся ў трыццатых гадох. Калі ён да 1936 г. пасылаў у МАП толькі наглядальніка й адно ў 1936 г., у сувязі з палітыкай стварэньня народнага фронту ў дэмакратычных краёх, зьявілася дэлегацыя на чале із старшынём ВЦСПС Швэрнікам, дык цяпер на канфэрэнцыі МАП СССР пасылае кажны раз дэлегацыю ў поўным складзе. У даваенны пэрыяд свайго сяброўства ў МАП СССР прыняў 14 міжнародных канвэнцыяў гэтай арганізацыі, але ніводнай зь іх не ратыфікаваў[56]; цяпер, у цягу 1956 г. ён прыняў і ратыфікаваў 18 наступных канвэнцыяў МАП[57]:

1/ Канвэнцыю №10 у дачыненьні мінімальнага веку пры дапушчаньні дзяцей на працу ў сельскай гаспадарцы.

2/ Канвэнцыю №11 у дачыненьні правоў на асацыяцыю й аб'еднаньне працоўных у сельскай гаспадарцы.

3/ Канвэнцыю №15 аб мінімальным веку пры дапушчаньні падросткаў на працу ў якасьці ладавальнікаў вугля ці качагараў у флёце.

4/ Канвэнцыю №16 аб абавязкавым мэдычным аглядзе дзяцей і падросткаў, занятых на суднах.

5/ Канвэнцыю №29 у дачыненьні прымусовае ці абавязкавае працы.

6/ Канвэнцыю №47 аб даўжыні працоўнага тыдня /аб паступовым пераходзе на 40-гадзінны працоўны тыдзень/.

7/ Канвэнцыю №52 аб гадавых аплочваных адпачынках.

8/ Канвэнцыю №58 аб мінімальным веку дапушчаньня дзяцей на працу на моры.

9/ Канвэнцыю №59 аб мінімальным веку прыйма дзяцей на працу ў прамысловасьці.

10/ Канвэнцыю №60 аб веку прыйма дзяцей на непрамысловыя працы.

11/ Канвэнцыю №77 аб мэдычным аглядзе дзяцей і падросткаў з мэтай высьвятленьня прыгоднасьці іх да працы ў прамысловасьці.

12/ Канвэнцыю №78 аб мэдычным аглядзе дзяцей і падросткаў з мэтай высьвятленьня прыгоднасьці іх да непрамысловых працаў.

13/ Канвэнцыю №79 аб абмежаваньні ночнае працы дзяцей і падросткаў на непрамысловых працах.

I4/ Канвэнцыю №87 аб свабодзе асацыяцыяў і абароне права на арганізацыю.

I5/ Канвэнцыю №90 у дачыненьні ночнае працы падросткаў у прамысловасьці.

I6/ Канвэнцыю №98 аб ужываньні прынцыпаў права на арганізацыю й складаньне калектыўных умоваў.

I7/ Канвэнцыю №99 аб роўным узнагароджваньні мужчын і жанчын за працу аднолькавае вартасьці.

I8/ Канвэнцыю №I03 аб ахове мацярынства.

Між ратыфікацыяй гэтых канвэнцыяў і зьменамі ў савецкім працоўным законадаўстве ёсьць, бясспрэчна, нутраная сувязь, незалежна ад таго, у якой храналягічнай пасьлядоўнасьці былі яны праведзеныя. Усе яны - толькі часткі ў вагульным ланцугу прапагандовых мерапрыемстваў савецкага рэжыму, разьлічаных на грамадзкую апінію замежжа. Зьмены ў савецкім працоўным законадаўстве былі шырока выкарыстаныя прадстаўнікамі СССР на 39 сэсіі генэральнай канфэрэнцыі Міжнароднай Арганізацыі Працы ў чэрвені I956 г. для прапаганды "новых мерапрыемстваў, уводжаных у галіне палепшаньня умоваў працы й быту савецкіх людзей."[58] Бязумоўна, савецкая прапаганда і ў далейшым не прапусьціць ніводнае нагоды, каб не нажыць сабе палітычны капітал на гэтых мерапрыемствах.

Бібліяграфічныя зацемкі й заўвагі

х/ Кодэксы законаў аб працы, дзейныя ў другіх саюзных рэспубліках, па свайму зьместу ня розьняцца ад Кодэксу законаў аб працы РСФСР. Дзеля гэтага мы агранічымся да апошняга, называючы яго ў далейшым тэксьце Кодэксам законаў аб працы.

I. "Известия", I4.8.I956.
2. "Известия", 25.2.I955.
3. Там-жа.
4. "Правда Востока", Ташкент, 22.9.I956.
5. "Правда", I5.2.I956.
6. "Труд", 20.II.I954.

7. "Правда", I.9.I953.

8. Пастанова СНК СССР з 27.6.I940. /СП СССР, I940, №I6, б. 385/.

9. Арт. 95 Кодэксу законаў аб працы I922 году.

I0. "Известия", I9.II.I953.

II. "Труд", 20.II.I954.

I2. "Ведомости Верховного Совета СССР", I955 г., №I5, арт. 303.

I3. Там-жа, I940 г., №37.

I4. "Правда", 29.5.I956.

I5. Там-жа, I9.5.I956.

I6. Часапіс "Советские профсоюзы", I956 г., №8, б.8.

I7. "Известия", 9.3.I956.

I8. Там-жа.

I9. Часапіс "Советские профсоюзы", I956 г., №8, б.9.

20. "Правда Востока", II.3.I956.

2I. "Известия", 27.3.I956.

22. "Правда", 9.9.I956.

23. Кодэкс законаў аб працы I922 году, §58 і 59.

24. "Süddeutsche Zeitung", 25.3.I955.

25. Г.Шварц, Нью Ёрк Таймс, I0.9.I956; А.Поплюйко, тыднёвы бюлетэнь радыястанцыі "Вызваленьне", Мюнхэн, I956 г., №40 за 2I верасьня.

26. Прыкл. Загад аб прадаўжэньні рабочага дня й рабочага тыдня, устанаўленьні крымінальнай адказнасьці за парушэньне працоўнай дысцыпліны, выдадзены 26 чэрвеня I940 г., увайшоў у сілу 27 чэрвеня, г.зн. у наступны дзень.

27. "Ведомости Верховного Совета СССР", I956 г., №I5, б.3I3.

28. "Социалистический труд", I956 г., №8, б.23.

29. "Советское государство и право", I956 г., №6, б.I5.

30. "Социалистический труд", I956 г., №8, б.24.

3I. Кодэкс законаў аб працы I952 году, б. I29.

32. "Демографический сборник ООН", I954 г., б. 626-628.

33. Прокопович. Народное хозяйство СССР, т.I, б.76.

34. "Туркменская искра", Ашхабат, 4.I0.I956.

35. "Советская Россия", 2.I0.I956.

36. "Социальное обеспечение", I956 г., №7, б.2.

37. "Труд", 30.9.1956.

38. "Ведомости Верховного Совета СССР", 1940 г., №10, б.203.

39. "Ведомости Верховного Совета СССР", 1940 г., №20.

40. "Указ Презид. ВС СССР" з 25.3.1956, арт.8, п."г" /"Ведомости", 1956 г., №10./.

41. "Основные законодательные акты о труде рабочих и служащих", Госюриздат 1953 г., б. 102.

42. Кодэкс законаў аб працы, б. 46.

43. Там-жа, б. 88.

44. "Ведомости Верховного Совета СССР", 1940 г., №42.

45. Там-жа, №37.

46. "Известия", 1.10.1953.

47. "Ведомости Верховного Совета СССР", 1941, №1.

48. "Социалистический труд", 1956, №7, б.7-8.

49. С.З., 1933, №40, б.238.

50. "Правда", 25.5.1955.

51. А.Пашерстник. Социалистический труд, 1956, б.3.

52. Jerzy Gliksman. "Problems of Communism" Washington, Juli-Aug. 1956, цытавана з "Ost-probleme", 1956, No.35,S. 1207.

53. Совет. Кирг., 7.9.1956.

54. "Правда", 18.2.1956.

55. Süddeutsche Zeitung, 18.6.1956.

56. Die Internationale Arbeits-Organisation (ILO). Dokumente herausgegeben von der Forschungsstelle für Völkerrecht und ausländisches öffentlichen Recht der Universität Hamburg, Heft III, Alfred Metzner Verlag Frankfurt am Main, 1952, S. 4.

57. "Правда", 11.5.1956; "Известия", 12.6.1956; "Ведомости Верховного Совета СССР", 1956, №14, б.301.

58. "Социалистический труд", 1956, №9, б. 34.

Усевалад Галубнічы

РАЗЬМЕШЧАНЬНЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ Ў ТЭОРЫІ Й ПРАКТЫЦЫ НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Згодна із савецкай тэорыяй палітычнай эканоміі, разьмешчаньне прамысловасьці ў СССР асноўваецца на чатырох розных прынцыпах: I/ штораз большае выраўнаньне прамысловага разьвіцьця ўсяе вялізнае краіны, г.зн. дасягненьня раўнавагі ў прасторы; 2/ хуткая індустрыялізацыя раней адсталых прыгранічных раёнаў, населеных нацыянальнымі мяншынямі, г.зн. дасягненьне раўнавагі ў часе; 3/ перасоўваньне прамысловасьці бліжэй да крыніцаў сыравіны й паліва, а таксама да раёнаў спажыцьця іхных вырабаў, г.зн. дасягненьне эканоміі ў разьмешчаньні і 4/ камплекснае разьвіцьцё эканамічных раёнаў СССР, г.зн. зноў-жа дасягненьне эканоміі ў разьмешчаньні папоўненае мэтазгоднасьцяй у выпадку абароны[I].

Відавочна й лягічна, што гэтыя прынцыпы не зьяўляюцца дапаўняльнымі адзін да другога, ды што ў кажным паасобным выпадку разьмешчаньня прамысловасьці можа між імі паўстаць супярэчнасьць і ў такім выпадку адзін зь іх мусіць быць адкінуты на карысьць другога.

У ўмовах эканоміі, аснованай на свабоднай ініцыятыве, разьмешчаньне паасобных прамысловых прадпрыемстваў не залежыць ад ніякіх цэнтральных ворганаў; яно поўнасьцяй залежыць ад прадпрыемцы й собсьніка ўкладанага капіталу; маючы наўвеце даход і ашчаднасьць, яны могуць улічваць іншыя дзейнікі, акрамя палажэньня рынку - але могуць іх і ня ўлічваць. У ўмовах дзяржаўнае манапалістычнае сыстэмы савецкага ўзору, дзе дзяржава зьяў-

ляецца адзіным собсьнікам капіталу, разьмешчаньне таго ці іншага прадпрыемства поўнасьцяй абумоўленае пастановай цэнтру; яно ў ладнай меры залежыць ад волі людзей, што зьяўляюцца сябрамі пастанаўляючых органаў. У тэорыі, зусім магчыма ўявіць такі дзяржаўны манаполь, які быў-бы кіраваны дэмакратычным спосабам - калі-б усе зацікаўленыя бакі былі прадстаўлены ў гэтых пастанаўляючых органах. Аднак у савецкай практыцы няма дэмакратыі й поўнае рэпрэзэнтацыі ўсіх зацікаўленых бакоў; таму пастановы прыймаюцца суб'ектыўна тымі, якія знаходзяцца пры ўладзе. У такіх умовах зусім лягічна, што, прыкладам, калі вайскоўцы маюць паважны голас у пастанаўляючых органах, чацьверты з вышэй пералічаных прынцыпаў разьмешчаньня прамысловасьці можа пераважаць над усімі іншымі; або - іншы прыклад - калі нейкая нацыянальная мяншыня не прадстаўленая ў пастанаўляючых органах, другі прынцып разьмешчаньня прамысловасьці будзе пакінуты на ласку людзей, якія не належаць да дадзенай нацыянальнасьці і таму мала цікавяцца ейнымі інтарэсамі.

У працэсе плянаваньня разьмешчаньня прамысловасьці ў Савецкім Саюзе палітычныя і эканамічныя меркаваньні неразлучна зьвязаныя з сабою. Існуе аднак поўны закон суадносінаў: чым вышэйшы герархічна пастанаўляючы орган, тым больш палітычны характар маюць ягоныя пастановы; чым ніжэйшы орган, тым больш эканамічныя меркаваньні ўплываюць на прыйманыя пастановы.

На эканамічны бок пастановаў у разьмешчаньні прамысловасьці ў Савецкім Саюзе ўплываюць звычайна дзейнікі: гістарычна складзенае эканамічнае асяродзьдзе, наяўнасьць натуральных рэсурсаў і кваліфікаванае працоўнае сілы, кошты транспарту й рынку, дзейнік часу пры капіталаўкладах і г.д.

У спэцыфічных савецкіх умовах некаторыя з гэтых эканамічных аспэктаў разьмешчаньня прамысловасьці цесна зьвязаныя з палітычнымі пастановамі. Гэтак, прыкладам, Р.С.Лівшыц піша, што дзейнік часу пры ўкладах капіталу ў недаразьвітых прыгранічных рэспубліках СССР вымагае запраўды палітычнае пастановы, таму што інвэстыцыі ў гэтых рэспубліках апраўдваюць сябе толькі пасьля 10-15 год. У высокіх савецкіх органах плянаваньня гэткія інвэстыцыі натыкаюцца заўсёды на паважную апазыцыю[2].

Спаміж праблемаў, зьвязаных з эканомікай разьмешчаньня пра-

мысловасьці, галоўнай праблемай разьмешчаньня новых прадпрыемстваў з гледзішча коштаў, савецкія эканамістыя лічаць ступень спэцыялізацыі й каапэраваньня прамысловых прадпрыемстваў ці цэлых галінаў прамысловасьці[3]. У шырокім сэньсе, спэцыялізацыя дадзенага раёну ў вытворчасьці пэўнага прамысловага прадукту можа быць абумоўленая такімі чыста аб'ектыўнымі дзейнікамі, як наяўнасьць адпаведных натуральных рэсурсаў ці ад пакаленьняў спрактыкаванае й кваліфікаванае працоўнае сілы. У вузкім сэньсе - а гэта самае галоўнае - спэцыялізацыя можа быць вынікам эканоміі на падзеле працы; шматлікія часткі складанага прамысловага прадукту /прыкладам, машыны/ могуць вырабляцца асобна, а пасьля мантавацца ў зусім іншым заводзе. Каапэраваньне між так вузка спэцыялізаванымі прадпрыемствамі стаецца адмысловай праблемай, калі прыймаецца пастанова заснаваць новыя прадпрыемствы ці пэўныя галіны прамысловасьці. Савецкая эканамічная тэорыя цьвердзіць што рацыянальныя спэцыялізацыя й каапэраваньне павінна забясьпечыць як мага найвышэйшы ўзровень выкарыстаньня вытворчых магутнасьцяў прадпрыемстваў, максымальную эканомію працы й капіталу, максымальнае скарачэньне адлегласьцяў транспарту ды комплекснае разьвіцьцё эканамічных раёнаў[4].

Практычнае прыстасаваньне савецкіх тэорыяў разьмешчаньня прамысловасьці можа быць найлепш разгледжана на прыкладзе індустрыялізацыі Беларускай ССР. Прыклад Беларусі цікавы таму, што ён характарызуецца наступнымі прыкметамі: I/ зь гістарычнага гледзішча гэтая рэспубліка зьяўляецца эканамічна неразьвітым прыгранічным раёнам, населеным нацыянальнай мяншыняй; 2/ яна мае пэўныя натуральныя рэсурсы, у некаторых зь якіх яна зьяўляецца спэцыялізаванай, хоць у той-жа час яна зусім ня мае некаторых іншых; 3/ яна паложана блізка да Захаду і мае мала натуральных ці іншых дзейнікаў, якія маглі-б быць важнымі з ваеннага гледзішча; 4/ БССР практычна ня мае голасу ў пастанаўляючых ворганах Савецкага Саюзу[5].

Ніжэйшы разгляд індустрыялізацыі Беларусі абаснаваны галоўным чынам на статыстычных дадзеных, якія знаходзяцца ў дадатку да гэтага артыкулу. Тут трэба адцеміць, што статыстычны матарыял аб Беларусі даволі бедны, і ад пачатку 30-х гадоў больш не зьяўляецца ў форме зборнікаў. Дадатковая цяжкасьць у разглядзе

беларускае эканомікі ўзьнікае з прычыны тэрытарыяльных зьменаў; у верасьні 1939 году Беларуская ССР амаль падвоіла сваю тэрыторыю далучэньнем да яе Заходняй Беларусі. Зьвяртаем увагу чытачоў, што статыстычныя дадзеныя ў гэтым артыкуле, якія адносяцца да пэрыяду перад 1940 годам, адпавядаюць БССР у межах перад 1939 годам, а ўсе статыстычныя дадзеныя пазьнейшага пэрыяду адпавядаюць ейным сучасным межам, за выключэньнем пэўных, адумыслова адзначаных, выпадкаў.

У 1913 годзе, у складзе царскае Расеі, прамысловая вытворчасьць Беларусі складала толькі 0,88% валавое прадукцыі Расеі, хоць ейнае насельніцтва складала 3,6% усяго насельніцтва імпэрыі[6]. Гэтая дыспрапорцыя ясна даводзіць тагачасную індустрыяльную неразьвітасьць Беларусі.

Вынікам індустрыялізацыі Савецкай Беларусі перад 2-й сусьветнай вайною быў ладны зрух у прапорцыі: у 1939 годзе вытворчасьць БССР складала ўжо 2% усяе прамысловае вытворчасьці СССР, пры 3,2% насельніцтва СССР[7].

У выніку далучэньня заходніх раёнаў да БССР атрымалася новая дыспрапорцыя між колькасьцяй насельніцтва й прамысловым разьвіцьцём, таму што заходнія раёны былі шмат менш разьвітыя, чымся ўсходнія. У 1938 годзе валавая прамысловая вытворчасьць на галаву насельніцтва ў Заходняй Беларусі складала толькі 48 рублёў /паводля цэнаў 1926-1927 гадоў/, у той час калі ў Усходняй Беларусі амаль 400 рублёў на галаву насельніцтва[8]. У 1940 годзе заходнія раёны БССР, насельніцтва якіх складала найменш 35% насельніцтва цэлае рэспублікі, прадукавала толькі 9,1% усяе прамысловае вытворчасьці БССР[9].

Вайна спрычыніла вялізарныя спусташэньні беларускай прамысловасьці; у 1945 годзе прамысловая вытворчасьць рэспублікі складала толькі 20% вытворчасьці 1940 году[10]. Гэты дзейнік меў яшчэ большае значаньне ў зьменшаньні ўдзелу Беларусі ў валавой прамысловай вытворчасьці Савецкага Саюзу ў пасьляваенным пэрыядзе, чымся далучэньне да Беларусі неразьвітых заходніх раёнаў. Вынікам гэтага ўсяго было тое, што пад 1955 год Беларуская ССР прадукавала толькі 1,25% прамысловае вытворчасьці СССР, але насельніцтва яе складала 3,9% насельніцтва Савецкага Саюзу[11].

Гэта значыць, што ў адносных ліках, у прапорцыі да ўсяго

Савецкага Саюзу, мала што зьмянілася ў прамысловым разьвіцьці Беларусі ад 1913 году. Параўнальна, Беларусь і далей застаецца прамыслова неразьвітай краінай. Гэта таксама значыць, што першы прынцып савецкае тэорыі разьмешчаньня прамысловасьці - прынцып раўнамернага разьмеркаваньня прамысловага разьвіцьця па цэлым Савецкім Саюзе - яшэ няпрыстасавальны ў выпадку Беларусі.

Гэтым мы ня хочам сказаць, што прагрэс індустрыялізацыі Беларусі быў зусім нязначным. Ня толькі савецкія, але й чужынецкія дасьледнікі беларускае эканомікі прыходзяць да высновы, што прамысловы прагрэс у Беларусі зьяўляецца даволі паважным. Прыкладам, нямецкі дасьледнік Беларусі Энгельгардт пісаў аб Беларусі перад 2-ю сусьветнай вайною:

> "У кажным выпадку за апошняе дзесяцігодзьдзе таксама і ў дагэтуль чыста аграрнай Савецкай Беларусі прамысловасьць сталася паважным фактарам.12

Сучасная думка амэрыканскіх дасьледнікаў Беларусі вельмі падобная да думкі Энгельгардта[13]. Але ў параўнаньні зь ейнымі патрэбамі, ды ў параўнаньні з рэштай Савецкага Саюзу, Беларусь усё яшчэ зьяўляецца прамыслова неразьвітай краінай. Пры апошнім перапісе насельніцтва ў 1939 годзе 75,3% насельніцтва Усходняй Беларусі ды 88,3% насельніцтва Заходняй Беларусі было занятае ў земляробстве[14]; наглядалася ладная аграрная перанаселенасьць у вёсках і адсюль - нізкая прадуктыўнасьць сельскагаспадарскае працы, незканамічнае выкарыстоўваньне рэсурсаў. Гэтыя суадносіны напэўна мала зьмяніліся пасьля вайны; ня маючы дадзеных што да сельска-гарадзкога разьмеркаваньня насельніцтва ў Беларусі цяпер, мы можам высунуць гэтую гіпатэзу прынамся на аснове ўжо дасьледаваных і даведзеных суадносінаў насельніцтва ў суседняй Украінскай ССР, дзе ад часу вайны адбыліся толькі нязначныя зьмены ў разьмеркаваньні насельніцтва[15]. Але для краіны із збыткам сельскага насельніцтва, індустрыялізацыя зьяўляецца неабходнасьцяй, адзіным запраўдным шляхам да эканамічнага прагрэсу й агульнага росту цывілізацыі.

Аднак два аб'ектыўныя дзейнікі, г.зн. далучэньне неразьвітых заходніх раёнаў і спусташэньні, спрычыненыя 2-ой сусьветнай вайной, ня могуць быць дастатковым выясьненьнем прычынаў нязьменнае дыспрапорцыі ў прамысловым разьвіцьці Беларусі ў параўнаньні з СССР пачынаючы ад 1913 году. Іншай важнай прычынай

зьяўляецца эканамічная палітыка Масквы. Разгледзім цяпер ейныя вынікі.

Савецкія крыніцы вельмі часта падчыркваюць факт, што перад другой сусьветнай вайной рост прамысловай вытворчасьці ў Беларусі быў параўнальна вышэйшы, чымся ў Савецкім Саюзе ў цэлым; паводля іх, гэта значыць, што Масква праводзіла актыўную палітыку індустрыялізацыі Беларусі. Заходнія дасьледнікі беларускае эканомікі прынялі гэта таксама за добрую манэту[16]. Трэба сказаць, што пэўны прагрэс у індустрыялізацыі Беларусі зьяўляецца бязумоўным фактам. Аднак мы хацелі-б адзначыць, што добра ведамае "тэлескапічнае павялічэньне" павінна заўсёды брацца пад увагу пры параўнаньнях росту разьвітых і неразьвітых краінаў. У краі, дзе існавала толькі адна хвабрыка, пабудаваньне яшчэ аднае азначае ўзрост на 100%; але ў іншым краі, дзе было 10 хвабрык, пабудаваньне аднае больш азначае толькі ўзрост на 10%. Параўнальна, не адбылося ніякае зьмены ў прамысловым разьвіцьці абодвух краёў, ня гледзячы на тое, што адзін зь іх разьвіўся "хутчэй" чымся другі. Якраз нешта падобнае адбылося ў выпадку Беларускае ССР.

Запраўдную эканамічную палітыку Масквы ў вадносінах да Беларусі можна бачыць толькі на аснове параўнаньняў укладаў у беларускую эканоміку і ейнае вытворчасьці з эканомікай СССР. Малюнак гэтых суадносінаў прадстаўлены ў табліцы I. Зь яго відавочна, што перад вайной вытворчасьць беларускае эканомікі была адносна й параўнальна вышэйшай чымся інвэстыцыі, якія ўкладваліся ў яе зноў. Той факт, што ў пэрыядзе 1928-1937 гадоў Беларусь давала 2,4% валавое народнае вытворчасьці СССР, атрымоўваючы ў той-жа час толькі 1% валавых капіталаўкладаў, прыводзіць на думку, што паважная частка капіталу, награмаджанага ў Беларусі, была забіраная ад яе й укладаная ў нейкім іншым раёне Савецкага Саюзу.

Табліца I

Удзел Беларускай ССР у насельніцтве, валавой вытворчасьці й капіталаўкладах Савецкага Саюзу

Пэрыяд	Насельніцтва	Валавы даход	Капітальныя ўклады
1928-1937	3,2	2,4 x/	1,0
1941 /плян/	4,8	2,3	1,0
1951-1952	3,9	1,9	2,8

x/ у 1937 г.

Крыніцы: Дадатак, табліцы А-I, А-2.

Сутнасьць эканамічнае палітыкі маскоўскага ўраду ў дачыненьні да Беларусі відавочная з таго факту, што ў пэрыядзе 1928-1937 гадоў валавыя капіталаўклады ў прамысловасьць складалі ў Беларусі 154 рублі на галаву насельніцтва, у той час, як у СССР у цэлым - 489 рублёў на галаву[17].

У пасьляваенным пэрыядзе, як відаць з табліцы I і А-2, удзел Беларусі ў валавых капіталаўкладах Савецкага Саюзу ладне пабольшыўся, хоць удзел яе ў валавай вытворчасьці зьменшыўся. Гэтыя зьмены нядвузначна паказваюць на вынікі другое сусьветнае вайны ды на патрэбу перабудовы эканомікі Беларусі. Аднак, як паказвае табліца I, капіталаўклады на галаву насельніцтва ўсё яшчэ большыя ў СССР у цэлым, як у Беларусі.

Усе гэтыя факты насоўваюць вывад, што маскоўскі ўрад ня кіраваўся выключна прынцыпамі афіцыяльнае эканамічнае тэорыі разьмешчаньня прамысловасьці ў сваіх пастановах адносна індустрыялізацыі Беларусі. Гэты вывад асабліва адносіцца да першага й другога прынцыпаў, пералічаных на пачатку гэтага артыкулу. Але таму, што мы прызналі магчымасьць існаваньня супярэчнасьцяў між гэтымі прынцыпамі, разгледзім цяпер, ці прычынай няпрытрымліваньня гэтых двух прынцыпаў Масквой зьяўляецца ясны канфлікт з двумя апошнімі прынцыпамі ў спэцыфічных умовах беларускае эканомікі. Інакш кажучы, разгледзім, ці ў гэтым выпадку палітычныя меркаваньні ўступілі чыста эканамічным, бо зусім відавочна, што першыя два прынцыпы тэорыі разьмешчаньня прамысловасьці маюць больш палітычны характар, у той час як два апошнія - больш эканамічны.

Характэрныя рысы беларускай эканомікі наступныя: Беларусь - краіна параўнальна бедная натуральнымі рэсурсамі. Торф зьяўляецца асноўнай крыніцай энэргіі, і запасы яго вялізарныя. У краіне дасюль ня знойдзена эканамічна годных да эксплятацыі залежаў зялезнае руды, вугалю ці каляровых мэталяў. Ёсьць залежы фасфарыту, вапняку, сілікату й гліны; нядаўна былі знойдзены паважныя залежы каменнае солі. Некаторыя рэкі годныя для гідраэлектрычнае эксплятацыі. Лясы складаюць паважную частку эканамічнага багацьця Беларусі. Інтэнсыўнае земляробства спэцыялізуецца ў вытворчасьці важных прамысловых сыравінаў, як бульба, лён каноплі; паважным дзейнікам зьяўляецца таксама жывёлагадоўля.

Беларуская прамысловасьць здаўна аснована на мясцовай сыравіне. Прыступім цяпер да разгляду найбольш важных відаў яе.

Годныя да эксплятацыі залежы торфу ў Беларусі ацэньваюцца на 2,700 міліёнаў тонаў[18]. Толькі гадавы прырост гэтых залежаў можа поўнасьцяй забясьпечыць палівам беларускую прамысловасьць[19]. Аднак, ня гледзячы на ладны ўзрост здабычы торфу за апошнія 30 гадоў /гл. дадатак, табліца А-5/, яго ўсё яшчэ не стае для пакрыцьця патрэбаў Беларусі. Удзел торфу ў балянсе паліва рэспублікі наступны:

1931	-	39 %
1937	-	44 %
1955	-	53 %[20]

Акрамя торфу ўжываецца як паліва дрэва, хоць гэта відавочнае марнаваньне рэсурсаў /дрэва куды больш эканамічна карыснае як сыравіна для хімічнае й папяровае прамысловасьці/. Агулам, толькі 75% попыту беларускае вытворчасьці забясьпечваецца мясцовым палівам; астатнія 25% трэба імпартаваць[21]. Гэтак, каля 20% паліва, спажыванага электрастанцыямі, усё яшчэ імпартуецца.[22]

Гэтыя факты прыводзяць да высновы, што разьвіцьцё беларускае тарфяное прамысловасьці ўсё яшчэ знаходзіцца ў незадавальняльным стане, ды што ейнае разьвіцьцё да патрэбнай ступені дало-б паважную эканомію капіталу, які траціцца цяпер на ўвоз паліва зь іншых частак СССР.

Варта таксама адцеміць, што перад вайной навукоўцы Беларускае Акадэміі Навук распрацавалі эканамічна выгадны мэтад выпрацоўкі з торфу бэнзіны й іншых маторных паліваў простым і танным працэсам гідрагенізацыі[23]. У 1941 годзе была пачатая будова хвабрыкі для перагонкі торфу ў бэнзіну, але яна была разбураная падчас вайны[24]. Пасьля вайны нічога ня чуваць аб гэтым шматабяцаючым прадпрыемстве.

Былы старшыня Дзяржпляну СССР Мікалай Вазьнесенскі ў сваёй прамове сказаў, што плян чацьвертае пяцігодкі прадбачвае

> "ліквідацыю ў працэсе адбудовы прамысловасьці й транспарту пацярпеўшых раёнаў РСФСР, Украінскай, Беларускай, Літоўскай, Малдаўскай, Латыскай, Эстонскай і Карэла-Фінскай ССР недахопаў даваеннага разьмешчаньня прамысловасьці, маючы на ўвеце адбудову й разьвіцьцё ўва ўсіх гэтых раёнах собскай энэргетычнай і паліўнай базы, прамысловасьці будаўнічых

матарыялаў і вытворчасьці масавых вырабаў лёгкае й харчовае прамысловасьці"[25].

Што датычыцца Беларусі, дык да гэтага часу як паліўная, так і энэргетычная база яшчэ далёка ня поўнасьцяй разьвітая. Мы бачылі гэта на прыкладзе тарфяное прамысловасьці. Гэткі-ж самы стан наглядаецца і ў выпрацоўцы электраэнэргіі. У 1952 годзе ў Беларусі на галаву насельніцтва прыпадала толькі 118 кіляватгадзінаў[26], у той час, як у СССР у цэлым прыпадала 627 кіляватгадзінаў[27]. Некаторы прагрэс наглядаецца ў разьвіцьці беларускае прамысловасьці будаўнічых матарыялаў, але ўсё-ж вытворчасьць аконнага шкла ў 1955 годзе была ўсё яшчэ ніжэйшай за ўзровень 1945 году на 14%[28].

Лёгкая прамысловасьць, якая выробляе тавары шырокага ўжытку, можа служыць цікавым прыкладам практычнае палітыкі разьмешчаньня прамысловасьці. Перад вайной Беларусь мела паважную трыкатажную й вопратачную прамысловасьць. На думку савецкіх аўтараў, ейная прадукцыя была шмат вышэйшай за патрэбы беларускага нутранога рынку, і таму больш за палавіну яе вывозілася ў іншыя раёны Савецкага Саюзу. З другога боку, сыравіна для гэтае галіны прамысловасьці ўвозілася ў Беларусь звонку. "З эканамічнага гледзішча гэткі стан рэчаў ня быў апраўданым", - кажа Р.С.Лівшыц[29]. Пасьля вайны прадукцыя гэтае галіны прамысловасьці была на шмат зьменшаная - з тым, каб пакрываць патрэбы толькі мясцовага рынку. Падобны лёс спаткаў беларускую баваўняна-тэкстыльную прамысловасьць. Як відаць з табліцы А-6, перад вайной прадукцыя баваўняных вырабаў у Беларусі разьвілася даволі шырака; аднак ад канца вайны гэтая прадукцыя зьменшылася ў 3 разы.

Гэтыя паважныя зьмены ў разьмешчаньні тэкстыльнае й вопратнае прамысловасьці афіцыяльна апраўдваліся высокімі коштамі транспарту й меркаваньнямі адлегласьці рынку. Лягічна можна дапусьціць, што можа не аплачвацца імпартаваць баваўняныя ніткі з аддаленых раёнаў у Беларусь, хоць кажны знае, што баваўняна-тэкстыльная прамысловасьць маскоўскае зоны ці, прыкладам, польская, працуюць зусім даходна на імпартаванай бавоўне. Але запраўды дзіўным і супярэчным усякай лёгіцы зьяўляецца факт, што мясцовая ільняная прамысловасьць Беларусі, якая мае за базу танную й багатую мясцовую выравіну, не разбудоўваецца дастаткова на

месцы баваўнянае індустрыі. У сучасны мамэнт 37 льняных камбінатаў пакрываюць толькі 45% патрэбаў. Вялікі аршанскі камбінат прадукуе толькі палатняныя вырабы[30].

Да гэтага тэорыя разьмешчаваньня прамысловасьці ў блізіні рынкаў збыту ня была поўнасьцяй застасаваная пры пераменах у беларускай прамысловасьці ў пасьляваенным пэрыядзе. Вынікам патройнага зьменшаньня вытворчасьці баваўняных вырабаў было вельмі няроўнае разьмешчаньне гэтае галіны прамысловасьці ў Беларусі ў параўнаньні з СССР у цэлым. Гэтак у 1955 годзе вытворчасьць баваўняных тканінаў на галаву насельніцтва ў Беларусі складала толькі 0,4 мэтра ў параўнаньні з 29,5 мэтра ў СССР у цэлым[31]. З другога боку, выраб скуранога абутку ў цэлым пасьляваенным пэрыядзе быў няроўным на карысьць Беларусі: вытворчасьць абутку ў 1955 годзе складала там 1,55 пары на галаву насельніцтва, у той час калі ў цэлым СССР - 1,37 пары[32]. З гэтага вынікае, што Беларусь мусіла ўвозіць баваўняныя тканіны і вывозіць скураны абутак.

Але праўдападобна найбольш цікавым з гледзішча застасаваньня тэорыі разьмешчаньня зьяўляецца разьвіцьцё машынабудаўнічай прамысловасьці ў Беларусі. Вышэй ужо мы адцемілі, што рэспубліка ня мае натуральных умоваў для разьвіцьця мэталюргіі; усе мэталі трэба імпартаваць з Расеі й Украіны. Ня гледзячы на гэта, на працягу другое пяцігодкі /1933-1937/ у Беларусі была створаная мэталяапрацоўчая прамысловасьць. У 1932 годзе наступная пастанова маскоўскага ўраду была фармальна зацьверджаная ўрадам БССР:

> "Па мэталяапрацоўчай прамысловасьці забясьпечыць разьвіцьцё ў разьмерах і напрамку задаваленьня патрэб народнай гаспадаркі БССР і часткова сумежных раёнаў іншых саюзных рэспублік у паасобных відах машына-будаўніцтва /тарфяное, дарожнае, мэльярацыйнае, будаўнічыя мэханізмы, камунальнае абсталяваньне, спэцыяльныя віды сельскагаспарадчых машын, дакладная мэханіка і інш." 33

Як вынікае з гэтага сьпіску, беларуская машынабудаўнічая прамысловасьць пачалася ад вырабу машынаў для спэцыялізаваных мясцовых рынкаў. Гэта супадае з тэорыяй разьмешчаньня прамысловасьці.

У запраўднасьці, падчас другое пяцігодкі Беларусь увозіла

з СССР дакладна столькі машынаў, колькі яна вывозіла туды сваіх. Як імпарт, так і экспарт машынаў у Беларусі складаў 0,7% усяго абароту машынаў у СССР[34]. У 1938 годзе для свае машынабудаўнічае прамысловасьці Беларусь мусіла імпартаваць 5,6% мэталяў, спажываных машынабудаўнічай прамысловасьцяй СССР у цэлым[35].

Аднак у пасьляваенным пэрыядзе адбыліся паважныя зьмены ў беларускай машыннай прамысловасьці. Агульнае разьвіцьцё машынабудаўнічай прамысловасьці працягвалася. Параўнаньне ў дадатку табліцы А-4 з А-3 паказвае на ейнае ўзрастаючае значаньне; удзел машынабудаўнічае прамысловасьці ў валавой вытворчасьці ўсяе беларускае прамысловасьці пабольшваўся наступна: у 1932 г. - 8 %, у 1940 - 15 %, у 1950 - 30 %, у 1955 - 70 %.

У пасьляваенным пэрыядзе ў Беларусі зьявіліся наступныя новыя галіны машынабудаўнічае прамысловасьці: аўтамабільная, трактарная, лякамабільная, шарыка-падшыпнікавая, матацыклевая, самакатная, станкабудаўнічая, дарожныя й будаўнічыя машыны[36]. Менскі Аўтамабільны завод /МАЗ/ пачаў працу ў 1947 годзе, цяпер ён выпускае пяці- і сямітонныя грузавыя аўтамашыны ды вялічэзныя 25-тонныя самазвалы - агульнай колькасьцяй амаль 13.000 на год /гл. дадатак, табліца А-4/. Менскі Трактарны завод /МТЗ/ пачаў працу ў 1950 годзе, цяпер ён выпускае больш за 18.000 трактараў "Беларусь" на год /гл. дадатак, табліца А-4/. Аднак ня гледзячы на гэты надзвычайны рост машынабудаўнічае прамысловасьці, у канцы 40-х гадоў Беларусь мела няспрыяльны балянс у гандлі машынамі: яна ўвозіла больш машынаў, чымся вывозіла[37]. Пазьней, падчас пятае пяцігодкі /1951-1955/, палажэньне магло зьмяніцца, аднак аб гэтым няма даступных дадзеных.

Новыя галіны машынабудаўнічае прамысловасьці, якія зьявіліся пасьля вайны ў Беларусі, былі разьмешчаныя тут ня зусім з мэтай пакрыцьця мясцовых патрэбаў. Вялічэзныя 25-тонныя аўтамабілі "МАЗ-525" рэдка могуць ужывацца ў Беларусі, іх ужываюць галоўным чынам на вялікіх новабудоўлях, як гідраэлектрастанцыі на Волзе або Енісеі. З гэтага вынікае, што яны вырабляюцца ў Беларусі бадай выключна для экспарту ў іншыя раёны СССР, уключна з далёкім Сібірам. Гэта відавочна абцяжвае транспарт і спрычыняецца да высокіх цэнаў выпусканае прадукцыі. Да гэтага, "МАЗ" вельмі вузка спэцыялізаваны. Гэта адзіны завод СССР, які

выпускае гэткія вялічэзныя самазвалы. Дзеля таго, што ў Беларусі няма прадпрыемстваў вырабу бляхі, ні іншае дапаўняльнае прамысловасьці большых памераў, Менскі Аўтамабільны Завод зьяўляецца галоўным чынам толькі мантажным; амаль усе дэталі ягоных аўтамабіляў вырабляюцца ў іншых частках СССР і пасьля прывозяцца для мантаваньня ў Беларусь[38]. Гэта йзноў-жа абцяжвае чыгунку ды падымае кошты вытворчасьці аўтамабіляў.

Калі-б Беларусь была незалежнай дзяржавай, можна было-б меркаваць, што кіруючыся нацыянальнымі інтарэсамі, яна прыйшла-б да высноваў, што вытворчасьць гэткіх спэцыялізаваных вялікіх самазвалаў на экспарт эканамічна аплачваецца. Але дзеля таго, што савецкая эканоміка плянуецца цэнтрам для Савецкага Саюзу ў цэлым і ў запраўднасьці ніхто не клапоціцца аб утрыманьні балянсу ў гандлі паміж саюзнымі рэспублікамі, наўрад ці пабудова ў Беларусі спэцыялізаванага мантажнага аўтамабільнага заводу мела служыць эканамічным інтарэсам. Аднак яго можна лічыць выгадным для Беларусі, таму што ён дае магчымасьць поўнага выкарыстаньня ейных рэсурсаў ды павышае ступень ейнае індустрыялізацыі; аднак для Савецкага Саюзу ў цэлым пабудова гэтага прадпрыемства ў Беларусі выявілася праўдападобна эканамічна нявыгаднай. Магчыма, што гэта было памылкай маскоўскіх плянавікоў.

Менскі Трактарны Завод зьяўляецца таксама вузка спэцыялізаваным прадпрыемствам. Гэта, як і МАЗ, мантажнае прадпрыемства. Ён выпускае лёгкія земляробскія трактары, якія маюць вялікі попыт ува ўсім Савецкім Саюзе, але таксама вельмі падходныя для беларускага інтэнсыўнага земляробства. Разьмешчаньне гэтае галіны прамысловасьці зьяўляецца бяз сумлеву куды больш выгадным з эканамічнага гледзішча, чымся ў выпадку 25-тонных самазвалаў. Аднак, з прычыны нястачы лёгкіх трактараў у СССР, пераважная бальшыня гэтых трактараў вывозіцца з рэспублікі, хоць мясцовая сельская гаспадарка параўнальна слаба мэханізаваная. У 1954 годзе ў СССР у цэлым прыпадала 6,5 трактара аднолькавае цягавае сілы на 1.000 гэктараў ворнае зямлі, а ў Беларусі - толькі 5,8 трактара[39].

З прыкладу беларускае аўтамабільнае й трактарнае прамысловасьці можна зрабіць высноў, што трэйці й чацьверты прынцыпы раней успомненай тэорыі разьмешчаньня прамысловасьці не заўсё-

ды пасьпяхова прыстасоўваюцца ў практыцы СССР. У некаторых выпадках выбар месца ўдачны, у іншых - не.

Выглядае, што запраўдныя прычыны няўдачнага, г.зн. эканамічна марнатраўнага выбару месца, зводзяцца да дзьвюх: а/ нязвычайна вялікія памеры Савецкага Саюзу і б/ срогая цэнтралізацыя ў эканамічным плянаваньні й прыйманьні пастановаў. Няўхільным вынікам завузкае спэцыялізацыі вытворчасьці ўва ўмовах краіны такіх вялікіх памераў зьяўляюцца высокія кошты транспарту й вытворчасьці. Варта тут адцеміць, што існаваньне ў СССР гэтак званых "эканамічных раёнаў" не павінна нас уводзіць у зман. У Савецкім Саюзе існуе I3 такіх раёнаў, і тэарэтычна яны маюць быць у большай ці меншай меры самавыстарчальнымі і незалежнымі адзін ад другога. Калі-б гэты тэарытычны прынцып быў калі-небудзь зрэалізаваны, дык гэта бяз усякага сумлеву вельмі-б зьнізіла кошты транспарту і вытворчасьці. Але ўзапраўднасьці эканамічнае значаньне гэтых раёнаў было да нядаўна вельмі абмежаванае. Гэтак, прыкладам, з I000 нормаў вытворчасьці розных прамысловых прадуктаў, устаноўленых у гадавых эканамічных плянах СССР, данядаўна толькі 40 плянавалася таксама для эканамічных раёнаў, а рэшта - для Савецкага Саюзу ў цэлым[40]. Дзеля таго, што нормы вытворчасьці цесна зьвязаныя з нормамі спажыцьця, можна дапушчаць, што агульныя балянсы вытворчасьці й спажыцьця ў рэгіянальным разрэзе плянаваліся таксама толькі для 40 прадуктаў. Рэшта балянсаў была плянаваная й рэалізаваная цэнтралізаваным спосабам для Савецкага Саюзу ў цэлым, у выпадку патрэбы перавозячы прадукты за тысячы кілямэтраў.

Срогая цэнтралізацыя плянаваньня й прыйманьня пастановаў спрычыняецца да марнатраўства й злаўжываньня. Возьмем за прыклад Менскую самакатную хвабрыку. Гэта зноў-жа вузка спэцыялізаванае прадпрыемства зь вельмі-ж грамадзкай сыстэмай каапэраваньня з дапаўняльнымі прадпрыемствамі ў ваддаленых месцах Савецкага Саюзу. Хвабрыка атрымоўвае званкі й залівачкі для сваіх самакатаў з Харкава, аддаленага амаль больш за тысячу кілямэтраў ад Менску; паветраныя помпы й сёдлы прывозяцца з Масквы, рэфлектары - зь Вялікіх Лукаў і г.д.[4I]. Усе гэтыя дэталі самакатаў могуць быць выробленыя ў Беларусі меншым коштам, але пастановы аб разьмешчаньні прамысловасьці прыймаюцца цэнтрам, і

высокапастаноўленыя бюракраты ў Маскве або ня ведаюць аб гэтым марнатраўстве, або адносяцца да яго абыякава. Але ў кастрычніку 1950 году Менскі самакатны завод ня мог адтранспартаваць гатовых самакатаў таму, што харкаўскія вытворцы залівачак /аліўнікаў/ ня выканалі на час сваіх забавязаньняў[42].

Але на гэтым яшчэ не канчаецца марнатраўства, спрычыненае цэнтралізаваным кіраўніцтвам. Пастановы цэнтру ў разьмешчаньні вытворчасьці папаўняюцца яшчэ цэнтралізаванымі замаўленьнямі, што яшчэ больш пабольшвае страты. У 1950 годзе сярэдняя адлегласьць перавозкі прадукцыі Менскага самакатнага заводу да месца збыту складала 1.738 км, прычым частка ягонае прадукцыі была высыланая аж на Далёкі ўсход Савецкага Саюзу, які знаходзіцца каля 10 тысяч кілямэтраў ад Менску. У той-жа самы час, Беларусь імпартавала з Расеі й іншых рэспублікаў СССР 50% усіх спажываных ёю самакатаў[43].

Падобнае палажэньне пануе ў беларускай лясной прамысловасьці. У 1952 годзе беларускі дэпутат жаліўся ў Вярхоўным Савеце СССР, што ў папярэднім годзе зь Беларусі было вывезена 1.550 вагонаў дрэва ў Расею й іншыя рэспублікі, і ў той-жа час у Беларусь было ўвезена з Расеі й іншых рэспублікаў 1.800 вагонаў такога-ж дрэва[44]. Гэтая скарга зусім не палепшыла сытуацыі. У 1955 годзе іншы дэпутат зноў паказаў на аналягічны прыклад: беларускае дрэва вывозілі ў Карэла-Фінскую ССР, і гэтакае-ж дрэва з Карэла-Фінскае ССР увозілі ў Беларусь[45]. Інакш кажучы, у гэтых выпадках вынікам цэнтралізацыі сыстэмы разьмеркаваньня было няпрыстасаваньне прынцыпу тэорыі разьмешчаньня прамысловасьці, які гаворыць, што вытворчасьць мусіць служыць мясцовым рынкам, паколькі гэта толькі магчыма.

Агулам, мы прыходзім да высноваў, што разгляд прыстасаваньня савецкае тэорыі разьмешчаньня прамысловасьці ў васобным выпадку эканомікі Беларускае ССР паказвае, што гэтая тэорыя не заўсёды ўжываецца ў практыцы.

Статыстычны дадатак

Зацемка ў справе крыніцаў

Ніжэй пададзеныя статыстычныя табліцы пабудаваныя на аснове дадзеных, узятых із шматлікіх афіцыяльных савецкіх крыніцаў. Каб пазьбегчы паўтораў доўгіх загалоўкаў крыніцаў у кажным паасобным выпадку, аўтар ужывае лікавы код. Лічнік азначае парадкавы нумар назову крыніцы, сьпісак якіх пададзены ў канцы; назоўнік азначае бачыну крыніцы, зь якое ўзятыя тыя ці іншыя дадзеныя. Прыкладам, I3/97 азначае: Вопросы экономики, I948, №5, бач. 97.

Табліца А-I

Валавая народная вытворчасьць Беларусі й СССР

/у цэнах I926/27 гг./

Гады	Валавая выт. бел. эканомікі /у мільёнах руб./	Выт. прамысл. і сельск. гасп. СССР /у мільярдах руб./	Удзел Беларусі ў СССР /у %%/
I927	889,4	35,2	2,5
I932	I.9I3,5	54,9	3,3
I937	2.638,3	II5,6	2,3
I952	6.403,6	337,I	I,9

Крыніцы: 4/2I3; 30/8II; I4/44; I6/74; 33/270; 34/57; 32/47.

Табліца А-2

Валавыя капіталаўклады ў беларускую эканоміку

/у мільёнах рублёў, цэны дадзенага году/

Гады	Валавыя ўклады ў БССР	Удзел Беларусі ў валавых укладах СССР /у %%/
I928-I937	I.900,0	I,0
I94I /плян/	384,9	I,0
I946	I.0I7,4	- -
I946-I950	6.950,0	2,8
I95I-I952	6.962,0	2,8

Крыніцы: I4/45; II/7I, 4I0; I2/243; I8/3I4; 20/485, 65I; 22/53, II6; 35/56, I29.

Табліца А-3

Валавая вытворчасьць прамысловасьці Беларускай ССР

/у мільёнах рублёў, цэны I926/27 гг./

Год	Вытворчасьць	Год	Вытворчасьць
I9I3	89	I940[б]	2.348
I928	I84	I946	728
I932	I.0I8	I950	2.700
I937	I.926	I952	3.522
I940[а]	2.046	I955	5.565

а. у межах перад I939 годам, б. у межах пасьля I939 году.

Крыніцы: 3/I0; 8/202; I3/97, 99; I7/I827; I8/3I4; 32/5I.

Табліца А-4

Вытворчасьць машынабудаўнічае прамысловасьці БССР

I. Валавая вытворчасьць мэталяапрацоўчае й машынабудаўнічае прамысловасьці

/у мільёнах рублёў, цэны I926/27 гг./

Год	Вытворчасьць	Год	Вытворчасьць
I9I3	7	I940[б]	350
I928	I5	I945	I53
I932	8I	I950	8I0
I937	233	I952	I.225
I940[а]	338	I955	3.890

II. Вытворчасьць мэталяапрацоўчых станкоў, дэталяў

I937	5.383
I950[о]	4.325

III. Вытворчасьць аўтамабіляў, дэталяў

I940	0
I950	2,400
I954	I0,800
I955	I2,900

IУ. Вытворчасьць трактараў, дэталяў

I950°	5.000
I950	40
I954	I4.300
I955	I8.300

а. у межах перад I939 годам, б. у межах пасьля I939 г.
о. паводля пляну.

Крыніцы: 9/I65; II/4I0; I3/99; I8/3I4, 233; 23/58; 32/76, 77.

Табліца А-5

Вытворчасьць асноўных прамысловых галінаў Беларускае ССР

Год	Торф /у I.000 т/	Электрычнасьць /у мільёнах кіляват/	Цэмэнт /I.000т/	неапр. сталь /I.000т/	вальцаваная сталь /I.000т/
I9I3	I4	4,2	33	0,0	0,0
I928	I58	39,0	н.д.	0,2	0,0
I932	834	н.д.	н.д.	н.д.	н.д.
I937	2.445	430,0	н.д.	н.д.	н.д.
I940	3.I70	460,0	200	5,0	4,0
I946	I.490	н.д.	н.д.	н.д.	н.д.
I950	3.645	662,4	342	5,0	7,0
I952	3.975	900,0	398	н.д.	н.д.
I955	6.096	н.д.	545	52,0	3I,0

н.д. = няма дадзеных.

Крыніцы: I3/97; 9/I65; I0/45; I8/3I5; I4/46; 8/203; I7/I828; 6/I06; 22/52, II5; 32/64, 66, 80.

Табліца А-6

Вытворчасьць тавараў шырокага ўжытку ў Беларускай ССР

Гады	Баваўняныя вырабы /у мільёнах мэтраў/	Скураны абутак /I.000 параў/
I9I3	I,2	н.д.
I928	4,6	22I[x]
I93I	I6,9	н.д.
I940	9,I	9.849
I950	I,6	7.507
I954	3,I	II.I29
I955	3,2	I2.429

х. толькі дзяржаўная прамысловасьць,
н.д. = няма дадзеных.

Крыніцы: 3/I4-I5; 7/I5; 32/84, 87.

Табліца А-7

Удзел вытворчасьці беларускае прамысловасьці ў валавай вытворчасьці СССР
/у працентах/

Від вытворчасьці	I937-I940	I952-I955
Валавая вытворчасьць прамысловасьці	2,0	I,25
Электрычнасьць	0,9	0,8
Торф	I0,2	II,8
Цэмэнт	3,0	2,4
Льняное валакно	I2,5	н.д.
Дрэва	4,0	н.д.
Фанера	36,2	I4,0
Папера	6,3	н.д.
Сярнічкі	28,9	I7,0
Сьпірт	8,3	7,0
Валавая вытворчасьць машынабудаўніцтва	I,0	I0,0
Цяжкія й лёгкія грузавыя аўтамабілі	0,0	3,9
Трактары	0,0	II,2
Мэталяапрацоўчыя станкі	II,I	I2,0
Баваўняныя вырабы	0,2	0,05
Льняныя вырабы	6,I	н.д.
Скураны абутак	4,6	4,5

н.д. = няма дадзеных

Крыніцы: I8/233, 3I5; I7/I827; 20/664-669; I3/97; I6/I27; 32/47, 70, 7I, 76, 77, 79, 84, 87; 36/490; 37/I27.

Крыніцы

I. Академия Наук БССР. Материалы мартовской сессии Академии Наук БССР /I2-I3 марта I942 г./, Казань, I942.

2. "Аб другой пяцігодцы БССР", Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і Генэральнага Камітэту КП/б/Б; ДВБ, I932.

3. Кіраўніцтва Народна-Гаспадарчага Вучоту БССР. "Матар'ялы па выкананьню пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі і культурнага будаўніцтва БССР", выпуск I /I928/29-I93I гг./, Менск, I932.

4. БССР, Центральное Статистическое Управление. Белорусская ССР в цифрах: I9I9-I929, Менск, I929.

5. Сэктар Народна-Гаспадарчага Вучоту Дзяржпляну. БССР, эканоміка-статыстычны даведнік, Менск, I93I.

6. Статыстычны даведнік на I928 год, Год выданьня 7, выданьне Цэнтральнай Статыстычнай Управы БССР, Менск.

7. Высший Совет Народного Хозяйства БССР. Промышленность БССР в диаграммах и таблицах, Менск, I928.

8. "Страны мира", Ежегодный справочник, Масква, I946.

9. ЦУНХУ Госплана СССР. Социалистическое строительство Союза СССР /I933-I938 гг./, Статистический сборник, Масква, I939.

I0. "Заседания Верховного Совета СССР /Вторая сессия/", Стенографический отчет, Масква, I946.

II. "Заседания Верховного Совета СССР /Первая сессия/", Стенографический отчет, Масква, I946.

I2. "Заседания Верховного Совета СССР /Третья сессия/", Стенографический отчет, Масква, I947.

I3. Вопросы экономики, Масква, I948, №5.

I4. В.В.Бедзін, І.Шапавалаў, М.Т.Лынькоў. Савецкая Беларусь, ДВБ, Менск, I938.

I5. "Шостая сэсія Вярхоўнага Савету БССР 2I-24 сакавіка I944 г.", Стэнаграфічная справаздача, Менск, I946.

I6. Академия Наук БССР, Институт Экономики. Экономическая БССР, Очерки экономической географии, Менск, I953.

I7. Большая Советская Энциклопедия, том "СССР", Масква, I948

I8. Р.С.Лившиц. Очерки по размещению промышленности СССР, Масква, I954.

I9. ЦСУ СССР. Итоги десятилетия Советской власти в цифрах, I9I7-I927, Масква, I927.

20. Государственный план развития народного хозяйства СССР на I94I год, Приложения к постановлению СНК СССР и ЦК ВКП/б/ №I27 от I7 января I94I г. /Не подлежит оглашению/.

2I. Наркомат Тяжелой Промышленности, Институт Промышленно-Экономических Исследований. Принципы географического размещения тяжелой промышленности во Второй пятилетке, Масква, I932.

22. "Заседания Верховного Совета СССР /Пятая сессия/", Стенографический отчет, Масква, I953.

23. "Заседания Верховного Совета СССР /Третья сессия/", Стенографический отчет, Масква, I952.

24. С.Сулькевич. Население СССР, Масква, I939.

25. Л.Я.Берри. Специализация и кооперирование в промышленности СССР, Масква, I954.

26. Н.Н.Баранский. Экономическая география СССР, Масква, I954.

27. Б.И.Брагинский, Н.С.Коваль. Организация планирования народного хозяйства СССР, Масква, I954.

28. "Заседания Верховного Совета СССР четвертого созыва /Четвертая сессия/", Стенографический отчет, Масква, I955.

29. Eugen Freiherr von Engelhardt, Weissruthenien - Volk und Land, Berlin, I943.

30. Малая Советская Энциклопедия, 2-ое выд., том I, Масква, I937.

31. Chicago University, Division of Social Studies, Aspects of Contemporary Belorussia, New Haven, I955.

32. ЦСУ СССР. Народное хозяйство СССР, Статистический сборник, Масква, I956.

33. П.И.Лященко. История народного хозяйства СССР, том III, Масква, I956.

34. Д.Аллахвердян. Национальный доход СССР, Масква, I952.

35. К.Н.Плотников. Бюджет социалистического государства, Масква, I948.

36. Большая Советская Энциклопедия, 2-е выд., том IУ, Масква, I950.

37. S. Kabyš, Belorussian Industry and the Sixth Five-Jear Plan, "Belorussian Review", Institute for the Study of the USSR, Munich, No.3, I956.

Бібліяграфічныя зацемкі

I. Р.С.Лившиц. Очерки по размещению промышленности СССР, Масква, I954, б.I3.

2. Тамсама, бач. 47, 56.

3. Гл. Л.Я.Бэрри. Специализация и кооперирование в промышленности СССР, Масква, I954, бб. II8-I2I.

4. Тамсама, б. I2I.

5. Нельга браць паважна голасу беларускіх дэпутатаў у Вярхоўным Савеце СССР, дзе падчас дэбатаў над гадавым бюджэтам ім могуць пазволіць папрасіць дадатковых субсыдыяў на адну школу ці шпіталь.

6. В.В.Бедзін, І.Шапавалаў, М.Т.Лынькоў. Савецкая Беларусь, Менск, I938, б. 40.

7. Гл. дадатак, табліца А-7.

8. В.В.Бедзін ... цыт. праца, б.98.

9. Вопросы экономики, Масква, I948, №5, б. 98.

I0. Заседания Верховного Совета СССР /первая сессия/, стенографический отчет, Масква, I946, б. 278.

II. Дадатак, табліца А-7.

I2. Eugen Freiherr von Engelhardt. Weissruthenien - Volk und Land, Berlin, I943, S.32I.

I3. Cf. Chicago University. Aspects of Contemporary Belorussia, New Haven, I955, p. 362.

I4. С.Сулькевич. Население СССР, Масква, I939, б. 29.

I5. Гл. артыкулы аўтара "Статыстыка насельніцтва Украіны у I940-I956" і "Насельніцтва украінскіх гарадоў" у "Вперед", Мюнхэн, №№ I0/7I/ і II/72/, кастрычнік і лістапад I956.

I6. Chicago University. Aspects of Contemporary Belorussia, p. 363.

I7. Большая Советская Энциклопедия, 2-ое выд., I950, т. 4, б. 489; К.Н.Плотников. Бюджет социалистического государства, Масква, I948, б. 208.

I8. АН БССР. Материалы мартовской сессии Академии Наук БССР, Казань, I942, б. 98.

I9. Н.Н.Баранский. Экономическая география СССР, Масква, I954, б.292.

20. Народный комиссариат тяжелой промышленности. Принципы географического размещения тяжелой промышленности во второй пятилетке. Масква, I932, б. II8; Р.С.Лившиц, цыт. праца, б. 234; С.Кабыш у Belorussian Review, Мюнхэн, №3, б. I24.

2I. Р.С.Лифшиц, цыт. праца, б. 3I5.

22. Тамсама, б. 3I5.

23. АН БССР. Материалы мартовской сессии..., б. II5.

24. Шостая сэсія Вярхоўнага Савету БССР, 2I-24.III.I944, Стэнаграфічная справаздача, Менск, I946, б. I0.

25. Заседания Верховного Совета СССР /первая сессия/, стенографический отчет, Масква, I946, б. 7I.

26. Дадатак, табліца А-5.

27. ЦСУ СССР. Народное хозяйство СССР, Масква, I956, бач. I7 і 7I.

28. С.Кабыш у Belorussian Review, №3, б. I27.

29. Р.С.Лившиц. цыт. праца, б. I94; гл. таксама б.234.

30. С.Кабыш у Belorussian Review, №3, б. I30.

3I. ЦСУ СССР. Народное хозяйство ..., б. I8, 84.

32. Тамсама, б. I8, 87.

33. Аб другой пяцігодцы БССР, Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэту КП/б/Б, Менск, I932,б.5.

34. Народный комиссариат тяжелой промышленности. Принципы..., б. I78, 273.

35. Р.С.Лившиц, цыт. праца, б. I78, 273.

36. Тамсама, б. 3I4.

37. Вопросы экономики, I948, №5, б. I00.

38. Л.Я.Берри, цыт. праца, б. 300.

39. ЦСУ СССР. Народное ..., б. I04, I45.

40. Б.И.Брачинский и Н.С.Коваль. Организация планирования народного хозяйства СССР, Масква, I954, 2I6-2I7.

4I. Л.Я.Берри, цыт. праца, б. 335.

42. Тамсама, б. I52.

43. Тамсама, б. 2I8.

44. Заседания Верховного Совета СССР /третья сессия/, стенографический отчет, Масква, I952, б. 59.

45. "Известия", Масква, 5.II.I955.

Мікола Куліковіч

ДА ПЫТАНЬНЯ ДЭГРАДАЦЫІ ВЯДУЧАГА ТЭАТРУ БССР

Перад кастрычніцкімі сьвятамі 39-годзьдзя бальшавіцкай рэвалюцыі, калі звычайна савецкі друк узмоцнена прапагандуе свае перамогі й дасягненьні, у Менскай сталічнай газэце "Зьвязда" - воргане ЦК камуністычнай партыі Беларусі, - зьявіўся артыкул народнага артыстага БССР Д.Арлова пад назовам "Рэпутацыя абавязвае", дзе аўтар паддае сур'ёзнай й жорсткай крытыцы дзейнасьць вядучага рэспубліканскага тэатру імя Я.Купалы. Аснаўныя абвінавачаньні І-га Бел. Дзярж. драмат. тэатру /БДТ І - гэтую скарочаную назву я захаваю ў далейшым/ такія:

> "Сярод спэктакляў / за апошнія гады - М.К./ не аказалася такога, які прымусіў-бы гаварыць аб сабе, як аб зьяве вялікага мастацтва... У тэатры заглохла барацьба за ансамбль, за высокую сцэнічную культуру... калектыў ня турбуе сябе пошукамі сцэнічных сяродкаў, якія адпавядалі-б прыродзе таго ці іншага драматурга... Для большасьці спэктакляў тэатру зрабілася тыповай неакрэсьлянасьць хварбаў, расплыўчатасьць. Усё больш няроўным становіцца й акторскае выкананьне... Нямала ў тэатры актораў, ігра якіх пазбаўлена душы... У іх выпрацаваўся аўтаматызм выкананьня, яны даўно падмяняюць жывыя пачуцьці мэханічным дзеяньнем ... Здарылася так, што цудоўнае мастацтва купалаўцаў пачало растварацца ў самацёку... Каб не апынуцца ў хвасьце "турнірнай табліцы" нацыянальных тэатраў Савецкага Саюзу, купалаўцы павінны адрадзіць свае здаровыя традыцыі".І

Мы маем, такім чынам, афіцыйнае, у поўны голас сказанае сьцьверджаньне аб наяўнасьці цяжкой хваробы найлепшага тэатру Беларусі, якая хуткімі крокамі вядзе БДТ І да дэградацыі, а можа й да поўнае катастрофы. Гатовыя, штампаваныя тлумачэньні аб адрыве тэатру ад народу й сучаснасьці, аб самаспакоі яго на лаў-

рах, аб няўвазе да крытыкі й самакрытыкі, аб славасьці партыйна-палітычнай вучобы й узгадаваньня ў тэатры, і г.д. - ня толькі нічога не дапамагаюць зразумець тут, але, наадварот, прыкрываюць і замоўчваюць запраўдныя й істотныя прычыны хваробы БДТІ, вядуць толькі да дэзарыентаваньня шырокага грамадзтва.

Становішча БДТ І, а таксама ведамкі аб небясьпецы ў другіх рэспубліканскіх тэатрах /напр. у вядучым тэатры імя Франка на Украіне/, змушаюць нас вельмі ўважліва й зусім у іншым аспэкце падыйсьці да разгляду такога важнага пытаньня.

І. Удзельная вага І-га Беларускага Драматычнага Тэатру

БДТ І нельга разглядаць толькі ў аспэкце беларускасьці, абмяжоўваць ягонае значэньне толькі тэрыторыяй БССР. Тэатр даўно ўжо выйшаў з гэтых паняцьцяў, стаўшыся мастацкаю адзінкаю саюзнага значэньня, да таго яшчэ займаючага й там адно зь першых месцаў.

Арганізаваны ў 1920 г. у Менску, БДТ І ужо праз тры гады, - у 1923 г. удзельнічае на Ўсесаюзнай Сельскагаспадарскай Выстаўцы /у Маскве/, а ў 1930 г. вызначаецца на І-ю Усесаюзную Алімпіяду савецкіх тэатраў /у Маскве/, дзе й сярод найлепшых тэатраў Украіны й Грузіі, і іншых нацыянальных рэспублік, вылучаецца сваім майстэрствам і дасягвае сур'ёзнага й саліднага посьпеху. Як аб гэтым кажа тэатравед А.Глебаў:

> "Ува ўсім гэтым аграмадным ... відовішчы / - І-ая алімпіяда савецкіх тэатраў - М.К./ Першы Тэатр Савецкай Беларусі заняў адно зь вядучых месцаў ... Зь сяньняшняга пункту гледжаньня, канечне, быў першым у шыхце тэатраў Алімпіяды".2

Далей Масква бачыць БДТ І даволі частым гасьцём: у 1931 г. ён удзельнічае ў тыдні беларускай культуры, у 1933 г. - на гастролях, у 1940 г. - на першай дэкадзе беларускага мастацтва, у 1948 г. - ізноў на гастролях і, нарэшце, у 1955 г. - на другой дэкадзе беларускага мастацтва.

Перад дэкадай 1940 г. БДТ І "уяўляў сабою прафэсыйна сьпелы творчы калектыў"[3], - пісаба аб ім мясцовая крытыка; газэта "Правда" пасьля маскоўскіх паказаў дала такія водгукі:

> "Першы беларускі ... тэатр ... за кароткі тэрмін заваяваў гарачыя сымпатыі маскоўскай артыстычнай грамадзкасьці й гледача. Ягоныя спэктаклі прай-

шлі з выключным посьпехам. Калектыў тэатру - гэта ў поўнай меры зладжаны арганізм, які мае 20-гадовую гісторыю й валодае буйнейшымі майстрамі тэатральнага мастацтва".4

Аб гастрольных пастаноўках БДТ I у Маскве ў I948 г. тая-ж самая "Правда" адзначала, што яны:

"спэктаклі таленавітыя, яскравыя, ... былі відавочным сьветчаньнем сьпеласьці культуры..."5

Некаторыя працы тэатру атрымалі Сталінскія прэміі: спэктакль "Хто сьмяецца апошнім" у I940 г., і спэктакль "Канстанцін Заслонаў" у I948 г.

Дэкадная прэса I955 г. гэтак гаварыла аб БДТ I:

Беларускі тэатр імя Купалы даўно ўжо заваяваў усесаюзную ведамасьць. Яго любяць на Украіне, знаюць і цэняць у гарадох і сёлах Сібіру".6

"Высокая культура сцэнічнага майстэрства гэтага тэатру ... сьветчыць аб бурным росквіце беларускага мастацтва".7

Агульная апінія арганізатараў грамадзкага абгаварэньня дэкадных спэктакляў БДТ I зводзілася да таго, што:

"Тэатр імя Я.Купалы зьяўляецца, бязумоўна, буйнейшым тэатрам ня толькі Беларускай Рэспублікі, але й усяго Савецкага Саюзу".8

Пасьля I-ай дэкады Урад СССР узнагародзіў БДТ I ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу, а пасьля другой дэкады яму была надана годнасьць: акадэмічнага.

Апрача гэтых мастацкіх і палітычных дасягненьняў БДТ I і матар'яльна стаяў і стаіць яшчэ на даволі моцных пазыцыях. Тэатр адным зь першых у СССР адмовіўся ад дзяржаўнае датацыі й перайшоў на самавыстарчальнасьць, з году ў год выконваючы вызначаны яму фінансавы плян і расклад сваёй працы. Складаная гаспадарка БДТ I таксама ішла досыць нармальна й ня выклікала ніякіх засьцярогаў.

Тэатр меў шырокага гледача як у самым Менску, гэтак і з шматлікіх куткоў Беларусі. У летнія часы плянаваліся й праводзіліся гастролі тэатру ў Кіеве, Харкаве, Адэсе, Днепрапятроўску, Томску, Новасібірску й іншых месцах СССР, а таксама шырока была зроблена й абслуга беларускага гледача. У Беларусі амаль што ня было ніводнага буйна населенага пункту, дзе-б ня быў БДТ I. Інакш кажучы, тэатр меў у масах саліднае імя, пашану й вялікую папулярнасьць.

Пасьля ўсяго гэтага варта заняцца высьвятленьнем тых якасьцяў, якія далі магчымасьць БДТ I дасягнуць такога моцнага становішча.

Характарызуючы выступленьне тэатру на першай беларускай дэкадзе 1940 г., "Правда" пісала:

> "У спэктаклях тэатру радуюць перш за ўсё ансамбль, моцная зыгранасьць і ўзаемаадносіны актораў. Адзіны стыль выкананьня, высокі ўзровень тэатральнай і акторскай культуры, пераканальнасьць і псыхалёгічная паглыбленасьць у распрацоўцы вобразаў, праўдзівасьць і шчырасьць акторскага выкананьня - вось аснаўныя якасьці гэтага тэатру".9

Тая-ж газэта, даючы ацэну гастролям у Маскве БДТ I у 1948 г., падчырківала "нацыянальную своеасаблівасьць формы" беларускіх спэктакляў, беспасярэднюю сувязь акторскай трактоўкі з "багатай творчай здольнасьцю" самога народу.10

Цэнтральная прэса й выступы тэатраведаў у час другой беларускай дэкады 1955 г. у вадзін голас гаварылі аб "запраўднай народнасьці" БДТ I. Сучасны дырэктар МХАТ А.Саладоўнікаў пісаў тады ў "Правде":

> "У сваіх спэктаклях тэатр увасабляе адну з важнейшых асаблівасьцяў ... ягоную запраўдную народнасьць ... выростае пачуцьцё непераможнага маральнага адзінства й духовага здароўя народу, нявычарпальны запас ягоных творчых сілаў".11

Заслужаны дзеяч мастацтва Н.Гарчакоў у газэце "Савецкая Культура" гаворыць:

> "У яго /тэатру - М.К./ афармленьні, у ігры выдатных актораў, у музыцы, песьнях і танцах яскрава ўвасобленая глыбокая народная рыса, уласьцівая творчасьці Я.Купалы ... шчырасьць і праўдзівасьць ... Акторы ... іграюць натхнёна... да граніцы сцэнічнай выразнасьці ... Духам гэтай запраўднай народнасьці пранікнуты ўвесь спэктакль, у ёй - ягоная сіла й хараство, ягоная нязьнікаючая сучаснасьць".12

Народны артысты Б.Захава таксама сьветчыць, што:

> "запраўдная народнасьць ягонай /тэатру БДТ I - М.К./ творчасьці лішні раз гаворыць аб буйным росквіце беларускага мастацтва".13

Тэатравед Ф.Бандарэнка на абгаварэньні спэктакляў БДТ I у Усерасейскім Тэатральным Згуртаваньні выказаў сваю пераканаўчую думку, што:

> "акторы й рэжысэры тэатру выключна ведаюць гэтых людзей /гутарка ідзе аб народных беларускіх вобра-

зах - М.К./. Веданьне духовых багацьцяў свайго народу дае акторам магчымасьць раскрываць гэтыя вобразы надзвычайна хораша й дакладна, знаходзіць іх нутраны зьмест і вонкавы малюнак ... Ідзе гэта, як ад ведаў жыцьця, гэтак і ад любові да свайго народу, ад разуменьня асобных рысаў нацыянальнага характару, нейкіх ягоных нутраных якасьцяў".I4

Трэ' аддаць справядлівасьць вышэй названым крытыкам і тэатраведам, яны, якраз, паглядзелі й пачулі галоўную прычыну посьпеху БДТ I, як і ўсяго нацыянальнага тэатру, падыйшлі беспасярэдня да істотнага пытаньня аб спрыяючай глебе для стварэньня своеасаблівага твару тэатру, для зерняў ягонага росквіту, для свайго мастацкага шляху. На маю думку ў гэтай нацыянальнай якасьці трэ' шукаць і аснаўную ніць для тлумачэньняў фактаў дэградацыі БДТ I.

2. Вытокі й традыцыі

БДТ I нарадзіўся /у I920 г./ у вабставінах бурнага культурна-нацыянальнага ўздыму 20-х гадоў і поўнасьцю падпарадкаваў сваю дзейнасьць нацыянальна-адраджэнскім ідэям, цалкам выйшаў зь іх на грамадзкую беларускую ніву.[I5] У гэтыя часы закладаліся, фармаваліся й рабілі станаўленьне ідэйна-эстэтычныя прынцыпы тэатру й ягонага мастацкага складу. Аснаўнымі тэмамі, якія распрацоўваў БДТ I былі тэмы аб гістарычным мінулым беларускага народу, аб народным змаганьні за сваё нацыянальнае вызваленьне. Бальшыня пастановак тэатру ахварбоўвалася ў колеры беларускага фальклёру, захоўвала ўсе асаблівасьці быту, народных звычаяў і абрадаў. Такія спэктаклі, як "Кастусь Каліноўскі", "Машэка" /народны гэрой XIУ стг./, "Каваль-ваявода" /гэраічная казка/, "На Купальле" /фальклёрная абрадавая п'еса/ і іншыя дастаткова яскрава гаварылі аб ідэйным кірунку БДТ I і ягоных драматургах /Міровіч, Кудзелька-Чарот, Я.Купала й іншыя/. Выдатная драма Я.Купалы "Раськіданае гняздо", пастаўленая ў тыя часы, якбы сымбалізавала імкненьні тэатру скончыць з раськіданай Беларусяй, адрадзіць адзіную Бацькаўшчыну й нарадзіць новага чалавека-Беларуса /вобраз Сымона/.

Цікава тут прывесьці ў прыклад дадзеныя рэпэртуарнага пляну БДТ I на сэзон I924-I925 і I925-I926 гг.

	Твораў	%
А. Беларуская нацыянальная тэматыка	I0	53 %
Б. Беларуская савецкая тэматыка	2	I0,3%
В. Заходня-эўрапэйская клясыка	4	2I %
Г. Расейская клясыка	3	I5,7 %
	I9	I00%

Табліца паказвае зусім нармальную прапорцыю сваіх частак, якая ўласьціва нацыянальнаму тэатру на савецкай тэрыторыі.

Як кажа сучасная савецкая энцыкляпэдыя, у гэты пэрыяд і для драматургаў і для БДТ I была характэрная "гістарычная й фальклёрная лінія", ды што:

> "у першыя гады ягонага /тэатру БДТ I/ існаваньня шырока выкарыстоўваўся матар'ял народных паданьняў, казак, песьняў, танцаў".I6

Беларускія тэатральныя крытыкі дадаюць, што:

> "Спэктаклі ... характарызаваліся народнасьцю аснаўных вобразаў, яркім адлюстраваньнем народнага быту і народнага гумару, што рабіла іх яшчэ больш папулярнымі ў гледача".I7

Якраз тут закладаліся прынцыпы пастановачна-рэжысэрскай працы, акторскага выкананьня /рэжысэр Е.Міровіч, акторы У.Крыловіч, Г.Грыгоніс, У.Уладамірскі і іншыя/, трактоўкі й прыёмаў сцэнічнага ўвасабленьня.

Больш таго, савецкая крытыка не гаворыць аб тым, што БДТ I /як і іншыя тэатры Беларусі таго часу/ моцна стаяў на пазыцыях адраджэньня гістарычных традыцыяў беларускага тэатру, ягонага старадаўняга народнага выгляду /ХУ-ХУI ст.ст./, адкуль урэшце рэштаў і чэрпаліся аснаўныя элемэнты дзеля практычнай сцэнічнай дзейнасьці, а пайменна: зінгшпільная форма спэктаклю, фальклёрны характар, народны калярыт і г.д. Тое, што "Правда" зацеміла аб "нацыянальнай сваеасаблівасьці формы" спэктакляў БДТ I і чаго не хацела правільна растлумачыць, - якраз вылівалася з гэтых прынцыпаў беларускага тэатральнага адраджэньня. Ня менш цікава ў гэтай сувязі сьцьверджаньне беларускіх савецкіх тэатраведаў, што:

"У першыя гады, да стварэньня Беларускага дзяржаўнага тэатру опэры й балету, тэатр /БДТ I - М.К./ быў музыкальна-драматычным і па сяньняшні дзень музыка й танцы, салёвае й харавое пяяньне зьяўляюцца абавязкавымі, арганічнымі элемэнтамі многіх ягоных спэктакляў".18

У гэтым сьцьверджаньні зусім правільна разгледжаны арганічна ўласьцівыя тэатру БДТ I формы беларускага спэктаклю, аднак вытокі й глеба іх, што хаваецца ў нацыянальнай тэатральнай спадчыне, старанна замоўчваюцца, каб ня ўпасьці ў грэх "нацдэмаўшчыны".

Несьці свае арыгінальныя, самабытныя традыцыі беларускага спэктаклю, зусім правільна й складала галоўную й асноўную мэту й задачу БДТ I. Тут, аднак, ня толькі бясспрэчная заслуга тэатру, але й ягоная арганічная рыса, якая карэньнямі павінна была ўвайсьці ў глебу ягонай дзейнасьці. Звычайна, ня ўсе рэжысэры й акторы стаялі сьведама на падобных прынцыпах і пазыцыях, але здаровы нацыянальны дух тэатру, ягоныя традыцыі ўзгадавалі выдатную, майстэрскую тэатральную трупу /Ждановіч, Ржэцкая, Пола, Глебаў, Платонаў, Дзядзюшка, Маўчанаў і інш./.

Так ці інакш, а свае перамогі тэатр дасягваў дзякуючы яскраваму адлюстраваньню беларускіх нацыянальных ідэйна-эстэтычных прынцыпаў.

Гэта выявілася ў пастаноўках "Салаў'я" Бядулі й "Кацярыны Жарнасек" Клімковіча, калі БДТ I удалося ізноў працягнуць, як кажа крытыка:

"пачатую ім раней распрацоўку тэмаў зь гісторыі і фальклёру беларускага народу".19

У беларускіх п'есах савецкай тэматыкі БДТ I таксама знайшоў магчымасьці праводзіць сваю аснаўную творчую лінію. Пачалося гэта із спэктакляў на партызанскія сюжэты, дзе можна было яшчэ ў вялікай меры захаваць беларускі нацыянальны характар і водыр /"Над Нёманам", "Перамога", "Партызаны" і інш./, а далей распаўсюдзілася й на сучасную, асабліва калгасную фабулу /"Пяюць жаўранкі", "Выбачайце, калі ласка"/. Рэжысэры й акторы БДТ I літаральна вышуквалі кажную дробязь, якая-б магла даць той ці іншы беларускі нацыянальны калярыт, яны рабілі гэта ня толькі з прынцыповых прычынаў, але й чыста практычна, ведаючы, што ў гэтым іхняя адрозьненасьць і сіла. Тое, што гэта так і што гэта

"даходзіць", сьветчаць, хаця-б, рэцэнзіі на спэктакль з жыцьця чыгуначнікаў - "Канстанцін Заслонаў", аб каторым цэнтральная крытыка гаварыла:

> "І драматургам і тэатру асабліва ўдаюцца прадстаўнікі простага народу Беларусі, з усімі ягонымі высокімі маральнымі якасьцямі, з усімі духовымі багацьцямі ... Веданьне ... свайго народу дае акторам магчымасьць раскрываць гэтыя вобразы надзвычайна хораша й дакладна, знаходзіць іхні нутраны зьмест, навет, тады, калі драматургам даецца дзеля таго ня вельмі многа".20

Рэжысуры й акторам БДТ І удалося разьвязаць вельмі важнае й значнае ды зусім новае пытаньне аб вобразнай пераймальнасьці зь беларускай тэатральнай клясыкі да савецкай п'есы. Аб тым, што вобраз Купалаўскай "Паўлінкі" мае такія ці іншыя пераклікаьні з вобразам агратэхніка Насьці ў сучаснай камэдыі Крапівы /"Пяюць жаваранкі"/, што шлях тут ідзе - "праз вялікія гістарычныя межы"[21]; аб тым, што на сцэне ствараецца вобраз старога беларускага калгасьніка "добра ведаючага як сяньняшні дзень, гэтак і мінулае свайго краю"[22], - было зацемлена ўжо маскоўскімі тэатраведамі. Яны зыходзіліся на апініі, што БДТ І і ў савецкіх беларускіх п'есах стварае спэктакль: "поўны нацыянальнага гумару й запраўднай народнай паэзіі".[23] Адзін з такіх тэатраведаў /А.Сімукоў/, зьвяртаючыся да ўдзельнікаў тэатру, казаў ім:

> "і п'еса "Выбачайце, калі ласка", і "Паўлінка", і "Заслонаў", пры ўсёй разнастайнасьці гэтых спэктакляў, сьцьвярджаюць, што вы адчуваеце голас свайго народу ўва ўсёй ягонай паўнаце".24

Вельмі добра аб гэтым-жа заўважыў беларускі тэатравед Д.Арлоў, які глыбока ведаў творчыя імкненьні БДТ І. Ён пісаў:

> "Кінуты народны аптымізм, сакавіты гумар па добрай традыцыі пераходзілі з "Паўлінкі" ў некаторыя сучасныя спэктаклі, у прыватнасьці, у спэктаклі "Пяюць жаваранкі" і "На крутым павароце".25

Многаму ў гэтай традыцыйнай пераймальнасьці дапамагаў стыль спэктакляў, уяўляючы ў бальшыні, жанр музычна-драматычны, захоўваючы й у савецкіх беларускіх п'есах вялікае месца музыцы, салёваму й харавому пяяньню й танцам.

Зусім немалазначна садзейнічае посьпеху ўспрыняцьця й у савецкім спэктаклі традыцыя дэтальнае адшліфоўкі вобразу, аж да дробязяў, што робіць постаці людзей у выкананьні беларускіх ак-

тораў вельмі яскравымі, жывымі. Уся маскоўская крытыка падчырківала здольнасьць БДТ I навет зусім маленькія ролі зрабіць поўнакроўнымі; у вобразе, як кажа крытыка:

> "усё, рашуча ўсё ў вонкавым абліччы і ў ігры жыцьцёва праўдзіва рупліва адабрана, выразна ў сваёй тыповасьці".26

Гэтае глыбокае нагляданьне, майстэрскае адшліфаваньне літаральна зьдзівіла крытыку й гледачоў, склала перакананьне, што акторы БДТ I надзвычай добра ведаюць і сучасную савецкую калгасную вёску, яе народ, яе жыцьцё.

Аднак, усё-ткі, як-бы ня былі вялікія посьпехі БДТ I і ў беларускіх савецкіх спэктаклях, галоўнае прыпадае на выкананьне й інтэрпрэтацыю беларускай тэатральнай клясыкі. Зусім нармальна й зразумела таму, што асаблівы трыюмф выклікала п'еса "Паўлінка" Я.Купалы, як на гастролях, гэтак і на дэкадным паказе БДТ I[27]. Гэтаму спэктаклю было прысьвечана асабліва шмат увагі, як у крытыцы, гэтак і ў грамадзкай апініі. Народжаная ў ідэйна-эстэтычных прынцыпах беларускага нацыянальнага тэатру, напісаная правадыром нацыянальнага адраджэньня, супадаючая поўнасьцю зь імкненьнямі пастаноўшчыкаў і актораў, "Паўлінка" і дагэтуль складае славу БДТ I. Беларуская сучасная крытыка падавала аб ёй:

> "Вялікай любоўю гледачоў карыстаецца войстрая й жыцьцярадасная камэдыя Я.Купалы "Паўлінка". Выдатнае камэдыйнае майстэрства яе выканаўцаў ..., глыбокае й тонкае ўвасабленьне аўтарскай думкі робяць гэты спэктакль дасягненьнем беларускай тэатральнай культуры".28

Маскоўская крытыка назвала спэктакль "Паўлінка""запраўдным шэдэўрам акторскага майстэрства"[29] й выказала вельмі значную думку, што:

> "Паўлінка", напісана Я.Купалай звыш сорак год назад. Але час аказаўся бясьсільным перад тварам той вялікай жыцьцёвай праўды, якой напоўнены кажны вобраз гэтай, стаўшай народнай камэдыі".30

Не сказала, нажаль, крытыка й прэса аднаго: запраўднай прычыны трыюмфальнага ходу "Паўлінкі", а ў гэтым сьвятле, якраз, разумеюцца й усе факты, што зрабіліся ў дзейнасьці БДТ I.

3. Саветызацыя БДТ I і яе паказьнікі

Нацыянальна-вызвольная глеба беларускага мастацтва, ягоныя самастойныя, незалежныя ад Масквы імкненьні, - выклікалі ў партыйна-савецкага кіраўніцтва вялікую трывогу й небясьпеку. Супраць гэтай "нацдэмаўскай" лініі пачалася жарсткая й, навет, крывавая барацьба, як сяродкамі адміністрацыйных рэпрэсіяў, гэтак і сяродкамі ідэялягічнымі. У БДТ I, дзе, як мы бачылі, асабліва адчуваліся нацыянальна-вызвольныя ўплывы, ужо ад 1926 г. сталі прымусова навязвацца "пазыцыі сацыялістычнага мастацтва" й адначасова "выкрывацца" ворагі савецкай палітыкі, "чужая" ідэялёгія й наагул нацыянальнае аблічча[30]. Паяўляюцца па загаду зьверху беларускія п'есы на савецкую тэматыку /аб іх трохі ніжэй/, але галоўнай рэпэртуарнай лініяй робіцца савецкая, галоўным чынам расейская п'еса. "Мяцеж" паводля Фурманава, "Бронепоезд 14-69" Ус.Іванова, "Разлом" Лаўрэнёва й іншыя спэктаклі цяпер разглядаюцца, як вядучыя пастаноўкі БДТ I, як ягоная прынцыповая творчая й мастацкая аснова. Згодна з галасамі савецкай крытыкі, у БДТ I "пачынаецца рашучы пералом", паўстае:

> "рэвалюцыйна-палкі, ідэйна мэтанакіраваны, жыцьцёва праўдзівы спэктакль ... Першы тэатр пачынае свой пераможны шлях у вырашэньні галоўнага пытаньня мастацтва - увасабленьня на сцэне вобразаў і гэраічных справаў сваіх сучасьнікаў".32

БДТ I прабуе адвесьці гэты новы, яму чужы шлях, растлумачыць сваё запраўднае прызначэньне перад беларускім грамадзтвам /у арганізаванай тэатрам тэатральнай дыскусіі/, аднак усе гэтыя спробы й чыны расцэньваюцца, як "буйная вылазка клясавага ворага супраць партыйнай лініі"[33].

Гэтак з году ў год узмацнялася савецкая лінія й савецкая п'еса ў тэатры, пакуль, нарэшце, савецкая драматургія /галоўным чынам расейская/ не заняла аснаўнога месца ў ягоным рэпэртуары, і БДТ I "пайшоў у нагу з жыцьцём ... апіраючыся на творчы вопыт свайго старэйшага брата, вялікага рускага народу"[34].

У савецкай мэтадалёгіі саветызацыя непарыўна зьвязаная з прымусовым увядзеньнем расейскай клясыкі ў нацыянальныя тэатры, што так сама падаецца як рэцэпт ад "нацыянальнай абмежаванасьці". БДТ I, аднак, прышлося ня толькі ўсосваць у сябе

расейскую клясыку як частку рэпэртуарнай палітыкі, але падпарадквацца ёй і як аснове ідэйна-эстэтычнай. Тэатр забавязалі прыняць традыцыі расейскай школы й пераважна тэатральную навуку Станіслаўскага /я цяпер гавару аб самым факце, аб значэньні яго будзе трохі ніжэй/. Як пераконвае крытыка:

> "Аграмаднае значэньне ... маюць ягоныя /БДТ I - М.К./ сяброўскія сувязі з Маскоўскім Мастацкім Акадэмічным Тэатрам... Практычная дапамога рэжысэраў МХАТ Судакова, Раеўскага[35] выразілася ў тым, што ў працы над радам пастановак яны здолелі глыбака пераняць ... асноўныя прынцыпы МХАТ-аўскай школы, сыстэмы Станіслаўскага".36

Але й гэтага аказалася недастаткова, і перад БДТ I увесь час ставіцца заданьне ўдзельнічаньня ў ягонай працы расейскіх пастаноўшчыкаў, падчыркваецца неабходнасьць іхніх уплываў. Гэтак "Правда" піша:

> "Тэатр /БДТ I - М.К./ неадначасова даручаў свае пастаноўкі маскоўскім рэжысэрам. Гэту карысную практыку сьлед праявіць, заахвочваючы ў працы буйных пастаноўшчыкаў з розных тэатраў".37 /Тут на ўвазе расейскія рэжысэры пастаноўшчыкі - М.К./.

Савецкая энцыкляпэдыя посьпехі БДТ I проста ставіць у залежнасьць ад расейскага тэатру, калі сьцьвярджае, што:

> "вядучая роля ў гэтым працэсе /гутарка ідзе аб саветызацыі БДТ I і "дасягненьнях" на гэтым шляху - М.К./ іграе рускі тэатр зь ягонай багатай клясычнай спадчынай".38

Зусім зразумела, што саветызацыя беларускага мастацтва ня мінула й беларускай драматургіі, змусіла БДТ I заняцца працаю над стварэньнем савецкага беларускага спэктаклю. Не кранаючы цяпер пытаньня якасьці іх /аб чым ніжэй/, трэба, аднак, сказаць, што намаганьні тут былі вельмі актыўныя ўжо зь першых гадоў існаваньня тэатру й апошні ад партызанскай тэматыкі /п'есы "Чырвоныя кветкі" Гарбацэвіча 1922 г., "Перамога" Е.Міровіча - 1926 г./, нарэшце, даў і сучасныя падзеі беларускага жыцьця /п'есы "Хто сьмяецца апошнім" Крапівы - 1939-40 г., "Выбачайце калі ласка" Махаёнка - 1954 г./, знайшоўшы для іх немалое месца ў рэпэртуары тэатру.

У якое становішча трапіў БДТ I, выконваючы волю партыі, лепш за ўсё гаворыць ягоны рэпэртуар за 36 год тэатральнага існаваньня. Справядліва, наагул, кажуць, што рэпэртуар ёсьць твар каж-

най мастацкай адзінкі, што-ж датычыцца тэатру савецкага, дык там пытаньне рэпэртуару робіцца найгалаўнейшаю справаю, істотнаю рысаю дзейнасьці. У рэпэртуары выражаецца палітыка партыі ў мастацтве, чарговыя задачы савецкага дня; тут-жа закладзеныя творчыя імкненьні, асаблівасьці дадзенага мастацкага арганізму, ягоныя творчыя сілы й магчымасьці, ягонае месца сярод грамадзтва і г.д. Таму ўважліва ўгледзьмася ў сьпіс пастановак БДТ I, зь якіх мы возьмем найбольш аснаўныя 109 п'есаў.

А. Беларуская нацыянальная драматургія /паводля зьместу й формы/:

П'есы Я.Купалы: I."Раськіданае гняздо", 2. "Адвечная песьня", 3. "Паўлінка", 4. "Прымакі"; 5. "На Купальле" - Кудзелькі-Чарота; п'есы Е.Міровіча: 6. "Кастусь Каліноўскі", 7. "Машэка", 8. "Каваль-ваявода; 9. "Пінская шляхта" Дуніна-Марцінкевіча, 10. "Салавей" Бядулі; 11. "Панскі гайдук" Дылы; 12. "Вір" Рамановіча; 13. "Кацярына Жарнасек" Клімковіча й 14. "Машэка" Вольскага.

Б. Савецкая беларуская драматургія:

I. "Над Нёманам" Грамыкі; 2. "Змрок" Шашалевіча; 3. "Чырвоныя кветкі" Гарбацэвіча; 4. "Лес цёмны" - Ільлінскага; п'есы Е.Міровіча: 5. "Кар'ера Брызгаліна", 6. "Перамога", 7. "Запяюць верацёны"; п'есы Рамановіча: 8. "Паляшукі", 9. "Мост"; 10. "Гута" Кобеца; 11. "Пагібель воўка" Самуйлёнка; п'есы К. Чорнага: 12. "Бацькаўшчына", 13. "Ірынка"; п'есы Крапівы: 14. "Хто сьмяецца апошнім", 15. "Партызаны", 16. "З народам", 17. "Канец дружбы", 18. "Пяюць жаваранкі"; п'есы Маўзона: 19. "Канстанцін Заслонаў", 20. "У ціхім завулку"; п'есы Губарэвіча: 21. "Цытадэля славы" /"Брэская крэпасьць"/, 22. "Простая дзяўчына", 23. "На крутым павароце"; п'есы Макаёнка: 24. "Выбачайце, калі ласка", 25. "Перад сьвітаньнем"; 26. "Шчасьце паэты" /"Янка Купала"/ - Віткі й 27. "Гэта было ў Менску" Кучара.

В. Савецкая /небеларуская/ драматургія:

I. "Мяцеж" паводля Фурманава, 2. "Бранепоезд 14-69" - Ус. Іванова; п'есы Біль-Белацаркоўскага: 3. "Луна зь лева", 4. "Жыцьцё кліча"; п'есы Пагодзіна: 5. "Падзь сярэбраная", 6. "Крэмлёўскія куранты"; п'есы Карнейчука: 7. "Платон Крэчот",

8. "Макар Чудра", 9. "У стэпах Украіны", 10. "Калінавы чай", 11. "Фронт", 12. "Крыльлі"; п'есы Рамашова: 13. "Вогнены мост", 14. "Байцы"; п'есы Лаўрэнёва: 15. "За тых, хто ў моры", 16. "Разлом", 17. "Голас Амэрыкі"; п'есы бр. Тур: 18. "Губэрнатар правінцыі", 19. "Асабняк у завулку"; п'есы Сіманава: 20. "Чужы цень", 21. "Рускія людзі", 22. "Хлапец з нашага гораду"; 23. "Пётра Крымаў - Фіна; 24. "Сям'я" - Папова; 25. "Прага застаецца маёю" - Буданоўскага; 26. "Душа Масквы" - Нікуліна; 28. "Пэрсанальная справа" - Шэйна; 29. "Уцёкі" Дз.Шчаглова; 30. "Маладая гвардыя" - Фадзеева; 31. "Дачка пракурора" - Яноўскага; 32. "Залп Аўроры" - Бальшакова й Чыаўрэлі; 33. "Машанька" Афінагенава; 34. "У добры час" Розава; п'есы Рахманава: 35. "Прафэсар Палежаеў", 36. "Неспакойная старасьць"; 37. "Маскоўскі характар" - Сафронава й 38. "Таня" - Арбузава.

Г. Расейская клясыка:

П'есы Горкага: 1. "На дне", 2. "Апошнія", 3. "Зыкавы"; п'есы Астроўскага: 4. "Бязь віны вінаватыя", 5. "Позьняе каханьне", 6. "Таленты й паклоньнікі", 7. "Ваўкі й авечкі", 8. "Даходнае месца", 9. "Праўда добра, а шчасьце лепш"; п'есы Чэхава: 10. "Ведзьма" /інсцэнізацыя/; 11. "Чайка", 12. "Вішнёвы сад"; 13. "Капітанская дачка" Пушкіна /інсцэнізацыя/; 14. "Недарасьль" Фонвізіна; 15. "Лес шуміць" - Караленкі /інсцэнізацыя/, 16. "Анна Карэніна" - Л.Таўстога /інсцэнізацыя/.

Д. Заходня-эўрапэйская клясыка:

1. "Апостал шатана" - Б.Шоў; 2. "Ваўкі" - Р.Раляна; 3. "Сельскі алькад" - Кальдэрона; 4. "Ілжэў" - Гальдоні, п'есы Мольера: 5. "Мяшчанін у шляхоцтве", 6. "Скупы"; 7. "Фляндрыя" - Сарду; 8. "Жакерыя" - Мэрымэ; 9. "Нора" - Ібсэна; 10. "Зрада і каханьне" - Шылера; 11. "Дурная для другіх, - разумная для сябе" - Лопэ дэ Вэга; 12. Ромэо й Юлія" - Шэксьпіра й 13. "Дзень цудоўных падменаў" - Шэрыдана.

Укладаючы вышэйпададзены рэпэртуар БДТ 1 ў мову лічбаў, мы атрымоўваем наступныя цікавыя й характэрныя паказьнікі:

А. Беларускіх нацыянальных п'есаў:	14	12,8%
Б. Беларускіх савецкіх п'есаў:	28	25,5%
В. Савецкіх /небеларускіх/ п'есаў:	38	35,4%
Г. Расейскай клясыкі:	16	14,5%
Д. Заходня-эўрапэйскай клясыкі:	13	11,8%
	109	100%

Такім чынам, у рэспубліканскім нацыянальным вядучым драматычным тэатры беларускія п'есы /уключаючы сюды й савецкую тэматыку/ займаюць толькі 38,3%, у той час, калі на іншыя /галоўным чынам расейскія/ прыпадае 61,7%.

Гэта, аднак, яшчэ не дае дакладнага малюнку, запраўдны выгляд апошняга значна пагоршваецца, калі мець на ўвазе ня колькасьць п'есаў, а колькасьць спэктакляў, якія ставяцца паводля таго ці іншага разьдзелу тэматычнага пляну. Для прыкладу прывяду спэктаклі, пастаўленыя БДТ I у верасьні й кастрычніку 1956г.[39] У вагульную лічбу 56 пастановак за гэты час /24 вячэрніх і 4 ранішнікі на месяц/ уваходзілі:

Назоў п'есы	Колькасьць пастановак
1. "Крэмлёўскія куранты" /Пагодзіна/	5
2. "Таня" /Арбузова/	19
3. "Дзень цудоўных падменаў" /Шэрыдана/	6
4. "У добры час" /Розава/	5
5. "Машанька" /Афіногенава/	4
6. "На крутым павароце" /бел. сав. п'еса Губарэвіча/	6
7. "Праўда добра, а шчасьце лепш" /Астроўскага/	6
8. "Позьняе каханьне" /Астроўскага/	4
9. "Салавей" /бел. нац. п'еса Бядулі/	1
	56

Інакш тэатрам было пастаўлена:

А. Беларускіх нацыянальных спэктакляў	1	2,9%
Б. Беларускіх савецкіх спэктакляў	6	10,7%
В. Савецкіх расейскіх спэктакляў	33	58,9%
Г. Спэктакляў расейскай клясыкі	10	17,8%
Д. Спэктакляў заходня-эўрап. клясыкі	6	10,7%
	56	100%

Значыцца небеларускіх пастановак усяго было 87,4%, а беларускіх толькі 12,6%, пры чым зь беларускай клясыкі паказаны беларускаму насельніцтву ледзь, ледзь 1 спэктакль.

4. Творчая праца БДТ 1 ў савецкіх умовах

Посьпехі ў штурханьні БДТ 1 на шлях саветызацыі, набыцьцё ім палітычнага капіталу зрабіліся адваротна-прапарцыянальнымі ня толькі да нацыянальнага аблічча тэатру, але й да ягонага творчага росту. Справа ў тым, што сярод савецкіх п'есаў бальшыня аказалася мала таго, што нявысокімі, але проста нізкапробнымі, хаўтурнымі скорасьпеўкамі, схвабрыкаванымі ў каньюнктурных мэтах. Гэтага не магла схаваць і сама савецкая крытыка. У пастанове Міністэрства культуры СССР 1955 г. было канстатавана, што ў савецкіх тэатрах:

> "першае месца занялі п'есы, каторыя зусім ня могуць прэтэндаваць на гэта".40

У якасьці аднаго з прыкладаў савецкай хаўтуры быў прыведзены твор Яноўскага "Дачка пракурора", - тая самая п'еса, якая доўгі час ня зыходзіла із сцэны БДТ 1[41].

Падводзячы вынікі тэатральнага сэзону 1955-1956 г., Міністэрства культуры СССР прызнаецца, што савецкае грамадзтва й прэса, навет, вялі:

> "зацятае змаганьне ... супраць дробнатэматычнасьці й маламастацкасьці раду п'ес, якія аказаліся "гаспадарамі рэпэртуару".42

Аб тым-жа гаварыла й партыйнае кіраўніцтва Беларусі, калі папярэджвала, што:

> "ў цэлым сэзон /1955-1956 г. - М.К./ быў бедны яркімі ... спэктаклямі. Больш таго, нямала было скарасьпелых, няўдалых спэктакляў".43

Сьцьвярджальнае зьніжэньне якасьці творчае працы тэатраў тут відавочнае. Аднак, каб дагадзіць кіраўніцтву з савецкай тэматыкай, рабілася ўсё, навет наяўныя ляпсусы й шкоднасьці. Заслугоўвае на ўвагу тут факт з пастаноўкай у БДТ 1 п'есы "Залп Аўроры" /Бальшанава й Чыаўрэлі/. Тэатр аж да 1952 г. не паказваў на сваёй сцэне савецкіх правадыроў. На фоне тэатральнага жыцьця, дзе ўжо даўно былі схвабрыкаваныя постаці Леніна й Сталіна, БДТ 1 выглядаў як прыкрая пляма. Каб выправіць гэтую палітычную памылку, і прапанавалі тэатру паставіць "Залп Аўроры",

дзе былі выведзеныя разам і Ленін і Сталін. Дзеля стварэньня пераможных уражаньняў пастаноўка спэктаклю была даручана маскоўскаму рэжысэру, ляўрэату Сталінскай прэміі - Судакову /МХАТ/. Тым ня менш, справа ня рушылася зь месца з прычыны таго, што на ролю Леніна з актораў БДТ I ніхто не надаваўся. Тады не задумоўваліся й далі загад аб пераводзе вядучага актора БДТ 2 /Маўчанава - нар. артыстага СССР/, зьняўшы яго сярод сэзону з працы гэтага тэатру. Фактычна БДТ 2 быў нанесены такі ўдар, які й дагэтуль балюча адбіваецца на ягонай дзейнасьці, але затое БДТ I дасягнуў палітычнага эфэкту. Дарэчы тут зацеміць усю каньюнктурнасьць і падхалімства гэтага чыну. Прысьвечаны Сталіну спэктакль "Залп Аўроры" цяпер, пры дэсталінізацыі, даўно ўжо зьняты з рэпэртуару БДТ I.

Наагул, як падае савецкі друк, савецкая п'еса /небеларуская/ БДТ I мала ўдалася. Гэтак у спэктаклі 4Крамлёўскія куранты" /Пагодзіна/:

> "ў цэлым не хапае дакладнага рэжысэрнага вырашэньня... Гэтая тэма /тут ідзе аб галоўным вобразе Леніна - М.К./ аказалася нібы адціснутай на другі плян. Вось чаму спэктакль не набыў патрэбнай сілы. Вельмі мала ў спэктаклі атмасфэры і яркіх рысаў часу".44

У другім аснаўным спэктаклі тэатру "Таня" /арбузава/ крытыка станоўча адгукваецца толькі на выкананьне ролі Тані /арт. Драздова/:

> "Тым больш прыкра, кажа рэцэнзэнт, што некаторыя яе партнэры ўпадаюць час ад часу ў саладжавую замілаванасьць. І тады ў спэктакль пранікае танны сэнтымэнт".45

Навет і вобразу гэроя /Герман - арт. Шаціла/ "не стае нутранай глыбіні".[46]

Такім чынам сьцьверджаньне аб тым, што БДТ I з рашучым пераломам у бок савецкай п'есы пачаў свой "пераможны шлях"[47] у вырашэньні новага творчага сучаснага аблічча, аказалася толькі пераддэкадным прапагандовым і яўна дэмагагічным прыёмам, нічога агульнага ня маючым з запраўднасьцю.

Такой-жа маною зьявілася сьцьверджаньне аб тым, што "зварот да расейскай клясыкі ... ня мог не адбіцца жыватворна на яго /тэатры - М.К./ творчым росьце".[48] Доказам апошняй заявы савецкая крытыка прыводзіць пастаноўку БДТ I горкаўскіх "Апош-

ніх", якую маскоўскі друк расцаніў, як "вылучную зьяву ў тэатральным жыцьці краіны"[49]. На маю думку, гэта гаворыць толькі аб выдатных здольнасьцях беларускіх актораў - усё іншае ізноў прапагандовыя напластаваньні. Тут адыгралі ролю шэраг акалічнасьцяў: час дэкадных камплімэнтаў[50], кансультацыя й ініцыятыва ў выбары гэтае п'есы, дадзеныя рэжысэрам МХАТ Раеўскім[51], дэманстрацыя горкаўскага спэктаклю нацыянальным тэатрам і г.д. Такі спэктакль з расейскай клясыкі аднак стаўся толькі адзінкаю й не знайшоў далейшых творчых пацьверджаньняў. Пасьля "Апошніх" тэатру была накінутая й пастаноўка другога горкаўскага спэктаклю "Зыкавы", які ператварыўся ў няўдачу тэатру. Крытыка піша аб гэтым:

> "Страчана глыбіня думкі й у спэктаклі "Зыкавы" ... із спэктаклю выпадае нейкая істотная тэма ... спэктакль адразу траціць глыбіню думкі. Гэта вельмі крыўдна, бо матар'ял п'есы мог-бы быць нявычарпальнай крыніцай акторскага і рэжысэрскага натхненьня". 52

Дарэчы тут выказаць поўную супрацьлежнасьці думку аб горкаўскай драматургіі, дзе, апрача "На дне", ня зроблена нічога яскравага, запраўды драматургічнага. Праца над горкаўскімі п'есамі не апраўдвае тых цяжкіх труднасьцяў, якія туды трэ' ўлажыць; тут літаральна ігра ня варта захадаў, тым больш для нацыянальнага тэатру, дзе горкаўскі спэктакль проста вядзе да адваротных вынікаў. Аднак у СССР можна толькі праслаўляць усё, што выйшла ад Горкага й навет ягоныя наяўныя мінусы трэ' ўводзіць у вялізарныя плюсы.[53]

На дэкаду 1955 г. БДТ I павёз у Маскву пастаноўку "Даходнае месца" Астроўскага, ізноў-жа з мэтаю паказаць "жыватворчы ўплыў" расейскай клясыкі. Прапагандовая мэта, аднак, не ўдалася. Крытыка, наагул, пастаралася найменш заўважыць гэты спэктакль, а пры абгаварэньні яго ў Усерасейскім Тэатральным Таварыстве тэатру было сказана аб занадта багатай роскашы пастаноўкі, няправільнай трактоўцы вобразаў, недакладным увасабленьні быту і характараў. Навет бліскучы актор Платонаў, што выконваў ролю Жадава, ня здолеў стварыць "правільнага разуменьня вобразу".[54]

Варта ўгледзецца ў падобныя факты больш глыбока. Справа тут ня толькі ў выкананьні й трактоўцы вобразаў расейскай кля-

сыкі, а больш у істотным: у падпарадкаваньні беларускага нацыянальнага тэатру традыцыям, прынцыпам і мэтадам расейскай тэатральнай школы, якое прымусова ставіцца за абавязак БДТ I /і іншых беларускіх тэатраў/.

Ніхто ня будзе адмаўляць вялізарнага значэньня расейскага тэатру й у прыватнасьці МХАТ і сыстэмы Станіслаўскага, іхнія дасягненьні агульнаведамыя, але й сярод расейскіх тэатральных кірункаў ёсьць знаныя тэатры Ермолавай, Камісаржэўскай, Таірава і іншых. Апрача таго, аб'ектыўная думка ня можа прайсьці міма такіх сусьветна вызнаных заходня-эўрапэйскіх фактаў зь гісторыі тэатру, як тэатры Шэксьпіра, Мольера, Лопэ дэ Вэга, Ібсэна, Мэтэрлінка, як Мэйнінгенская тэатральная школа, як творчыя кірункі актораў і рэжысэраў: Росі, Сальвіні, Дузэ, Коклена, Сары Бернар, Кіна, Крэга і г.д. і г.д.

Самы ўчынак навязаньня таго ці іншага творчага кірунку ўжо вядзе да ланцугоў творчую думку тэатру й ягоных актораў.

Звычайна, што й нацыянальны тэатр можа насьледваць тыя ці іншыя школы і кірункі, можа адчуваць іхнія ўплывы, але ўсё гэта толькі сяродкі, што дапамагаюць тэатру лепш выявіць сваё нацыянальнае аблічча, і толькі гэта апошняе можа й павінна быць ягонаю мэтанакіраванасьцю, а ніяк не наадварот. Беларускія тэатраведы пішуць:

> "Няўдачы тэатру /БДТ I - М.К./ з пастаноўкамі чэхаўскіх і некаторых іншых п'ес рускай ... клясыкі[55] сьветчаць аб тым, што калектыў ня турбуе сябе пошукамі сцэнічных сяродкаў, якія-б адпавядалі прыродзе таго ці іншага драматурга. Вось чаму многім спэктаклям не хапае вобразнасьці, шырыні мастацкага мысьленьня".[56]

А ніхто не асьмельваецца голасна запытацца: "А ці падыходзяць мэтады расейскай тэатральнай школы творчаму кірунку тэатру? Ці вядуць яны тэатр наперад?" Калі ў свой час /у 1928 г./ на тэатральнай дыскусіі, арганізаванай БДТ I, падняліся гэтыя пытаньні, дык іх расцанілі як вылазку клясавага ворага. З тэй пары ніхто іх і не падымае. Таму зразумелыя ёсьць і "няўдачы тэатру".

Неабходна адцеміць тут яшчэ й тое, што нацыянальнаму тэатру накідаецца не запраўдны выгляд клясычнай спадчыны, а ягонае новае савецкае "прачытаньне", паводля мэтаду сацыялістычнага рэ-

алізму, інакш кажучы, схвальшаваная трактоўка твору. Напрыклад, у пастаноўцы "Даходнае месца" Астроўскага савецкая каляпартыйная крытыка патрабавала ад БДТ I , каб вобразы адмоўныя /чыноўнік Юсупаў/ былі-б страшныя, каб у дадатніх тыпаў іхняя жальба ператваралася ў гнеўныя, гарачыя пратэсты супраць існуючага тады рэжыму. Калі актор, выконваючы ролю Жадава /Платонаў/, скромна й горача выказваў свае рэплікі, дык гэта не спадабалася крытыкам, якія патрабавалі, каб Жадаў увасабляўся "змагаром супраць чыноўніцкага ладу, каб ён верыў, што прыйдзе час /сацыялістычнае прадбачаньне!/, калі зладзеі будуць баяцца ня крымінальнай адказнасьці, а грамадзкага /разумей - партыйнага/ суду".[57]

Узгадаваным на законах праўды ў мастацтве акторам і рэжысэрам БДТ I такое "прыспасабленства", такая каньюнктуршчына ніяк не садзейнічала ў іх выканаўчай творчасьці.

Разгледзім цяпер працу тэатру над беларускім савецкім спэктаклем. Тут ужо раней успаміналася аб тым, што ў некаторых беларускіх савецкіх п'есах як беларускім драматургам, гэтак і БДТ I удавалася часткова выкарыстаць традыцыйную фальклёрна бытавую рысу ў спэктаклі, аднак, патрабаваньні партыі ўсё больш накіроўвалі да сучаснай тэмы, разам зь якою ўсё меншымі становіліся сувязі з нацыянальнымі асаблівасьцямі беларускага жыцьця, характарамі й спосабамі акторскага выкананьня. Беларускія драматургі ўсё больш губілі мастацкія якасьці, а многія й проста ішлі па дарозе рамесьніцтва й хаўтуры, карыстаючыся прыкладамі іншых савецкіх "драмадзелаў". Галоўны рэжысэр БДТ I Рахленка пісаў аб гэтым:

> "Драматургі ня пішуць або пішуць вельмі дрэнна. У п'есах тусклыя, убогія думкі, надуманыя здарэньні, дробныя, сумныя людзі, што глыбокадумна й холадна праракаюць "ізьбітыя ісьціны"".58

Навет бясспрэчна таленавіты Крапіва ў сваіх п'есах на сучасныя тэмы ня высьцерагся страты якасьці і ў вапошніх дэкадных рэцэнзіях, калі стараюцца больш падчыркваць посьпехі, "Правда" зацеміла аб п'есе "Пяюць жаваранкі":

> "Такі майстра, як Крапіва, мог-бы, звычайна, унікнуць таго спрошчанага разьвязаньня канфлікту, якое робіцца ў п'есе".59

Газэта "Сов. Культура" таксама знайшла ў п'есе Крапівы слабыя месцы:

"Нельга не закінуць аўтару ... за апошні акт, для каторага ў яго слоўна не хапіла істотнага зьместу".60

Аб п'есе Маўзона "У ціхім завулку" маскоўская крытыка гаварыла, як аб творы далёкім "ад запраўднага мастацтва", "прымітыўна ілюстратыўным і бездапаможна - мэнтарскім".61

Беларускія савецкія тэатраведы таксама даюць аб беларускіх п'есах на сучасную тэму даволі крытычныя ацэны. Гэтак аўтару п'есы "На крутым павароце" Губарэвічу робяцца дакоры аб "сур'ёзных недахопах", аб тым, што ён асабістыя любоўныя дачыненьні паставіў:

"амаль аснаўным драматычным матывам п'есы. Ад гэтага твор траціць сваю дзейнасьць і мэтанакіраванасьць, аслабляецца ягонае грамадзкае гучэньне".62

Адсюль, зразумела, тыя цяжкасьці, у якія быў пастаўлены БДТ I пры працы над савецкай беларускай п'есай. Як заўважае цэнтральная рэцэнзія:

"Тэатр прабаваў перамагчы гэты недахоп /гутарка ідзе аб ідэйна-мастацкіх памылках у п'есе Крапівы "Пяюць жаваранкі" - М.К./... і ўсё-ткі... акт у цэлым здаецца аднатонным і бязьдзейным".63

У пастаноўцы "На крутым павароце", згодна думкі газэты "Зьвязда", рэжысурай /Саньнікаў/:

"прыватныя праблемы неправамерна ўзьнятыя ... да ўзроўні агульных, прывялі да аслабленьня канфлікту п'есы, які і так слаба быў намечаны аўтарам. У выніку ў спэктаклі няма маштабнага характару нашага сучасьніка".64

Аб пастаноўцы "У ціхім завулку" сказана, што:

"тэатру не ўдалося выявіць у належнай меры станоўчыя ідэі п'есы. Іх мала ў ёй".65

Наагул сустрэча БДТ I і працуючых зь ім аўтараў з сучаснаю савецкаю тэмаю паставіла перад імі сьцяну непаразуменьня, выявіла такія супрацьлежнасьці паміж палітыкай і мастацтвам, якія ані аўтар, ані тэатр ужо не маглі прывесьці ў раўнавагу, перамагчы, - і палічылі за лепшае зусім ухіліцца ад працы над сучаснай савецкай тэматыкай. У пачатку 1955 г. часапіс "Беларусь" заўважыў тэатру, што ў яго:

"не аказалася спэктакляў ..., у якіх-бы раскрываліся вобразы перадавых савецкіх людзей".66

На апошняй дэкадзе "Правда" папярэджвала БДТ I:

"Перад тэатрам ... узьнікае небясьпека самапаўтарэньня, зацягласьці ў творчым росьце. Аб гэтым гаворыць хаця-б практыка апошніх двух год, калі калектыў ня здолеў падрыхтаваць аніводнага новага спэктаклю на сучасную тэму, годнага паказу на дэкадзе".[67]

Ніхто, канечне, не адважыўся сказаць, што гэтыя самапаўтарэньні, зацягласьць творчага росту, а дакладней загуба мастацкай якасьці якраз і прынеслася тэатру сучаснай сацыялістычнай тэматыкай, чужой нутру тэатру.

Дзеля большае паўнаты асьвятленьня працы БДТ I у савецкіх умовах трэ' сказаць колькі слоў і аб пастаноўцы на яго сцэне твораў заходня-эўрапэйскай клясыкі. Можна думаць, што тэатр ад самага пачатку свайго існаваньня быў вельмі заахвочаны працаю й шуканьнем творчых вынікаў у гэтай галіне тэатральнай дзейнасьці. Пасьля аснаўнога нацыянальна-беларускага кірунку заходня-эўрапэйская драматургія была наступным пытаньнем творчых імкненьняў БДТ I. Аб гэтым сьветчаць такія грунтоўныя пастаноўкі тэатру, як п'есы Мольера, Кальдэрона й Р.Раляна ў першыя пэрыяды дзейнасьці, і п'есы Шылера, Ібсэна, Лопэ дэ Вэга й Шэкспіра /гл. раней паказаны сьпіс рэпэртуару/ ў ягонай далейшай працы. Ёсьць дадзеныя бачыць тут, навет, большае, а пайменна - жаданьне схавацца за заходня-эўрапэйскую спадчыну ад няўдачаў тэатру ў працах над савецкай і расейскай п'есай. Аднак БДТ I чакала і ў гэтай галіне горкае расчараваньне. Зразумелая ўсюды творчая цяга тэатру на Захад была прынятая савецкай уладай як палітычная памылка, як праступак, што выходзіў за межы мастацкага значаньня. Партыйнае кіраўніцтва паставіла БДТ I, як вялікую загану:

"Сур'ёзнага дакору заслугоўвае рэпэртуарны плян тэатру імя Я.Купалы, у якім неправамерна вялікае месца займаюць творы замежнай драматургіі й зусім мала п'ес, якія адлюстроўваюць нашу савецкую рэчаіснасьць". 68

Апрача таго ад пастановак замежнай драматургіі таксама патрабавалі "сучаснага прачытаньня" на асновах сацыялістычнага рэалізму, што зьявілася прычынаю таго, што і гэтыя спэктаклі /як і расейскай клясыкі/ зрабіліся "расплыўчытымі", "няроўнымі" і "неакрэсьленымі".[69]

5. Некаторыя вынікі

Мы падыйшлі цяпер да самага істотнага.

"Правда" аб дэкадзе беларускага мастацтва 1955 г. пісала:

> "Спэктаклі /БДТ I - М.К./ напоўненыя такімі цудоўнымі ... такімі калярытнымі штрыхамі і дэталямі старога вясковага быту, такім жыцьцярадасным, іскрыстым і "заразьлівым" народным гумарам, якія мог знайсьці толькі тэатр, які блізка й ува ўсіх дробязях ведае народнае жыцьцё".70

Раней ужо падавалася аб вялікіх вартасьцях БДТ I /разьдзел 2-гі/ і тых карэнных асновах, адкуль яны выцякалі, застаецца іх толькі падагульніць. БДТ I дасягнуў сваей мастацкасьці: I/ стоячы на нацыянальна-беларускіх ідэйна-эстэтычных прынцыпах; 2/ захаваўшы сваеасаблівую форму нацыянальна-беларускага спэктаклю; 3/ веданьнем народных імкненьняў, пачуцьцяў і народнага быту. Цяпер усе гэтыя асновы або зусім, або амаль што зусім выбітыя з-пад ног тэатру самою савецкаю ўладаю.

Зроблена гэта з прычыны таго, што быццам БДТ I скатваўся на шлях "нацыянальнай абмежаванасьці". Аднак такое сьцьверджаньне было цалкам ілжывым. БДТ I ніякім чынам ня ўхіляўся ад працы над заходня-эўрапэйскай і расейскай клясыкай, наадварот, праявіў да іх /асабліва да замежнай драматургіі/ вялікае зацікаўленьне і імкненьне знайсьці тут шмат чаго карыснага і вартаснага. Аб гэтым гаворыць прагледжаная ўжо вышэй рэпэртуарная палітыка тэатру. Справа толькі была ў тым, каб з аднаго боку працаваць тут свабодна, паводля творчага жаданьня й выбару, але не пад прымусам і навязваньнем; а з другога боку, каб захаваць сваё нацыянальнае аблічча. Пайменна тут і была разумная правамернасьць, правільнасьць якой была пераканальна выяўлена практычнай дзейнасьцю БДТ I. У аспэкце аб'ектыўнасьці правамернасьць творчай лініі нацыянальнага тэатру мусіць ісьці ў бок нацыянальны, і ў гэтым ня можа быць аніякага сумлеву. Калі працэнтныя суадносіны паказваюць, што тэатр мае 53% нацыянальнай тэматыкі, як гэта было ў першыя пэрыяды ягонага яшчэ больш вольнага жыцьця /гл. вышэй/, дык гэта нармальна, а вось калі працэнт нацыянальных твораў упаў да I2,8%, а паводля фактычна дадзеных спэктакляў ня перавышае 3%, дык гэта вядзе да нацыя-

нальна-культурнай катастрофы, а не да правамернасьці, як гэта думаюць партыйныя кіраўнікі.

Нацыянальная беларуская драматургія пакінула не такую ўжо малую спадчыну, творы Сыракомлі, Дуніна-Марцінкевіча, Каганца, Дарэўскага, Купалы, Коласа, Бядулі, Міровіча, Чорнага, Кудзелькі, Зарэцкага, Галубка, Аляхновіча - складаюць залаты фонд для беларускіх тэатраў. Цікава й паказальна паглядзець: што-ж з гэтага залатога фонду засталося на сцэне БДТ I? Зь вялікай спадчыны Дуніна-Марцінкевіча - толькі аднаактовая камэдыя "Пінская шляхта", зь вялікай спадчыны Я.Купалы - не ягоныя грунтоўныя творы, а толькі дзьве камэдыі: "Паўлінка" і "Прымакі". Пасьля доўгага перапынку аднавіўся, нарэшце, "Салавей" Бядулі, - і гэта ўсё. Колькасьць - ганебная для нацыянальнага тэатру. Найлепшае, фундамэнтальнае, якаснае і ідэйнавыразнае адкінута савецкаю ўладаю, як нясугучнае. Ды й тое, што яшчэ засталося, мэтадамі саветызацыі было схвальшавана, прыняло скалечаны выгляд. У "Салаў'і" Бядулі глядач дарэмна-б шукаў запраўдных вобразаў Беларусі, прадбачаньні яе новых людзей, хараства й сілы каханьня, - усяго таго, што хацеў паказаць Бядуля, там акцэнтуецца цяпер клясавае змаганьне, помста, чалавеканенавісьніцтва й непазьбежная перамога пралетарыяту. У Купалаўскай "Паўлінцы" асабліва падчырквацца цяпер "войстрае сацыяльнае гучэньне", імкненьне беларускай вясковай дзяўчыны да "новага шчасьлівага жыцьця" і прадчуваньне савецкага раю[71]; маляваньне чорнымі хварбамі беларускай перадрэвалюцыйнай рэчаіснасьці, выяўленьне асаблівага "падтэксту" п'есы[72], які "нацэльваў-бы" гледача на сучасныя патрыятычныя думкі.

Як на ўзор падобных савецкіх тэндэнцыйных махінацыяў, варта паказаць пастаноўку БДТ I "Шчасьце паэты" Віткі, дзе вобраз народнага змагара /Я.Купалы/ за нацыянальную незалежнасьць па загаду партыі перароблены савецкім аўтарам у постаць амаль што камуністычнага прапагандыстага й савецкага артадаксальнага правадыра.[73]

Няма нічога дзіўнага, што пры гэных ідэйна-творчых і "мастацкіх" накіраваньнях БДТ I страціў глебу дзеля натхнёнай творчай працы й жыцьцёвых ідэялаў.

Гэтай стратай тлумачацца ў васнаўным усе тыя сур'ёзныя аб-

вінавачваньні, якія цяпер крытыка кідае ў адрас БДТ I. Час, калі ў пастаноўках тэатру "выяўляліся нацыянальныя рысы тэатру й ягоныя творчыя асаблівасьці ... кіпучы народны аптымізм... добрыя традыцыі"[74], прамінуў, а цяпер робяцца толькі адзнакі мінулага, іх выкараняе саветызацыя й адсутнасьць у працы нацыянальных твораў.

Тэатравед Арлоў толькі крануў, але ня спыніўся й ня даў ніякіх тлумачэньняў такому кардынальнаму пытаньню, як пазбаўленьне ў ігры актораў глыбіні й душы, падмены іх мэханічнасьцю, што зьяўляецца таксама відавочнаю адзнакаю катастрафальнага становішча БДТ I, прычына якога ляжыць у той-жа страчанай глебе. Таму й атрымалася так, як кажа крытык, што старое пакаленьне захавала яшчэ "шчодрасьць ігры", што яно знаходзіцца ў добрых традыцыях, якія ўжо далёка не падзяляюцца асавечанай прымусова моладзьдзю тэатру. На гастролях 1948 г. маскоўская грамадзкасьць паказала беларускаму партыйнаму кіраўніцтву на: "вялікі разрыў паміж вядучай групай майстроў тэатру /інакш кажучы старэйшым пакаленьнем - М.К./ і ягонай моладзьдзю"[75] ў БДТ I. Значыцца ўжо тады былі адзнакі глыбокай хваробы тэатру, але на гэта не зьвярнулі ўвагі. Становішча натолькі пагоршылася, што кіруючаму органу беларускім мастацтвам, газэце "Літаратура й Мастацтва" неабходна было прызнацца:

> "У Беларускім акадэмічным тэатры, які носіць імя Я.Купалы, павінна гучэць запраўдная беларуская мова ... Нажаль нярэдка із сцэны мы чуем нячыстае вымаўленьне, некаторыя артыстыя няправільна ставяць націскі ў беларускіх словах".76

Саветызацыя, пранікнуўшы ня толькі на сцэну, але й у быт актора, асабліва маладушных кадраў, засьмяціла мову й яны перасталі размаўляць "яркай эмацыянальнай мовай"[77], сакавітасьцю якой тэатр гэтак дзівіў раней. Такія ганебныя зьявы вядучага нацыянальнага тэатру паказваюць тую трагэдыю, якую ён перажывае. Што такія факты ня ёсьць адзіночнымі, прыпадковымі, а адным з вынікаў савецкай нацыянальнай палітыкі наагул, можа пераканаўча сьветчыць становішча Украінскага Рэспубліканскага Дзяржаўнага тэатру імя Франка /Кіеў/[78].

Страта БДТ I выразнага нацыянальнага аблічча, своеасаблівасьці й арыгінальнасьці творчага ўвасабленьня ня толькі адбілася на нацыянальным спэктаклі, але й спрычынілася да дэградацыі тэатру

ў творчай дзейнасьці наагул. Пад савецкім прымусам БДТ I паступова апускаўся да становішча звычайнага абласнога тэатру, нівэляваўся, усё больш зьніжаў узровень мастацкай якасьці. На вачох гледача й крытыкі тэатр адыходзіў ад вялікага мастацтва ня толькі ў савецкіх п'есах /дзе гэта можна зразумець/, але й у працах над клясычнай спадчынай, і ягоныя пастаноўкі рабіліся шэрымі, безкаляровымі, руйнаваўся выдатны моцна зладжаны ансамбль:

"Здарылася так, што цудоўнае мастацтва купалаўцаў пачало растварацца ў самацёку". 79

Савецкая крытыка амаль што ніколі выразна не гаворыць аб беспасярэдняй сувязі ў савецкіх умовах якасьці спэктаклю зь фінансавай базай тэатру. Пытаньне "клясавай" і "касавай" п'есы, аднак, і дагэтуль засталося неразьвязанай праблемай у савецкім тэатры. Як правіла, ідэялягічная /гэта значыцца тэндэнцыйна бальшавіцкая, клясавая/ п'еса збору не дае, гледача адштурхвае, наадварот - п'еса нясугучная савецкай рэчаіснасьці заўсёды забясьпечвае касу тэатру. Тут устанавілася адваротна-прапарцыянальнае зьявішча, а кіраўніцтва патрабуе як ідэялёгіі, гэтак і срогага выконваньня фінансавага пляну. БДТ I, які знаходзіцца на самавыстарчальнасьці, неабходна гібка й хітра лавіраваць паміж гэтымі разьбежнымі бакамі тэатральнага існаваньня. Тэатр мусіць трымаць спэцыяльных выезных адміністратараў і касіраў, якія займаюцца арганізацыяй гледача на прадпрыемствах, установах, школах і г.д., наладжваньнем выязных спэктакляў у раёны й калгасы, прадажай спэктакляў тым ці іншым арганізацыям, зьездам, канфэрэнцыям, камісіям, што ладзяць юбілеі, сьвяты, урачыстасьці. Ня гледзячы на вагу БДТ I, на ягоную папулярнасьць, яму аднак, ці рэдка прыходзіцца папаўняць сваю касу "ходкай п'есай". Слабой, прымітыўнай па якасьці, затое цікавячай абыватэля інтрыгай, крыміналам, ці сэнтымэнтам мэлядрамы, ці далёкім ад сучаснасьці бытам, а іншы раз і, наадварот, лабавой прапагандай. Тут відавочны мэтрыкальныя, але не мастацкія накіраваньні. БДТ I, як кажуць крытыкі:

"сьпяшаецца, каб выканаць фінансавы плян".[80]

Дзеля гэтых меркаваньняў трупу тэатру мусяць драбіць на дзьве-тры брыгады, якія выпускаюць так званыя паралельныя спэктаклі. Само сабой зразумела, што пры гэтым губляцца сваеасаб-

лівасьць актораў, ролі даюцца выходзячы зь лічбаў складу, а не павсюля творчых здольнасьцяў.

Савецкае штатнае расьпісаньне тэатраў складзена так, што яно ня ўлічвае нацыянальнай спецыфікі тэатраў, тое, што беларускія й украінскія тэатры маюць сваю традыцыю музычна-драматычных пастановак, неабходнасьць трымаць у складзе трупы аркестру, хор, танцавальную групу, - на ўсё гэта амаль што няма прадугледжаных крэдытаў і тэатру прыходзіцца вышукваць сяродкі, каб захаваць цэласьць нацыянальнага спэктаклю.[81]

Наагул, атрымоўваецца фактычна, на практыцы тэатральнай дзейнасьці, што, быццам наўмысьля, на кажным кроку савецкія ўмовы ставяць перапоны, рагаткі, складаюць цяжкасьці, нэрвознасьць, цягнуць тэатр назад. Асабліва ўсю недарэчнасьць савецкай тэатральнай палітыкі /зь ідэйнага, мастацкага й фінансава-гаспадарскага боку/ адчуваюць на сабе нацыянальныя тэатры, а ў ліку іх і БДТ I. Страта вартасьцяў, - наяўны таму довад.

6. Сяродкі аздараўленьня

Небясьпечнае становішча БДТ I, як можна было бачыць, заўважана было ў паасобных частках ужо амаль што адразу пасьля 2-ой сьветавай вайны, а ў вапошнія гады яно настолькі пагоршылася, што выклікала сур'ёзную трывогу сярод савецкай крытыкі й кіраўніцтва. Аднак, лучнасьць у вызначэньні наяўнасьці ў тэатры цяжкой і зацяглай хваробы зусім яшчэ не вяла да агульнасьці ў апініі й паглядах, якімі сяродкамі й лекамі трэ' правесьці аздараўленьне. Тэатравед Арлоў, артыкул якога паслужыў зернем дадзенага кароткага дасьледваньня, выказаўшы рэзюмэ, што "купалаўцы павінны адрадзіць свае здаровыя традыцыі"[82], радзіць зрабіць гэта спосабам шырокага адчыненьня дзьвярэй тэатру -

> "таленавітай рэжысэрскай і акторскай моладзі, якая павінна ўнесьці сьвежасьць у жыцьцё тэатру, узбударажыць майстроў, якія былі ў мінулым неспакойнымі і гарачымі".[83]

Інакш кажучы, прапануецца гальванізаваць дзейнасьць БДТ I маладою крывёю. Я тут ня маю намеру браць пад сумлеў шчырасьці парады, а таксама яе станоўчых, пазытыўных якасьцяў, але трэ' зараз-жа сказаць, што яна яшчэ ня ўпіраецца ў сутнасьць справы. Магчыма, што той факт, што артыкул Арлова, напісаны для

газэты "Зьвязда", - воргану ЦК камуністычнай партыі Беларусі, - перашкодзіў крытыку выказаць больш войстрыя думкі. Ува ўсякім разе аўтар, нашмат адстаў ад некаторых іншых тэатраведаў. У беларускім савецкім друку /часапісе "Беларусь", газэце "Літаратура і Мастацтва"/, дзякуючы пэўнай лібэралізацыі новага калектыўнага кіраўніцтва, за апошнія часы сям-там трапілі думкі больш цікавыя. Справа ходзіць ня толькі аб узьнятай кампаніі за беларускую п'есу, за арыгінальны нацыянальны рэпэртуар[84], але аб тым, што хаця й прыглушана, вакольнымі шляхамі, усё-ткі давалася ўяўленьне аб тых грунтоўных і запраўдных леках, якія маглі-б тут мець вялікае значаньне. Беларускія мастацкія крытыкі зусім правільна сталі гаварыць "аб забытых каштоўнасьцях"[85], зьвярталі ўвагу, што ў тэатрах ня стала клясычных беларускіх твораў, што ня выкарыстаныя лепшыя вузоры беларускай драматургіі /творы Дуніна-Марцінкевіча, Купалы, Міровіча - "Кастусь Каліноўскі"/, што:

> "наша багатая драматургічная спадчына ... патрабуе пільнага вывучэньня".86

У друку, навет, паявіліся радкі аб магчымасьці рэгабілітацыі "На Купальле" Кудзелькі-Чарота, у свой час трыумфальна пастаўленага БДТ I[87]. Такім чынам краналіся /завуалявана/ істотныя пытаньні аздараўленьня БДТ I.

Немагчыма рабілася мірыцца, пагаджацца з такімі фактамі, што вядучы тэатр БССР зачыніў сэзон 1955-56 году п'есай Арбузава "Таня", а адчыніў новы сэзон 1956-57 году п'есай Пагодзіна "Крэмлёўскія куранты"[88], не знайшоўшы магчымасьці даць і ў такія ўрачыстыя для кажнага тэатру дні - сваёй арыгінальнай беларускай пастаноўкі.

Вышэйшае партыйнае савецкае кіраўніцтва навонкі таксама нібы было ўстрывожана адсутнасьцю беларускага рэпэртуару. На XXII зьезьдзе партыі Беларусі першы сакратар /тады Патолічаў/ заяўляў, што:

> "тэатры Беларусі ў 1955 г. не паказалі ніводнай новай п'есы беларускіх драматургаў".89

"Зьвязда" прысьвечвае арыгінальнай беларускай п'есе колькі сваіх перадавіцаў. Тым ня менш гэтыя пытаньні разглядаюцца выключна ў прапагандовым аспэкце. Трэ' складсьці міт аб сувэрэннасьці БССР, і там галоўным чынам турбуюцца:

"неясна якімі арыгінальнымі творамі сустрэнуць яны /тэатры БССР - М.К./ саракагодзьдзе Кастрычніка?"90

Партыйныя рэцэпты аздараўленьня грунтуюцца на перавазе савецкага мастацтва ўва ўсім сьвеце, на непарушных прынцыпах сацыялістычнага рэалізму й таму бачаць ратунак у стварэньні такіх беларускіх пастановак і п'есаў, якія-б раскрывалі:

патос пасьляваеннага будаўніцтва", "вобразы сваіх сучасьнікаў"[91], "вобразы перадавых савецкіх людзей".[92]

Пад уплывам гэтай палітычнай траскатні й спэцыялістыя-тэатраведы, зварочваючыся да БДТ I, з патасам ускліквацьць:

"Дзе яны - нашы сучасьнікі? Чаму так доўга, так пакутліва нараджаюцца тыя, хто пакліканы прыняць факел пераемнасьці ад Сымона, Якіма Сарокі, Леапольда Гушкі, Данілы Дрыля і іншых гэрояў беларускай клясыкі?"93

Можна толькі радавацца таму, што гэтая сучаснасьць "так доўга, так пакутліва" нараджаецца ў БДТ I, - якраз у гэтым трэ' бачыць дадатні факт, які трохі яшчэ стрымлівае ўпадак тэатру. Тут ужо разглядалася, як савецкая сучаснасьць адбілася на творчай працы БДТ I. Справа ідзе не аб пераемнасьці /настолькі вялікая прорва ляжыць паміж двумя сьветамі: нацыянальным і камуністычным/, але аб поўнай згубе гэрояў беларускай нацыянальнай клясыкі, а значыцца разам і постаці Беларуса, ягонай натуры, псыхалягічных і бытавых адзнакаў. Гэрої гэтыя або адкінутыя, як нясугучныя савецкаму часу, або выглядаюць пры сацыялістычнай прэпарацыі, як у крывым люстэрку, чужымі й непраўдзівымі.

Вось знаны вобраз беларускага нацыянальнага змагара Кастуся Каліноўскага. Калісьці п'еса аб ім /Міровіча/ была фундамэнтальнай пастаноўкай БДТ I і ўплывала на ўсё беларускае грамадзтва /варта тут прыгадаць постаць Каліноўскага ў нацыянальнай трактоўцы знанага артыстага БДТ I - Крыловіча/, - цяпер, на працягу ўжо 30 год яна ня йдзе на сцэне тэатру, спачатку таму, што было цалкам забаронена імя беларускага народнага правадыра, а потым таму, што не знаходзіўся аўтар, які задаволіў-бы партыйныя колы сваёй хвабрыкацыяй постаці Каліноўскага на савецкі лад.[94]

Такі-ж лёс чакаў і п'есы "На Купальле", "Каваль-ваявода", "Адвечная песьня" і іншыя - ўсё грунтоўныя рэчы рэпэртуару БДТ I, найлепшыя нашчадкі купалаўскай тэатральнай традыцыі.

Немагчыма ўявіць сабе на сучаснай тэатральнай сцэне й вобраз Леапольда Гушкі /аб якім падае З.Арлоў/, змагара з эксплятацыяй работніцкай клясы, - сучасная эксплятацыя з боку савецкай улады тады набывала-б занадта войстрае рэагаваньне гледача. Вельмі спрэчным рабіўся-б цяпер і вобраз партызана Данілы Дрыля, у якім мы бачылі ў пастаноўцы БДТ I столькі чыста беларускіх рысаў і нацыянальнай сьведамасьці, што былі-б плямаю на інтэрнацыяналістычных прынцыпах савецкай палітыкі. Недарма, трэба меркаваць, ані Гушка, ані Дрыль ужо дзесяткі год ня бачаць сцэнічнага ўвасабленьня.

Што датычыцца і цяпер яшчэ жывучых на сцэне БДТ I вобразаў Сымона й Якіма Сарокі, дык мы ўжо сустракаліся зь іх "новым прачытаньнем", "сугучнасьцю сучаснасьці", "сацыяльным акцэнтам" і іншымі прыёмамі савецкай лябараторыі, у якой гэтыя вобразы абрабляюцца.

Да рэчы тут паставіць пытаньне: чаму на сцэне БДТ I ня была адноўленая драма Я.Купалы "Раськіданае гняздо"? Здавалася-б, што якраз БДТ I меў на гэтую п'есу ўсе правы: - яна была першая ім у свой час /пачатак 20-х гадоў/ пастаўлена, мела грунтоўнае месца ў рэпэртуары тэатру на працягу колькіх год і да таго яшчэ належыць таму аўтару, імя якога носіць цяпер тэатр. Аднак аднавіў "Раськіданае гняздо" БДТ 2. Паводля крытычных артыкулаў аднаўленьне гэтай пастаноўкі /рэжысэр Сьцібнеўскі/ выходзіла з тэй прычыны, што з драмы Купалы была выкінута ўся сымболіка, ёй уласьцівая, і пастаноўка прыняла рысы сацыялістычнага рэалізму. Разам з гэтым адкінутымі аказаліся й тэма Беларусі, зьбіраючай сваіх дзетак па сьвеце, а таксама і вобраз новай Беларусі /Сымон/ й пазаклясавыя суадносіны яе дзеючых асобаў, - гэта значыць выкінута ўсё купалаўскае нутро, уся душа твору. Можна думаць, што сярод рэжысэраў БДТ I, узгадаваных у купалаўскай традыцыі, не знайшлося такога, які ўзяў-бы на сваё сумленьне такую жудасную вівісэкцыю.

Тут ужо гаварылася аб тым, што БДТ I яшчэ імкнецца цэпка трымацца за ўсякую магчымасьць выявіць такую пераемнасьць традыцыяў - у гэтым ягоная вялікая заслуга й у гэтым сакрэт ягоных творчых посьпехаў, няўміручасьці, - але трагэдыя ў тым, што магчымасьцяў дзеля захоўваньня традыцыяў робіцца ўсё менш і

менш, а з сучаснай сацыялістычнай тэматыкаю, яны й зусім прападаюць і губяцца. Маладое пакаленьне актораў БДТ I аб нацыянальных ідэйна-эстэтычных прынцыпах працы тэатру, гістарычных традыцыях можа ведаць толькі з чутак, ды й то высказаных шэптам. Адкуль-жа ёй даставаць тыя прыклады пераемнасьці, аб каторых гэтак клапоціцца беларуская крытыка? Новая акторская зьмена расьце чужой, гадуецца на зусім іншых чужых і варожых дактрынах нацыянальнаму тэатру, і гутарка аб "сьвежасьці" і "ўзбударажаньні", якія нібы ўвойдуць з такою моладзьдзю /я, звычайна, маю наўвеце масу, але не адзінкі, сярод якіх бясспрэчна могуць быць і сьведамыя нацыянальна працаўнікі мастацтва/ у БДТ I і ліквідуюць ягоную зацяглую хваробу - ёсьць гутарка дзеля прыгожага слоўца.

Тое, што ратунак БДТ I ад канчатковай катастрофы ў "вадраджэньні сваіх традыцыяў", а шырэй кажучы /і чаго ня могуць сказаць у савецкіх умовах/ у вадраджэньні нацыянальных ідэйна-эстэтычных прынцыпаў, вырашэньні праблемы нацыянальнага стылю, захаваньні сваеасаблівага нацыянальнага твару - гэта ня выклікае, на маю думку, аніякіх сумлеваў. Толькі разумець усе гэтыя катэгорыі, іх сэнсавы зьмест трэ' па-запраўднаму, у глыбокай сваёй істоце. Але, аб тым, што савецкая ўлада ня хоча й ня можа зразумець і дапусьціць пайменна такога тлумачэньня, таксама, думаецца, ня будзе спрэчак. Партыйная-ж палітыка, як лекі й рэцэпты ня толькі не даюць аніякай надзеі на аздараўленьне, а, наадварот, усё больш штурхаюць у прорву найлепшую тэатральную адзінку БССР, вядуць яе да поўнага выраджэньня.

Бібліяграфічныя зацемкі

I. Д.Арлоў. "Рэпутацыя абавязвае". "Зьвязда", I4.X.I956.

2. Прамова А.Глебава на паседжаньні Ўсерасейскага Тэатральнага Таварыства, /I9.II.I955 г./; "Дэкада Беларускага Мастацтва", Менск, I955, б. 269-270.

3. "Дэкада Бел. Мастацтва", Менск, б. 20.

4. Там-жа. Дзеля ведама падаю тут найбольш выдатных актораў БДТ I: Народныя артыстыя СССР Ржэўская, Уладамірскі, Гле-

баў, Платонаў, Маўчанаў; Народныя артыстыя БССР: Ждановіч, Галіна, Пола, Рахленка, Саньнікаў, Грыгоніс /нябожчык/, Дзядзюшка, Шаціла, Бярыла; Заслужаныя артыстыя: Аляксеява, Драздова, Станюта, Браварская, Бараноўскі, Стома, Шынко, Янпольскі, Шапко, Пекур і іншыя.

5. "Дэкада Бел. Мастацтва", Менск, I955, б. 2I-22.

6. "Правда", I7.2.I955.

7. "Савецкая Культура", 22.2.I955.

8. Выступ Т.Осіпава ў ВТО. "Дэкада Бел. Мастацтва", б. 275.

9. "Дэкада Беларускага Мастацтва", Менск, I955, б. 20-2I.

I0. Там-жа.

II. "Правда", I7.2.I955.

I2. "Савецкая Культура", I6.2.I955.

I3. Там-жа, 22.2.I955.

I4. "Дэкада Беларускага Мастацтва", Менск, I955, б. 266.

I5. Характарыстыку й дадзеныя аб беларускім мастацтве 20-х гадоў падрабязьней у маім артыкуле: "Беларускае Мастацтва 20-х гадоў", "Беларускі Зборнік" Інстытуту для Вывучэньня СССР, кніжка 5, Мюнхэн, I956.

I6. Бел. Гос. драматический Театр имени Я.Купалы, БСЭ, т. 42, I956.

I7. У.Няфед. Шлях беларускага савецкага тэатру. Менск, I954, б. 5.

I8. "Дэкада Беларускага Мастацтва", Менск, I955, б.I8-I9.

I9. У.Няфед. Шлях беларускага савецкага тэатру. Менск, I954, б. I6. Крытык толькі некалькімі словамі гаворыць аб гэтым важным учынку тэатру, яўна трымаючыся савецкай лініі ў сваіх ацэнах.

20. З выступленьня Ф.Бандарэнкі. "Дэкада Беларускага Мастацтва", б. 265-266.

2I. А.Саладоўнікаў. "Правда", I7.2.I955.

22. Ф.Бандарэнка. "Дэкада Беларускага Мастацтва", б.264.

23. Б.Захава. "Сав. Культура", 22.2.I955.

24. Выступленьне А.Сімукова. "Дэкада Беларускага Мастацтва", б. 269.

25. Д.Арлоў "Зьвязда", I4.I0.I956.

26. Б.Захава. "Сав. Культура", 22.II.I956.

27. Вельмі важна тут падчыркнуць, што такое-ж трыумфальнае значаньне мела для БДТ 2 /імя Я.Коласа/ пастаноўка п'есы "Несьцерка", таксама з прычыны яе яскравай народнасьці, фальклёрнасьці, выяўленьня ўсіх элемэнтаў беларускага нацыянальнага спэктаклю - тут адзіная лінія.

28. П.Лютаровіч. "Росквіт Беларускага Савецкага Мастацтва", Менск, I955.

29. Н.Гарчакоў. "Савецкая Культура", I6.2.I955.

30. Д.Андрэеў. "Труд", 22.2.I955.

3I. Аб барацьбе БДТ I за нацыянальную лінію можна дазнацца й у брашуры У.Няфеда "Шлях Беларускага Савецкага тэатру", б. 7, 8, 9.

32. У.Няфед. "Шлях Беларускага Савецкага тэатру",б.6, 7, 8, 9.

33. Там-жа.

34. "Дэкада Беларускага Мастацтва", б. I8-22.

35. Рэжысэр Судакоў паставіў у БДТ I спэктакль "Залп Аўроры", а Раеўскі спэктаклі "Хто сьмяецца апошнім" і "Апошнія" /Горкага/.

36. "Дэкада Беларускага Мастацтва", б. 22.

37. "Правда", I7.2.I955.

38. Театр. БСЭ, т. 42, I956.

39. Паводля "Зьвязды" за верасень і кастрычнік I956 г.

40. "Савецкая Культура", 26.5.I955.

4I. Ёю-ж доўгі час захапляўся й БДТ 2.

42. "Савецкая Культура", I0.7.I956.

43. "Зьвязда", 30.9.I956.

44. "Зьвязда", I4.I0.I956.

45. Там-жа.

46. Там-жа, 8.8.I956.

47. У.Няфед. "Шлях Беларускага Савецкага тэатру", б. 6.

48. Там-жа, б. 5.

49. "Дэкада Беларускага Мастацтва", б.2о-2I.

50. П'еса "Апошнія" ўваходзіла ў дэкадныя паказы I940 г.

5I. БДТ I першым паставіў "Апошніх" і ўжо адно гэта мела вялікае значаньне ў СССР.

52. "Зьвязда", I4.I0.I956.

53. У непарыўнай сувязі тут знаходзіцца абавязак для крытыкі ўсю беларускую драматургію /й літаратуру/ падпарадкаваць уплыву Горкага, ягонаму беспасярэдняму ўзьдзейваньню.

54. "Дэкада Беларускага Мастацтва", б. 274-275.

55. Тут ідзе гутарка й аб заходня-эўрапэйскай клясыцы, але аб гэтым скажам далей.

56. "Зьвязда", 14.10.1956.

57. "Дэкада Беларускага Мастацтва", б. 275.

58. Л.Рахленка. Артыкул "Тэатр і п'еса" у "Советская Белоруссия", 6.5.1955.

59. "Правда", 17.2.1955.

60. "Савецкая Культура", 22.2.1955.

61. Там-жа, 4.10.1956.

62. "Зьвязда", 14.10.1956.

63. "Сав. Культура", 22.2.1955.

64. "Зьвязда", 14.10.1956.

65. Там-жа.

66. "У тэатрах Рэспублікі" "Беларусь" №1, 1955, Менск.

67. "Правда", 17.2.1955.

68. "Зьвязда", 30.9.1956.

69. "Зьвязда", 14.10.1956.

70. "Правда", 17.2.1955.

71. Там-жа.

72. "Дэкада Бел. Мастацтва", б. 265-267.

73. П'еса Віткі "Шчасьце паэты" настолькі была хвальшыва схвабрыкаваная, што яе хутка зьнялі з рэпэртуару, на яе глядачы ня йшоў.

74. "Зьвязда", 14.10.1956.

75. "Дэкада Бел. Мастацтва", б. 22.

76. "Літаратура і Мастацтва", 17.12.1955.

77. "Зьвязда", 14.10.1956.

78. Дзеля прыкладу прывяду газэту "Савецкая Культура", 30.10.1956.

79. "Зьвязда", 14.10.1956.

80. "Літаратура і Мастацтва", 26.5.1956.

81. Аб гэтым ёсьць цікавы артыкул народнага артыстага УССР, рэжысэра Кіеўскага тэатру імя Франка - Харчанкі. "Савецкая Куль-

тура", 30.10.1956.

82. "Зьвязда", 14.10.1956.

83. Там-жа.

84. Аб гэтым гаворыць і Арлоў у сваім артыкуле. Больш падрабязна па гэтаму пытаньню можна знайсьці ў маім артыкуле "Сучаснае беларускае мастацтва ў БССР", "Беларускі Зборнік" Інстытуту для Вывучэньня СССР, Мюнхэн, 1955.

85. Артыкул Есакова "Беларусь" №12, 1954 г. Есакоў - камуністы вельмі абмежаваных якасьцяў, да таго крытык каньюнктурны, працуючы паводля партыйнага загаду, але гэта ня толькі ня губляе актуальнасьці думкі, але, наадварот, падчырквае савецкую рэчаіснасьць.

86. Там-жа.

87. "Літаратура і Мастацтва", 7.4.1956. Аўтар гэтай п'есы быў зьнішчаны бальшавікамі, а п'еса забароненая.

88. "Зьвязда" за 29.7.1956 і за 28.8.1956.

89. Прамова Патолічава. "Зьвязда", 26.1.1956.

90. "Літаратура і Мастацтва", 2.6.1956.

91. "Зьвязда", 30.9.1956.

92. "Беларусь" №1, 1955.

93. Тэатравед Арлоў мае на ўвазе тут ведамых гэрояў з выдатных беларускіх п'есаў, меўшых месца ў рэпэртуары БДТ 1: Сымон - зь п'есы "Салавей" Бядулі /аб прыгонных беларускіх акторах/; Сарока - з камэдыі "Паўлінка" Я.Купалы /тэма маладой Беларусі/; Гушка - зь п'есы "Бацькаўшчына" К.Чорнага /нашчадкі сілескіх ткачоў/; Дрыль - зь п'есы "Партызаны" Крапівы /партызанскі рух супраць польскай акупацыі/.

94. Спроба пісьменьніка Клімковіча скласьці мэтадам сацыялістычнага рэалізму з тэмы Кастусь Каліноўскі опэрнае лібрэта закончылася правалам, опэра /Лукаса/ пасьля паказу ў юбілейныя дні 1941 г. /30-годзьдзе кастрычніка/ была зьнятая з рэпэртуару.

РЭЦЭНЗІІ Й ХРОНІКА

"КОМУНІСТ БЕЛАРУСІ", 1957, №1

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай Партыі БССР

Эканамічныя праблемы /галоўным чынам, пляны ды выконваньне іх/ і пытаньні палітычнага выхаваньня прабіваюцца праз увесь зьмест першага сёлетняга нумару "КБ". Кароткі перадавы артыкул "За новыя посьпехі ў камуністычным будаўніцтве" прысьвечаны сьнежаньскаму Пленуму ЦК КПСС. Артыкул знаёміць з характарам Пленуму ды накіраванасьцяй ягоных пастановаў. Побач із цьвердженьнем, што "перавагі сацыялістычнай гаспадаркі заключаюцца ў тым, што яна зьяўляецца плянавай", знаходзіцца некалькіразовае прызнаньне, што да гэтага часу "ў радзе выпадкаў у плянах мелі месца ўпушчэньні і памылкі", пры якіх "недастаткова ўлічваліся рэальныя магчымасьці забесьпячэньня плянавых заданьняў матарыяльнымі й фінансавымі рэсурсамі". "Комуніст Беларусі" перасьцерагае некаторых дзяржаўных кіраўнікоў, якія прабуюць "прыкрываць недахопамі плянаваньня сваю нездавальняючую работу па кіраўніцтву прадпрыемствамі".

Перадавы артыкул адцемлівае таксама разьвязанае Пленумам "пытаньне аб расшырэньні правоў саюзных рэспублік". "Гэта дазваляе, - гаворыцца ў ім з гэтае нагоды, - пасьлядоўна ажыцьцяўляць ленінскую нацыянальную палітыку ў гаспадарскім і культурным будаўніцтве, усебакова ўлічваць нацыянальныя асаблівасьці і мясцовыя рэсурсы". У цэлым часапісе ня відаць, аднак, сьлядоў канкрэтнага "расшырэньня правоў" саюзнае Беларусі ды якіх-небудзь рэформаў, зьвязаных з гэтым "расшырэньнем".

Бясспрэчна, вельмі важным пытаньнем, якое шырока закранаецца ў "Комунісьце Беларусі", зьяўляецца праблема ідэялёгіі й палітычнае дзейнасьці КП Беларусі сярод жыхарства. Гэтай тэме прысьвечаны артыкул загадчыка аддзелу прапаганды й агітацыі ЦК КПБ, Н.Халіпава "Аб некаторых пытаньнях палітычнае работы". Артыкул надзвычай характэрны. Ён вымоўна паказвае, якія настроі цяпер у Беларусі. Ён выяўляе той наважаны байкот, на які напатыкаецца камуністычная партыя з боку беларускага насельніцтва. Гаворачы на тэму "маральна-палітычнага адзінства савецкага грамадзтва", аўтар змушаны сьцьвердзіць /б. 9/:

> "Нельга ня прызнаць, што ў нашым грамадзтве ёсьць асобныя людзі, якія падпадаюць пад уплыў варожай прапаганды і, сьвядома ці несьвядома, становяцца праваднікамі разбэшчаных буржуазных паглядаў. Некаторыя чуждыя элемэнты, выкарыстоўваючы ў сваіх варожых мэтах барацьбу нашай партыі супраць культу асобы і яго вынікаў, пачынаюць падвяргаць нападкам нашу сацыялістычную сыстэму, наш лад, нашы прынцыпы. Пад флагам барацьбы супраць вынікаў культу асобы гэтыя элемэнты распаўсюджваюць рознага роду вымыслы, паклёпнічаюць на наш партыйны і дзяржаўны апарат, зьмяншаюць і прыніжаюць нясумненныя /бясспрэчныя - Я.З./ дасягненьні, заваяваныя гераічным савецкім народам пад кіраўніцтвам сваёй роднай партыі ў напружанай і цяжкай барацьбе, перавялічваюць недахопы і памылкі нашага будаўніцтва, пачынаюць прадстаўляць савецкую рэчаіснасьць толькі ў чорных хварбах. Сярод асобнай часткі савецкае інтэлігенцыі і студэнцкае моладзі зьявіліся нездаровыя настроі, распаўсюджваецца шкодная іржа нігілізму, зуд татальнага выкрывальніцтва, імкненьне ўсё падвяргаць злопыхальніцкаму крытыканству".

Мова й тон гэтае характарыстыкі "асобных людзей" гавораць самі за сябе, і эфэкту не злагоджвае далейшая аўтарава агаворка, што "такія элемэнты складаюць мізэрную, нязначную меншасьць".

Аўтар вызначае далей перад камуністычным актывам "першачарговы абавязак": "надаць нашай ідэялягічнай рабоце больш баявы, мэтанакіраваны характар". Адцеміўшы "вялікую палітычную работу, якую правялі й праводзяць партыйныя арганізацыі рэспублікі", Н.Халіпаў адразу-ж перайшоў да крытыкі гэтае работы. На аснове "стараннае праверкі стану палітычнае работы на месцах", праведзенае нядаўна ЦК КП Беларусі, загадчык аддзелу прапаганды і агітацыі, заяўляе /б. 10/:

"Як паказала праверка, ува ўсіх выпадках, мы сутыкаемся амаль з аднымі і тымі недахопамі: слабы ахоп палітычным уплывам усіх слаёў насельніцтва, асабліва сельскага, несыстэматычнасьць, эпізадычнасьць праводжанай палітычнай работы, абмежаванасьць тэматыкі, вельмі часта нізкі ідэйны зьмест лекцыяў, дакладаў, гутарак, заняткаў, наяўнасьць фармалізму ў праводжаных мерапрыемствах, безадказныя адносіны да вывучэньня і рэагаваньня на ідэйныя запатрабаваньні і інтарэсы тых або іншых слаёў працоўных".

Справа ўскладняецца яшчэ й тым, што, як паказвае прыклад Горадзенскае вобласьці, палітычнай работай ахоплена ня больш за 20-40 працэнтаў дарослага насельніцтва, а то і за гэта менш.

На гэтую-ж самую тэму ды ў гэткім-жа самым духу выказваюцца й іншыя аўтары "Комуніста Беларусі" №I /прыкладам, А.Савановіч, "Чаму не расьце партыйная арганізацыя?"; А.Позьняк, "Пасьля бурнага сходу" і інш./.

З карэспандэнцыі брыгадзіра Слонімскае мэблёвае хвабрыкі С.Новіка "Ці так трэба разьмяркоўваць партыйныя даручэньні?" выяўляецца, між іншага, выразнае ўхіляньне самых камуністых ад прапагандовае актыўнасьці. "У нас, - піша С.Новік, - ужо так павялося: добра выконвае камуністы сваё /партыйнае/ даручэньне - дабаўляюць яму яшчэ адно, цягне два - дадаюць трэцяе" /б.28/.

Вышэй адцемлены "слабы ахоп палітычным уплывам усіх слаёў насельніцтва" трывожны для камуністычных кіраўнікоў Беларусі тым, што /прынамся, у іхным разуменьні/ гэта беспасярэдня руйнуе вытворчыя пляны, якія, як цьвердзіла перадавіца, становяць сабой "перавагу сацыялістычнае гаспадаркі".

Гэтак, прыкладам, у карэспандэнцыі зь Віцебскага станкабудаўнічага заводу імя Кірава бязьдзейнасьцяй завадзкое партыйнае арганізацыі тлумачацца такія вытворчыя заганы /б. 29, 30/:

"Завод зь месяца ў месяц ня выконвае вытворчай праграмы як па колькасных, так і па якасных паказчыках ... З-за дрэннае арганізацыі работы ў цэхах многія рабочыя не загружаны. Як кажуць, гадзіну працуюць, дзьве стаяць ... Звычайна, у першыя дні месяца ў цэхах заціішша, а ў канцы месяца абвяшчаецца аўрал, адмяняюцца выхадныя дні, уводзяцца звышурочныя ..."

Тэме штодзённага быту савецкага чалавека прысьвечаныя: карэспандэнцыя "Больш клапаціцца аб людзях" ды артыкул / не падпісаны/ "Грамадзкае харчаваньне - пад кантроль мас".

У карэспандэнцыі з Аршанскага ільнакамбінату "Больш клапаціцца аб людзях" апісваецца прабег прафсаюзнае канфэрэнцыі прадпрыемства. Як адзначае аўтар, "сур'ёзныя нараканьні выклікала дзейнасьць прафсаюзу і адміністрацыі ў галіне нармаваньня і заработнай платы. Сама сыстэма налічэньня заработнай платы занадта грамоздкая і ў многім незразумелая радавым працаўніком" /б. 39/. Усе дэлегаты канфэрэнцыі згадзіліся таксама, што "трэба павесьці рашучую барацьбу за ліквідацыю прычын, параджаючых вытворчы траўматызм". Шмат хто жаліўся на благую работу сталовай, на нізкую якасьць прыгатаваньня стравы.

Значна цікавейшы другі артыкул "Грамадзкае харчаваньне - пад кантроль мас". У ім даецца агульны малюнак стану грамадзкага харчаваньня ў БССР. Як даведваемся, "пасьля рашэньня партыі і ўраду /"Аб мерапрыемствах па палепшаньню работы прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня" - Я.З./ ў рэспубліцы праведзена некаторая работа па палепшаньню грамадзкага харчаваньня". Выявілася гэтае палепшаньне ў тым, што за мінулы год у БССР было пераведзена на самаабслугоўваньне звыш 800 сталовых і чайных. "Комуніст Беларусі" зазначае /б. 43/: "Самаабслугоўваньне дае магчымасьць зьніжаць цэны на стравы за кошт зьмяншэньня накладных расходаў і выдаткаў вытворчасьці, паляпшаць якасьць харчаваньня, скарачаць час на атрымоўваньне ежы", і падае далей некалькі прыкладаў спраўнае дзейнасьці сталовак мэтадам самаабслугоўваньня. Пасьля артыкул - шырэй ужо - спыняецца на "сур'ёзных недахопах" грамадзкага харчаваньня ў Беларусі. "Комуніст Беларусі" сьцьвярджае, што "разьвіцьцё сеткі прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня адстае ад патрэб насельніцтва"; што будаўніцтва ў гэтай дзялянцы вядзецца "вельмі марудна". Цьверджаньні гэтыя падмацаваныя цэлым шэрагам прыкладаў. Сытуацыя выглядае запраўды непацяшальна, бо навет у самой сталіцы Беларусі /на адбудову якое быў накіраваны максымальны высілак/ у некаторых ейных раёнах /Старажоўка, Кальварыя і інш./, як гаворыцца ў артыкуле, "ня знойдзеш ніводнай сталовай".

У двух кароткіх артыкулах "З улікам канкрэтнай абстаноўкі" і "Як мы працуем з калгасьнікамі" партыйныя актывістыя расказваюць, як "калгасныя камуністыя дабіваюцца таго, каб пасьпяхова выканаць рашэньні XX зьезду КПСС і намечаныя мерапрыемствы

па намечанаму ўздыму грамадзкай гаспадаркі і павышэньня дабрабыту калгасьнікаў".

Тэме беларускае літаратуры прысьвечана зацемка сакратара Юрацішкаўскага райкому КПБ В.Буробіна п. заг. "Аб галоўнай тэме".

Вось-жа адзін зь лепшых беларускіх празаікаў, Іван Шамякін, прысьвяціў жыцьцю калгаснае вёскі два раманы: "У добры час", напісаны ў 1949-1952 гадох, і "Крыніцы", напісаны ў 1953-1956 гадох. На прыкладзе гэтых двух раманаў сакратар Юрацішкаўскага райкому КПБ даводзіць, што ў шмат якіх творах беларускае мастацкае літаратуры зусім адсутнічае тэма працы, якая, на ягоную думку, "павінна быць галоўнай, цэнтральнай тэмай". "Калі-ж чытаеш раман Івана Шамякіна "У добры час", - піша рэцэнзэнт, - складаецца ўражаньне, што сваім уздымам калгас "Партызан" /галоўны "гэрой" раману - Я.З./ забавязаны паседжаньням, сходам - чаму хочаце, толькі не працоўнай дзейнасьці калектыву арцелі". Побач з гэтым ставіцца аднак прызнаньне, што "ў гэтым-жа рамане, як і ў некаторых іншых творах пісьменьніка, адчуваецца рука добрага майстра"...

У разьдзеле "Лекцыі і кансультацыі" часапісу "Комуніст Беларусі" знаходзім артыкул на тэмы матарыялістычнае дыялектыкі - "Аб законе адмаўленьня адмаўленьня".

Разьдзел "У дапамогу прапагандысту і агітатару" запоўнены артыкулам М.Алексютовіча "Навука нясумешчальная з рэлігіяй". Між іншага, аўтар артыкулу, "дапамагаючы прапагандыстаму і агітатару", самавольна й абсурдна залічыў да матарыялістых і змагароў супраць рэлігіі выдатнага ўсходніх Славян першадрукара, аўтара першага беларускага перакладу Бібліі /1517 г./ і іншых кніг Сьв. Пісьма, хрысьціянскага прасьветніка Францішка Скарыну, а таксама беларускіх рэлігійных і культурных дзеячоў Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага.

Характэрнай зьяўляецца рэакцыя "Комуніста Беларусі" на падзеі ў Польшчы ў галіне сельскае гаспадаркі. У студзеньскім нумары часапісу зьмешчаны "агляд матарыялаў" варшаўскае "Трыбуны Люду" ў пытаньні польскіх калгасаў.

> "Падзеі, - піша "Комуніст Беларусі", - якія разгарнуліся на працягу апошніх месяцаў у польскай вёсцы, выклікалі ў нас у Беларусі, як у суседзяў дружалюбнай нам Польскай Народнай Рэспублікі, нату-

ральную цікавасьць. Ня ўсюды, аднак, гэтыя падзеі зразуметы правільна. Сёй-той, карыстаючыся ўсякага роду падазронымі чуткамі, зрабіў вывад, што, быццам-бы, Польская аб'еднаная рабочая партыя зьмяніла сваю палітыку ў сялянскім пытаньні, навет ледзь не адмовілася ад будаўніцтва сацыялізму ў вёсцы" /б. 72/.

Вырваўшы некалькі цытат з "Трыбуны Люду", з пастановаў УІІІ Пленуму ПАРП ды з прамовы Гамулкі, "Комуніст Беларусі" дарма намагаецца супаксіць беларускае сялянства ды ўгаварыць яго, што "... перадавая частка /польскага/ сялянства ўпорна адстойвае і замацоўвае заваяваныя пазыцыі"; што "... навет у тых вёсках, дзе вытворчыя каапэратывы часова распаліся, сяляне аб'ядноўваюцца на новых арганізацыйных пачатках"; урэшце, што "адліў з вытворчых каапэратываў ў Польшчы ... быў часовым" ды што "...вытворчыя каапэратывы ўстаялі і прадаўжаюць разьвівацца ..."

Праведзеная рэдакцыяй "Комуніста Беларусі" па гарадох і раённых цэнтрах "канфэрэнцыя чытачоў", між іншага, выявіла наступнае /б. 78, 79/:

"Апошнім часам у журнале надрукаваны рад цікавых матарыялаў, якія аказваюць людзям несумненную дапамогу ў павышэньні ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню, а таксама ў практычнай рабоце ... Разам з тым...: На старонках журналу мала выступаюць партыйныя работнікі - сакратары, загадчыкі аддзелаў, інструктары райкомаў партыі. Недастатковая колькасьць артыкулаў і заметак, напісаных нізавымі партыйнымі работнікамі. ... Слаба вядзецца атэістычная прапаганда. Трэба ўзмацняць і весьці яе не наогул, а выходзячы з канкрэтных умоваў Беларусі, у прыватнасьці яе заходніх раёнаў. ...У журнале яшчэ не пераадоленая некаторая аднастайнасьць мовы карэспандэнцыяў і артыкулаў..."

Цяжка не згадзіцца асабліва з гэтым апошнім цьверджаньнем.

Я.Запруднік

БЕЛАРУСЫ Ў ПОЛЬШЧЫ

/Беларускае Грамадзка-Культурнае Таварыства/

26 лютага 1956 году ў Польшчы, у г. Беластоку, адбыўся зьезд Беларусаў Польшчы, на якім было заснаванае Беларускае Грамадзка-Культурнае Таварыства. Гэта першая беларуская грамадзкая арганізацыя ў Польшчы, пасьля дванаццаці год жорсткае дыскрымінацыі беларускае нацыянальнае мяншыні[x/]. У зьезьдзе ўзяло ўдзел звыш 400 дэлегатаў і гасьцей, якія рэпрэзэнтавалі сабой каля 150 тысяч Беларусаў.

У статуце Беларускага Грамадзка-Культурнага Таварыства гэтак гаворыцца аб мэтах гэтае арганізацыі:

> "Мэтай Таварыства зьяўляецца:
> 1. Шырэйшае як дагэтуль уключэньне беларускага насельніцтва ў усенароднае будаўніцтва сацыялізму ў Польшчы.
> 2. Папулярызацыя і распаўсюджваньне традыцыяў супольных змаганьняў беларускіх і польскіх работнікаў і сялян.
> 3. Усебаковае распаўсюджваньне добрасумленнай веды аб СССР, а ў асаблівасьці аб БССР, аб жыцьці іх на-

---

x/ Беларускаельніцтва ў Польшчы зьяўляецца найбольш шматлікай нацыянальнай групай у Польшчы. Усіх Беларусаў у Польшчы налічваецца да аднаго мільёна двухсот тысяч. Гл. Мікола Волаціч, Насельніцтва Заходняе Беларусі і яго перасяленьне між сучаснай Польшчай і БССР у "Беларускі Зборнік" Інстытуту для Вывучэньня СССР, кн. 4; Я. Каранеўскі, Да пытаньня Беларусаў у Польшчы. "Б-на", 30.9.56; А.Будзіч, Па старой традыцыі. Колькі Беларусаў у Польшчы? "Б-на", 28.10.56.

родаў і непахіснай барацьбе за мір і дружбу паміж народамі.
4. Умацоўваньне сувязі братэрскага супрацоўніцтва беларускага насельніцтва з працоўным польскім насельніцтвам.
5. Азнаямленьне беларускага насельніцтва з прагрэсыўнай культурай польскага народу і наадварот - азнаямленьне польскага насельніцтва з прагрэсыўнай культурай беларускага народу.
6. Распаўсюджваньне беларускае культуры: нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу.
7. Арганізаваньне і падтрымліваньне беларускае мастацкае і навуковае творчасьці.
8. Ахоўваньне беларускага фальклёру.
9. Арганізацыя апекі над беларускімі бібліятэкамі, калектывамі мастацкае самадзейнасьці і школамі.
10. Арганізацыя апекі над забытковай беларускай культурай.

Да заснаваньня Беларускага Грамадзка-Культурнага Таварыства беларускае грамадзка-культурнае жыцьцё ў Польшчы насіла чыста спарадычны характар і ня мела ні падтрымкі з боку польскіх уладаў, ні праўнае асновы. Тым ня менш, на дзень зьезду ў Польшчы /Беласточчыне/ налічвалася 5 сярэдніх беларускіх школ, 52 пачатковыя школы і 114 школ зь беларускай мовай як прадметам. Узровень культурнага жыцьця Беларусаў вымяраўся 84 бібліятэкамі й 238 бібліятэчнымі пунктамі, 151 дзяржаўнымі й грамадзкімі клюбамі, 140 гурткамі народнае мастацкае самадзейнасьці.

Ад часу заснаваньня Беларускага Грамадзка-Культурнага Таварыства павялася актыўная дзейнасьць у кірунку замацаваньня беларускае нацыянальнае сьведамасьці, пашырэньня беларускага школьніцтва, беларускіх бібліятэк, тэатраў і самадзейных гурткоў.

З сакавіка 1956 году пачала рэгулярна выходзіць першая ў пасьляваеннай Польшчы беларуская тыднёвая газэта "Ніва".

Пры Варшаўскім унівэрсытэце была зарганізаваная Катэдра Беларускае Філялёгіі, якая ўвосень пачала сваю працу.

Цяпер ставяцца дамаганьні правесьці пры наступных выбарах беларускіх паслоў у Сойм Польшчы, якія-б рэпрэзэнтавалі там не выбарчыя акругі, а нацыянальную беларускую групу.

Ува ўсіх кірунках пастаўленых мэтаў БГ-КТ асягае значныя посьпехі.

Аднак, пасьля кастрычніцкіх падзеяў у Польшчы, супраць Бе-

ларусаў, як і супраць іншых нацыянальных групаў, павяліся моцныя шавіністычныя нападкі з боку польскіх мясцовых чыньнікаў. Цяпер змаганьне гэтае ў поўным разгары, і яно спрычыняе шмат шкоды беларускаму грамадзка-культурнаму жыцьцю ў Польшчы.

Праявы польскага нацыяналізму знайшлі свой адбітак на праведзеным 25 лістапада Першым пленуме Галоўнае Ўправы Беларускага Грамадзка-Культурнага Таварыства. Пастанова гэтага пленуму забавязвала сваімі першымі чатырмя пунктамі Галоўную Ўправу Беларускага Грамадзка-Культурнага Таварыства:

> "I. Высьвятліць адносіны Партыі і Ўраду да правакацыйных выступленьняў, праяваў дыскрымінацыі польскіх шавіністых у адносінах да Беларусаў.
> 2. Зьвярнуцца ў Ваяводзкі Камітэт ПЗПР з просьбай, каб даў рашучы адпор шавіністычным і дыскрымінацыйным элемэнтам у сваім воргане "Беластоцкай Газэце", і каб "Беластоцкая Газэта" бліжэй зацікавілася справай адносінаў Палякаў да беларускае меншасьці ў ваяводзтве.
> 3. Апублікаваць адозву ў "Беластоцкай Газэце" адносна справаў суадносінаў паміж польскім і беларускім насельніцтвамі.
> 4. Як мага хутчэй высьветліць справу прадстаўніцтва ад беларускага насельніцтва ў будучым Сойме".

Праблема польскіх шавіністычных нападак на нацыянальныя мяншыні турбуе ня толькі кіраўнікоў беларускіх арганізацыяў у Польшчы. Дзеіцца крыўда і іншым нацыянальным мяншыням - Немцам, Украінцам, Летувісам, Жыдом і іншым. Кіраўнікі іх дамагаюцца ад польскага ўраду спыненьня ненармальнага - асабліва ў сацыялістычнай дзяржаве - нацыяналістычнага антаганізму з боку дзяржаўнага народу. Усё часьцейшыя выказваньні на гэтую тэму зьяўляюцца ў прэсе й радыё. Пытаньне гэтае выносіцца на публічны й урадавы форум прадстаўнікамі нацыянальных мяншыняў Польшчы. Аднак, як выглядае, разьвязка ягоная нялёгкая.

27.XI.56 у Варшаве адбылося спатканьне беларускіх, украінскіх, жыдоўскіх і польскіх журналістых з прадстаўнікамі Міністэрства нутраных справаў Польшчы. Заступнік міністра заявіў /гл. "Ніва", 9.XII.56/: "Праблемы нацыянальных мяншыняў ня вырашыць сёньня само Міністэрства нутраных справаў. Рэалізацыя палітыкі нацыянальных мяншыняў вымагае супрацоўніцтва ўсяе грамадзкасьці, усіх міністэрстваў. Гэтай справай павінен штодзённа займацца польскі друк".

Як ведама, Беласточчына, дзе сканцэнтраванае цяпер беларускае жыцьцё ў Польшчы, зьяўляецца часткай этнаграфічнае Беларусі. У 1939 годзе Беласточчына была далучаная бальшавікамі да БССР, як частка гэтае рэспублікі, а сам Беласток быў уважаны за сталіцу Заходняе Беларусі. У 1944 годзе, у выніку палітычных камбінацыяў, Сталін аддаў Польшчы гэтую частку беларускае тэрыторыі.

Цяжка цяпер прадбачыць, як будзе разьвівацца далей беларускае жыцьцё ў Польшчы. Фактам аднак зьяўляецца, што кіраўнікі беларускіх арганізацыяў, падтрымоўваныя беларускім насельніцтвам, вядуць наважанае змаганьне за захаваньне сваіх правоў на раўнапраўнае жыцьцё ў межах Польшчы. Да гэтага часу шмат чаго было зроблена ў гэтым кірунку.

Ворган Беларускага Грамадзка-Культурнага Таварыства, газэта "Ніва" /18.XI.56, перадавы артыкул/, адказваючы на пытаньне "Што з намі будзе?", якое пачалі задаваць сабе Беларусы ў сувязі з праявамі польскага шавінізму, - пісаў:

"Што з намі будзе? - А вось што: мы будзем жыць на сваім месцы, працаваць на сваім кавалку зямлі, у сваёй вёсцы, ці горадзе. Нас ніхто ня мае права адсюль выгнаць і ня выгане. Тут наша бацькаўшчына. Мы раўнапраўныя гаспадары гэтае зямлі..."

ДА ПЫТАНЬНЯ РЭГАБІЛІТАЦЫІ Ў БССР

У сувязі з антысталінскай прапагандовай кампаніяй калектыўнага кіраўніцтва, якая сталася асабліва выразнай пасьля XX зьезду КПСС, у Савецкім Саюзе была рэгабілітаваная невялікая група беларускае інтэлігенцыі. У яе ўвайшлі выключна людзі пяра, што якраз і характэрызуе гэтую рэгабілітацыю як захады апраўдальнае рэклямы, а не мерапрыемствы з гуманным зьместам. Фактычна, ніякае рэгабілітацыі, у запраўдным сэньсе гэтага слова, у БССР не праводзілася. Тое, што адбылося ў гэтым кірунку настолькі частковае й мінімальнае, што яно наводзіць думку хутчэй на асьцярожныя сымптомы рэгабілітацыі, што патрэбны былі новым валадарам Беларусі выключна "на дадзеным этапе", які, дарэчы, з канцом 1956 году таксама дабег да свайго канца.

Колькасьць ахвяраў, якія панёс беларускі народ ў часы сталінскага тэрору ды перасьледу беларускіх апазыцыйных настрояў яшчэ й да сяньня дакладна не ўстаноўленая, але яна бясспрэчна была вельмі вялікая.

Рэгабілітавана-ж сяньня ня поўны дзесятак асоб, і то рэгабілітавана часткова. Характэрным прыкладам гэткае частковае рэгабілітацыі зьяўляецца беларускі палітычны, грамадзкі і культурны дзеяч, паэта і празаік, Цішка Гартны /Жылуновіч/. Цішка Гартны ведамы беларускаму грамадзтву ня толькі як пісьменьнік, але як і буйны палітычны дзеяч. Ён быў першым старшынём першага савецкага беларускага ўраду, падпісваў маніфэст аб стварэньні БССР у 1919 г. Да 1930 году - дырэктар Беларускага дзяржаўнага выдавецтва. Ад 1928 году - акадэмік Беларускае Акадэміі. Арыштаваны ў 1936 годзе, ён загінуў у бальшавіцкіх турмах, не даведаўшыся навет, у чым ён вінаваты.

Тымчасам Цішка Гартны рэгабілітаваны спадкаемцамі Сталіна выключна як пісьменьнік; аб ягонай шматбаковай палітычнай і грамадзкай дзейнасьці ня сказана ані слова.

Другім довадам частковасьці савецкае рэгабілітацыі зьяўляецца факт, што ніводзін прадстаўнік зь ніякае іншае дзялянкі беларускага жыцьця да гэтага часу ня быў рэгабілітаваны, навет часткова.

Трэцім довадам частковасьці рэгабілітацыі зьяўляецца асаблівая нясьмеласьць у падаваньні біяграфічных дадзеных "рэгабілітаваных" беларускіх дзеячоў ды поўнае прамоўчваньне абставінаў іхнае гібелі.

Савецкі "Энцыкляпэдычны Слоўнік" /1955/ слова "рэгабілітацыя" у дачыненьні да загінутых ахвяраў несправядлівасьці тлумачыць, як "аднаўленьне папярэдняе рэпутацыі, запярэчаньне абвінавачаньняў". Аднак, у ніводным выпадку рэгабілітаваных у БССР беларускіх пісьменьнікаў ня было ня толькі запярэчаньня пастаўленых ім калісьці абвінавачаньняў, але ня прыгадваюцца ні словам і гэтыя самыя абвінавачаньні. З гэткага спосабу рэгабілітаваньня аніяк нельга зрабіць выраду, ці пакараныя, прыкладам, былі вінаватыя ці не. Гэтая нясьмеласьць сучасных камуністычных валадароў найвыразьней паказвае і на нячыстасьць іхнага сумленьня што да ахвяр сталінскага рэжыму.

Уся так званая "рэгабілітацыя" беларускіх пісьменьнікаў выявілася ў тым, што ў беларускай савецкай прэсе былі апублікаваныя кароценькія біяграфічныя даведкі гэтых некалькіх асобаў ды па некалькі твораў або ўрыўкаў зь іхных твораў. Да "рэгабілітаваных" беларускіх пісьменьнікаў сяньня належаць: Цішка Гартны /паэта, празаік/, Платон Галавач /празаік/, Барыс Мікуліч /празаік/, Сымон Баранавых /празаік/, Васіль Шашалевіч /драматург/, Уладзімер Хадыка /паэта/, Юлі Таўбін /паэта/, Я. Бранштэйн /крытык/. Усе яны былі арыштаваныя ў 1934-36 гадох. Зь перавыданьнем іхнае літаратурнае спадчыны пакуль што няясна. Да гэтага часу выйшаў толькі ў 1956 годзе зборнік выбраных твораў Уладзімера Хадыкі ды заплянавана на 1957 год выданьне раману Цішкі Гартнага "Сокі цаліны", Юлія Таўбіна "Выбраныя творы". Аб іншых пакуль што нічога няведама, хоць кажны зь іх мае арыгінальныя, незнаёмыя беларускаму чытачу, творы.

Да рэгабілітаваных нельга, зразумела, аніяк залічыць таксама няпоўны дзесятак беларускіх пісьменьнікаў, якія пасьля 20 год катаргі вярнуліся цяпер у Беларусь і публічна выступаюць.

Уся гэтак званая "рэгабілітацыя" ў БССР /закончаная, зрэшты, ужо/ выразна паказавае, што гэта быў тактычны прапагандовы манэўр партыйнага кіраўніцтва, які ня выклікаў ніякіх зьменаў ні ў нутры самое БССР, ні ў савецкай "нацыянальнай палітыцы", ні ў дачыненьнях Масквы да беларускае культурнае спадчыны.

ТРЭЙЦІ ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМ БЕЛАРУСІ

Ад 20 да 21 сьнежаня 1956 году ў Менску адбыўся трэйці пленум ЦК ЛКСМ Беларусі. У працы пленуму ўзялі ўдзел кіраўнікі ВНУ і тэхнікумаў ды сакратары камітэтаў камсамолу буйнейшых установаў Беларускае рэспублікі[x/]. Пленум абмеркаваў дзейнасьць камсамольскіх арганізацыяў вышэйшых і спэцыяльных сярэдніх навучальных установаў Беларусі[xx/].

Скліканьне трэйцяга камсамольскага пленуму Беларусі мае за адну з асноўных прычынаў палітычныя забурэньні сярод студэнцкае моладзі Савецкага Саюзу. Беларусь, як крайняя заходняя частка імпэрыі, мяжуючыся з Гамулкавай Польшчай, асабліва адчула подых новых ідэялягічных фэрмэнтаў. Між іншага, Менскае радыё, паведамляючы 22.12.56 аб адбытым камсамольскім пленуме, адцеміла было: "Пасьля XX-га зьезду КПСС у студэнтаў узрасла цікавасьць да падзеяў у нутраным жыцьці ў нашай краіне і за рубяжом. Аднак, не заўсёды камсамольскія актывістыя могуць адказваць на пытаньні, якія задаюць студэнты ..."

Як выглядае з афіцыйных справазданьняў праведзенага пленуму, на парадак дня былі пастаўленыя дзьве асноўныя праблемы:

1. Выхоўваньне ідэйных высокакваліфікаваных спэцыялістых і
2. Сувязь камсамольскіх арганізацыяў з шырокімі масамі моладзі.

---

x/ Пашыранае справазданьне аб пленуме гл. у "Чырвонай Зьмене", 26.12.56.

xx/ Паводля афіцыйных дадзеных, у Беларусі налічваецца 23 вышэйшыя і 122 сярэднія спэцыяльныя навучальныя ўстановы, у якіх вучацца 110 тысяч студэнтаў. У вышэйшых навучальных установах - 50,5 тысяч студэнтаў.

З праведзеных адносна першага пункту спрэчак вынікае наступнае: На Беларусі адчуваецца нястача працоўных рук і ўхіляньне моладзі ад камсамольскае арганізацыі. Каб уцягнуць у сацыялістычную вытворчасьць і ў камсамольскія арганізацыі абсальвэнтаў сярэдніх школ і студэнцкую моладзь, робіцца шэраг захадаў. Да іх у першую чаргу належаць новыя ўмовы прыняцьця ў ВНУ. Як было адцемлена на пленуме, згодна з гэтымі ўмовамі, пры прыйме кандыдатаў у ВНУ будзе давацца "перавага людзям з вытворчасьці, улічваючы рэкамэндацыі камсамольскай арганізацыі".

Адносна некаторых асобаў, ужо прынятых на студыі, было сьцьверджана: "Сярод студэнтаў ёсьць яшчэ беларучкі, людзі, якія пасуюць перад цяжкасьцямі, крыкуны, стылягі... Не перавяліся яшчэ аматары пахуліганіць, дэбашыры і іншыя парушальнікі грамадзкага парадку, якія перашкаджаюць сумленным людзям жыць і працаваць".

На пленуме было пастаўленае дамаганьне, што "трэба падняць ролю камсамольскіх арганізацыяў ВНУ, каб бязь іх ведама дырэкцыі не рашалі пытаньняў аб лёсе студэнтаў". Як бачым, гэта паказвае на ўзмацненьне беспасрэднага ўмешваньня партыйных чыньнікаў у навучальны працэс ВНУ Беларусі.

Пленум закрануў таксама і справу пасьпяховасьці ды кваліфікаванасьці выаускнікоў беларускіх ВНУ. З гэтага гледзішча ёсьць таксама шмат чаго правіць. У выказваньнях было сьцьверджана: "Сур'ёзна адбіваецца на якасьці падрыхтоўкі маладых спэцыялістых тое, што студэтаў нярэдка не далучаюць да непасрэднага ўдзелу ў вытворчых працэсах і ў выніку бывае, што інжынер ня можа запусьціць станка, лекар - аказаць першае мэдыцынскае дапамогі" /падкр. нашае - Я.З./

Ад таго, што студэнты пачынаюць задаваць "недыскрэтныя" пытаньні, адчуваюць цяжкасьці ня толькі камсамольскія актывістыя /як было адцемлена вышэй/; выразна баяцца гэтае "недыскрэтнасьці" й прафэсары. "Некаторыя выкладчыкі грамадзкіх навук, - было адзначана на 3-ім пленуме ЦК ЛКСМБ, - на сэмінарах ухіляюцца ад абмеркаваньня злабадзённых пытаньняў, лічаць за лепшае адмаўчацца там, дзе трэба паказаць няправільнасьць таго ці іншага ўяўленьня, пераканаць". Хоць супраць такога ненармальнага зьявішча выказвалася шмат крытычных заўваг, - зрух з гэтага "маўклівага пункту" можа быць толькі ў вадным з двух кірункаў: або далейшае "браджэньне ў студэнцкіх галовах", або рэакцыя й паварот да сталінскага дагматызму й духовага тэрору

/сымптомы чаго ўжо вычуваюцца на Беларусі/.

Пры абмяркоўваньні пытаньняў студэнцкага штодзённага жыцьця былі адцемленыя надзвычай цяжкія бытавыя абставіны: цесната ў памешканьнях інтэрнатаў, нястача прадуктаў і паліва, перабой з забесьпячэньнем вадой і электраэнэргіяй і г.д.

Абмяркоўваньне другога пункту парадку дня пачалося з дакладу "Аб кіраўніцтве Камянецкім райкомам ЛКСМБ камсамольскімі арганізацыямі калгасаў".

Чаму за прыклад узяты Камянецкі райком? - А таму, што гэта прыклад найбольш тыпічны, прыклад, які дае ўсім іншым раённым камсамольскім кіраўніком найбольш аналёгіі.

> "Адным з сур'ёзных недахопаў Камянецкага РК ЛКСМБ ў кіраўніцтве пярвічнымі арганізацыямі зьяўляецца няправільная расстаноўка сіл актыву. У ходзе справаздачаў і выбараў у 1956 годзе з 19 сакратароў пярвічных камсамольскіх арганізацыяў калгасаў заменена 15. Да сьнежаня ў 12 арганізацыях ЛКСМБ ня былі створаны ні брыгадныя пярвічныя арганізацыі, ні камсамольскія групы".
> "Сакратары шэрагу пярвічных арганізацыяў перасталі абапірацца на сяброў камітэтаў ЛКСМБ, а сябры камітэтаў ня сталі адчуваць адказнасьці за работу камсамольскіх арганізацыяў. У шэрагу выпадкаў камітэты перасталі наагул зьбірацца на паседжаньні".
> "У Камянецкім раёне запушчана палітыка-выхаваўчая работа сярод моладзі. Камсамольскія актывістыя нерастлумачваюць і не інфармуюць моладзі аб падзеях унутры краіны і за рубяжом, слаба змагаюцца з рэлігійнымі забабонамі, не праводзяць лекцыяў на атэістычныя і навукова-прыродазнаўчыя тэмы. Дрэнна арганізавана палітычная асьвета, не наладжана эканамічная вучоба".
> "Як і ў Камянецкім раёне, у шмат якіх раёнах Гомельшчыны не завершаны абмен камсамольскіх дакумантаў /павінен быў закончыцца з канцом 1956 г. - Я.З./, частка моладзі, асабліва старэйшага ўзросту, адарвалася ад камсамолу".

Як бывае звычайна, "па абмеркаваных пытаньнях пленум прыняў разгорнутыя пастановы"...

СЭСІЯ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

Ад 19 да 22 сьнежаня 1956 году ў Менску адбылася чарговая сэсія Акадэміі навук БССР. Сэсія была скліканая, каб падсумаваць праробленую за апошнія пяць год працу ды абмеркаваць заданьні шостае пяцігодкі. На абмеркаваньне сэсіі быў пастаўлены таксама праект новага Статуту АН БССР. Новы Статут прадугледжвае павышэньне дамаганьняў да навуковых працаўнікоў з мэтай павышэньня іхнага ўдзелу ў разьвіцьці гаспадаркі рэспублікі й культуры. Праект новага Статуту меў у сабе таксама значныя зьмены ў структуры Акадэміі і ворганаў кіраўніцтва. У Статуце падкрэсьліваецца, што найвышэйшым ворганам АН БССР зьяўляецца агульнае паседжаньне ганаровых акадэмікаў і акадэмікаў Акадэміі навук. Сябры-карэспандэнты маюць на гэтым паседжаньні дарадчы голас. Праект Статуту таксама значна пашырае правы паасобных аддзелаў і інстытутаў Акадэміі.

Асноўная навуковая дзейнасьць Акадэміі навук БССР сканцэнтраваная ў 14 навукова-дасьледніцкіх інстытутах, аб'еднаных у тры аддзелы: фізыка-матэматычных і тэхнічных навук, біялягічных навук і аддзел навук грамадзкіх.

У 1957 годзе ў Акадэміі навук БССР плянуюць адкрыць новыя інстытуты: архітэктуры й будаўніцтва, мастацтва й этнаграфіі, батанікі, заалёгіі й паразыталёгіі.

На сэсіі АН БССР было выбрана ў склад Акадэміі 7 новых акадэмікаў і 7 сяброў-карэспандэнтаў. Цяпер Акадэмія навук БССР мае 45 акадэмікаў і 35 сяброў-карэспандэнтаў.

За мінулыя пяць год колькасьць доктараў навук, супрацоўнікаў Акадэміі, пабольшылася з 20 да 34, кандыдатаў навук - з 156 да 226 асобаў. У асьпірантуры Акадэміі навук БССР рыхтуюцца 134 спэцыялістых.

РАСШЫРЭНЬНЕ ПЭРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ Ў БССР

З пачаткам 1957 году ў БССР былі пашыраныя некаторыя пэрыядычныя выданьні.

Гэтак, часапіс "Калгасьнік Беларусі", штомесячны навукова-вытворчы часапіс Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР, перайменаваны цяпер у "Сельская гаспадарка Беларусі" /ворган Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР і Міністэрства саўгасаў БССР/. Ён будзе мець штомесячна 10 друкаваных аркушаў, замест дасюлешніх 5 друкаваных аркушаў.

Ворган Міністэрства культуры і ўправы Саюзу пісьменьнікаў БССР, тыднёвая газэта "Літаратура і Мастацтва", з пачаткам 1957 году выходзіць два разы ў тыдзень.

У перадавым артыкуле "Літаратуры і Мастацтва" з 15.XII.56 адцемлівалася: "Калі некалькі год таму назад рэдакцыі беларускіх літаратурных часапісаў часам адчувалі недахоп літаратурна-мастацкіх твораў, дык цяпер рэдакцыйныя партфэлі перапоўнены, устанаўліваецца доўгая чарга, прынятыя да друку творы часта залежваюцца". У сувязі з гэтым абмяркоўваецца цяпер прапанова ператварыць ворган ЦК ЛКСМ Беларусі штомесячны часапіс "Маладосьць" /4 друкаваныя аркушы/ у грамадзка-літаратурны часапіс тыпу "Маладняка" /6-7 др. арк./, што выдаваўся ў 20-х гадох у Менску. Прапануецца таксама аднаўленьне пэрыядычнага выпуску альманаху "На сонечных сьцежках" ды ўсякая падтрымка выдаваньня альманахаў абласных літаратурных аб'еднаньняў.

"У новым годзе часапіс "Полымя" /месячны ворган Саюзу пісьменьнікаў БССР, 10 друк. арк./ будзе выходзіць павялічаным памерам" - такую вестку падала "Літаратура і Мастацтва" 1.I.57.

Хроніку апрацаваў - Ян Запруднік

З Ь М Е С Т

Бачына

1. Ст.Станкевіч: Якуб Колас /3.II.1882-13.8.1956/ 5
2. П.Урбан: Нацыянальнае пытаньне пасьля XX зьезду КПСС 31
3. А.Лебедзь: Да пытаньня гідратэхнічнага будаўніцтва ў Беларусі 51
4. А.Яловіч: Тарфяныя рэсурсы БССР і іх эксплятацыя 61
5. Т.Даўлечын: Зьмены ў савецкім працоўным праве 75
6. У.Галубнічы: Разьмешчаньне прамысловасьці ў тэорыі і практыцы на прыкладзе Беларускай ССР 98
7. М.Куліковіч: Да пытаньня дэградацыі вядучага тэатру БССР 120

РЭЦЭНЗІІ І ХРОНІКА:

а/ "Комуніст Беларусі", №1, 1957 - Я.Запруднік 154
б/ Беларусы ў Польшчы - Я.Запруднік 160
в/ Да пытаньня рэгабілітацыі ў БССР - Я.Запруднік 164
г/ Трэйці пленум ЦК ЛКСМ Беларусі - Я.Запруднік 167
д/ Сэсія Акадэміі Навук БССР - Я.Запруднік 170
е/ Расшырэньне пэрыядычнага друку ў БССР - Я.Запруднік 171

З Ь М Е С Т

"БЕЛАРУСКАГА ЗБОРНІКА" №№ I, 2, 3, 4, 5 і 6 ЗА I955-I956 ГОД

АРТЫКУЛЫ	№	Бачыны
I. Адамовіч Ант.: Саветызацыя беларускай літаратуры й ейныя этапы	2	7-22
2. Адамовіч Ант.: Сацыялістычны рэалізм і ягоныя сучасныя аспэкты	5	I44-I77
3. А.Архімовіч: Культура лёну даўгунца ў Беларусі	3	I65-I73
4. В.Будзімер: Праблема асушэньня Палескай нізіны	I	72-85
5. В.Будзімер: Адмоўная роля кукурузы ў сельскай гаспадарцы БССР	2	I87-202
6. Л.Вароніч: Дзьве сыстэмы права ў Савецкім Саюзе	I	67-7I
7. Л.Вароніч: Гісторыя Беларусі ў працах савецкай гісторыяграфіі расейскаю моваю	3	I3I-I64
8. М.Волаціч: Лінія Кэрзона на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зьменаў на Усходзе Эўропы	3	68-I30
9. М.Волаціч: Насельніцтва Заходняй Беларусі і яго перасяленьне між сучаснай Польшчай і БССР	4	5-40
I0. У.Галубнічы: Разьмешчаньне прамысловасьці ў тэорыі й практыцы на прыкладзе Беларускай ССР	6	98-II9
II. Л.Гарошка: Савецкая рэлігійная палітыка пасьля I942 году	3	5-67
I2. Л.Гарошка: Сучаснае рэлігійнае становішча ў Беларусі	4	II4-I36

13. Т.Даўлечын: Савецкія мэтады змаганьня за дысцыпліну працы да XX зьезду КПСС 4 97-113
14. Т.Даўлечын: Аб пасыланьні моладзі на індустрыяльныя работы на Поўнач, Усход і ў Данбас 5 102-116
15. Т.Даўлечын: Зьмены ў савецкім працоўным праве 6 74-97
16. С.Кабыш: Уборка, хлебанарыхтоўкі й ўраджай 1955 году ў СССР 4 75-96
17. С.Кабыш: Прамысловасьць і сельская гаспадарка БССР у аспэкце шостай пяцігодкі 5 67-101
18. В.Кіпель: Мінэральныя рэсурсы Беларускай ССР 1 100-114
19. М.Куліковіч: Крызыс беларускага музычнага мастацтва ў БССР пасьля вайны 1941-1945 гг. 1 115-136
20. М.Куліковіч: Беларускае народнае мастацтва пад савецкім кірункам 2 23-48
21. М.Куліковіч: Сучаснае беларускае мастацтва ў БССР 3 174-196
22. М.Куліковіч: Падрыхтоўка мастацкіх кадраў у БССР 4 151-171
23. М.Куліковіч: Беларускае мастацтва 20-ых гадоў і ягоныя карэньні ў савецкай сучаснасьці 5 124-143
24. М.Куліковіч: Да пытаньня дэградацыі вядучага тэатру БССР 6 120-153
25. А.Лебедзь: Да пытаньня гідратэхнічнага будаўніцтва ў Беларусі 6 51-60
26. Я.Менскі: Чаму ды як была ўтвораная Беларуская ССР 1 7-33
27. Г.Няміга: Дакумэнтальнае значэньне антынацдэмаўскай літаратуры 1 67-71
28. Г.Няміга: Школьніцтва ў БССР да разгрому "нацдэмаўшчыны" /1917-1930/ 2 111-170

29. Г.Няміга: Школьніцтва БССР у няволі бальшавіцка-камуністычнай дактрыны 5 7-66
30. Ст.Станкевіч: Нацыянальная палітыка Крэмля на Беларусі ..... I 34-47
3I. Ст.Станкевіч: Купала праўдзівы й Купала схвальшаваны 4 4I-74
32. Ст.Станкевіч: Якуб Колас 6 5-30
33. Я.Станкевіч: Моўная палітыка бальшавікоў у Беларускай ССР 2 49-II0
34. П.Урбан: Нацыянальная палітыка пасьля XX зьезду партыі 6 3I-50
35. А.Яловіч: Лясы Беларускай ССР ..... I 86-99
36. А.Яловіч: Ахова прыроды й запаведнікі ў БССР 2 I7I-I86
37. А.Яловіч: Беларускія дубровы 5 II7-I23
38. А.Яловіч: Тарфяныя рэсурсы БССР і іх эксплятацыя 6 6I-73

РЭЦЭНЗІІ

I. Я.Запруднік: "Комуніст Беларусі", №I, I957 ..... 6 I54-I59
2. А.Карповіч: Кніга аб беларускім тэатры й драме / Vladimir Seduro. The Byelorussian Theater and Drama. Research Program on the USSR. New York, I955, pp. XXII-5I7/ 3 I97-20I
3. А.Марговіч: Кніга аб Беларусі ў ангельскай мове /Nicholas P.Vakar. Belorussia, The Making of a Nation. Harvard University Press. Cambridge, Massachusetts, I956, pp. 297/ 5 I78-I98
4. Г.Няміга: "Савецкая нацыянальная палітыка на прыкладзе Беларусі", у васьвятленьні Н.Вакара /Nicholas Vakar. Soviet Nationality Policy: The History of Belorussia. "Problems of Communism", I954, No.5 / 4 I37-I50

ХРОНІКА Й ЗАЦЕМКІ

I. Я.Запруднік: XXII зьезд камуністычнай партыі Беларусі 4 I72-I76
2. Я.Запруднік: XIX зьезд камсамолу Беларусі 4 I77-I83
3. Я.Запруднік: Беларусы ў Польшчы 6 I60-I63
4. Я.Запруднік: Да пытаньня рэгабілітацыі ў БССР 6 I64-I66
5. Я.Запруднік: Трэйці пленум ЦК ЛКСМ Беларусі 6 I67-I69
6. Я.Запруднік: Сэсія Акадэміі Навук БССР 6 I70
7. Я.Запруднік: Расшырэньне пэрыядычнага друку ў БССР 6 I7I
8. А.Карповіч: Другі зьезд кампазытараў Савецкае Беларусі 4 I84-I87
9. Р.М.: Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва 4 I94-I96
I0. Я.С.: Крывіцкае /Беларускае/ Навуковае Таварыства Пранціша Скарыны 4 I90-I93